

# ВЯЧАСЛАЎ АДАМЧЫК

# НЯЗРУШАНЫ КАМЕНЬ

Апавяданні

Мінск
Сучасны літаратар
2002

**УДК 882.6-31**
**ББК 84 (Беи) 6**
**А28**

Кніжная серыя НАША НІВА заснавана ў 2002 годзе
Рэдакцыйны савет:
Міраслаў Адамчык
Адам Глобус
У афармленні кнігі выкарыстаны малюнкі Адама Глобуса

**Адамчык Вячаслаў Уладзіміравіч**
А28 Нязрушаны камень. Апавяданні. — Мн.: Сучасны літаратар, 2002. — 320 с.

ISBN 985-456-0192-7.

У кнізе выдатнага беларускага літаратара — Вячаслава Адамчыка (1933—2001) сабраны апавяданьні апошніх гадоў жыцця. Зборнік “Нязрушаны камень” быў складзены аўтарам літаральна за некалькі месяцаў да смерці. Проза Адамчыка вылучаецца шчырасцю, тонкім лірызмам і своеасаблівай дасканалай моваю. Творчасць Вячаслава Адамчыка з’яўляецца ўзорным прыкладам служэння ідэалам Бацькаўшчыны.

**ББК 84 (Беи) 6**

**ISBN 985-456-0192-7**

© Сучасны літаратар, 2002
© Ніна Глобус, 2002
© Адам Глобус, 2002
© Міраслаў Адамчык, 2002

# Крэскі з аўтабіяграфіі

Радзіўся 1 лістапада 1933 года. Калі верыць тагачаснай польскай газеце, была серада, хмуры дзень позняе восені і паганскае свята — дзяды.

Мая вёска — Варакомшчына была Слонімскага, Навагрудскага, цяпер Дзятлаўскага раёна.

Варакомшчына... Дзікаватае, незвычайнае слова. Але яно для мяне хрумсціць, як нарэзаная скрылікамі і падсмажаная з алеем бульба. Варакомшчына...

Каб я быў мастаком і меў шчыра-балючы талент Ван-Гога, я нашу вёску, зямлю і людзей маляваў бы не ў сіні, а ў шэра-жоўты колер —

колер прывялага лета, спелага жыта і нашае нішчымна пясчанае зямлі. У нас не ткалі, як у Галандыі, сіняе сукно і не насілі на тварах цёмна-сіні пыл ад вугальных капальняў. У нас ткалі і да сённяшняга дня ткуць шарачак. А вяртаючыся з ворыва ці малацьбы, мае вяскоўцы прыносілі ў хату, нават на кончыку носа, шэры пыл.

У нас усё шэрае: хаты, неба (бо край дажджлівы) і нават вечары — шарая гадзіна.

Мой род. Па мацярынай нітцы — ці не татары. Калі даць веру размаітым даведнікам, то ў 1242 годзе над Лідаю быў разбіты ліцвінамі хан Шайбак з яго «цьмою».

Палонных татар пасялілі на тутэйшых землях. Адсюль нашы суседнія вёскі называюцца дзікавата: Таркачы, Шайбакова. Адсюль і прозвішча мацярыных дзядоў і прадзедаў — Шайбакі.

Бацькаў род — прымачы. Ні мой прадзед Янка (ён быў з суседняе вёскі Аханяны), ні дзед Тодар, ні бацька Ладзімер не мелі права на варакомскую спадчыну.

Як помню сябе, помню бітву і калатэчу за зямлю. Помню плач маці, збялелага бацьку з нажом і дзядзькоў з каламі.

Дзяцінства ўспамінаю, як нейкую далёкую радасць, тую ціхую радасць, як пісаў Талстой, у якой «немного чего-то недостает».

Помню падпаветку, куды, аддзяліўшыся ад дзеда, перабралася наша сям'я, маленькае ў ёй акенца, гарышча ў вялых і шэрых лапіках павуціння, сярод ночы польскіх паліцыянтаў з ліхтарыкамі на грудзях. І пазней: Вільню, гатэль, старога яўрэя, што пусціў нас нанач. Бацька прывёз мяне на аперацыю — я праглынуў бляшку, якою прыбіваюць толь.

Помню маладое лета 41 года. Гарэла наша вёска. Сонца праз густы дым было мутна-жаўтаватае, як перад зацьменнем. Помню ядавіты свіст куль. Абгарэлыя трупы людзей на суседнім падворку, пажарышчы, растопленае шкло і абсмаленую галаву нашае каровы, што лезла, пэўна, з хлява ў акенца. Дзіўна, але шкада было толькі каровы.

Наваградчына зрабілася «зямлёю крыві».

Помню, як ставілі крыжы. За адну ноч кабеты пралі і вытыкалі ручнік, мужчыны секлі ў лесе хвойку, абчэсвалі, рабілі перакладзіну. Крыжы ставілі перад вёскаю — адзін з іх стаіць сёння.

Па хатах хадзілі «святыя пісьмы», «абнаўляліся» абразы. Помню, як прыслужваў ксяндзу. Цётка тарціярка перахрысціла мяне ў католіка.

Школа. Тры гады хадзіў у «нямецкую». Вучыліся ў пустой яўрэйскай хаце з аблупleны-

мі шпалерамі. Пасля сёмага класа — недзе ў 49-м годзе — пайшоў у вячэрнюю. Пачаў прызарабляць сам. На чыгуначнай станцыі Навадельня грузіў цэмент, соль, гарэлку, кавуны. З таго часу люблю пах мазуты, свісток счэпшчыка, раптоўны лязгат вагонаў, белы салодкі дым ад чорных паравозаў.

У вячэрняй сабралася распуста. У школу пераросткі прыходзілі «пад мухай» і з самаробнымі кінжаламі з цэлулоіднымі ручкамі ў розны колер.

Да беларускага прывучылі кнігі віленскіх выданняў, што ляжалі на гарышчы ў дзядзькі.

Нізкі паклон старадаўняй Вільні.

Родныя песні учуў ад маці, ад кабет на вяселлях і хрэсьбінах. Пачаў трохі запісваць і складаць сам. Ад маці дазнаўся, што песні некалі збіраў яе родны брат — Ян Шайбак (цяпер жыве ў Польшчы), грамадавец, першы адукаваны (вучоны, як казалі ў нас) чалавек у вёсцы, бо скончыў царкоўна-прыходскую школу.

У шарачковым пінжаку, з драўляным куфэркам і дзіцячай надзеяй (1952 год) на нешта вялікае прыехаў ва універсітэт.

Першае апавяданне напісаў ва універсітэцкай аўдыторыі. Занёс у «Полымя». Прачытаў Танк, сказаў: «Ну, нічога, брат... Першая ластаўка, ага... Будзем друкаваць». Што яго згубі-

лі, дазнаўся тады, калі з дому прывёз «Зоню».

У роднай хаце за ясеневым сталом пры матчынай гаворцы — маці сядзела за кудзеляю: зімою яна прала, а ўвесну перад Вялікаднем снавала і ткала кросны — пісаў «Зоню». Пісаў і дзеля сябе і дзеля маці, каб ведала, што яе сын — колькі яна, пэўна, малілася, каб яе дзеці не зазналі гэтакіх мук у жыцці і цяжкае працы, як зазнала яна — стаў «вучоны». Колькі яна скардзілася і наракала, што яе не вучылі і яна асталася «цёмнаю». Маці сапраўды не ўмее чытаць і нават распісвацца і па сённяшні дзень ставіць крыжыкі.

Усяго адну зіму «ад пашы да пашы» ў «вясковага дарэктара» вучыўся і бацька.

Напісанае чытаў усім, а бацьку і маці саромеўся і саромеюся, бо можа, што свая кніга яшчэ не напісана, — тая кніга, якую жадалася напісаць даўно і па якой даўно перагарэла душа.

Пісаў і пісацьму сваё жыта, сваю дарогу ў полі, маладую бярэзіну пры хаце, ціш, вечар і сваю маці з дзяружкаю зелля за плячыма.

Мяняюцца на зямлі людзі, адыходзіць адно і прыходзіць другое пакаленне.

Я думаў і думацьму пра тое, чаму асталося восем мільёнаў беларусаў, а іх было больш дзесяці яшчэ тады, калі слынны чалавек з-пад Наваградка, чытаючы курс лекцый у Калеж дэ

Франс у Парыжы, гаварыў пра найпекную прастату нашае мовы.

Я хачу гэта зразумець: для сябе і для другіх. Пра што і будзе свая кніга.

Мой невялікі народварты вялікай кнігі. Я гавару не толькі пра сябе. Я веру нашай літаратуры, на яе спадзяюся. Трохі перайначу слыннае прароцтва: многія славянскія літаратуры сказалі сваё, надышла пара нашай.

Шчаслівы буду, калі на ніве беларускае літаратуры ўзыдзе і маё зярнятка.

*17 ліпеня 1967 года*



# Прылёт кажана
## Недапісаная навела

Іх было пяцёра, смярдзючых ад тытуню і самагоннага перагару дужых мужчын, на яе адну, кволую, як падлетак, з вялікімі перапалоханымі вачыма маладую настаўніцу. Навучыцельку, як казалі яшчэ на польскі лад тутэйшыя людзі.

Страціўшы мужа — няхай крые Бог, яны пражылі разам усяго толькі месяц — і баючыся ўжо сама арышту, яна пры намове і помачы добрых людзей уцякла з горада сюды, у прылясную вёску. Не спадзявалася, вядома, што і тут няма зацішку: партызаны разбілі ўправу і застрэлілі інжынерадарожніка, які ўладкаваўся быў на працу дырэктарам тутэйшай пачатковай школкі.

Як не ведала, што яны ўжо напытвалі і пра яе.

І вось, апранутыя хто як — у напалову вайсковае, у напалову цывільнае, — але ўсе падпаясаныя шырокімі рамянямі, яны стаялі ў пройме асвечаных малочнай поўняю дзвярэй. І ўсе з ружжамі. Хоць не. Той, што насуплена пазіраў з-пад круглай фуражкі з нізкай туліяй, уздымаў руку, зашчаміўшы ў ёй вастрадзюбы пісталет.

Яна і не адсунула б дзвярэй, каб яе не абхітрыў знарок падасланы імі ціхі, сарамяжы Ілля — школьны вартаўнік.

Савецкі бяжанец, як казалі на яго, прыбіўся сюды, у Косічы, з Беластоку, дзе ён быў на практыцы — устанаўліваў у клубе кінапраектар. Аглушаны, як і ўсе, першымі ўзрывамі бомбаў, першымі сполахамі пажару і першым, ніколі не чутым стогнам і енкам параненых, ён сарваў з экрана шоўкавае палатно, запхнуў яго за пазуху і ўліўся ў паток бежанцаў. Ён уцякаў на ўсход, у Расію.

Але за Слонімам яго нагналі нямецкія танкі, а палатно, якое ён адрэзамі мяняў на харчы, таксама скончылася. Дайшоўшы да Косічаў, Ілля застаўся тут спярша парабкам, а потым, як адчынілася школка, перайшоў у яе вартаўніком, а заадно і прыбіральшчыкам.

Яна і паддалася на падман, калі гэты самы

Ілля, асцярожна пастукаўшы ў акно, ціхавата, з хітрай ліслівасцю папрасіў:

— Откройте, дело есть.

Накінуўшы лёгкі халацік, яна падышла да дзвярэй.

Думалася пра ўсё благое — пажар, смерць, — толькі не пра тое, што ў яго за спіною будуць стаяць яшчэ пяцёра, а ў пройму прыадчыненых дзвярэй уткнецца руля вінтоўкі, каб ужо іх зачыніць яна не магла.

— Окошко занавесь и огонек зажги, — загадаў той, што ў шчыліну між вушаком і дзвярмі ўсадзіў вінтоўку, і халоднаю руляю, што запахла нейкім мазутам і гарам, адапхнуў яе на сярэдзіну вузкай бакоўкі.

Яна зняла з ложка лёгкае, пашытае з лапічкаў-ласкутоў коўдра, завесіла акно і тады ўжо на стале каля газоўкі пачала шукаць запалкі — малюсенькі карабок нямецкіх, кардонавых, з вялікімі шыпучымі галоўкамі, што нядаўна купіла ў горадзе.

Шыпучая запалка высвеціла стол, стосік вучнёўскіх сшыткаў на ім, чарнільніцу-невылiванку з драўлянаю лакіраванаю ручкаю і пухірок газоўкі. А каснічок дымнаватага агню, што захістаўся на газоўцы ад скразняку, бо дзверы яшчэ не зачынілі, — іх усіх: найперш іхнія чырвоныя ад перапою, адутлаватыя твары,

а потым і чорныя рулі вінтовак, што былі ў іх за плячыма.

Ілля баязліва таптаўся за імі ў парозе.

— Так вот какая ты, немецкая шлюха, — азваўся нарэшце той, што шчыміў у руцэ пісталет. Пэўна, старшы над імі. Акрамя пісталета пра гэта сведчыла і яго нягеглая, ужо добра паношаная фуражка на нізкай туліі. У немцаў фуражкі седлаватыя, ганарыста задзёртыя, а гэтую нібы хто прыпляскаў на галаве.

— Да, ничавось птичка, — рагатнуў другі, мурлаты, у цывільнай кепцы і суконным, вясковае работы фрэнчы.

— Ну что же, ребята, крылышки мы ей почистим, — азірнуўся і сказаў сабе за плячо той, што быў у вайсковай фуражцы.

І маладая, падобная да дзеўчаняці-падлетка настаўніца схаладзела душою. З жахам успомнілася ўжо тое, што тыдзень назад ёй сказала рупная, занепакоеная гаспадыня, у хаце якой яна і зняла гэтую бакоўку з адным венскім акном і асобным ходам.

— Ой, дзяўча, не ўпору ты прыехала. Спакою нямашука ў нас. Наўкруга лес, а ў ім ужо развяліся і віжуюць парцізанты. Яны, пераадзеўшыся ў нямецкае, нават удзень прыйшлі і заарыштавалі Аўсяніка, што да цябе ра-

біў у нашай школе. І няхай сцеражэ Бог, каб да цябе чаго-небудзь не мелі.

— Ці ёсць у іх інтэрас да мяне?

— Гэ, дзетка, — усміхнулася гаспадыня, нейкім трохі касаватым вокам агледзеўшы кватарантку, — цяпер бойся кожнага. Вайна. Ніхто ні на каго не зважае. Абы што, так за ружжа і хватаюцца. — І ўскінула абедзве рукі, нібы адмахнулася ад сваіх слоў. — Во галава! Я ж не спытала, як жа звацць цябе?

— Леанарда. Баброўская Леанарда.

— Во моднае імя. Але ж ці дзіва — навучыцелька.

— Чаму ж моднае?

— Не чула я.

— Тады кажэце проста — Лявонка.

— Во гэта іншая рэч, — гаспадыня пагле-дзела зноў гэтым сваім касаватым вокам.

— А як жа вас велічаць? — спытала ўжо яна, кватарантка-навучыцелька.

— Ужо з мяне такая вялікасць, — нібы засаромелася і адвярнула галаву гаспадыня. — Ёўда я.

— Во і я першы раз чую такое імя, — задрыжалі ад смеху пухкія губкі ў валавокай, прыгожай з твару кватарантсі.

— Яно палескае. А па-тутэйшаму — Аўдоця. Мой нябожчык Іванка, калі рабіў за Поль-

шчаю на чыгунцы, знайшоў мяне ажно за Ганцавічамі і прывёз сюды, у Косічы. Во як было...

Цётка Ёўда, накульгваючы на левую нагу і нібы трохі перавальваючыся на левы бок, падышла да дзвярэй, узялася за клямку, але не адчыніла іх.

— Я кажу — было. Немцы неяк стараною прайшлі ад нас. Толькі потым, ужо ўследа за хронтам тут на хутарах савецкіх байцоў выпорвалі. А з гэтай восені ўсё пагоршала. Ужо адныя за аднымі палююць: парцізанты за паліцыянтамі, паліцыянты за парцізантамі. Свет калоціцца, як на верацяне...

І вось іх пяцёра, першы раз убачаных, стаяць і цяжка, як загнаныя дыхавічныя коні, сапуць перад ёю, адзінокаю і бездапаможнаю маладзіцаю. Што ж рабіць ёй, як бараніцца ад іх, неразважных, п’яных і агідных?

— Ну, рассказывай, — не ўстояў на нагах і пахіснуўся на яе той, што трымаў у руцэ сінявата-чорны пісталет.

— Што вам расказваць?

— А с каким заданием фашисты подослали тебя.

— Ніхто мяне нікуды не падсылаў, — сказала ўжо цвёрда, спадзеючыся яшчэ, што тут

выйшла нейкая абмылка. — Я прыехала сама. Уцякала ад нямецкай жандармерыі, што застрэліла майго мужа.

— Да-да, от имени жандармерии открывать фашистские школы.

— Школа ў нас беларуская.

— Ха-ха, — зарагатаў мурлаты ў пляскатай кепачцы і ў суконным вясковым фрэнчы. — Школа с портретом Гитлера на стенке.

— Дзяцей трэба вучыць.

— Конечно, на немецкий лад.

Ім, мусіць, нічога не дакажаш. Яны настроіліся на адно: забіць ці згвалціць яе. Няўжо той кажан, рыжавата-сухі, як кажурынка, з сабачай мордачкай, што зачапіўся раніцаю за лату над парогам, прынёс бяду? Леанарда, баючыся яго чапіць, паклікала тады гаспадыню.

Трымаючы, як у муфце, рукі пад шарым фартухом, старая падышла да парога, прыскаліла одно вока і, паказваючы ў роце чорны дупляны зуб, глухавата, нібы сама сабе сказала:

— Нешта ліхое яго прыгнала, гэтага кажана.

Старая азірнулася наўкруга сябе, убачыла пры плоце сухі арэхавы кій і парнула ім у ржава-сухую кажурынку. Але кажан толькі разявіў

сабачую мызу з натапыранымі вушкамі, вышчарыў вострыя зубы і тоненька, як драцінка, зазвінеў.

— Во, яшчэ і не ўцякае, нічыстая сіла, — гаспадыня прыцэлілася і зноў парнула доўгім кіем у кажана. Ён нарэшце адарваўся ад латы, нячутна, па-матылінаму пархнуў і ўлукаткі паляцеў пад стрэху блізкага гумна.

— Нядобрую ён табе навасць прынёс, — зноў пацвердзіла сваё цётка Ёўда і заківалася ў хату.

А яна, Леанарда, увесь дзень была як сама не свая. Прыгадвала Навагрудак. Тую ноч, калі прайшла павальная аблава — нехта падклаў міну пад парог дома, дзе кватараваў гебітскамісар, але падарваўся ўсяго вартавы. Арыштоўвалі чамусьці найбольш беларусаў. Шукалі тых, хто калісьці палітыкаваў ці быў на прыкмеце, як падазроны. Хоць яе Франак ні з кім вельмі і не знаўся.

Але во кажан прынёс новую бяду. Нібы не хапіла той, што прылучылася ў Навагрудку. Праўду ж кажуць: бяда адною не ходзіць. Яны толькі пабраліся, і ім нібы пашэнціла: Франак напытаў работу ў транспартным аддзеле гарадской управы, а яе, Леанарду, узялі карэктарам у рэдакцыю павятовай газеты.

Надарылася тым часам зняць і кватэрку —

вузкі пакой за дашчанаю перагародкаю ў шарай неабшалёванай хаце заўсёды п'янага балагола — ці не татарына? — і яго рослай, заўсёды пакорна прыгорбленай, як яна сябе называла, — Разаліі.

Было яно, гэтае мядовае шчасце, ці не, Леанарда разабрацца не паспела. Бо, можа, не вельмі і любіла наіўнага і, здаецца, яшчэ няспелага як мужчыну свайго Франака. Ёй падабаўся яго таварыш, шыракаплечы з валасатымі рукамі Жэнік, што працаваў загадчыкам склада ў гандлёвай нямецкай фірме.

Але ў тую трывожную ноч яна якраз не спала. Сэрца нібы чула бяду. У двары баязліва цяўкнуў чуйны гаспадароў сабачка. Ад яго брэху яна заўсёды прачыналася, як і ад Франака, калі ён гарнуў яе да сябе і яго рука шкраблася ў яе між ног і нахабна, упарта разводзіла іх...

Перапуджана цяўкнуўшы, сабачка больш не аказаўся. Леанарда нават не ведала, што сабакі, як і людзі, баяцца ўзброенага чалавека, — яны, мусіць, чуюць, як пахне гарачаю смерцю настылая руля вінтоўкі.

Леанарда ўжо не спала — прачнулася ад цяжкага і страшнага сну. Угнуўшы і пагрозліва набычыўшы чорную галаў з белай зоркай між шырока раскінутых вострых рог, на яе ішоў

вялікі бык з кутасікам пад шырокім чэравам. І гэты кутасік варушыўся.

Яна ўцякала, але ногі адымаліся. Спрабавала крычаць, але голасу не было. А ўбуялы, расовы бык, бушуючы і дзеручы пярэднім капытом зямлю і кідаючы яе на сябе, упарта і раз'юшана блізіўся да Леанарды. Яна нават убачыла яго налітыя крывёю, вялікія, як слівы, лілова-сіняватыя вочы. Яна закрычала зноў, але без голасу... і прахапілася.

Дзесьці ў прыцемку ночы натужна вуркатала ценжароўка — мажа, тая, доўгая і чорная, з адсечаным радыятарам і накрытым кузавам, што была пры турме. У фортцы брамы востра дзынкнула жалезная зашчапка. У двары зноў ашалела заскавытаў і ацiх перапуджаны сабачка.

Здаецца, мільганула, як начная трапяткая маланка, святло кішанькаовага ліхтарыка. Леанарда палахліва прыгарнулася да Франака, і яго халодная рука настойліва прасунулася ў мяккае цяпло яе ног. «Дурны», — хацела сказаць, але ўжо не трэба было: у гэты міг у дзверы моцна і адчайна загрукалі, і каля акна шаргануўся нечы размыты цень. Мусіць, пільнавалі, каб ніхто не выскачыў праз акно.

Хату адчыняць пайшоў сам гаспадар.

І, счакаўшы, у сенях загаварылі то па-нямецку, то па-беларуску. У кватэры пад аранжавым абажурам засвяцілася слепаватая жароўка-лямпачка. Загрукалі нямецкія шыпаватыя боты...

Раніцою яна прыбегла да турмы. Паліцыянт з вузкімі падбрытымі вусікамі, што адчыніў быў аконца, хаваючы свае вочы, каротка адсек:

— Тут нікога не шукайце.

— А дзе ж?

— За кашарамі.

У Леанарды падкасіліся ногі. За даўнейшымі польскімі казармамі, дзе цяпер стаяла нямецкая вайсковая часць, у ровішчах пры горадзе ў першы год расстрэльвалі савецкіх актывістаў, а ў гэтае жніўнае лета — набожна пакорных яўрэяў.

Леанарда яшчэ збегала туды, але ўжо блізка да ямаў, дзе яшчэ ўспыхвалі адзіночныя тупаватыя стрэлы, яе не пусціла старая жанчына ў чорным, з'едзеным моллю плюшавым каптане, што падпасвала ў прышашэйнай канаве мігітлівую казу:

— Не йдзі туды, маладзічка. Тут адзін мужчына быў пайшоў шукаць і напытваць сына і сам не вярнуўся.

У вузенькі завулак з белымі двухпавярхо-

вымі мураванкамі, адную з якіх займала рэдакцыя, яна ўжо ледзьве дабрыла.

Нізенькі, сыта-ружовы рэдактар, прыладжваючы абедзвюма рукамі за вушы свае рэдзенькія, напамаджаныя валасы, для прыліку толькі паспачуваў:

— Але чым жа ж я вам памагу. Мы ўсе пад памялом.

А потым і падстрашыў:

— Я баюся, каб не арыштавалі і вас.

Як абязвечаная, Леанарда вярнулася ў свой цемнаваты кабінет, што адным акном выходзіў у заслонены дрэвамі двор, села за столік насупраць рыжавата-агністае машыністкі, што перастала ляскаць па старэнькім рэмінгтоне, і затрасла худзенькімі плячыма ад нестрыманага плачу.

— Не траць часу, — неяк трохі суха і нібы абыякава сказала машыністка. — Зайдзі ў аддзел народнай асветы, да інспектара. Ён у недалёкую школу напытвае настаўніка... У Косічы, здаецца... Перачакай бяду там.

І вось яны, Косічы, дзе Леанарда хацела знайсці зацішак і ўратавацца ад арышту, гвалту, смерці... А перад ёю стаяць пяцёра ўжо гатовых на ўсё страшнае і агіднае дурнавата-п’яных мужчын.

Не дзіва, што сёння ў школу прыйшло менш

як напалову дзяцей. Непакою ці чагосьці таемнага, загадкавага дадала яшчэ бялявая дзяўчынка з другога класа ў доўгай плаценкавай сукенцы з нашытымі ў падоле чырвонымі паскамі і ў зморшчаных скураных хадаках.

Цярпліва стоячы каля стала і пазіраючы з-пад краплістай хусткі валошкавымі вачыма на Леанарду, яна нарэшце адважылася і спытала:

— Скажыце, пані навучыцелька...

— Цяпер трэба называць мяне грамадзянка настаўніца, — падказала Леанарда.

— Ага, грамадзянка, — пацёршы кулачком свой нос, паўтарыла бялявая дзяўчынка. — Чаму ўсе кажуць, што не трэба хадзіць у нямецкую школу?

— А хто кажа?

— Не ведаю. Але мы баімося, што нас могуць пастраляць.

— Хто? — сумелася Леанарда.

— Усе: і немцы, і партызаны.

— А за што ж вас, малых дзяцей? Глупства гэта.

— О, не кажыце так. Бо і вучыцеля вунь забілі.

Толькі цяпер Леанарда здагадалася, чаго на вочы не паказваўся Ілля. Недзе ўсё туляўся. Значыць, нешта ведаў. Пэўна ж, баяўся, каб не

выдаць сябе. І цяпер туліцца ў парозе, як пабіты сабака. Хаваецца за шырокія спіны гэтых пяцёх.

— Анутка, Илья, — махнуў чорным, зашчэмленым у руцэ пісталетам старшы сярод іх. — Напомни ей, какие она немецкие агитки привезла с собой.

— Да, привезла, — зноў нясмела з прыцемку адклікнуўся вартаўнік, але на святло газоўкі не выйшаў. — Журналы с портретами всяких геббельсов.

Ах, Божа, гэта ж ён віжаваў за ёю і ўсё пераказваў ім. Ці ж не яго гэта справа — адзін украдзены нумар «Новага шляху»? Усім класам па чарзе яны чыталі з яго апавяданне пра санітарку.

— Ну, так скажи, кто тебя подослал сюда? — перад ёй зноў махаецца гэты чорны пісталет.

— Мне даў накіраванне школьны інспектар.

— Инспектор, говоришь, — той мурлаты, што быў у суконным вясковым фрэнчу, імгненна выцягнуў з вінтоўкі чорны востры шомпал.

Але яго перапыніў ён, старшы:

— Постой маленько. Она нужна нам чистенькая...

Аднак шомпал раз’юшана свіснуў над ёю. Як ад удару перуна, яна заплюшчыла вочы. І ёй убачыўся той высокі пагодны дзень бабінага лета, калі яна на спадарожнай фурманцы ехала сюды з сваім невялікім пажыткам — плеценаю карзінаю. Дарэчы, вёз яе не абы-хто, а тутэйшы багатыр, саракагадовы ўсмалелы, як корч, гарбаносы і чорны, як корч, з навіслымі бровамі і сінімі хітрымі вочкамі Гервас Сапега.

Памогшы ёй з карзінаю і пасадзіўшы поруч з собою ў фацэтную, з прэтэнзіяй на нейкае шляхецтва, рысорную брычку, ён адразу і назваўся:

— Гервас буду, а па прозвішчы — Сапега. — Махнуўшы выгінастымі прыгожымі вейкамі, ён неяк сарамяжа заплюшчыўся, а потым раскацiста зарагатаў: — Кажуць, знакамітая княжацкая фамілія. А тут, наўкруга нашых Косічаў, яе носіць столькі галадранцаў, што і не злічыць.

Пад’ехаўшы да самае школы, што была ўпрытык з управаю — прыгожым драўляным домам пад нямецкі вугал, крытым драніцаю і з прычолкам, падпёртым дзвюма выштукаванымі калонамі, нечакана запрапанаваў:

— А можа, паедзем да мяне? Хата вялікая, на два канцы. Не раўня гэтай школцы.

Зазірнуў у вочы і вялікаю жорсткаю далоняю злавіў яе руку:

— Мне гаспадыня патрэбна.

— А што вы кажаце, дзядзька?

— Во, яшчэ і дзядзькам называе, а я — нежанаты.

— Даруйце, як вас па бацьку? — сумелася Леанарда.

— Бацьку Цімохам называлі, — ён неяк паволі, нібы не хочучы, зняў з брычкі яе плеценую карзіну і паставіў на зялёную мураву каля шырокае сцежкі. — Я чалавек адкрыты, прызнаюся. Адчыняю ў горадзе краму. Буду гандляваць шапкамі. Мы аднога жыдка-краўца прыхавалі. Ён ужо іх шые. Мне патрэбны граматны супольнік ці памочнік. А што ваша школка? Ці пратрывае да зімы. Тут партызаны ўсё спрыткам паляць — і ўправы, і школы. Што ні ноч, то пажар. Вунь колькі ўжо згарэла двароў і фальваркаў.

— А як жа дзеці? Без навукі? Не, буду трымацца школы.

— Дарма даяце ганьбу майму дому. Я ж платы не вазьму. А ў мяне і садок, і пчалярня...

Яго рысорная брычка доўга і, здаецца, зласнавата падлясквала на ружовым выбоістым бруку вуліцы.

А назаўтра, знайшоўшы нейкую зачэпку,

зазірнуў да гаспадыні. Потым і яе, Леанарду, перастрэў на падворку. Нацягваючы яшчэ ніжэй барашкавы каўпак і пільна азіраючы яе сінімі быстрымі вочкамі, загаварыў:

— Еду ў горад. Можаце што заказаць. Сахарыну, ніткі, іголкі...

— Ой, што вы, дзякую, нічога покуль не трэба, — як магла аднеквалася Леанарда.

Яго жаўтлявая вялікая рука тым часам пакапашылася ў адтапыранай кішэні шарага ў клетку пінжака і выцягнула колькі цёплых, мусіць, толькі з печы, падсушаных груш.

— Цукровыя, — падказаў Гервас і, варухнуўшы чорнымі навіслымі бровамі, цераз парог у сені падаў іх старой Ёўдзе.

— О, дагаджае вам, — смяялася і паказвала чорную шчарбіну ў роце ўедлівая старая.

— Кінь перад сабою, знойдзеш за сабою, — трапна, слова на слова адказваў хітраваты Гервас.

А потым, нібы незнарок, уцягнуўся да яе ў баковачку, агледзеў адзін табурэцік, налёгшы на яго, праверыў, ці моцны і стойкі, і ўжо папрасіў:

— Я з вашага дазволу прысяду?

— Садзіцеся, што ўжо зробіш з вамі.

Зняўшы з чорнай густой чупрыны, што ўжо іскрылася першай сівізною, свой барашкавы каўпак, загаварыў:

— Я ж вам ужо казаў, што хачу мець пры сабе пісьменнага чалавека. Знаюся ў арыхметыцы, але з драбямі рэч благая.

— І што пры вас буду рабіць я?

— Памагаць у рахунках.

— І не болей? — з’едліва ўсміхнулася тады яна.

— А калі прыгледзецца адзін да аднаго, то...

— Ну, дагаворвайце.

— А хіба вы ўжо не здагадваецеся?

— Не вельмі, бо намёкаў шмат.

— Прызнаюся, шкада мне вас, маладзенькую.

— Нешта страшыце, ці што?

— У страха, як кажуць, вочы вялікія... Бо наўкруга столькі брыды. І на вас, адзінокую і харошую з твару, кожны спакусіцца.

— Во пра што вы загаварылі.

— Не ласкавая вы нешта са мною, — ён зарыпеў табурэтам, падняўся з яго. У парозе яшчэ сказаў: — А я вам хачу дапамагчы і заступіцца.

Хітраваты і трохі як нахабны Гервас гаварыў праўду — як на тое ідзе: яны, гэтыя пяцёра п’яных начных гасцей, будуць дамагацца яе. Яна ўжо адчувае, як прагна гараць іх асалавелыя з шкляным водбліскам вочы, як яны раз’юшана дыхаюць.

І яна, трацячы над сабою ўладу, ужо крыкнула ім у чырвоныя, налітыя крывёю твары:

— Што вам трэба ад мяне?

— А разве не знаешь, что мужикам надо?..

— Пайшоў вон, брыда! — крыкнула яна таму рыжаватаму, у пілотцы, што высунуўся наперад і намагаўся схапіць яе за руку.

— Слушай, Шубин, — закамандаваў старшы. — Сделай кляп и закрой ей хайло.

Леанарда забегла за стол, нібы ён мог яе ўратаваць. Але сюды ўладна ступіў стрыжаны пад нулёўку, на галаве ў якога шырока разлезлася злінялая пілотка з чырвонай, аблушчанай на адным куце зоркай.

Ён і схапіў Леанарду за грудкі, моцна, да болю, рвучы на ёй летні халацік. Яна нават не паспела апомніцца, як бразнулася плячмі ўпоперак ложка. Леанарда закрычала зноў, але яе дыханне перахапіла ўваткнутая ў рот гаркаватая ад тытунёвай пацярухі анучка, што была ў некага з іх замест насоўкі.

— Илюха, давай, первым пойдёшь? — нечыя халодныя дужыя рукі схапілі яе за агаленыя калені і пачалі іх разводзіць. Яна сілілася стуліць іх, але не магла.

— Илюха, не трусь, целина у неё уже вспахана, — нехта душыўся ад рогату з прадчуваннем блізкае асалоды.

— Ты что, плачешь?

— Ну, это от радости, — рассцёгваючы дрыготкімі рукамі рэмень і пазвоньваючы спражкай, крычаў той, што апошнім станавіўся ў калейку.

— А вон, смотри, Ильюшка сгорел.

— Ха-ха! В одном шаге от счастья.

«Якая пакутлівая, якая здзеклівая і нечалавечая смерць у мяне», — яшчэ падумала Леанарда, сілячыся супраціўляцца таму, што гэтыя пяцёра пачыналі чыніць над ёю. Пасля ўжо, знясіленая, ледзьве памятная, учула, як першы ўдар штыка палыхнуў ніжэй жывата, а потым яшчэ адзін, гарачы, як агонь, нібы дзеля збаўлення ад доўгіх мук, знайшоў яе сэрца...

Старая Ёўда прачнулася ад першага стуку ў суседняе акно. Падумала адразу пра благое. Гэтаксама і ў гэтакую пору стукалі тады, калі забіралі нядаўняга кватаранта, прыгожага рослага мужчыну з бародкаю і ў скураной карычневай куртцы, што толькі і паспеў парабіць у школе не больш як месяц. І на табе, прыйшлі па яе, ціхенькую, прываблівую і адзінокую маладзіцу.

Спешна, блытаючыся ад страху і перадрагі ў спадніцы, старая праз голаў нарэшце нацягнула яе, знайшла на біле ложка кофту. Косы слу-

пок мройнага, вадзяністага святла ляжаў на стале — месяц, набраўшы вышыню, пераходзіў на другі бок хаты. Старая, адшморгнуўшы фіранку, прыпала да халоднай шыбы. На вуліцы пры плоце цямнела фурманка. Нехта нецярпліва і размашыста расходжваў каля каня. За сцяною ў бакоўцы чуліся глухаватыя неразборлівыя галасы, цяжкае і невядомае грукатанне, нібы хто падаў.

Тады, як арыштоўвалі кватаранта, такога грукату не было — забіралі яго сцішком, нібы крадучыся.

Ах, Божа святы, што робіцца там? Што чыняць яны над безабароннаю маладзіцаю? У яе і так ледзьве ліпіць душа. Можа, рашыцца на ўсё і збегаць паглядзець? Але ж ці будуць гэтыя злыдні зважаць на тваю старасць. Заб'юць ці ўкалечаць — і не знайся.

Ёўда, як сама не свая, як адрашоная, пасядзела на лаве пры акне, а потым рашуча ссунулася і парыўна падышла да дзвярэй, націснула на язычок клямкі і з усяе моцы папхнула іх. Яны, нямазаныя колькі гадоў, моцна і ржава зарыпелі на петлях. Ажно ў яе ад страху перахапіла дых і прапала раптоўная гарачая рашучасць.

Неўзабаве на падворак выкаціўся сыты рогат. Цэлаю плоймаю, несучы за плячыма стра-

хатлівыя вінтоўкі, яны, нехрысці, ішлі да фурманкі.

Старая вярнулася да лавы, прыкленчыла на яе адною нагою і зноў лобам ткнулася ў халодную шыбу.

Загрукацеўшы коламі, фурманка нарэшце знікла ў сутоках вуліцы.

Вобмельгам выскачыўшы з хаты, старая Еўда ababегла яе і спынілася каля дзвярэй бакоўкі. Наўкруга шапаткім звонам сыпалася цішыня, і старая адно чула, як тахкае і разрываецца яе сэрца. Яна пастукала ў зачыненыя дзверы, але за імі ніхто не адклікаўся. «А можа, забралі яе, як таго кватаранта?» — старая пацягнула за клямку і ў зеленаватым месячным святле на ложку ўбачыла белае цела. Леанарда ляжала ўпоперак ложка, бездапаможна звесіўшы на падлогу аголеныя ногі.

У бакоўцы пахла газаю, але газоўка ўжо не гарэла.

— Лёнька, Лявонка! — закрычала старая, трасучы яшчэ цёплую, але ўжо маўклівую Леанарду.

Нахіліўшыся бліжай над мёртвым целам, старая нарэшце ўбачыла анучу ў роце і на абедзвюх грудзях чорныя, мусіць ад штыка, ранкі. Адна з іх, як у Хрыста на абразах, была з падцёкам крыві ніжэй карычневага зморшча-

нага саска. Як здагадалася старая, штык прыйшоўся якраз у сэрца.

Ёўда дзіка, адчайна заенчыла, асунулася на каленкі і пачала хрысціцца.

*7—23 красавіка 1999 года*





# Бронікі,
## альбо Навела пра каня

Дзве сям'і, і ў кожнай па два Бронікі — бацька і сын. І межавалі яны не толькі полем, але і сенажацямі. Хоць якая там сенажаць — адно куп'ё, зарослае стрэлкамі конскай цыбулі ў белых кутасіках — пушніцы, як на яе яшчэ кажуць.

Вось там і пасвіўся спутаны вераўчаным путам драбнаваты, але цягавіты Варанец — конь Броніка Жука. На пашу ў спякотны полудзень прыехаў на ім, прыгнаўшы перад сабою яшчэ пяцёра сівых авечак і цёмна-вішнёвую карову, меншы Жукоў хлопец.

Ён і згледзеў, нават здалёк, як сюды ішоў, несучы за брызентавы пасак вінтоўку і ледзьве

не чапляючыся ёю за купіны, іхні сусед па сенажаці і полі, белабровы Бронік Крывеня па мянушцы Маслянка, што нядаўна апынуўся ў партызанах. Быў хто болей з ім ці не, Жукоў хлопец не заўважыў. Лежачы на разасланым каптане і затоена сочачы за Маслянкам, ён чакаў нечага іншага, а не таго, што ўзброены Маслянка падыдзе да іхняга Варанца, які прагна прыпадаў да травы, адмахваючыся доўгім ільсніста-чорным хвастом ад заедзі, здыме пута, закіне каню за шыю і ціха павядзе з лужка. Вобруць засталася ляжаць на тым жа шарачковым каптане, на якім сядзеў уражаны і перапалоханы ўбачаным басаногі падлетак. Але сядзеў ён да той пары, покуль за зялёным ад мройнага аўсу боханістым грудком не схаваліся чорны пакорны конь і злінялая пілотка на белабрысай галаве. Пудкім зайцам хлопец рвануўся з месца і цераз поле паімчаў у вёску. Бацьку ён застаў якраз дома — той на дрывотні, паблісваючы лязом сякеры, калоў дровы і, убачыўшы ўстрывожанага сына і здагадваючыся, што ўчынілася нешта благое, убіў у калодку сякеру і падаўся насустрач сыну ўжо сам.

— Каня Маслянка забраў, каня! — ледзьве адсопся задыханы хлопец.

— Каня, кажаш?

— Каня.

— Тады бяжы назад, глядзі скаціну, а я пайду ў мястэчка, у паліцыю... Накажу Броніку.

...Не вельмі хацелася старому Жуку ісці на паклон да старэйшага сына, з якім летась, звозячы з поля снапы і ўкладаючы воз, яны пабіліся. Праўда, біўся ён, бацька, калі ўкладзены сынам і ўжо ўціснуты рублём воз, пахіснуўшыся на разоры, раптам рассыпаўся. Нядобра і не спрытна ўложаныя снапы выслізнулі з-пад рубля і шухнулі на яго, на старога Жука. Злосны, пунтовы і не заўсёды разважны бацька як трымаў у руцэ ядлаўцовае пужальне, так і смальнуў ім па галаве і па сынавых плячах. Перад гэтым яшчэ перавярнуўшы тое пужальне тоўстым канцом. Сын адбегся, знайшоў на іржышчы камень, але не кінуў у бацьку — асцярогся — шпурнуў міма. І тут жа ўцёк з поля. Дзе ён бадзяўся, што рабіў, але прыйсці нанач дадому не прыйшоў. А праз дзён колькі старога Жука нібы аглушыла нечаканая і балючая навіна — яго старэйшы Бронік запісаўся ў паліцыю. Жонка, праўда, збегала ў мястэчка, але сына дахаты ўжо не прытурыла. Сам Бронік Жук, помслівы і злосны на сына, нікуды не хадзіў і нічога не дамагаўся — ведаў, што ўсё гэтае старанне марнае і дарэмнае.

Сустрэліся яны выпадкам праз тыдняў колькі на вуліцы ў тым жа мястэчку — сын быў

у дзюбатай шапцы і ў чорнай форме з сівымі закарвашамі і каўняром. Яны абодва толькі здзіўлена зіркнулі адзін на аднаго і моўчкі, нібы чужыя, размінуліся.

Трохі адышоўшы ад крыўды і знявагі, паліцыянт тады-сяды прыходзіў дадому ў вёску, але на бацьку паглядаў скрыва, помнячы тое гарачае пужальне, што апякло голаў і плечы, і гаварыў толькі да мацеры. На бацькавыя роспыты адклікаўся няхочучы і суха, нават абыякава, даючы гэтым знаць, што з бацькам ніякіх спраў мець не хоча.

Можа і ён, стары Жук, не паступіўся б сваім гонарам, каб справа мела іншы паварот. Але ж шапка не зваліцца, калі пераступіць цераз сваю пыху, бо гонар гонарам, а конь канём. Без яго ў гаспадарцы як без рук. І трэба схадзіць не толькі да сына, каб ведаў, з каго і які спрос, а ў блізкія Панікарты да Броніка Крывені, сын якога нарабіў столькі бяды — ды каб чый сын, а то іменніка і равесніка, з якім калісьці ў маладыя гады ён, Бронік Жук, таварышкаваў, піў чарку, на вечарынкі ў далёкія вёскі хадзіў і з якім нават жаніўся ў адзін дзень. Яны тады, маладыя, пад'юджваючы і падзадорваючы адзін аднаго, нават спрачаліся, чыё вяселле будзе гучнейшае.

А выйшла, што яго, Броніка Жука, на якім

ігралі ажно тры музыканты — дудар, скрыпач і гарманісты, а ў Броніка Крывені трэнькалі адны цымбалы.

Пасля польскай камасацыі, калі доўгія шнуры былі парэзаны на хутаранскія дзялкі, яны, абодва Бронікі, і па полю сталі суседзямі — іхнія надзелы апынуліся поруч, цераз зялёную калматую мяжу. Ужо і будынкі збіраліся перавезці на хутар. Але ён, Бронік Жук, капаючы калодзезь, не дастаў да вады. Апусціў у глыб васемнаццаць труб, а вады — ні кроплі. А Бронік Крывеня, купіўшы яшчэ не старую хату ў суседніх Панікартах, не паспеў перавезці на свой надзел — усё перабіла вайна. Прыйшлі бальшавікі, здзівіўшы і зняверыўшы ўсіх арыштамі і вывазамі ў Сібір, прымусовымі згонамі на «трудовое участие» і запісамі ў калгасы. І Крывеня, перабраўшыся ў купленую і даволі спраўную, зрубленую з непадсочанай сасны хату, да часу застаўся ў Панікартах.

А цяпер ужо, на трэцяй раце, з'явіліся немцы, перайначваючы ўсё на свой лад — касуюць тыя калгасы, зганяюць яўрэяў за калючы дрот у гета і вывозяць дужых маладых дзяўчат і хлапцоў у Нямеччыну. Таму і ўцякаюць падшыванцы — хто ў лес да партызанаў, хто ў мястэчка ў паліцыю. А там ужо і паразбэшчваліся, узяўшы ў рукі зброю. І во прыйшоў, за-

браў каня — і не знайся. Што ўжо ні будзе, а цягавітага Варанца трэба вярнуць.

...Стары доўга стаяў перад ганкам карычневага ашалёванага дома на высокім падмурку і накрытага памутнелым ужо, як старое вядро, цынкавым дахам. Наўкруга карычневага дома з расхрыстанымі аканіцамі мігацела сетка драцяной агароджы. Выштукаваны прыгожы будынак да нядаўняга прыналежаў ганарыста-нізенькаму пры дзябёлай жонцы Моўшу Ліпскаму, гаспадару тутэйшага местачковага тартака, восенню спаленага партызанамі. А самога Моўшу, пратрымаўшы паўгода на пасадзе інжынера ў сваім жа тартаку, пасля пажару немцы ўсё ж расстралялі. Казалі, што гэта быў самы апошні яўрэй, якому Бог падараваў яшчэ некалькі месяцаў жыцця.

Як ні турзаў Бронік Жук хітры замок у жалезнай фортцы, ён ніяк не адмыкаўся. І так і гэтак круціў ручку, але фортка не адчынялася. Покуль з дому на прыгожы ганак з балясками, убачыўшы дарэмныя мукі няспрытнага старога, не выйшаў хлюставата-ганарысты з падбрытымі тонкімі вусікамі сам камендант паліцыі ў чорнай уніформе. Стары Жук прызнаў у ім колішняга местачковага сальніка, што трымаў найлепшы каўбасны магазін.

— Я на пастарунак, — стары зноў пагрукаў жалезнаю форткаю з загадкавым замком.

— Па якой справе?

«Казаць ці не? — запнуўся стары і схаваў свае вочы. — Мусіць, не».

— Я пытаю, па якой справе?

— Справу маю да сына. Ён служыць тут у вас.

— Прозвішча як?

— Браніслаў Жук.

— Ён дзяжурыць пры складзе за вакзалам.

Знайсці склад аказалася не проста і яшчэ горш — небяспечна: хадзіць каля чыгункі і цераз чыгунку было забаронена. І ў нікога не распытаеш — наўкруга адны непадступныя немцы. І найбольш у чорнай форме чыгуначнай паліцыі ці аховы.

Але, прыгледзеўшыся да аднога, трохі недалужнага і нягеглага, на якім форма сядзела вахлакавата, Жук здагадаўся, што гэта нехта з тутэйшых, — і загаварыў. Салдат аказаўся сапраўды сваім тутэйшым хлопцам і нават ведаў Броніка.

Паказаўшы на доўгі пакгаўз за рампаю, на якой стаялі вялікія, знятыя, мусіць, з касцёлаў, пацямнелыя званы і ляжалі медныя снарадныя гільзы і зломкі каляровага металу — усё ўжо гатовае да пагрузкі, — вуграваты хлопец у чорнай форме яшчэ гукнуў у крайнія, шырока рассунутыя, на кольцах, дзверы:

— Жук, тут да цябе!

Вясёлы і ў добрым настроі малады Бронік, убачыўшы прыгнутага, знябожанага бацьку, раптам спахмурнеў:

— Ты чаго?

— Інтэрас маю да цябе.

— Які?

— Ты ж ведаеш, як на яго кажуць, Маслянку... Ну, таго, што ў партызанах.

— Дзіва што.

— Ён жа ж забраў надоечы нашага каня.

— А чым жа я памагу? — насупіўся меншы Бронік.

— А тым, што скажаш немцам, дзе я прапаў.

— Як прапаў? — недаўменна зажмурыўся паліцыянт.

— Як драпянка за тры грошы. Я заўтра пайду ў Панікарты да Крывеняў і скажу, каб вярнулі каня.

— Ты здурэў, бацька.

— Не, яшчэ пры розуме. — Стары памаўчаў і, абцершы жменяю перасмяглыя губы, сказаў нарэшце тое, дзеля чаго ішоў да сына: — Калі не вярнуся, каб ты ведаў, з каго спрос. Замальдуй, ці заяві немцам, яны ўміг разбяруцца.

— Ну, намудрыў, бацька, ты на сваю галаву, — пакруціў чорнаю дзюбатаю шапкаю кір-

паносы паліцыянт і схаваўся ў пакгаўзе, дзе зноў выбухнуў вясёлы смех.

...Дзень выдаўся пагодны. На сонцы тлуста ільснілася маладая, але ўжо шырокая ў пер'і ярына. Чародка белых хмарак сплывала ў ліловыя сутожкі неба. Пеністымі хвалямі на гарбаты грудок набягаў светлы, яшчэ не пацямнелы бярозавы гай. Паперадзе яго ружавеў, выгнаўшы залатыя стрэлкі, малады сасоннік. Шарая дарога з грывамі травы абапал яе, дзе грэлі спіны замшэлыя каменні, дабягала да сіне-ліловага жыта, што выпусціла срэбна-сівы вусаты колас, і хавалася ў ім.

Вялікімі босымі ступакамі Бронік Жук пляскаў па тупкай сцежцы збоку каляін. Смуглы, ужо добра загарэлы на вясновым сонцы, з срэбрам сівых кудзеркаватых валасоў, што выбіваліся з-пад старое заношанае кепкі, ішоў ён цяжкавата, па-старэчы падаўшыся ўсім тулавам наперад.

Абнюхваючы дарогу і час ад часу азіраючыся, каб не згубіць гаспадара, яго апярэджваў чорны вялікі сабака з белым нагруднікам на персях.

Усё вечнае і паўторнае ў сваім харастве — маладое блакітнае неба, салатавы лес, мройнатрапяткая на ветры ярына — і нязводнае чалавечае зло на гэтай зялёнай зямлі, — усё блыта-

лася і мяшалася ў гарачых, адчайных думках старога Жука. Яны цяклі і кружылі, як кружыць вір вакол карча, набягаючы на страчанага каня.

Сабака, абнюхаўшы мышэй, драў лапамі іхнія норы, то гэльцаў за палахлівым жаваранкам, што мякка пырхаў з травы і нізенька ляцеў, адводзячы няхітрага сабаку ад свайго гнязда.

А стары Бронік Жук думкамі ўжо быў у Крывеневай хаце, што адным доўгім пашаркам расцягнулася ад брукаванай вуліцы да лужка, які зарос ружовым вобаратнікам і агеньчыкам смолкі і дзе шмыгаў, як вуж, ручай, атулены вербамі.

Хацелася ж угадаць, хто будзе ў той хаце? Каго ён застане — аднаго Крывеню ці яго сына са зграяю недавяркаў, і што скажа ім, ужо, не дай Божа, п’яным.

За думкамі і не ўбачылася, як ужо былі Панікарты. Чужыя, патаемна-цёмныя вокны з-пад саламяных застрэшкаў, здаецца, падазрона і ўважна пазіралі на старога Жука. За імі тамсям мільганулі і цікаўныя вочы. Згледзеўшы чужога калматага сабаку з белым нагруднікам, у дварах на розныя галасы забрахалі ўсе панікарцкія. Ажно Бронікаў вялікі і, здаецца, не баязлівы Рэкс падтуліў хвост.

— Ну, ты чаго спалохаўся? — гаспадар паляпаў яго па загрыўку. — Не бойся, я тут, пры табе.

Крывенева сядзіба была якраз пасярэдзіне кароценькай, на хат пятнаццаць, вёскі. За бусловым гняздом, што чорным вялікім вянком зачапілася за верхавіну старое грушы з дупламі для шпакоў і вераб'ёў. У гняздзе на адной назе стаяў, пэўна, над малымі, яшчэ не аперанымі буслянятамі, трохі смутны, знябожаны бусел.

Пусціўшы за браму сабаку і загадаўшы яму тут сядзець, Бронік Жук увайшоў у чужы двор, чуйна азіраючы яго. З расчыненых хлявоў густа пахла гноем і рохкала, шукаючы ратунку ад гарачыні, і рылася ў сваім загарадку кормная свіння.

Бронік ступіў босаю нагою на гарачы камень, што ляжаў перад парогам, і прыгнуўшыся ўвайшоў у сені, а потым — у хату, успалахнуўшы чорны рой звінючых мух, што ўзляцелі з падваконня і лавы.

Нападобе было, што ў хаце нікога няма.

— Ёсць удома хто? — голасна спытаў Бронік Жук, зазіраючы яшчэ за печ, на ложкі.

На голас яго, жаласна мяўкнуўшы, з-пад стала выбегла мурзатае белае кацяня і, задраўшы хвосцік, прытульна пацерлася аб калёшы-

ну чужога чалавека, прызнаўшы, мусіць, за свайго.

— Дзе ж яны? — Бронік плячыма падаўся назад да дзвярэй.

З надворка ўжо ўбачыў, як вуліцаю бегла дзяўчына-падлетак. Але нечакана зніякавела перад брамаю — згледзела страхатліва вялікага сабаку, а потым і яго, Броніка Жука.

— Вой, хто ж гэта ў нас?

— Свой я, — Бронік падцягнуў на клубах шарачковыя порткі з латкамі на каленях і падаўся насустрач дзяўчыне. — А ты не дачка Броніка Крывені будзеш?

— Ага, — яна ўсё скоса паглядала на вялікага чорнага сабаку. — Вой, які ён у вас страшны.

— Ды сабака як сабака. А бацька дзе?

— Вуньдзека, — азірнулася на вуліцу і пачала адчыняць, зняўшы крук і папхнуўшы дзве палавіны разам, шырокую браму.

Ідучы за плугам, што парыпваў на суваку — шырокай дошцы са скабою, — з ворыва варочаўся сам Бронік Крывеня ў споднім расхрыстанай сарочцы, у круглай, яшчэ царскай фуражцы, — картузе, як яе называлі, з няголеным колькі дзён тварам, сівым, нібы абсыпаным попелам. Над стомленым, натруджаным за дзень у плузе канём віўся і дацінаў яго раз'юшаны гмыз.

Убачыўшы ў сваім двары Броніка Жука, Крывеня, нібы збіўся з хады, прыстакнуў на які міг, а потым выпрастаўся і, спыніўшы каня, падаў суседу руку. У поціску Крывеневай рукі Жук нібы ўлавіў, што яна трохі дрыжала. Ён, Крывеня, мусіць, ведаў пра забранага каня.

— Здароў быў, я да цябе, — Бронік Жук прытрымаў нахіленую палавіну брамы, каб лепш і вальней праехаў у двор Крывеня.

— Ды бачу, што да мяне, — Крывеня даехаў да шырокіх дзвярэй падпаветкі і пачаў распрагаць каня.

— Арэш на сваім, а дзе схаваў майго?

— Не ў мяне трэба пытаць.

— А ў каго ж?

— Сам ведаеш, мы сваім сынам ужо не ўказ.

— Я збегаю, яны тамака, — раптам страпянулася дзяўчына, — у Дземянісі п’юць.

— Тады пачакай, — прыпыніў дачку Крывеня, — якая з п’янымі гутарка.

— Конь у цябе ёсць, і ты можаш чакаць, — не стрываў і сарваўся на крык Бронік Жук.

— Ты на мяне не крычы, браце, — падняў на яго свае сінявата-ліловыя, як у барана, вочы заўсёды спакойны і разважны Крывеня.

І гэтых вачэй, іхняга колеру нібы спалохаўся трапятліва-нервовы Бронік Жук і ўжо сам загаварыў лагадней:

— Не крычаць я прыйшоў, а папярэдзіць: не аддасце каня — будзе кепска. Бо немцы і паліцыянты ведацьмуць, чый сын ходзіць з ружжом.

— А твой хіба не?

— Мой чужых каней не забірае.

— Яшчэ як сказаць, — і з-пад чорных броваў, што закручваліся вострымі коскамі, на Жука зноў патаемна зіркнулі сіне-ліловыя вочы.

— А ты, як ні кажы, а майго каня вярнуць мусіш! — Бронік Жук прыляпнуў рукою па сцягне, клічучы за сабою чорнага, вялікага, як цяля, сабаку, і выйшаў за браму.

Яго ніхто не аклікнуў. І праклёну не паслаў услед. І гэта яго душыла помслівою злосцю і адчайнаю крыўдаю яшчэ больш. Ішоў ён спешна, забыўшыся нават, што ў калене баліць пабітая рэпка, якою ён сёння зранку выцяўся аб кубелец у цёмнай варыўні.

У крайняй хаце, чуваць было, стаяла п'яная гамана. Нехта спрабаваў нават зацягнуць песню, але збіваўся, бо, пэўна, не ведаў яе слоў.

«Не, гэтыя злыдні каня не прывядуць. Не!» — усё шырэй і цвярдзей ступаў Бронік Жук. Крыўда балючым камяком падступала да горла.

Выходзячы на палявую дарогу, яшчэ раз азірнуўся на шара-саламяныя, прымрэлыя ад

гарачыні Панікарты. Перад гародчыкам крайняй хаты, дзе крэмавымі кветкамі свяціўся язмін, сінела сукеначка таго самага дзяўчаці, што парывалася збегаць да Дземянісі і паклікаць брата, які забраў чужога каня.

«Напэўна, там дзе-небудзь у хляве і мой Варанец?..» — раптам падумаў і прыпыніўся на ясна-зялёным ад падужэлай аўсянай руні крутаватым грудку разгарачаны і ўзбунтованы Бронік Жук.

— А можа, вярнуцца? — цяжка адрываючы ногі, ступіў на сцежку, зацярушаную пухкім, як попел, і цёплым, як попел, сівым пылам.

Сабака азірнуўся на голас гаспадара. Недаўменна чакаў яго, седзячы пасярод дарогі.

Вялікая загарэлая рука з чорна-сінімі, вострымі, як маладзік, канцамі пазногцяў пагладзіла па галаве даверлівага і паслухмянага сабаку:

— І што скажаш рабіць? Ісці казаць немцам? Тады пагібель усёй Крывеневай сям'і.

...Стрэл пачуў хіба сабака, бо палахліва ўздрыгнуў. Але ўжо пасля таго, як, прашыты куляю навылёт, з заміжка, з дарогі ў мройнатрапяткі ад парыўнага ветру і кусцісты, шырокі ў пер'і авёс упаў яго гаспадар.

Стралялі з-пад крайняе хаты, рассунуўшы частакол і паклаўшы на жэрдку вінтоўку. Стра-

лялі, пэўна, наўгад. Але куля сама іншы раз выбірае цэль.

Перапуджаны сабака яшчэ пастаяў над мёртвым гаспадаром і нарэшце, панура апусціўшы голаў, пабег у вёску. Ён і прынёс дадому трывожную і загадкавую навіну, чаму не вярнуўся гаспадар і што яго трэба ісці шукаць...

На трэці дзень, гэтакі ж самы бясхмарны, спякотны і з ветрам сухавеем, нямецкая танкетка, а ўслед за ёю два грузавікі з паліцыяй і коннаю казацкаю сотняю, падымаючы горкі пыл на палявой дарозе, марудна сунуліся на груд, з якога ўжо былі відаць Панікарты — саламяна-шарая вёска ў пятнаццаць хат з чорным бусловым гняздом пасярод яе.

Стральбы ў навакольных вёсках не чулі — кароткія аўтаматныя і кулямётныя чэргі глушыў парывісты вецер. Ён прыгінаў да зямлі і сіва-рудаваты дым. Але ў тым баку, куды яго слаў і зносіў вецер, смуродна і чадна пахла спаленым чалавечым мясам.

*6—23 чэрвеня 1999 года*
*Валоўшчына–Мінск*

# Смерць на парозе

Стрэлу ён пе пачуў. Хоць стралялі зблізку, з палявога каменя, што старчма стаяў на ўтравелым замежку.

Ён толькі падышоў да парога і зняў з карамысла два поўныя вядры з сцюдзёнай крынічнай вадою. І паспеў яшчэ ўзяцца за клямку. Агністы ўдар у галаву аглушыў яго і кінуў у чорную прорву. Падаў ён спіною назад і на тыя два драўляныя вядры, перавярнуўшы адно з іх. На яго плюхнула сцюдзёная вада, але холаду яе ён ужо таксама не пачуў.

А смерць ён прадчуваў, бо яшчэ зранку, калі запалілі лямпу, сказаў мацеры:

— Ты сёння пабудзь дома, нікуды не адлучайся.

— Ой, яшчэ што скажаш. Соль і газа выйш-

ла. Я ж сабралася прадаць курыцу. Ці ж забаўляюся ў тым мястэчку.

Твар у маці быў зжоўклы, прывялы і са зморшчанаю, як на ўсохлым яблыку, скуркаю.

«Нездароўча яна. Як жа ж ёй будзе жыцца без мяне?» — пагараваў, глянуўшы на яе, але сказаў коратка і цвёрда:

— Успееццa.

І ўзяў два пустыя драўляныя вядры, што стаялі з прыхаду, каля парога, каб ісці па ваду. А ісці было далекавата, за груд, на лужок у лагчыне, дзе кіпела, падымаючы залацістаружовы жвір, жывучая, што не замярзала і лютаю зімою, гарачая крыніца. Улетку вада была халодная, крамяная, што ажно скрыпела на зубах.

Колькі гадоў назад туды ўкапалі цэментную трубу, і на дне яе кожную зіму, распластаўшыся, спалі зялёныя жабы з чорнымі гарбатымі спінкамі. Маці брыдзілася, а ён смяяўся і шкадаваў выкідаць іх на снег. А на згоне зімы яны невядома дзе дзяваліся — знікалі самі.

Сцежка да крыніцы вілася, як невымоўная казачная радасць. На грудзе заўсёды мякка, прытульна і ласкава шумела змарнелая, пахіленая, як стары грыб, крываватая хвойка.

Нават у бязветраны дзень тут вірыў задзірысты віхор, абвяваючы спіну халодным скразняком.

І ён, Віталь Якшук, трымаючы на каромысле цяжкаватыя дубовыя вёдры і робячы круг, палахліва азіраўся. Ён ведаў, што ўжо болей як месяц, пасля таго, як загарэўся суседні хутар, за ім палюе ястрабок з блізкай вёскі, трохі малахольны Лёнік Шашок, што запісаўся ў «истребительный батальон»* і прынёс дадому вінтоўку і, кажуць, некалькі папяровых пачак з патронамі.

Наўкруга ў ранішнім сыраватым змроку серабрылася і ажно прылягла ад цяжкай расы кусцістая рунь. У замглёнай далечыні цяжка каркаў самотны крумкач. Волкі туман, як паводка, заліўшы даліну, хаваў вёску і боханістыя груды з прытоенымі хутарамі.

Віталь уздыхнуў і, сцепнуўшы ад сырога холаду плячмі, росным заміжкам пачаў спускацца да лужка, над якім таксама круглым азярцом расплыўся туман.

Высокі, плячысты, ён ступаў трохі размашыста. З-пад ног, з-пад мяжы раптоўна фуркнула і імкліва знікла ў тумане за крыніцаю чародка маладых курапатак. «Значыць, тут нікога не было, раз сядзелі курапаты», — Віталь падвесяліў сябе і рашуча падышоў да глыбока

ўкапанай трубы. Вада цурчэла праз вышчарблены край. На метраў дваццаць ад крыніцы вузкім каснікам сярод парудзелага лужку молада зелянела свежая трава.

Віталь нагнуўся і зачэрпаў першае вядро...

Ён не ведаў, што з прылеску праз ядлоўцавыя кусты, як воўк да авечкі, прагна і настырна да яго падбіраўся ён, малахольны Лёнік.

Лёнік жыў толькі адным жаданнем і прагай — застрэліць. Гэтую хваробу, гэты магнэз забіваць чалавека ён набыў яшчэ ў партызанскім атрадзе. Спачатку было здзіўленне, а потым насалода. Калі ў атрадзе судзілі каго за здраду, разбой і гвалт, і калі выстраеныя партызаны на запытанне камандзіра, хто прывядзе ў выкананне загад, упарта і зацята маўчалі, пачаў вызывацца ён, Лёнік:

— Я, таварыш камандзір!

Потым доўга і адрошана пераЖываў гэтае забойства, седзячы зводдаль ад усіх на пні і зацягваючыся задушлівым самасадам. Лёніку яшчэ бачылася тая жахлівая хвіліна, калі застрэлены ў патыліцу партызан падаў перед ім жа самім выкапанай ямай і хроп і турзаўся ў страшнай агоніі.

Забойства, учыненае Лёнікам Шашком, ператваралася ў свой, яму толькі вядомы ры-

туал.

Але на такую ж бяду, што з гарачкаваю асалодаю Лёнік чыніў над іншымі, ён напароўся і сам. Пасланы на «хозаперацыю» — вынюхаць у вясковым хляве парсюка і, уклаўшы яго на воз, прывезці ў атрад, Лёнік да страты прытомнасці напіўся. Сярод белага дня пры калодзежы ён пакаціў, схапіўшы ў поясе, падлеткадзяўчынку, спрабуючы яе згвалціць. Але вёрткае дзяўчо ўміг выкруцілася з-пад асалавелага Лёніка і ў знак помсты днішчам акутага вядра смальнула яму па пераноссі.

І Лёнік, прывучаны страляць, — стрэліў. У атрад яго прывялі з чорным апухлым тварам, але без парсюка і з нечаканаю навінаю, што ён застрэліў дачку аднаго з тутэйшых партызанаў.

Лёніка Шашка, вядома, судзілі. Нават адчыталі перад строем грозны загад, але ў чорную яму ён не ўпаў — па малалецтву даравалі.

Праз гэта малалецтва — Лёніку было семнаццаць — яго не ўзялі і на фронт, калі пасля партызанскага парада ўсіх маладых мужчын і хлапцоў прыгналі на прызыўны пункт.

Вярнуўшыся дадому ў прыцішэлыя, напалову спаленыя ў час астатняй аблавы родныя Лукі, жыць прыгнечаным, спакойным дамасе-

дам Лёнік Шашок ужо не мог. Па незабытай і спакуслівай партызанскай звычцы спакваля поначы пачаў абіраць далёкія хутары, ходзячы ажно пад Нёман — там яны былі багацейшыя. У супольнікі і ў помач сабе ўзяў, як смяяўся, «прычэпа», нейкага прыблуду з Расеі, агідна і брыдка ўпрыгожанага наколкамі на пальцах, вытатуіраванай галавою тыгра на левай лапатцы і выгінастаю змяёю на правым бядры.

Тут жа, на прынёманскіх хутарах, яны абое незнарок нарваліся на акоўцаў — польскіх партызан, што бадзяліся па лясах, ваюючы ўжо з саветамі, — і, мусіць, прызнаўшы Лёніка і яго супольніка за энкавэдзістаў, далі з-за хутаранскага хлява колькі аўтаматных стрэлаў, уклаўшы насмерць «прычэпа». Лёніка ж вырataваў спярша глыбокі равок, а потым — высокія і круглыя, як копы сена, ядлоўцавыя кусты.

Пацягнулася зноў вусцішнае да брыдоты, агорклае жыццё. І на табе — яго рукі займелі жаданую і зваблівую вінтоўку і ўчулі, як дрогка і радасна турзаецца яна пры стральбе. Кароткі, як таўкач, абрэз, ды яшчэ з адламаным прыкладам, з якім ён хадзіў калашмаціць, як казаў, прынёманскія хутары, Лёнік заткнуў назад пад застрэшак, падалей, для іншага часу.

Акрамя мосінскай вінтоўкі, яму ў міліцыі выдалі новы вайсковы бушлат з залаціста-бляшанымі гузікамі і пасведчанне байца «истребительного батальона», ці ястрабка, як называлі яны сябе. Фуражкі Лёніку не дасталося. А насіць вясковую кепку, хай сабе і наўкруга падкладзеную для штыўнасці згорнутаю ў некалькі столак газетаю, было не да гонару. У сельсавецкага начальніка ваенна-ўліковага стала, былога франтавіка, ён выпрасіў добра падношаную і добра зашмальцаваную зверху, над цемем, нехлямяжую фуражку. Засмучаў яго і чорны аколыш. Хацелася мець нешта з малінавым альбо блакітным, як у лётчыкаў. Але ўсё ж на галаве трохі набакір сядзела тое, што прылучала Лёніка да важнай і таямнічай вайсковай справы.

На вечарынкі, што бывалі цяпер глухаватымі, і вяселлі, што скупіліся на даўнейшыя пацешныя і прыгожыя выдумкі і звінелі не так гучна, Лёнік Шашок прыходзіў у шара-зеленкаватым бушлаце з гузікамі-дутышамі і вайсковай фуражцы, з-пад якое выкручваўся чорнасіняваты ўпарты чуб. Яго, неразважнага распусту, свае дзяўчаты баязліва стараніліся, а ў незнаёмых вёсках нябрыдкі з твару Лёнік меў поспех — на яго заглядаліся.

Трапіўшы да стрыечнай сястры на хрэсьбі-

ны і запрошаны за стол, Лёнік, як заўсёды, перабраў меру і зваліўся ў воз, што стаяў сярод двара з распрэжаным канём. А прыцемкам у гэты ж воз паляцеў вагкі камень. Кінулі з-за вугла хаты. Лёнікаву галаву выратавала ручка воза.

Другі камень, падкраўшыся ў глухую ноч пад Шашкову хату і пастукаўшы ў дзверы, кінулі ўжо тады, калі яны адчыніліся. Адчыняць іх якраз пайшоў бацька. Чакалі, вядома, яго, Лёніка, і ў поцемку абазналіся. Учуўшы грукат і стогн, Лёнік выбег падняць ужо і прынесці ў хату беспрытомнага бацьку. Камень — і зноў жа не малы — трапіў бацьку ў нос, расплюскаўшы яго ўшчэнт. Бацька выжыў, але з увагнутым, укалечаным носам прызнаць у ім ранейшага статнага Пятра Шашка было досыць цяжка.

Назаўтра Лёнік пабег шукаць след. За вёскай, праз сівую рунь зелянела вузкая стужка ababітай расы. Яна вяла, як здалося Лёніку, на суседнія хутары, якраз на асаду Якшука.

У той жа дзень Лёнік завёз у раённую бальніцу ўкалечанага бацьку, а сам завітаў у міліцыю. Праз тыдзень, прыехаўшы наведаць хворага, ён атрымаў жаданую вінтоўку, палахлівае для іншых пасведчанне ястрабка і бушлат з бліскуча-таннымі гузікамі. Душа яго віравала

ад радасці — ён мог цяпер палявадь за ціхмяным Якшуком.

...Заўсёды памяркоўны, разважлівы і паслухмяны Віталь застаўся адзін з двух сыноў у аўдавелай Настулі. Старэйшы Янак, болей упарты і рэзкі, трапіўшы з польскім войскам у савецкі палон, згінуў недзе ў Старабельску, у Расеі. Гультаяваты і не здатны да навукі, Янак адужаў толькі пяць класаў. Праўда, потым, пасталеўшы ўжо, апомніўся: пайшоў чаляднікам да местачковага Моўшы — вучыўся за краўца. Але ўсё перайначыла вайна — якраз напярэдадні яе Янака забралі ў войска. І Настуля атрымала ад яго ўсяго дзве паштовыя карткі — першую з польскага горада Пшэмысла, дзе ён быў уланам, другую, з васільковаю маркаю і заштрыхаванымі некаторымі сказамі, — з Расеі, з невядомага Старабельска, дзе Янак апынуўся ў лагеры палонных.

Разам з іншымі дакументамі, укруціўшы ў хустку, Настуля беражэ і гэтыя дзве паштовыя карткі — ляжаць яны ў яе яшчэ дзявочым куфры, у прымацаванай збоку шуфлядцы.

Настуля гаруе па іх ужо двох — па сыну Янаку і яе Язафату, што быў застудзіўся на лесавывазках і праз два тыдні памёр ад запалення. Тады, у трыццаць дзевятым, зайшоўшы, бальшавікі надта арыштоўвалі людзей і бязлі-

тасна ганялі іх на розныя работы, як называлі — «трудовое участие».

Язафатава смерць выратавала сям'ю Якшукоў ад вывазу ў Сібір. Бо, кажуць, у тых, патаемна складзеных у сельсавеце спісах было і іхняе прозвішча.

І вось у Настулі, на глухаватым і далёкім ад вёскі хутары застаўся ён, сарамяжы, трохі нерашучы, з жаночым характарам, чарнабровы з валошкавымі вачыма, прыгожы Віталь.

У школе настаўнікі нахваліцца ім не маглі. Упарты да вучобы, ён паступіў у Навагрудскую семінарыю ўжо пры немцах. Але ж і вайною і вучыцца, і араць, і сеяць трэба ж было.

Аднак за семінарыю, за той зеленкаваты касцюмчык, што яму выдалі, даравацць ужо не могуць, а свае ад зайздрасці і злосці яшчэ падтыкаюць.

На згоне зімы трое з чырвонымі пагонамі і ўзброеныя доўгімі вінтоўкамі прыходзілі на хутар. Праўда, Віталь якраз з канём паехаў у тыя ж Прылукі памагчы нямогламу дзядзьку выкінуць з хлявоў і вывезці на поле гной. А там ужо хтосьці шапнуў, што дома яго чакаюць госці.

Там, у Прылуках, Віталь перачакаў бяду і, вярнуўшыся на трэці дзень дадому, пачаў рабіць схрон — у варыўні клаў другую сцяну. Ту-

ды, у засценак, можна было залезці толькі з гарышча, адкінуўшы на ім дзве лёгкія дошкі.

Нібы збаўленне і ратунак ад гэтага туляння на стол лягла павестка — Віталя забіралі ў войска, і ён, назапасіўшыся харчамі, з'явіўся ў райваенкамат.

Ужо далёка за Гомелем па вагонах сярод навабранцаў папаўзла чутка, што іх вязуць не ў вайсковыя часці, а ў Данбас, на шахты. Сакрэт выдаў падкормлены пахучаю каўбаскаю і падпоены агністым першаком сяржант-татарын. І словы яго спраўдзіліся — навабранцаў пасялілі ў бараках і, даўшы шахцёрскі ліхтар, кіркі і каскі, пачалі спускаць у забой.

У вузкай, з мала вышэйшым паднябеннем, як вясковай печы, штольні вугальную пароду трэба было кіркаваць лежачы. З шахты падымаліся ледзь жывыя, не чуючы ні спіны, ні рук, ні ног.

Шахту аднойчы заваліла. Яны, пяцёра чалавек забойшчыкаў, ажно трое сутак начавалі ў сене разам са сляпымі коньмі, што цягалі ваганеткі з вуглем. І многія пачалі чахнуць, здаваць і ад непасільнай работы і ад галадухі — у сталоўцы да тонкай лусты хлеба давалі рэдзенькі ружовы кісель. Яго, Віталя, ратавала яшчэ сала. А зямляк з-пад Зецелы, дробны, пасінелы, з доўгай і худзенькай, як у пеўніка,

шыяй Іван Юргель, ледзьве ўжо цягаў ногі. Ён першы і не вытрываў. Аднойчы, адклікаўшы ад грамады Віталя, здушаным, ціхім голасам выдыхнуў:

— Я ўжо выведаў, як ходзяць цягнікі.

— Ты пра што? — зразумеўшы намёк, усё ж перапытаў Віталь.

— А пра тое, што на два білеты грошы ў мяне ёсць. Учора прыслалі з дому.

— Значыцца?..

— Як значыцца, то ацеліцца. Трэба ўцякаць! Бо тут альбо памром з голаду, альбо заваліць у штольні.

І ў Юргеля задрыжаў на губе пякучы акурак:

— Уцякаць трэба, уцякаць, покуль яны не апомніліся і не загналі нас за калючы дрот. Тады не вырвемся.

З дарогаю спачатку нават пашэнціла — да Харкава ехалі цягніком. А там упрасіліся ў вайсковы эшалон. Але ўжо ў Баранавічах, калі таварняк, поўны салдатні, спыніўся перад калонкаю, каб набраць вады, з падкручанымі вусамі старшына падклікаў да вагона афіцэра з двума вахлакаватымі, нейкімі абношанымі салдатамі ў шэрых трусовых шапках — вайсковы патруль.

Да ваеннай камендатуры, куды ўжо вялі іх, Віталь не дайшоў. Убачыўшы туалет, схітра-

ваў, адпрасіўся, спаслаўшыся на хворы страўнік. І яны паверылі, нават не суправаджалі яго. А яму толькі і трэба было, каб знікнуць у сутоках доўгіх складоў і пакгаўзаў.

Дадому з Баранавіч, не рызыкуючы болей садзіцца на цягнікі, каб не злавіла чыгуначная ахова, Віталь дабраўся пешшу. Што здарылася з Юргелем, куды яго адправілі — назад у шахты ці ў турму, — ён не ведае.

На трэція суткі чуйным прыцемкам Віталь пастукаўся ў акно паменшалай і яшчэ болей прыгорбленай за гэтыя два месяцы, калі ён не быў дома, роднай хаты. Маці доўга не адчыняла, мусіць, ужо спрасонку ёй здалося, што за акном стаіць не ён, Віталь, а яго брат Янак, які ўваскрос з мёртвых.

На людзях Віталь спачатку не паказваўся. Але ж ці ўседзіш доўга на адзіноце. Маці, каб памагчы ў бядзе, нават напытала ў далёкай вёсцы, адкуль была замужам, як казала яна, нязгоршую дзяўчыну. Аднак Віталь сватацца не стаў — помніў з Навагрудскай семінарыі пухленькую, кучаравую, з анёлкавым тварам, Сабіну Мятлік. За ёю ўжо тады ўвіхаўся нехта з рагулеўскіх афіцэраў. І ці не звёз разам з сабою ў Нямеччыну. Аднак схадзіць у Сялец, невялікую вёску, што хавалася ў раўку за пяць вёрст ад Наваградка і адкуль Сабіна была ро-

дам, сарамяжлівы Віталь пабаяўся — а раптам абязвечаць нечаканаю навінаю, сказаўшы, што яна, Сабіна, ужо замужам.

І маўклівы Віталь затоена сядзеў на абрыдлым хутары, старонячыся чужога вока. Чуйна, як напалоханы заяц, прыглядаўся да кожнага, хто зварочваў на сцежку, што вяла з дарогі да Якшуковай хаты.

Але ўсё разрашыў і перайначыў пажар — на суседнім хутары загарэлася хата. Да Якшукоў з чатырохгадовым абпаленым сынам на руках прыбегла перапалоханая Аксеня. І Віталь не схаваўся ў свой схрон, а, схапіўшы бусак, кінуўся на помач. Але ў хаце на ўсю моц ужо бушаваў агонь. Падпаліў яе той жа хлопчык. Аксеня перад гэтым церла ў сенях лён, а ён, хлопец, забаўляўся на печы, седзячы на тым жа падсушаным лёне. Як дзіцячая рука намацала на мурку коміна карабок запалак, невядома. І запалка чыркнула па карычневым канце каробкі, каб лён успыхнуў, як порах. Аксеня ўчула енк і ўжо з агню выхапіла дзіця. Іншае што ўзяць, вядома, не ўскорала.

Уварвацца ў хату не змог і Віталь. Яшчэ ў сенях дух забівалі дым і гарачыня. Ён вынес толькі церніцу, на якую наткнуўся тут жа, у сенях. І пачаў бусаком падварушваць ачэп — верхнюю, пакладзеную на бэлькі дзеравіну.

Але дзе ж ты адзін яе сарвеш. З вёскі мужчыны падбеглі тады, калі абвалілася страха. Неразважлівыя жанчыны былі ўражаныя і агнём, і тым, што тут на пажары з'явіўся Віталь, а казалі ж, што яго забралі ў войска. І Віталь учуў у сябе за спіною здзіўлены ўскрык:

— Зірні, Гэлька, дальбог Віталь Якшукоў тут!

— Ціхо, дурная.

— Мне што... Я так сабе...

З гэтага пажару, гайдануўшыся кругамі, як вада ад кінутага каменя, разышлася па наваколлі чутка, што з войска ўцёк і хаваецца на сваім хутары Якшукоў Віталь.

Гэтыя разгайданыя кругі дайшлі і да Лёнікавага берага. І якраз напярэдадні таго здарэння, калі ноччу ў бацьку пацэліў вагкі камень і зялёны след па сівой ад расы руні пайшоў на хутар, дзе ўзвышалася вялікае, на двое дзвярэй, Якшукова гумно.

А вяртаўся дадому менавіта Віталь, яшчэ прыцемкам і цярэспале, каб лішне не трапляць на чужое вока. А быў ён у дзядзькі — аддаваў пазычаныя грошы. Там і заначаваў, каб ледзь свет прыйсці на хутар.

Помслівы, гатовы на забойства Лёнік не вельмі і верыў сабе, што рахманы, па-дзявочы сарамлівы Віталь Якшук, якога помніў яшчэ са

школы, мог падкрасціся ноччу пад іхнюю хату і кінуць у бацьку каменем. Зрабілі гэта напэўна ж браты той застрэленай дзяўчыны. Яны, праўда, і не таіліся, што хочуць адпомсціць за сястру. І іх, двух вуграватых і насатых здаравякоў, шчуплаваты Лёнік Шашок па-сапраўднаму пабойваўся.

Таму за ворага лепш прымаўся ціхмяны Віталь Якшук, каб было хоць уяўнае апраўданне, што будзе пакараны ён не так сабе, а па-належнаму і слушна.

Тым больш, што ў Лёніка зявілася вінтоўка, і яна спакуслiва апякала рукі і, здаецца, сама, як магнітная стрэлка, дрыготка паварочвалася на той далёкі хутар з вялікім гумном.

Але першы раз Лёнік абышоў усё наваколле без яе, перымерваючыся толькі, адкуль лепш страляць. І выбраў ружаваты, адсечаны зверху, пэўна, перуном пляскаты валун, што, як адзінокі зуб з дзёснаў, вытыркаўся з затравелай мяжы. Дарэчы, якраз насупраць хаты.

Тады з прылеску, з ядлоўцавых кустоў, дзе ледзьве не наступіў на соннага зайца, ён і ўбачыў пры крыніцы з вёдрамі яго, Віталя.

Гэта праўда: чалавек заўсёды чуе на сабе чужы зірк. І Віталь, падымаючыся на прывабны грудок з двума вёдрамі на каромысле, адчуў нават спіною, што нехта сочыць за ім. Дайшоўшы

да крываватай хвойкі, што мяккім і прыветным пошумам сустрэла яго, паставіў вёдры і азірнуўся: у ядлоўцавых кустах на прылеску нібы мільганула круглая фуражка. «Ён, Шашок, віжуе за мною. Але сёння страляць не будзе, ён толькі прыйшоў разведаць і выведаць».

Віталь зноў па чарзе зладзіў кручкамі восілкі цяжкіх дубовых вёдраў, падняў іх на каромысле і пайшоў насустрач тугаватаму, напорыстаму, але не халоднаму ветру, што пахнуў саладжавай рунню і гаркаватым прэлым лісцем восені. І ўчуў над сабою мяккі, незнаёмы шорхат. Падняўшы голаў, убачыў трох сіва-срэбных жураўлёў, асвечаных перадвечаровым чырванаватым сонцам. Натужліва, нібы змарана махаючы крыламі, яны ляцелі ў вырай. І так нізенька. Напэўна, на блізкую ўжо і халодную зіму. Ляцелі якраз у кірунку Наваградка. І Валю ўбачыліся сінявата-ружовыя з чатырохкутнымі праймамі абсечаныя замкавыя вежы, белы з чырвоным дахам будынак іхняй семінарыі і мілая, кучаравая, як у анёлка, галава прысадзістай, поўненькай Сабіны...

Як раўнаваў яе Віталь, калі на іхнім вечары да яе падышоў вастраносы афіцэр у зеленкаватай форме з жоўтымі кантамі на галіфэ і на абшлагах рукавоў — рагулеўскі кавалерыст — і запрасіў яе да танца. Аднойчы, пра-

водзячы Сабіну да мураванага дамка, дзе яна кватаравала ў нейкіх сваякаў, за брамкаю Віталь убачыў яго, афіцэра. Ён падпільноўваў і чакаў Сабіну. Віталь, як здурэлы, кінуўся прэч, каб ноч ужо не спаць і прасядзець у пачакальні чыгуначнага вакзала, да якога падыходзілі малыя з чатырма вагончыкамі паравозы вузкай калейкі...

Напаіўшы каня, Віталь пайшоў да крыніцы яшчэ раз, каб прынесці яшчэ ў хату вады і каб прыгледзецца: хто ж паходжвае там, на прылеску. Але ў ядлоўцавых кустах, здаецца, нікога не было.

Ставячы вёдры з прыхаду ў парозе, Віталь прызнаўся мацеры:

— Ці мне падалося, ці не, але нехта мяне высочвае. Напэўна ён, Лёнік Шашок, што ў ястрабкі, кажуць, запісаўся.

— Ці ж ліха яму, — жахнулася маці.

Нервова-ўстрывожанаму Лёніку Шашку не спалася і ад поўні, што, зазірнуўшы ў акно, ліпла на вочы, і ад думак, што роіліся і мільгацелі, як лятучыя мурашкі. Ён калісьці бачыў, і шмат іх было з празрыстымі крыльцамі, і яны адна за адною ўзляталі з караністай лясной дарогі.

А думалася Лёніку пра адно і тое ж: як да світання, яшчэ прыцемкам, ён падкрадзецца да вялікага пляскатага каменя, што стаіць насу-

праць Якшуковай хаты і... падпільнуе Віталя. З тымі двума дубовымі цяжкімі вёдрамі, якімі носіць з крыніцы ваду.

Мярцвяна-блакітнае святло поўні чамусьці пераносіла Лёніка на мігілкі ў чэзлы хвойнік з пахіленымі збуцвелымі крыжамі. А ў гэтым смутна-сіняватым святле ўздымаўся свежы, падзёўбаны дажджом капец магілкі, пад якім ляжала яна, ім застрэленая грудастая дзяўчына-падлетак. І кожны раз страхатліва-дзіўнае жаданне зманвала і пад'юшвала яго схадзіць у тое Хвоева, на тыя ніколі не бачаныя могілкі. І нешта, таксама страхатлівае, асцерагала і стрымлівала яго.

Цяпер ён уяўляў, як побач з гэтаю магілкаю паўстане яшчэ адзін капец, пад якім ужо ляжа Віталь.

Лёнік уставаў з ложка, неяк прыхапкам і нервова шукаў на стале пачак тонкіх, як цвічкі, «флоцкіх» папярос. Закурваў. Доўгімі зацяжкамі глытаў дым. Ён быў горкі, як атрута. Папярхнуўўшыся ім, з печы злавала маці:

— Усё курыш, каб на табе шэрсць курэла!

Лёнік пляваў у далоню, тыкаў туды рубінавы агеньчык недакуранай папяросы і клаўся зноў на ложак.

Раніцаю, яшчэ пры лямпе, ён зняў з двух цвікоў на сцяне, дзе яна заўсёды вісела, палохаючы

ўсіх, хто заходзіў у хату, зваблівую вінтоўку і, дурнавата ўсміхаючыся, услых сказаў:

— Ну, я пайшоў на паляванне.

— Куды гэта поначы? — бацька ўзняў свой шырокі, як у калмыка, з пляскатым носам і перакрэслены сіняватаю нарасцю твар.

— Глядзі ж, ізноў не нарабі бяды. А то нам, старым, хоць у свет уцякай. Брыдка людзям у вочы глянуць.

— Стыд не дым, вочы не выесць, — руляю вінтоўкі, што тырчала з-за пляча, Лёнік зачапіўся за касяк і знік у сенях.

Поўня, размытая лёгкаю мярэжаю хмарак, ужо зніжалася за старым адзінокім дубам, што рос на полі за вёскаю. Цяпер ён здаваўся падобным да вялікага качана капусты — круглая крона і кароткі тоўсты камель.

Ішлося лёгка. Чуваць толькі было, як шасталі калошы штаноў. Лёнік раз за разам адкідваў настылы прыклад вінтоўкі, што біў па клубе. Нарэшце зняў яе і за пасак панёс, як прывык насіць у партызанах, падыходзячы да якога-небудзь небяспечнага месца, каб не выдаць сябе, што ты ўзброены. Але тады, у партызанах, у яго была дзесяцізарадка. Не раўня гэтай доўбні.

Пераскочыўшы глыбокую каляіну, поўную дажджавое вады, Лёнік з дарогі звярнуў да ха-

лоднага настылага лесу. Запахла горкім асовым лісцем і мокраю яловаю карою. З дрэў капала, пляскаючы па апалым подсціле, сцюдзёная раса. Нават не заходзячы у лес, Лёнік чуў яе холад. І ён пайшоў затравелым берагам, абыходзячы назвожаныя, ссунутыя сюды з поля белаватыя валуны і стаўбунаватыя, ацяжэлыя ад шчодрай расы ядлоўцавыя кусты.

Мінуўшы цёмную непраглядную сцяну лесу, ужо з грудка ўбачыў страху доўгага Якшуковага гумна. Паджоўклая поўня вісела нізка над ім.

Цярэспале, гразнучы ў свежай раллі, Лёнік пайшоў на поўню і на гэты доўгі і цёмны сілуэт будынка. Натрапіў на замежак і ўжо ім накіраваўся да вышчарбленага пляскатага валуна.

Паволі і марудна выясняўся асенні дзень. У Якшуковай хаце патухлі падслепаватыя, зробленыя на даўнейшы лад, у чатыры шыбы, два акны. Рыпнулі дзверы — нехта выходзіў з хаты. Лёнік прысеў за каменем. Рука мацней сціснула настылую вінтоўку. Па спіне прабеглі дрыжыкі і ад ранішняга сыраватага холаду, і ад таго, што ўжо мае быць. Аб вушак тупа грукнула драўлянае вядро. Лёнік збоку, з-за каменя зіркнуў на падворак. Трохі размытая ў прыцемку мужчынская пастаць паплыла за гумно. Узнятыя рукі трымалі за кручкі каромысла, на якім пагойдваліся вёдры.

Час цягнуўся марудна. Недзе адзінока і дзярката, нібы курэц зранку, захрыпеў крумкач. Развіднявалася. Паволі адсоўваўся полаг ночы.

«А можа, уцёк? Можа, згледзеў мяне?» — Лёнік падняўся з кукішкаў і на вышчарблены, абсечаны перуном валун паклаў вінтоўку.

«Не, ідзе вунь», — Лёнік зноў чуйна прыгнуўся. З-за гумна, трохі прыгорбіўшыся пад двума вёдрамі, размашыста і неяк клышанога ступаў Віталь. Угнуўшы галаў, глядзеў недзе сабе пад ногі.

«Панясе ў хлеў? Не, закіроўвае ў хату», — Лёнік павярнуў вінтоўку на праём дзвярэй, і яго вока знайшло дрыготкую мушку.

«Стрэлю тады, калі спыніцца перад дзвярыма. Ён будзе мой».

Лёнік напружыўся, сцяўся ўвесь, нібы ястраб перад тым, як кінуцца на здабычу, і падвёў мушку на самы вушак. А там якраз і спыніўся, здымаючы з каромысла вёдры, Віталь Якшук. Ён толькі ўзяўся за клямку, як гарачы ўдар кінуў яго ў чорную прорву — куля пранізала галаў.

З рулі вінтоўкі, што ўздрыгнула і аціхла, курыўся сіняваты дым.

Лёнік адрошана, як сам не свой, звар'яцела ўсміхнуўся. Узяў за пасак вінтоўку і панёс збоку сябе, як насіў у партызанах дзесяцізарадку.

Ён неяк абмяк, ссутуліўся, але на губах у яго яшчэ не астыла крываватая, як у шалёнага, брыдкая ўхмылка.

Яму зноў убачыліся могілкі. Лёнік азірнуўся, шукаючы на небасхіле поўню і думаючы, як яе сінявата-мройнае святло абалье свежы надмагільны капец. Але поўня ўжо змеркла за далёкім лесам.

Пачынаўся новы дзень жыцця і пакут. На парозе хаты дзіка і адчайна галасіла адзінокая Настуля.

*19—27 мая 1999 года*





# Ноч на Галавасека

Пахла, ажно зводзіла ў роце, церпка-гаркаватым смолкім ядлоўцам.

Рослы, трохі сутулаваты Сцёпа Галаскок раздзьмуў крылы пляскатага носа і, выцягваючы жураўліную шыю, яшчэ раз нюхнуў даўкае паветра. І нарэшце адчуў, што ён дома. Зялёнай радзюжкаю паўмяж перад ім разаслалася доўгая лагчына, зарослая круглымі і калючымі, як згорнутыя вожыкі, ядлоўцавымі кустамі.

Сцёпа запаволіў крок і спыніўся. За яго спіною з палёгкаю ўздыхнулі пяцёра ўзброеных аўтаматамі мужчын у сцёганых вайсковых куртках. Як і ў Галаскока, на іхніх спінах спражкамі паблісквалі і набухла ўздымаліся, нібы прыгнятаючы іх, пакоўныя, набітыя то-

лам плечакі. Па-малалетняму танюткая, з бялявым валавокім тварам дзяўчына, адзетая таксама па-вайсковаму — куртка, кубанка, галіфэ, — стомлена паставіла каля сваіх ног у парусінавых боціках зачахлёны, падазрона цяжкі чамаданчык.

Змяркалася. Бэзавы поцемак церушыўся на ялавінную, усыпаную ядлоўцамі лагчыну і на абгладжаныя, як боханы, груды з чорнымі копамі панурых хутароў пры іх. Адтуль, перасякаючы малаежджы, заглушаны сіва-ліловымі каткамі гасцінец, бегла дарога. Ужо байчэйшая, парэзаная глыбокімі каляінамі, поўнымі глеістай дажджавой вады.

За спадам, у даліне, атуленая рэдкімі, асыпанымі ўжо вербамі, яна па калені танула ў цьмянай ленце наравістае рэчкі, за якою на апоўзлым касагоры расцягнулася вёска. Гэта былі яго, Галаскокавы, Погіры.

А далей, наўпрасты, дзе ў маладым хмызняку знікаў малаежджы гасцінец, прыцішылася, пазавешваўшы вокны, без ніводнага агеньчыка баязлівае мястэчка. Карбітныя агні свяціліся хіба ў ліхтарах з цяжка апушчанымі адвесамі каля галоўных стрэлак на чыгуначнай станцыі.

Адтуль і ўзняўся, прынёсшы за сабою глухаваты стрэл, ружовы агеньчык запальнае

кулі. Зрабіўшы невысокую дугу, агеньчык нечакана згас над чорнымі купамі прыгорбленых хутароў.

Як здагадаўся Галаскок, перапуджаная якім-небудзь шоргатам ці нават проста сутоннем, з бункера пры чыгуначным мосце страляла варта — тых некалькі нехлямяжых, нібы адрошаных, рускіх палонных пры двух-трох стараватых немцах.

— Адкуль гэта? — першым страпянуўся камандзір групы, смуглявы, скохнавокі, падобны да татарына, але прыгожы Нагаеў.

— З бункера, з чыгуначнага моста б'юць, — спакойна, разважна, нават з непрыхаваным смехам растлумачыў Галаскок. — Але болей ад страху.

Нагаеў нерваваўся. Ды было чаго. Спецгрупа, якую на месца дыслакацыі, у Ліпічанскую пушчу, вёў Галаскок, страціла ўжо двух чалавек. Першага яны не далічыліся адразу, як прызямліліся ў Налібоцкіх лясах каля возера Кромань. Ці ў яго не раскрыўся парашут, ці ён трапіў у рукі якой-небудзь засады — невядома. Завітаўшы на хутар, яны адно даведаліся, што тутэйшыя прылесныя вёскі прачэсвае шунаеўскі батальён. Каб не заспела пагоня, прыйшлося спешна пакідаць, як здалося напачатку, прытульныя Налібоцкія лясы.

Другога разведчыка, Секінаева, чорна-сінявата, каржакаватага асеціна, згубілі пры больш загадкавых абставінах, калі пераплылі ўжо Нёман, шчасліва натрапіўшы на лодку, што стаяла пры старой алешыне недалёка ад цаглянай каробкі спаленага млына — пэўна, паравога. Ён, Секінаеў, пераеўшы на тым жа хутары нечага нястраўнага ды яшчэ запіўшы атрутным самагонам, ледзьве паспяваў распапружваць штаны. На гэты раз па сваёй патрэбе ён адлучыўся ў яр, густа заглушаны кустамі шыпшыны і ценькім маліннікам з высокаю крапівою.

На ўсякі выпадак, перабегшы з палявое дарогі ў хваёвы, зялёна-блакітны маладняк, яны можа з гадзіну чакалі Секінаева, але ён так і не аб'явіўся. Прыклікаўшы да сябе пастуха, пасінелага й босага хлопца, нарэшце дачуліся, што ўчора і сёння тут, пры вёсцы, шнырылі акоўцы. Не зважаючы на тое, што Секінаеў не знайшоўся, група рашыла адыходзіць ад падазрона небяспечных воўчых яроў.

Пасля нялёгкага дзённага пераходу, цяняючыся болей па прылесных і палявых дарогах, абыходзячы шашу і людныя скрыжаванні, яны, знясіленыя і змораныя, нарэшце апынуліся тут, у ядлоўцавых кустах, на прырэчнай даліне блізка Галаскокавай вёскі з літоўскаю ўжо назваю — Погіры.

Не быўшы два гады дома, Сцёпа Галаскок патурзваўся ад неспакою. Яго, як ад сыраватага холаду, калацілі дрыжыкі.

У прагале старых купчастых і ўжо трохі згалелых вербаў, выставіўшы вушаты канёк, вызірала першая хата з невялікім трохкутнікам шчыта і апоўзлым саламяным лобам. За ёю, ужо трэцяю з канца, да густа-зялёнай ліпы тулілася замшэлаю страхою яго, Галаскокава, хата.

Галаскок размашыста чарпануў развешаны між высокіх двух кустоў гамак ліпучай павучыны і, чуючы ў жмені сухую жарству мух, інстынктыўна падаўся да блізкага стромага берага, які штогод у паводку падмывала наравістая рэчка і з якога ўжо была выразна відаць родная хата. Там — маці і сястра. Жывыя яны ці не? Сэрца ў Галаскока зашчымела і, як пасля лішняй чаркі, свет мройна калыхнуўся — на вочы набеглі слёзы.

Сястра яшчэ перад вайною, выйшаўшы замуж за сляпога на адно вока хлопца, праз тыдняў два ўцякла дадому. Так і жыве пры мацеры — ні дзяўчына, ні ўдава. Не брыдкая з твару, яшчэ і кавалераў прыманьвае. Але, апёкшыся на першым замустве, ці рошышся на другое?

Пэўна ж, варта было б наведацца дадому. Але ці дазволіць камандзір групы — злосны, з

падцятымі губамі Нагаеў. Ды ў вёсцы, што стаіць пры самым чыгуначным мястэчку, ці мала на каго можна нарвацца. Немцы ўстрывожаныя і мсцівыя, як ніколі. Блізіцца фронт, і ад партызанаў ратунку няма — дыверсія за дыверсіяй. Таму ў прышашэйныя вёскі нагнаны ўкраінскія батальёны і там-сям расселены казацкія сотні. Пры чыгуначных пераездах і скрыжаваннях дарог зажаўцелі зрубленыя са свежага акоранага дрэва бункеры — невялікія дамкі, абнесеныя тоўстым сасновым валам з пяском усярэдзіне і чорнымі праймамі для вінтовак і кулямётаў. Можа, яны, вусатыя данцы ў чорных бурках з плеценымі нагайкамі, з'явіліся і тут, у родных Погірах.

Сцёпа Галаскок злосна варухнуў плячыма, падтрос вышай абрыдлы мулкі плячак з толам і спешна вярнуўся назад, да прыцішаных узброеных мужчын, тым больш, што з грудка, з хутароў, пэўна, у вёску спускалася фурманка, едка парыпваючы адным колам.

Сцёпавы рукі ўмомант выпусцілі брызентавыя рамяні цяжкага плечака і хапіліся за кароткі аўтамат з грубаватым дыскам, што вісеў на грудзях.

Глыбей у кусты адступіліся ўзброеныя мужчыны, падняла свой цяжкі чамаданчык і радыстка.

— Но-о! Ты чаго баішся? Воўка счуў ці што?

Па высокім, трохі гугнявым голасе чуйны Галаскок распазнаў, што едзе хутаранец Старук.

«Браць ці не браць яго?» — на які момант разгубіўся ўспалошаны Галаскок.

Бо яўнай помсты на гарбаносага, з пукатымі, як у рака, вачыма, старога ўжо нерватрапяткі Галаскок не меў. Гарачым кіпнем помслівая злосць падымалася толькі на яго сына, аднарукага — другую маладым падсадзіў у сячкарню — Юзафа ці Юзіка, свайго равесніка, што падаўся нейкім пісаруком у нямецкую ўправу і разам з двума немцамі на грузавіку прыязджаў арыштоўваць яго, былога савецкага міліцыянера, — Сцёпу Галаскока. Выратавала тады ліпа, на якую ў міг вока (можа, падагнаў страх) Галаскок ускораў залезці. Адтуль, зверху, і бачыў, як, ператросшы гумно, хлеў і хату, двое рослых немцаў ад помслівай злосці, што нікога не знайшлі, тут, пад ліпаю, пачалі біць збялелага, ужо, мусіць, гатовага да смерці бацьку. Каб немец быў адзін, то Сцёпа Галаскок не стрываў бы, гэльцнуў з ліпы на яго, зваліў і, вядома, вырваў бы вінтоўку...

Перапалоханы, пабіты на горкае яблыка, бацька з гэтага здарэння, ці, як ён казаў,

прышчакі, пачаў чахнуць, покуль не захварэў зусім.

А ён, Галаскок, праседзеўшы з тыдзень у снапах, у пашарках, што стаялі яшчэ на ржышчы, нарэшце прызнаўся сястры, што будзе ўцякаць у Расію. Яна расстаралася добры брус сала і разам з немалым акрайцам хлеба прынясла сюды, у схрон. Нямецка-савецкі фронт Галаскок перайшоў ужо за Смаленскам...

— Но-о! — пагукваў раз за разам на каня, што, счуўшы ў кустах людзей, натапырваў вушы, насцярожаны, мусіць, і сам Старук. — Но-о, каб ты!..

«Трэба браць, не ўпускаць яго», — раптам рашыў Галаскок, убачыўшы, як на фоне зеленаватага неба варушыцца і расце, набліжаючыся, чорны калматы сілуэт канёвай галавы са скобкаю дугі.

Галаскоку прыгадалася, як раненаму ў плячо яшчэ на першай сусветнай вайне Старуку недзе з Амерыкі ішлі даляры — пенсія за інваліднасць, і як ён, Старук, ганарыста даваў грошы свайму аднарукаму Юзафу, калі яны, погірскія хлопцы, выбіраліся ў мястэчка на фэст. О, як зайздросцілі яны ўсе, бяднейшыя, аднарукаму Юзафу.

За гэтыя амерыканскія грошы ён і ў гімна-

зіі, у Лідзе мог вучыцца, а яны, яго равеснікі, скончыўшы шэсць-сем класаў, браліся за плуг, думаючы, каб як гэта вырвацца ў Францыю, у шахты, на добрыя заработкі.

І вось едзе яго бацька, Базыль Старук. Юзіка Старука з управы ён, Сцёпа, не ўпаляваў, затое сам у рукі едзе яго бацька.

«Браць, толькі браць». — Галаскок азірнуўся на кусты, за якімі прыгнуліся пяцёра ўзброеных, і прыглушана падаў голас: — Стараста едзе!

— Неужели? — перакінуў цераз галаў брызентавы пасак аўтамата даўганосы і недарослы намеснік камандзіра групы Ягор Сазонаў.

— Ты не абазнаўся? — перапытаў Нагаеў.

— Як гэта абазнаўся, стараста, кажу, — яшчэ раз змахляваў Галаскок. — Ён з тутэйшых хутароў.

— Хорошо, сама мышка... — Сазонаў шчоўкнуў бяспечнікам аўтамата.

— Ты што, страляць нельга, — папярэдзіў Нагаеў. — Мы і так яго, голымі рукамі...

Не толькі конь, але і глухаваты ўжо Старук счуў, што наперадзе нехта ёсць — нібы варушацца ў прыцемку цені і рвецца нечы невыразны голас.

Старук прыўстаў на калені і наструненаю ляйчынаю шлёпнуў каня. Той захроп і наўска-

пыта з ляскатам панёс воз. Яшчэ мацней зарыпела, захадзіла ўлукаткі крываватае кола.

І пачулася ўжо глухавата-расцяжнае, нямоцнае, але ўладна-пагрозлівае:

— Стой... тваю маць!

Гэта крычаў Нагаеў.

Фурманка спынілася, але ўсяго на які міг, каб скіраваць назад. Раз-другі свіснула, пэўна, балючая вузлаватая пуга. Едка зарыпелі гужы, завішчаў, сцялежыўшыся трохі, воз.

— Но-о, пайшоў, сівы! — пудкі голас фурмана вырваўся з прыцямнелых ядлоўцаў.

Фурманка, перавальваючыся ў неглыбокіх калявінах, ужо ляцела назад і за кустамі выкіравалася на роўнае адкрытае поле.

— Уцячэ, гад, — з адчаем ускрыкнуў Нагаеў.

— Ды не, — спускаючы з плячэй цяжкі плячак, злосліва і з'едліва ўхмыльнуўся Галаскок. — Я зараз яго...

Сягаючы размашыста і хутка, Галаскок пусціўся ў пагон, але фурманка ўжо знікала ў каламутным прыцемку вечара.

— Вот і не дагоніць, — па-дзіцячы наіўна пырснула смяшком радыстка. — І дзякуй Богу.

Але далей пайшла мяккая рунь — і конь і воз танулі ў намоклай, глеістай зямлі. Галаскок, чвякаючы па гразкім полі, усё ж насціг-

нуў воз і першае, што здагадаўся зрабіць, — схапіў фурмана за каўнер. Лускаючы і трэскаючы па шве, каўнер, як і ўвесь шарачковы, добра падношаны пінжак, з якога вылузаўся Старук, заставаліся ў дужай і ўчэпістай Галаскокавай руцэ.

— Держи, не упускай его! — крычаў, падбягаючы на помач Галаскоку, разгарачаны, ужо злосны Сазонаў.

Сюды, на раскіслую ў лагчыне глеістую рунь, беглі ўсе партызаны. Той-сёй ужо выходзіў каню напярэймы.

Не падагнаны пугай, супакоены конь і сам пачаў сцішаць свой бег — на фурмане, пераваліўшыся ў воз, ляжаў узнерваваны і злосна-помслівы Галаскок.

— Тяни его сюда, тяни, — выскальваў у прыцемку белыя зубы нецярплівы Сазонаў.

Сцёпа Галаскок нарэшце, што было моцы, рвануў на сябе і нечакана выкуліў з воза ўпартага, што фыркаў, як абліты вадою і раскручаны вожык, гэтаксама непадступна-калючага Старука.

— Чаго хочаш, злыдух? — абкруціўся наўкруга сябе, але не ўпаў, устаяў на нагах Старук, засвяціўшы белай, без шапкі, лысінай.

— А тое і хачу спытаць, дзе сын? — цяжка, задыхана адсопся Галаскок. — Юзаф дзе твой?

— Юзаф тут не жыве. Сам ведаеш, у мястэчку ён. Бульбы мех яму во вязу.

— Ва ўправе служыць?

— Кінуў ужо, — стары нагнуўся, каб знайсці згубленую шапку, але не знайшоў.

— Абрыдла прадаваць людзей?

— А ты лепшы? — Старук пацягнуўся, каб узяць хоць пінжак, які ўчэпіста трымаў Галаскок, але той схапіў яго за грудкі, трасянуў: — Дак дзе жыве ён, твой Юзаф?

— Кажу ж, у мястэчку.

— У якім доме і на якой вуліцы?

— Ці знаю я тыя вуліцы. Белы дом, што каля вугальнага складу...

— А немцы там кватаруюць?

— Немцаў няма. Майстар з жонкаю і дваіма дзецьмі жыве.

Нарэшце ўсім абрыдла слухаць гэты нязначны і непатрэбны дыялог, і Нагаеў ужо скамандаваў:

— Ну, пайшлі.

Каня за цуглі ўзяў і вывеў з глеістай руні Сазонаў.

Бэзава-сінявыя змрок ужо густа ўкрыў лагчыну, і ядлоўцавыя кусты зліваліся ў адну, ужо непрасветную чарнату. Глыбокаю паводкаю гэтая сінявая цемень затапіла рунь і абступала хутары, — невыразна віднеліся толькі абрысы прыгорбленых будынкаў і круглыя, як

шчоткі, верхавіны дрэў. На сіне-густое неба высыпалі і раіліся калючыя залацістыя зоркі.

— Куды вы мяне вядзеце? — наравіста заўпарціўся і раптам спыніўся Старук.

— Ды вось недалечка, метраў сто пройдзем, — мякка, лагодна сказаў Нагаеў і раптоўна ўскрыкнуў: — Распрагай каня!..

Двое партызан падбеглі да каня і пачалі рассупоньваць хамут і вышморгваць з гужоў дугу і атосы.

— Што вы робіце? Што-о?.. — бездапаможна заенчыў Старук, не здагадваючыся, што яшчэ мае быць, але прадчуваючы бяду.

— Рэмень! — загадаў Нагаеў.

Нехта разразаў сваю брызентавую папругу. Нагаеў звязаў дзве ўзнятыя і перакрыжаваныя атосы. Аднекуль з кішэні выцягнуў скрутак абмоткі і, зрабіўшы пятлю, накінуў цераз голаў успалошанага Старука.

— За што? Што вы чыніце са мною? — дрыготкія рукі Старука зашкрабліся па грудзях, намагаючыся хапіцца за пятлю. Але да старога падскочыў і спрытна заламаў іх за спіну раз'юшаны Сазонаў.

— За што? — ападаў голасам Старук.

— За то, что фашист! — зласліва прашаптаў Сазонаў.

— Які ж я фашыст, людцы добрыя!

Радыстка, не ўтрываўшы гэтай просьбы, перамешанай з плачам, закрыла твар рукамі і адбеглася.

Нагаеў нарэшце прывязаў канец абмоткі за адну з атосаў і пагрозліва загадаў:

— А ну, узяліся ўсе, і па маёй камандзе: раз-два — паднялі!

Мужчыны адзін перад адным падбеглі да атосаў і ўсе разам, узняўшы рукі, паднялі іх.

Як у нейкай дзіўнай браме, забоўтаў нагамі, шукаючы апоры, падвешаны Старук.

— Дзяржы, дзяржы, тваю маць! — брыдка, агідна лаяўся Нагаеў.

У пятлі хроп і турзаўся, б'ючы адною нагою ў атосу, канаючы ў агоніі, павешаны стары. Нарэшце ён узвіўся ўвесь, задрыгаў белымі нагамі, што былі відаць з-пад караткаватых штаноў, і прутка выцягнуўся.

Атосы апусцілі ўжо тады, калі мёртвае цела пакорна і бездапаможна абвісла.

Успуджаны конь, нібы счуўшы смерць гаспадара, вусцішна заіржаў. І на яго голас адклікнуўся брэхам хутаранскі сабака.

— Ну, дзякуй, камандзір, — падлашчваўся да Нагаева не менш за іншых неспакойны і ўзнерваваны Галаскок. — Удала і лоўка ты яго... — І кіўнуў на старога, што ляжаў пад неразвязанымі атосамі.

— Далей ад дарогі, у кусты прахвоста трэба зацягнуць, каб не ляжаў навідавоку, — падказаў Нагаеў і сам нагнуўся, каб адвязаць ад атосы доўгую абмотку...

Запрогшы каня і згрузіўшы на воз нялёгкія плечакі з толам, усе маўкліва, стомлена і маруднa ішлі зводдаль фурманкі. На возе сядзела толькі радыстка ды поруч яе размашыста ступаў сутулаваты Сцёпа Галаскок, раз за разам падмахваючы лейцамі і пацмокваючы на каня.

Ён вёў групу ў мястэчка да таго белага дома з мансардавым дахам, дзе, як падказаў Старук, кватараваў яго сын, аднарукі Юзаф.

Дом стаяў з самага краю мястэчка — пяройдзеш кладкаю цераз рэчку і будзеш каля яго. Праўда, злева, праз метраў трыста, чыгуначны мост, а там — бункер. Немцы з палоннымі рускімі, што маюць напэўна ж цяжкі кулямёт, — не спяць, яны напагатове. Абстраляць могуць, але з бункера наўрад ці высунуцца. Пагоні ноччу, вядома, не будзе.

Галаскок прыкідваў, як ён праскочыць да белага дома за нізкім, як помніць, плоцікам і засцігне там аднарукага Юзафа, яшчэ цёпленькага, у пасцелі са сваёю дзябёлаю Косцяю.

Помста, як балючы нарыў, затузала зноў. А завяліся яны з Юзафам яшчэ перад вайною за чарнявую юрлівую наймічку, якую Старукі

ўзялі на ўсё летняе жніво. Тады Сцёпа Галаскок правёў яе з нядзельных вечарніц, з вёскі, сюды, на здзічэлы хутар, дзе іх нецярпліва падпільноўваў ашалелы ад рэўнасці Юзаф. Тут яны пабіліся. Праўда, Юзаф быў з жалезным шворанам — і плячо ў Галаскока балела можа з год.

Аднак чарнявую наймічку Юзаф зганьбіў — за жонку прывёз дзябёлую, залаціста-кучараву, як царыца, Косцю, з якой вучыўся ў Лідзе, у гімназіі.

Другі раз Сцёпа Галаскок сутыкнуўся з Юзафам, калі ўжо зайшлі бальшавікі. Разам з маладзейшымі мужчынамі Сцёпа Галаскок запісаўся ў рабочую гвардыю, каб раззбройваць стшэльцаў (маладых баевікоў) і лавіць асаднікаў — насланых польскіх каланістаў. О, было на кім спагнаць злосць. А потым апынуўся ў міліцыі і разам з савецкімі энкавэдзістамі даставуляў (падвозіў) на станцыю, дзе ўжо стаялі нагатове таварныя саставы, сем'і розных панкоў з маёнткаў, вясковых старастаў, паштальёнаў, паліцыянтаў... А неўзабаве ў мястэчку з'явіўся асабіст, выбраў сабе ў памочнікі яго, Галаскока, і яны, узяўшы сельсавецкую фурманку, паехалі на Погірскія хутары, каб схапіць аднарукага Юзафа. Як сведчыў асабіст, Юзаф аказаўся польскім канфідэнтам...

Не думаў Галаскок, што з савецкай турмы ці высылкі можна было вярнуцца дамоў. Але прыйшлі немцы — і, як з таго свету, паўстаў Юзаф Старук. Ён уцёк з Полацкай турмы, дзе сядзеў пад следствам.

Трэці раз Сцёпа Галаскок убачыў яго з тое густое ліпы, зблажэлага, з худымі плячыма, на якіх вісеў гаматны стракаты пінжак з падшпіленым, да локця пустым рукавом. Тады Юзаф з двума немцамі — афіцэрам і сяржантам — на грузавіку прыехаў ужо арыштоўваць яго, былога савецкага міліцыянта. Сцёпу Галаскока.

Не спадзяваўся Галаскок, што з Юзафам Старуком іх, даўніх ворагаў, можа звесці лёс.

За Смаленскам, дзе Галаскок перайшоў фронт, яго прызвалі ў армію. Пасля трохтыднёвай вывучкі іхні пяхотны батальён падвезлі на *** балоты пад Ленінград і пешым маршам, яшчэ нават без вінтовак, накіравалі на фронт. І назаўтра ўжо ў чэзлым балоцістым лесе, праз які яны ішлі, наўкруга іх пачалі рвацца нямецкія міны. Галаскок толькі помніць, што ачуняў ён у варонцы, поўнай халоднае дажджжавое вады. Ад болю шчымела ўся пашчэнка. Што асколак ад міны, прашыўшы абедзве шчакі, выбіў два кутнія зубы, ён разабраўся потым. А цяпер убачыў, як, мінаючы яго, спеш-

на ўцякаюць салдаты. Галаскок пачаў крычаць, каб памаглі яму выпаўзці з глеістай ямы. Але яго, здаецца, ніхто не чуў. Нарэшце рабацініста-рыжаваты сяржант схапіў яго руку і крыкнуў блізкаму тут санітару: «А гэты, здаецца, жывы!»

Потым, вядома, быў шпіталь, і, нарэшце, — спецшкола за Масквою, дзе Галаскока ўжо вучылі падрыўной справе і ўмельству скакаць з парашутам. Пасля яму, як тутэйшаму, хто найбольш ведае быт, звычкі і норавы заходнебеларускіх вёсак, падабралі якраз такую работу — суправаджаць у Ліпічанскую пушчу партызанскія спецгрупы. З гэтай, трэцяй, яму не пашэнціла найбольш.

— Степаша, дисциплины нет. Рыба гниет с головы, — ціха, з прытоенаю ўкрадкаю ўчора зашаптаў на вуха Галаскоку нізенькі, з паўпаданымі шчокамі Яфрэм Сазонаў. — Пропадем мы. Ну какой из нашего Нагаева командир? Бабник он.

Галаскоку было трохі не па сабе. Бо ўчора, калі яны сушыліся і начавалі на прылесным хутары, ён, Сазонаў, паставіўшы на варту Галаскока, загадаў яму паназіраць і за Нагаевым, што пайшоў начаваць у гумно, паклікаўшы да сябе на сена маладзенькую радыстку.

І Галаскок не столькі асцерагаў хутар, коль-

кі з гарачаю задушліваю цікавасцю прыкладаў вуха да шурпатае сцяны і, чуючы, як ад шалёнай рэўнасці замірае сэрца, прыслухваўся да шамацення порсткай саломы і здушаных стогнаў.

— Вишь, какой из него вояка, — вышчарыўшы рэдкія зубы, ціхенька і саладжава-давольна потым ужо пасміхваўся Сазонаў. — А она, наша Груня, тоже цаца...

У здзеклівым, ціхенька-прытоеным голасе Сазонава ўгадвалася і помслівая рэўнасць, і нянавісць да Нагаева.

Галаскок і сам неўзлюбіў за ўсё ўчарашняе і спакуслівага прыгажуна Нагаева, і яе, танюткую і бязгрудую, з адным прыгожым тварком і сінявата-дымнымі, як спелыя дурніцы, вачыма, маладзенькую радыстку. Няўзнак і ён зіркаў на яе зайздросным, можа трохі неабыякавым вокам. Але каб сказаць, што яму падабалася сухагрудая радыстка, то не вельмі. Сцёпа Галаскок уважаў дзяўчат ці кабет з крутымі сцёгнамі, каб у іх з-пад кофты нахабна выпіраліся тугія грудзі, якія спакушалі і ўздурвалі мужчыну. А ў радысткі апрача наіўна-лупаваценькіх вачэй, здаецца, больш нічога зваблівага не было...

Дарога паволі ўпаўзла ў густа-цёмны, забэрсаны прыцемкам лес. Запахла волкаю кастры-

цаю, крохкімі зелянцамі. Пачынаўся невялікі грудок перад лагчынаю, у якой пятляла, скручваючыся пярсцёнкамі, як туга звітая суровая нітка, і наўкруга абыходзіла мястэчка халодная, крамяная ўлетку і гарачая, заўсёды з параю ў марозную зіму, крынічная рэчка.

Сэрца ў Галаскока шалёна затрапяталася: там, за рэчкаю, як перайсці кладку, за старымі чорнымі алешынамі і будзе той белы з мансардавым дахам дом, дзе кватаруе Старук Юзаф. Галаскоку нават убачылася, як ён падыме з пасцелі яшчэ ва ўсім споднім перапалоханага Юзафа з гэтаю яго кароткаю, адрэзанаю па локаць рукою, а потым успора і яго даўганогую ў кароткай начной кашулі Косцю і стрэліць ёй між ног на вачах у Юзафа, як страляў жонку каменданта паліцыі, кінуўшы яе на зямлю, камандзір той першай групы, якую за Слонім, у Ружанскія лясы, вёў ён, Галаскок.

Ад наплыву раз'ятранай злосці Галаскок мацней сціснуў халаднаваты прыклад аўтамата, які трохі наўскос вісеў у яго на грудзях, і ляйчынаю падагнаў маруднага каня.

Чуючы пад'ём, конь зафыркаў і ўпарта натужыўся. Закалыхаўся, зарыпеў недагледжаны стары воз, раздражнёна завішчала задняе кола.

На высакаватым грудку, дзе зрадзеў лес, віхрыў тугі, настылы вецер. Галаскок угнуў го-

лаў і затуліўся за каня. Але праз пошум ветру ў вушах распазнаў далёкае патахкванне цягніка. Гэты рытмічны паспешны перастук устрывожыў усіх.

— Поезд, ці што? — наганяючы Галаскока, задыхнуўся Нагаеў.

— Ды я ж казаў — чыгунка тут.

— Ага, праўда... І бункер каля моста.

— І бункер, — нехаця пацвердзіў Галаскок.

— О, чтоб кокнуть его, этот эшелон, — узрадавана адазваўся Сазонаў.

Рытмічнае пагрукванне цягніка як раптоўна з’явілася, так раптоўна і аціхла, нібы ён уцягнуўся ў вялікі падземны тунэль.

— А трацілавая шашка ёсць? — пырснуў смяшком і заблішчаў у поцемку белымі зубамі Галаскок.

— А ты ведаеш, знойдзецца. Нават фінская, кілаграмовая.

— Ну, з падрыўною тэхнікаю не будзем спяшацца, — разважна сказаў Нагаеў і нечакана змоўк.

— Гэта праўда, пачакаецца, — замахаў дзюбатаю кепкаю Галаскок і загаварыў пра сваё: — Пракрадземся спярша ў мястэчка і ўкакошым здрадніка. У-у гад, скуру з яго трэба драць, столькі людзей прадаў.

— Ой, страх, які ж ты, Сцёпа, злы і пом-

слівы, — не стрывала і нават адхілілася ад Галаскока ўражаная радыстка.

— Гэ-э, злы, — перадражніў яе Галаскок. — Папалася б ты яму ў лапы...

Але голас яго перарваў, насцярожана шарахнуўшыся ўбок і б'ючы Галаскока аглобляю ў сцягно, перапуджаны конь — адначасна з ружоваю запальнаю куляю прыцішанага лесу дасціг кароткі стрэл.

— Баяцца, гады, нібы чуюць нас, — зноў са смяшком азваўся Галаскок.

— А можа ўсё ж такі абыдзем мястэчка? — падаў голас насцярожаны Нагаеў.

— А мы ў яго заязджаць не будзем, — захлёбіста загаварыў Галаскок. — Таварыш камандзір, мы ўжо, лічы, прыехалі... Вы дайце мне толькі двух байцоў, а самі заставайцеся тут. Я за паўгадзіны спраўлюся. Хата на водшыбе, во якраз як перайсці кладку... За метраў трыста—чатырыста.

— Ну, ужо дазволь, пайду і я, — Нагаеў наводмаш махнуў рукою, нібы адхіляючы ад сябе Галаскока.

— Что вы, товарищ командир, вам нельзя! — перапалохана папярэдзіў Сазонаў.

— Адставіць ныццё! Глядзі за Груняшаю. Галавою за яе адказваеш.

— А я? — з крыўдаю ў голасе адазваўся адзін з двух байцоў.

— Цябе, Ігруноў, бяром, — пасля паўзы, нібы злітаваўшыся над байцом, адказаў Нагаеў і ўладна закамандаваў: — Слыш, Сазонаў, трэба з'ехаць з дарогі і прыхаваць воз.

— Слушаюсь, — каротка, але са злосцю на сподзе душы адклікнуўся Сазонаў.

— Ну, глядзі, — беручы на згатоўку аўтамат, Нагаеў цвёрда ступіў услед за сутулавата-высокім і размашыста-нязграбным Галаскокам.

Патаемная, ледзьве значная ў поцемку сцежка, то падаючы ў раўкі, то падымаючыся на ўзлобкі, вяла да блізкае кладкі — дзвюх жалезных рэек, на якія ўпоперак шчыльна былі пакладзеныя кароткія дошкі.

Кладка была без парэнчаў, і Галаскок ціха, але нястрымана-злосна мацюкаўся, першым пераходзячы алавяна-блішчастую стужку страхатлівай рэчкі. За ім прыгінаўся і азіраў цёмныя сілуэты мястэчковых будынкаў, мружачы падслепаватыя вочы, Нагаеў. Ззаду іх засяроджана і чутка пасопваў у свой даўгаваты нос Ігруноў.

Белы атынкаваны дом з мансардаю, пра які гаварыў Галаскок, аказаўся не на водшыбе, а за трыма чорнымі, накрытымі гонтаю хатамі, на ветраным грудку, побач з вадакачкаю, за якою праз метраў трыста ўздымаўся двухпавяр-

ховы будынак вакзала. Там недзе, пры калонцы, пачмыхваў, набіраючы ваду, распалены, гатовы да выезду паравоз. Падпаліўшы квач, каля яго хадзіў і аглядаў колы руплівы машыніст.

Нагаеў і баец, не згаворваючыся, адчулі падсвядомую боязь і падазронасць — ці не заманіў іх Галаскок у якую-небудзь пастку: поруч жа, у вакзале, напэўна ёсць немцы.

У чатырохкутніку нядбала зашторанага крайняга акна востра прарэзаўся краёк няяркага святла.

— Стой, дай агледзецца! — Нагаеў рэзка рвануўся наперад і схапіў за рукаво паспешнага і разгарачанага Галаскока. — У вакзале ж немцы...

— Тут толькі чыгуначная ахова. Гарнізон далей, — рэзка вырваў сваю руку непадуладны, ахоплены ўжо маніяй помсты нервова-дрыготкі Галаскок.

— А тэлефонная сувязь? Вунь два слупы цямнеюць, — падказаў Ігруноў.

— Гэта — алектрыка, тэлефона там няма.

— Ціха-а, — прыгнуўся сам і, распасцёршы рукі, асадзіў на зямлю Галаскока з Ігруновым перапуджаны Нагаеў — ад тэлеграфнага слупа адарваўся і паплыў да белага дома цёмны невыразны цень. — Бачыце, нехта ідзе.

— Нам пашанцавала, — узрадавана выдыхнуў Галаскок. — Цяпер я прарвуся ў дом. Вы пабудзьце тут, падыдзеце да ганку потым, каб ніхто не вырваўся на вуліцу. Ганак там, за вуглом.

Дабегшы да невысокага рэдзенькага плота, Галаскок уміг вока перакуліўся цераз яго і ледзьве не паўзком, зліваючыся з поцемкам, праскочыў да высокага з двухскатным дахам дома. На фоне белай сцяны мільганула яго галава.

— Ой, — толькі паспела ўскрыкнуць прыгнутая немаладая жанчына з вялікаю шарсцяною хустаю, накінутаю на галаў і плечы, калі яе за мяккую і халодную руку ўчэпіста схапіў Галаскок.

— Ты толькі, баба, не дрэнчы, а то будзе аман — застрэлю, — нахіліўшыся да яе галавы, у шорсткую суконную хусту пагрозліва зашыпеў Галаскок.

— Ах, Божа, — адрошана, ледзьве не трацячы прытомнасць, зяхнула старая.

— Я пастукаю, але акажашся ты, чуеш?

— Чую.

Галаскок адхіліўся ад веранды і кулаком стукнуў у раму акна — тонка затрымцела незакітаваная шыба.

— Хтотака? — раптам адклікнуліся не за

акном, а за дзвярыма веранды. Голас быў перапалоханы і насцярожана жаночы.

Галаскок локцем падштурхнуў перапуджаную кабету.

— Сарафінка, гэта я.

— Цётка Браніслава? А мне ж падумалася, што нейкі парцізант.

І калі адна палавінка дзвярэй адчынілася, Галаскок рвануў яе да сябе:

— Немцаў у доме няма?

— Не, не... Што вы... Яны ў вакзале, — баязліва затрымцеў голас праставалосай у светлай сукенцы жанчыны, што, узіраючыся з-за пляча старой Браніславы, намагалася распазнаць, хто гэтак самапростам рвецца ў кватэру.

— Не цікуй — свае, — чутка і нацята выпрастаўся Галаскок і прысвіснуў у прыцемак, дзе ля плота прыгнечана туліліся Нагаеў з Ігруновым.

У кватэры, скупа асвечанай слабаю лямпачкай пад зялёным махрыстым абажурам, пахла нечым гарэлым.

За полагам перагародкі чуўся баязлівы шэпт. Галаскок нервова ўздрыгнуў і парывіста ступіў туды. Руляй настаўленага аўтамата прыўзняў занавеску.

— Пачакайце ж, хворая там, — заступіла дарогу праставалосая жанчына — наймічка ці пакаёўка ў хаце.

І праўда, у вузкім пакойчыку, асветленым нізка апушчанай малочнай лямпачкай, дзе пахла яшчэ паленым спірытусам, на ложку пад коўдрам, тварам у падушку, ляжала жанчына. А поруч — во чаго не хацеў Галаскок — на складным драўляным крэсле сядзела пані Цыгельская, яшчэ польская настаўніца матэматыкі, што не раз лінейкаю ці накрыўкаю ад пенала біла па галаве распуснага і самага нядбалага вучня ў класе, яго, Сцёпу Галаскока.

— Дзе ён, дзе Юзаф? — Галаскок па-ястрабінаму навіс над ложкам.

— Няма яго. Ён паехаў у Баранавічы. Па справе. — Павярнулася — і ў яе на спіне пад коўдрам зацюкалі, баязліва зазвінелі шкляныя банькі — схуднелая, доўгатварая Косця, жонка Юзафа Старука.

— Ага, паехаў, — падцвердзіла пакаёўка.

— А можа тута, пад ложкам? — Галаскок прыкленчыў і адкінуў край чырвонага пастрыгаванага коўдра, раптам успудзіўшы беленькага котка, што вышмыгнуў адтуль.

— Так дзе той шаптун? — сюды, у пакойчык, зазіраў ужо Нагаеў.

— Ды быў ён тут. Я сам бачыў, — змахляваў Галаскок, востра ўзіраючыся на сівавалосую насатую Цыгельскую.

— Не бачыла, не ведаю, — бліснула залатою

каронкаю пабялелая Цыгельская. — Я прыйшла да пані Канстанцыі толькі банькі паставіць.

— Яна ўжо пані, ядрона вош, — злосна і пакрыўджана сплюнуў Галаскок.

— Трэба рваць когці, покуль фашыст не падняў шухер, — азіраючыся на цёмныя куткі, занепакоіўся Нагаеў.

Раптам у кватэру ўбег і цяжка выдыхнуў Ігруноў:

— Нехта ідзе сюды! З суседняга дома...

— Ты толькі не спалохай. А як зойдзе, назад не пускай, — загадаў Нагаеў і сам затуліўся за вушак.

— Гэта сын мой, напэўна, — падказала Цыгельская і памкнулася да дзвярэй.

— Маўчаць! — выцягваючы губы, зашыпеў Галаскок і, штурхануўшы рукою ў плечы, кінуў яе назад, за перагародку.

Цыгельская, пакаёўка і старэнькая кабета — ці не маці яе, бо гэтакая ж даўганосая — прыгорблена прытуліліся адна да адной.

На верандзе пачулася валтузня і глухаваты, тупы грукат. А неўзабаве Ігруноў, расчырванелы, з прыкушанаю ад злосці споднюю губою, упіхнуў у кватэру, заламаўшы таму за спіну рукі, маладога, гадоў шаснаццаці хлопца. Па цёмна-сінім гімназісцкім фрэнчы, тонкім гарбаватым носе і кучаравых валасах — фуражка,

мусіць, згубілася ў часе валынкі — Сцёпа Галаскок пазнаў сына Цыгельскай.

— Во гад, ледзьве не выкруціўся з рук, — Ігруноў падапхнуў хлопца на сярэдзіну пакоя.

— А гэта хто? — кінуў пералётны позірк на Галаскока ўжо зусім азадачаны Нагаеў.

— Сынок каменданта польскіх стральцоў. Фашыст, словам. Бацьку, праўда, мы схапілі яшчэ ў трыццаць дзевятым.

— Да? — не вельмі разумеў у чым справа разгублены Нагаеў.

І тут за спіною ў яго, адкінуўшы занавеску, высунула свой збялелы твар з дрыготкім падбароддзем спатажаная Цыгельская.

— Вой, Януш! — Голас быў упалы, самлелы ад страху.

— Я прыйшоў цябе і бабусю клікаць дадому.

— Пацярпі трохі, — павярнуўся да хлопца Нагаеў.

Мусіць, пазнаючы ў Галаскоку нешта знаёмае, Цыгельская няпэўна спытала:

— Вы ж былі маім вучнем, праўда?

— Што праўда? — адступіўся Галаскок, не ведаючы яшчэ, прызнавацца яму, ці не.

І нечакана прыгадаў той маёвы дзень, калі ён, разам з дзяўчаткамі, хораша прыбранымі, што ўжо падумвалі пра хлопцаў, падышоў да

школы, і з іхняга класа адчынілася акно, і на падваконнік цяжкай задніцай умасцілася Цыгельская. Здзекліва ўсміхаючыся, крываватым пальцам яна паказала тады на яго, на Сцёпу Галаскока:

— Ты, Галаскок, можаш ісці дадому. Табе па кантрольнай я паставіла два і пакідаю цябе на другі год.

Назаўсёды Галаскоку запомніліся гэты крываваты палец і гэтая здзеклівая ўхмылка. Як яны балюча апякалі памяць.

Непрыемнае, помслівае пасміхванне тарганула тонкія злосныя губы, як здалося Галаскоку, і цяпер.

— Пайшла ты!.. — не ўтаіў даўняе крыўды Галаскок.

— Божа літасцівы! — успляснула рукамі Цыгельская. Чуйна-ўстрывожаны Нагаеў рэзка павярнуў да сабе Галаскока, дыхнуў пракураным ротам яму ў твар:

— Чорт ведае, хто яшчэ сюды прыйдзе. Уцякаем. А студэнта бяром.

Невядома, ці ўчула, ці проста здагадалася Цыгельская, што гэтыя падазроныя, узброеныя і злосна-помслівыя мужчыны, якія прыйшлі арыштаваць ці застрэліць Юзафа Старука, могуць забраць і, барані Божа, забіць яе сына.

Кабета бяспамятна, стрымгалоў падбегла да

яшчэ не апомненага, здзівёна-перапалоханага хлопца і рашуча схапіла яго за руку:

— Не стой тут, ідзі ў пакой!

Але дайсці да полага ў пройме перагародкі і схавацца ў вузкім пакоі, дзе ляжала хворая, ашаломленаму хлопцу не даў Галаскок. Помсліва і брыдка зморшчыўшы твар, ён адапхнуў яго дулам аўтамата.

— Сцяпан, апомніся, не чапай хлопца! — ціха, але ўпарта папрасіла пакаёўка, што дагэтуль цярпліва маўчала.

— Не лезь, баба, не ў сваё дзела, бо зараз... — і чорнае дула ў прадаўгаватых дзірачках павярнулася на яе.

— Што робіш, Галаскок? Я пазнала цябе, — адчайна ўжо закрычала Цыгельская.

— Успакой! — кіўнуў у бок Цыгельскай Нагаеў і, падпіхаючы хлопца, схаваўся ў чорнай прорве веранды.

— І не смей забіраць сына! Чуеш? — Цыгельская адвяла ад сябе Галаскокавы распасцёртыя рукі.

— Стой, курва! — Галаскок грозна і ўжо без літасці падняў, трымаючы за дула, страхатлівы аўтамат. З размаху гахнуў ім па сівой галаве. Пачуўся крохкі хруст, і жанчына, абліваючыся крывёю, мякка і ціха аб’ехала на падлогу.

Галаскок ступіў да незачыненых дзвярэй,

але яго вярнуў нечаканы крык з плачам:

— Ах, Божа, што ты нарабіў! Гэта ж усе ведацьмуць.

Крычма крычала, стоячы пры занавесцы ў спальню, нібы абязвечаная Сарафіна.

— Ведаць? — Галаскок перавярнуў аўтамат і папхнуў туды, у вузкі пакой, у спальню абедзвюх жанчын.

Вялікімі, застылымі вачыма на яго глядзела трэцяя — жонка Юзафа Старука, даўгатварая, зблажэлая ад хваробы Косця.

Галаскок наставіў аўтамат на вялікія палахліва-неміргаючыя вочы і націснуў на спуск, учуўшы, як задрыжала ў руках і налілося цяплом халоднае жалеза.

— Што робіш, недавярак?! — адчайна і жаласна заенчыла Сарафіна, але яе енк абарвала наступная кароткая аўтаматная чарга.

Уміг выскачыўшы з задушлівага вузкага пакоя, прапахлага лякарствамі і церпкім спірытусам, Галаскок пераступіў скурчаную і ацішэлую Цыгельскую, што ляжала на падлозе ў лужыне цёплай крыві, і апынуўся ў фіялетава-сляпым, прахалодным змроку позняга вечара. Глытнуў, нібы крынічна-крамянай вады, свежага паветра і адчуў дужую, нечаканую лёгкасць. Ачахла і трохі спала гарачая злосць і нервовая ўсхваляванасць.

Прывыкаючы да цемнаты, доўга шукаў

вачмі прытуленых да сцяны партызанаў. І не столькі распазнаў, колькі ўчуў пагрозлівы папрок Нагаева:

— Ты што, ядры тваю вош, гарнізон хочаш падняць у руж'ё? Чаго страчыш?

— Ды не давалі выйсці з хаты, — змахляваў Галаскок. — Аўтамат хацелі адабраць.

— Ты маму забіў, сволач! — рвануўся да Галаскока падлетак.

Але яго ўчэпіста за грудкі схапіў Ігруноў і з усяе мужчынскае моцы прыгрукнуў спіною да сцяны:

— Не рвіся, гадзёныш.

Чыгуначная ахова ўсё ж, мусіць, счула колькі глухаватых, прыглушаных сценамі аўтаматных стрэлаў, і ружовыя кулі, скрыжоўваючыся над белым мансардавым домам, паляцелі адначасна і з блізкага вакзала і з бункера пры чыгуначным мосце. Застукаў кулямёт — туга, як нацягнутыя струны, блізка празвінелі кулі. Услед за ім данёсся водгалас гарматнага стрэлу: стралялі недзе ў другім канцы мястэчка. Напэўна, у гарнізоне.

— Адыходзім, — загадаў Нагаеў, і чорныя, размытыя прыцемкам постаці, гразнучы і спатыкаючыся ў свежай раллі, рушылі да сцежкі, што вяла да кладкі і да блізкай наміткі лесу, дзе ўсіх павінна была чакаць фурманка.

— Мацней трымай гада, — кінуў Ігрунову Галаскок, ловячы падлетка за другую руку.

Але яна спрытна і лёгка выслізнула, і раптоўны ўдар пад калена левай нагі ўміг паваліў нягегла-вахлакаватага Галаскока на глеістакіслую раллю.

Яны двое, Нагаеў з Ігруновым, толькі паспелі згледзець, як падлетак апынуўся верхам на Галаскоку, стараючыся, мусіць, вырваць у яго з рук так патрэбны аўтамат.

Што рабіць, дагадаўся хіба Ігруноў. Ён скоранька падскочыў да распластанага Галаскока, на якім хрыпеў яшчэ слабаваты, але хітры падлетак, і, наступіўшы падлетку каленам на спіну, усадзіў руку між яго ног і з усяе моцы сціснуў за два цёплыя яечкі.

Нема войкаючы і ажно трацячы прытомнасць, падлетак скаціўся з Галаскока. Тады на яго наваліўся задыхана-раз’юшаны Галаскок.

Рукі яго ўжо самі пацягнуліся да хлапечага горла. Вастраваты кадык заварушыўся пад вялікім пальцам і з хрустам пайшоў уніз. Хлопец задушліва захроп.

У Галаскоку забушавала таемная, звар’яцелая радасць, што ён задушыць у гэтай глеістай раллі помслівага падлетка і ніхто не будзе ведаць пра яго, Галаскокава, завітанне на хутар і

ў мястэчка, як ніхто не дачуецца пра смерці, учыненыя ім.

Галаскок падняўся тады, калі пад ім аціх падлетак.

— Ты што, задушыў? — не паверыў яшчэ Нагаеў.

— Ды ўжо не падымецца, не пабяжыць у камендатуру, — абедзвюма рукамі Галаскок сціраў з сябе ліпкую гразь. — Ужо ўсё.

— Як усё? — перапытаў Ігруноў.

— Капцы яму, — Галаскок суха сплюнуў і задаволена пацёр яшчэ дрыготкія рукі.

Зноў прастукаў, цэлячыся ў сляпую бясконцасць ночы, нямецкі кулямёт. І змоўк.

Чуйная, шапоткая, як снег, цішыня аблягла на халодную асеннюю зямлю.

Надыходзіла ноч святога Галавасека.

*Мінск, 1989—1999*



# Ксёндз

На свеце змяняецца ўсё, калі не лічыць, што ўпарта нязменнымі і нязрушнымі застаюцца хіба турмы і ўрадавыя будынкі. Над іхнімі франтонамі перайначваюць свой колер толькі вывешаныя сцягі і ў рамачных партрэтах, увітых вянкамі калюча-зялёнай дзеразы, уваскрасаюць новыя абліччы фюрэраў.

І вось стаю пры ганку колішняй нямецкай управы, ці магістрата, як тады казалі, пазней, у пасляваенныя гады, — пасялковага сельсавета, а цяпер — адміністрацыі майго роднага мястэчка.

Абед. Усё адпаведна зачынена і замкнёна. І я прыкметна нервуюся: паспею адзначыць камандзіроўку да адыходу адзінага рэйсавага аўтобуса, што ідзе на Мінск, ці застануся нанач, каб

зрабіць гэта ўжо заўтра. Яшчэ адны пустыя і нясцерпна пакутныя суткі.

Нервуюцца і местачкоўцы, ці, як іх даўней называлі, — мяшчане, пад'язджаючы сюды, да белаватага, абкладзенага ўжо сілікатам, фацэтна і ганарыста ўзнятага будынка, на веласіпедах і матацыклах — гэта маладзейшыя, ці проста прыкульгваючы, абапіраючыся на палку — вядома, старэйшыя.

— Вы наконт дроў? — рэзка затармазіўшы, ажно зазвінеў званок за брамкаю, спыняецца і, ухапіўшыся рукою за частаколіну, пытае чарнявы мужчына гадоў пяцідзесяці.

— Не.

— А дровы яшчэ не выпісвалі? — смуглявы мужчына падгладжвае пад кепку кудзеркі ўпартых валасоў.

— Не ведаю.

— Значыць, вугалю дадуць, — суцяшае мяне веласіпедыст і, адапхнуўшыся рукою ад плота, скрыпуча націскае нагамі на педалі.

«Ці не сын Сямашкавай Броні?» — напружваю памяць і пазіраю яму ўслед. Даўней шырокая, а цяпер чамусьці павузелая, але гэтакая самая пясчаная вуліца з прыгорбленымі, ужо, напэўна, спарахнелымі дамамі, да якіх прыбудаваны касабокія, апоўзлыя веранды. Над імі хіляцца чорныя, патаўсцелыя ў камлях, стра-

катыя, кранутыя жаўцізною ліпы. Пад імі — кругамі чуйнае, шапаткое лісце.

Малады клёнік, што, помніцца, кожнае восені загараўся першым і першым сонечна свяціўся, ужо вышугаў у вялікае дрэва...

Але дзе ж той прыгожы ашалёваны дамок з цынкавым паласатым дахам — ксяндзоўская плябанія? Згарэў? Разабралі, куды-небудзь перавезлі? А там, дзе нас, малых, звабліваў малады ўраджайны садок з кармінна-чырвонымі, заўсёды спакуслівымі, рана паспелымі ранеткамі, самотна хіляцца адна да адное старыя яблыні, чорныя, як вадзяныя карчы. І воддаль ад іх бялее асадзісты будынак з нахіленаю шыльдаю — «Прадукты». Акурат там, дзе харашэў выфарбаваны, з жоўта-белымі аканіцамі, ксяндзоўскі дом, натужна гудзе, ажно, здаецца, чуваць тут, каля былога магістрата, падняты на слупах і абгароджаны дашчаным плоцікам высакавольтны трансфарматар.

У душы, як падстрэленая пташка, ападае адчай, і пякучая, гарачая збянтэжанасць сціскае сэрца.

Я заўсёды раблюся бездапаможным, губляюся і ніякавею перад тым, што адышло і патаемна, беззваротна знікла.

Двое мужчын, нэндзных і прыгорбленых, нападобе тых, што грабуцца ў гарадскіх кан-

тэйнерах са смеццем, прытрымліваючы ў адтапыраных кішэнях бутэлькі, як іншы раз іх называюць — паўтаракі, з саладжаваю ўсмешкаю на бяскроўна-адутлаватых тварах прыспешваюць да пусткі з чорнымі, разложыста-крывымі яблынямі. Прысядаюць, падымаюць пераспелыя апады ў збэрсанай траве і ідуць да гузаватага пня, наўкруга якога стаяць прынесеныя з таго ж магазіна тры блакітныя пластмасавыя скрынкі. Садзяцца на іх. І, знайшоўшы тут, каля скрыняў, хрусткія пластыкавыя шклянкі з-пад ёгурту ці смятаны, ставяць іх поруч з зялёна-цёмнымі паўтаракамі на чорны і шырокі, як патэльня, круг тоўстага пня — даўнейшай спілаванай яблыні альбо грушы. І «стол» у выглядзе пня з сіняватымі на ім бутэлькамі і лабатымі ружовымі яблыкамі нагадвае ўжо нацюрморт у стылі Ван-Гога. Адзін з мужчынаў, у якога абпалена ці парэзана вуха, выглядае падобным да знакамітага мастака.

Нарэшце я скупа ўсміхаюся, узрадаваўшыся сваёй знаходцы і параўнанню.

А бутэлькі і пластыкавыя шклянкі з-пад ёгурту, убачаныя на пні, уваскрашаюць у маёй памяці прыгожую крышталёва-срэбную шклянку, увітую разьбянымі кветачкамі і лісцем, што стаяла тут, у магістраце, на карычневым выштукаваным століку каля акна, прыцемненага

цяжкаю цёмна-зялёнаю гардзінаю. На белай, выгафтаванай сурвэтцы ўзвышаўся дзюбаносы сіфон, поўны гэтай самай шыпучай, тады яшчэ нязнанай вады-газіроўкі...

Вайна для нас, падлеткаў, была не толькі страшнаю, але і незабыўна цікаваю і незвычайнаю. Наўкруга, у прышашэйных канавах, палохала і заманліва хвалявала шарэнга ўпокат складзеных чырвоных перыстых мінаў, горбы залацістых узрывальнікаў, парцяных сумак з смярдзючымі гумовымі супрацьгазамі, папяровых пакетаў з патронамі, кінутых вінтовак з найбольш адбітымі, зламанымі прыкладамі, агідных, як зялёныя чарапахі, гранат-лімонак.

Але цікава было не толькі кінуць у агонь залацісты ўзрывальнік, які да вугольчыка, як шуфлем, счышчаў усё вогнішча, ці ўсадзіць у ваду вінтоўку з адбітым прыкладам і стрэліць, дастаўшы з рэчкі ўжо кароткі, без рулі, зломак.

Страшна зманліва і спакусліва было гуляць у сапраўдную вайну, ганарыста хадзіць перад носам у самое смерці. Ад радасці і боязі ажно займала дух, калі ты, падкраўшыся да адчыненага акна ў ортскамендатуры, у таго сухарлявага афіцэра з срэбнымі вітымі пагонамі мог схапіць з падваконніка якую-небудзь дробязь, напрыклад пляшку з воскам і цвёрдым кнотам,

каб запаліць яе дома, бо газы не было, альбо сцібрыць пачак цыгарэт з прыгожымі залацістымі ільвамі, каб разам у грамадзе раскурыць слабыя, як націна, цыгарэткі...

Альбо тут, у магістраце, які вартаваў немалады ўжо, нават сіваваты мужчына з адною трохі каротшаю нагою, што хадзіў неяк перавальваючыся на адзін бок. Выбраўшы момант, калі ён адлучаўся з магістрата і надоўга знікаў у дашчанай прыбіральні з ганарыста задзёртым дахам і выпілаванымі сэрцайкамі ў абодвух дзвярах, мы ўміг вока, як касяк малькоў на плыткім плёсе, шугалі сюды, у магістрат. Напярэймы адзін аднаму ўрываліся ў кабінет з масіўным сталом, удэкараваным зялёным сукном, на якім, нібы касцельная вежа, уздымаўся белы тэлефон з нікеліраванымі відэльцамі. На іх, як у спартсмена з цырку, які ляжаў на спіне і пакручваў нагамі другога, умясцілася галаватая слухаўка. Але найперш мы рваліся да сіфона з шыпучаю вадою, апякаючы рот і душу незнаёмым смакам.

Аднак шыпуча-даўкай, пякучай газіроўкі мы пакаштавалі не больш як разы са два, покуль нехта не зняў слухаўку і, па-дурному крыўляючыся, не загалёкаў у тэлефон. І невядома адкуль узяўся паліцыянт, напэўна, прыбег з блізкае пошты, пакліканы ці выпраўлены

ў магістрат тэлефаністкаю. І мы не ўсе, але недзе цераз аднаго пакаштавалі ўжо чорнай гумы. Даўуганогі, вусаты здаравіла з сіпатым голасам, у чорнай форме з сівымі закарвашамі і каўняром і даўгадзюбай шапцы, стаўшы ў парозе, сек нас няшчадна. Мяне, меншага, ён нібы пашкадаваў. Але тыя, каго гума злавіла і па-вужынаму лягла на плечы, доўга насілі памятныя жаўтлява-фіялетавыя пісягі.

Прыгадаўся і старшыня ўправы, рослы мужчына ў шарым капелюшы, рыпучай карычневай скуранцы і з эспаньёлкаю — вузкаю бародкаю на нерухома злосным твары. Помніцца нават яго зусім не шляхетнае, што ніяк не пасавала да шыракаполага капелюша і рыпучай скуранкі, прозвішча — Чабоцька. Ён неяк нечакана прапаў, арыштаваны немцамі за сувязь з акоўцамі, і заміж яго з’явіўся праставаты, у пацёртым касцюмчыку вясковы дзядзька Жалязоўскі ці Жалязніцкі, былы дырэктар пачатковай, спаленай ужо партызанамі беларускай школкі.

У нас, у мястэчку, была тады сямігодка. Аднак далей чацвёртага класа ніхто не хадзіў — старшакласнікі пабойваліся вывазу ў Нямеччыну.

Толькі ў нашым трэцім да нейкай пары яшчэ сядзела на задняй лаўцы пераростая, гадоў чатырнаццаці ці пятнаццаці, чарнява-валаво-

кая, падобная да яўрэйкі, Сямашкава Броня. Скоса пазіраючы на заднюю лаўку, у класе шапталіся дзўчаткі, што Броню пасылае ў школу ксёндз і што на святы, калі працэсія ідзе наўкруга касцёла, Броня, адзетая ў бела-ружовы вуаль, не толькі сыпле з прыгожага плецёнага кошычка ксяндзу пад ногі папяровыя ці жывыя кветкі, а днюе і начуе ў яго плябаніі.

Але Броня як нечакана з'явілася ў нашым класе, так нечакана і знікла. «Радзіць будзя», — чырванелі ад сораму і пырскалі з'едлівым, калючым смяшком дзяўчаткі, падымаючы над ружовымі вушамі заплеценыя коскі.

Праўда, праз колькі месяцаў на тутэйшай пясчанай вуліцы я ўбачыў блакітную каляску і зблажэлую, бяскроўную ў твары Броню. Каптурок у калясцы быў дбайна завешаны лёгкаю, нібы шоўкаваю полачкаю. Броня, згледзеўшы мяне, усё ж сарамяжа адвярнулася.

Ішоў ці, дакладней, толькі пачынаўся чацвёрты год вайны, было светлае прадвесне, калі акрыялі і заварушыліся, нібы мурашкі, і пачалі дапякаць немцаў увішныя партызаны: гарэлі і ўзрываліся то склады пры чыгуначнай станцыі, то вагоны. Тады немцы сталі чужацца ўсіх і ўсіх падазраваць, нават дзяцей, у тэрактах.

Але мы асцерагаліся не старых, гультаявата-

абыякавых тодаўцаў, што адбудоўвалі спалены тартак, а параненых на фронце танкістаў у чорнай уніформе, ганарыста-баявітых лётчыкаў у адзежы колеру марской хвалі, нарэшце — жандараў у салатавым убранстве. Словам, усіх, хто ачуньваў, ішоў на папраўку ў вайсковым шпіталі, што размясціўся ў даваенным туберкулёзным санаторыі, адзіным у мястэчку чатырохпавярховым будынку. Яны, трохі асалавелыя ад кілішка рому ці бенедыкціну, чапляліся да дзяўчат, а нас, падлеткаў, вылоўлівалі, як дыверсантаў,ператрасаючы кішэні і сумкі з адзінока-сумным падручнікам і двума-трыма сшыткамі. Шукалі, вядома ж, міну ці зброю. А можа іх насцярожвалі нашыя пілоткі, згубленыя пры адступленні рускімі байцамі і падабраныя намі дзе-небудзь у жыце, ці чорныя, з гузамі-падушачкамі, шлемы савецкіх танкістаў, якія насілі мы. У мяне заміж самаробнай торбы, пашытай з дзяружкі ці палатнянай полкі, па сцягне біла парцяная, колеру хакі, сумка ад выкінутай і парэзанай на рагатку супрацьгазавай маскі.

Пры немцах мы, дзеці, хадзілі ў рускіх пілотках і перашытых збольшага гімнасцёрках, пры рускіх — у нямецкіх шыпаватых ботах і зеленкаватых, таксама пераліцаваных мундзірах.

Мо таму, убачыўшы рускую вайсковую фор-

му, п’янаватыя нямецкія танкісты ці лётчыкі, пасінелыя ад помсты і злосці, пачыналі страляць над нашымі галовамі з кароценькіх чорнавугальных вальтэраў і падбягалі да нас.

І вось тут, недалёка ад магістрата, якраз насупраць цяперашняга прадуктовага магазіна, двое п’янаватых афіцэраў у салатавай форме і ганарыста ўзнятых фуражках запынілі Сямашкаву Броню. Я падышоў якраз тады, калі рука аднаго з іх, даўгашыяга, у акулярах, вылузалася з чорнай скураной пальчаткі і пашылася ў кішэню, выцягнуўшы адтуль некалькі загорнутых у ружаватую паперку, мусіць, танных ледзянцовых цукерак.

Што сказаў немец, я не дачуў. Я толькі разабраў, як аднеквалася Броня:

— Ой, што вы, што вы!

Другі, прыгнуўшыся, зазіраў пад узняты дашак дзіцячай каляскі. Раптам агідна зморшчыўся, адвярнуўся, як ад чаго смуроднага, і істэрычна, тонкім фальцэтам ускрыкнуў:

— Юда! Kleiner jude! Малы юда!

Я толькі цяпер сам заўважыў і падумаў пра тое, што Броня з кучараваю чорнаю галавою і лупаценькімі вачыма была падобная да жыдовачкі. Мусіць, да яе было падобнае дзіця, што ляжала ў калясцы. Даўгашыі, у акулярах, афіцэр, што частаваў Броню таннымі цукеркамі,

імгненна расшпіліў кабуру і выцягнуў кароценькі, нібы без рулі, пісталет. І чорны, як сажа. Як цяпер здагадваюся, гэта, напэўна, быў вальтэр.

— Sich legen! Легчы!

Пад нагамі ў мяне топкім багнішчам загайдалася зямля. Я спыніўся і схаладзеў, чакаючы нечага страшнага.

Збялелая Броня, абхапіўшы распасцёртымі рукамі блакітную каляску, бездапаможна, нібы беспрытомная ужо, прыкленчыла пры ёй.

За мною нехта цяжка і густа засоп. Я азірнуўся: перапалохана курчылася наша суседка Леакадзія, паўнявая і даволі прыгожая маладзіца, з бялявым тварам, абсыпаным, як у анёлка, залацістымі кудзеркамі. Трымаючы аберуч на ўзроўні цяжкаватых грудзей шары фанерны чамаданчык, яна як бы закрывалася ім. Гэта быў той самы пакоўны чамаданчык, які на местачковай таўкучцы так спрытна адчыняўся, паказваючы ў глыбі сябе танныя, але і слабенькія цыгарэткі, дарагія, удушлівыя цыгары, смярдзючыя брускі дрожджаў, беласнежную драбнату таблетак сахарыны, і гэтак імгненна зачыняўся, калі пачыналася паліцэйская аблава.

— Aufschtehen! Устаць! — чорны, як сажа, пісталет ткнуўся ледзьве не ў самы Бронін

твар.

— Што ж гэта яны, недавяркі, да маладзіцы маюць? — да мяне данёсся атрутна-задушлівы пах накуранай Леакадзіі.

— Laufen! Бегчы! — левая рука жандара растапыранымі ўчэпістымі пальцамі схапіла за плячук шарага жакеціка, і ён, жакецік, не вытрымаў — разарваўся, паказваючы паджоўклую вату.

— Пан Яблонскі! Пане, ратуйце маладзіцу! Вы ж ведаеце па-нямецку, — бездапаможна, неяк па-хаўтурнаму залямантавала Леакадзія, заўважыўшы па другі бок вуліцы рослага, з падбрытымі вусікамі, ружовашчокага арганістага з нашага парафіяльнага касцёла. Не ў прыклад усім местачковым мужчынам ён хадзіў без кепкі, паблісваючы чорнаю, напамаджанаю брыялінам і акуратна — на прабор — як у галівудскага актора, зачэсанаю цёмна-русаю галавою.

— Laufen! — голас нямецкага афіцэра пачаў злосна зрывацца.

— Што гэта ён кажа? — папярхнулася тытунёвым дымам, закурыўшы новую цыгарэтку, сытая, з анёлкавым, нібы дзіцячым тварам, бавітая на таўкучцы, а тут чамусьці зніякавелая Леакадзія.

— Кажа, каб бегла, — падказаў я, бачачы,

як афіцэр падпіхае ў плечы нерухома-змярцвелую Броню.

— Маўчы, ты ўжо знаешся, — трасянула сваімі белымі кудзеркамі Леакадзія.

Другі немец, трохі адышоўшыся, абыякава і маўкліва цікаваў за ўсім. Пэўна ж, бачыў, як шалеў ад злосці яго таварыш, але ні адгаворваў, ні перапыняў яго.

— Пане Яблонскі! — Леакадзія падняла руку, дзе ў двух адтапыраных пальцах дыміла кругленькая нямецкая цыгарэтка.

Спатажаны і гэтым зазыўным крыкам і ўжо ўбачанаю сцэнкаю, арганісты нечакана перастаў размахваць шырокімі калошамі штаноў — запаволіў крок.

— Пане, вы ж ведаеце па-нямецку, — зноў бездапаможна зяхнула і задыхнулася Леакадзія.

Яблонскі асцярожна і чуйна, як успуджаны заяц, ледзьве не прысеў. Прыгледзеўся, каб пераканацца дакладна, што там, наперадзе, робіцца, і неяк бокам, як ходзяць па вузкай кладцы, памалу пачаў адступацца назад. Спатыкнуўся аб горб вытыркнутага з зямлі каменя, калупнуў яго лапацістым наском карычневага туфля і, сутулячы ад страху шырокую спіну ў балонкавым пінжаку, прыспешыў крок, схаваўся за блізкім рогам высокага плота.

— Па ксяндза трэба бегчы. Па ксяндза! —

Леакадзія лёгка падкінула пад паху фанерны чамаданчык, абвіла яго белаю поўнаю рукою, на якой ажно хавалася вострая костачка локця. — Я падышла б да іх сама, але пад ліхату і мяне застрэляць, ці благое што ўчыняць. Яны ж п'яныя. Набраліся, як мурза гароху. — Яна крутнулася на сваіх чорных, лакіраваных, з замшавымі дзюбкамі, цяпер даношаных, а некалі, пэўна, дарагіх туфлях. — Трэба клікаць ксяндза. Дзіця ж яго. Яна, Броня, яму...

Але выратаваў Броню і дзіця не ксёндз, а дурнаваты Васіль, што выпадкова, як і ўсе мы, надарыўся тут. Замурзаны, нямыты, у вайсковай фуражцы з малінавым аколышам, але без брыля, у вайсковых галіфэ з незавязанымі матузкамі — усё знятае ці не з забітага байца, — Васіль раптам выскачыў з-за плота і, наблізіўшыся да афіцэраў, голасна, трохі гаркава прагудзеў:

— У-у, немчура!

Не думаю, што ў гэтым гаркавым выгуку афіцэры маглі ўлавіць нешта зняважлівае, але перад імі прабег нягеглы і падазрона дурнаваты, прыбраны ва ўсё рускае вайсковае, і што, можа, ён — пад выглядам хворага падасланы партызан, напэўна западозрылі. Бо тут жа пачулася кароткае, як стрэл:

— Halt! Стой!

Васіль таксама, мусіць, ведаў гэта нямецкае страхатлівае слова, бо тут жа даў у ногі. Я бачыў, як замільгалі яго ружаватыя пяты. Яны і паддалі нямецкім афіцэрам раз'юшанай злосці. Афіцэры ўскрыкнулі ўжо разам ад дзіва і нечаканай разгубленасці. Яны рвануліся ўслед за Васілём, забыўшыся пра «юдэн кляйн» і яго лупаваценькую маці. «Дагнаць і застрэліць» — вось што ўжо зваблівала іх. І мне помняцца іхнія боты з granёнымі шыпамі на падэшвах і блішчастымі жалезнымі падкоўкамі на абцасах. А можа, гэта не іхнія, не афіцэраў, а радавых нямецкіх салдатаў. Можа, мне помняцца боты, якія насіў сам, знятыя з двух забітых нямецкіх салдатаў — адзін большы, з шырокаю ўверсе халяваю, другі — меншы. Як яны іскрыста і шыпуча рэзалі лёд... А тады гэтакія боты нясліся ўпагон за нямым, малахольным Васілём. У той дзень на мястэчковай, як і цяпер, пясчанай вуліцы я стаяў босы, чуючы цяпло мяккага, як попел, перацёртага пяску. А Васіль, прыгнуўшыся, матляючы доўгімі рукамі, напорыста бег. І, неразважны, неразумны дзівак, якраз сярэдзінаю вуліцы.

Я ажно прысеў і зажмурыўся ад страху, бачачы, як даўгашыі, у акулярах, афіцэр прыкленчыў і на ўскінутую левую руку паклаў свой кароткі чорны вальтэр. Не вельмі гучны стрэл

падняў толькі з блізкага куста бэзу маладых шчабятлівых вераб'ёў, што спуджана разляцеліся ў розныя бакі, а Васіля пакінуў жывым. Тады выстраліў другі, і Васіль трохі пахіснуўся. З галавы ў яго зляцела і, робячы круг, упала сярод вуліцы ў сухі, шары пясок круглая, без брыля, фуражка з малінавым аколышам. А трэці стрэл нібы пранізаў маё сэрца — Васіль падае. Прыглядаюся лепш — не. Гэта ён заварочвае ў завулак, ажно сустрэчны вецер задзірае стрэшкаю яго рыжавата-сонечныя валасы.

«Уцёк», — з палёгкаю ўздыхаю я. Але нямецкія афіцэры, нібы не верачы, яшчэ бягуць упагон.

Беражонага, як кажуць, Бог беражэ. Але і неразважнага, хворага на галаў Васіля, што не вельмі бярогся, асцерагаў таксама. І не толькі тут, на пясчанай мястэчковай вуліцы, але і ў нязнанай, чужой для яго Нямеччыне. Бярог праз усю вайну, каб вярнуць дадому дагледжанага, у новым касцюмчыку, які ў родным мястэчку неўзабаве абнасіўся, сцёрся, і Васіль у ім стаў тым самым знаёмым, нямытым, недагледжаным, малахольным Васілём. А сталася тое, што нехта з мястэчковай управы выкрасліў са спіса прозвішча свайго знаёмага ці падкупленага і ў таварным цягніку, які стаяў

недалёка ад вакзала, у карычневым вагоне апынуўся ён, хворы на голаў Васіль Таўкун. Мне прыгадваецца, як яго маці, рослая, худая, касцістая кабета з касаватым вокам, што ўсё бліскала вялікім бялком, стаяла зводдаль закрытых вагонаў з белым клуначкам у руцэ — падаянкаю, як кажуць у нас, і ніяк праз варту злосных і няўмольных паліцыянтаў не магла прабіцца да вагона.

Выратаваны Васілём хлопчык, што ляжаў у калясцы, благаславёна і шчасліва рос — Броню з дзіцем ці то за пакаёўку, наймічку, ці, праўдзівей, каханку забраў да сябе Яблонскі, той самы арганісты з местачковага касцёла. А ксёндз, як закрылі касцёл, зрабіўшы там склад солі, пераехаў у Польшчу. Яблонскі тады пры сваім доме, адкрыўшы малітоўню, прытуліў вернікаў, асабліва старых адзінокіх бабулек, што даверылі яму не толькі душу, але і прыхаваныя на чорны дзень, на смерць дробныя залатнікі. Колькі іх сабраў Яблонскі — невядома, але нехта ў знакамітую пару барацьбы з валютчыкамі падказаў. Забраўшы тыя залатнікі, Яблонскага, вядома ж, судзілі, і там, у турме, ён нібы звёўся...

Ціха паходжваю ўздоўж нізкага плоціка, што падпірае навіслыя, яшчэ не асыпаныя кусты акацыі. Нада мною суха шапоча высокі, як

вулканічны фантан, стары шурпаты сохарань. Вецер, што пачынае ўсходжвацца, прадказваючы змену надвор'я і дождж, сыпле, рве на дрэве пажухлае лісце. Сохараня, дарэчы, я не помню, помню толькі крывую нахіленую, як неапалітанскую, ружовую сасну. Я туліўся за яе, калі рослы, сіпаты паліцыянт няшчадна сек гумаю старэйшых хлопцаў, выпусціўшы з магістрата толькі мяне.

Аднак ужо шчоўкае замок. На цэментовых прыступках стаіць прывабна-спакуслівая, стройная маладзіца.

Я ўслед за ёю ўваходжу ў былы магістрат, а цяпер адміністрацыю мястэчка. Той самы калідорчык з дзвюма бела-ружовымі грубкамі. Дзверы, якія адчыняю, папярэдне пастукаўшыся, здаецца, таксама тыя ж. За імі — ніжэйшы і нашмат паменшалы кабінет. Вялікага стала з зялёным сукном і белым тэлефонным апаратам, на нікеляванай вілцы якога ляжала галаватая слухаўка, таксама няма, як няма і круглага століка з вышыванай сурвэткай, на якой стаяў дзюбаты сіфон і разьбяная крышталёвая шклянка.

Сталы два: адзін пры акне, заслоненым малочнымі палоскамі модных цяпер вертыкальных жалюзі, з бэжавым камп'ютэрам на ім, другі — напроці дзвярэй, са стосам папак, настольнаю, як нага коніка, востраю ў каленцы

лямпаю і... бялявай, кучарава-прыгожаю галоўкаю пад ёй.

Кучаравая галоўка падымаецца, і варушацца спакусліва поўныя губкі:

— Не, вугаль мы яшчэ не выпісваем.

Я ўсміхаюся і дастаю з нагруднае кішэні камандзіровачны бланк:

— У мяне іншая да вас справа.

— Ой, я ж пераблытала вас Бог ведае з кім.

— Бывае... Я таксама аднаго, што круціўся тут на веласіпедзе, таксама пераблытаў... Дарэчы, ён і напытваў пра вугаль і дровы.

— Гэта, мусіць, ксёндз, як мы кажам, — пухлыя губкі хукаюць на пячатку, і на адвароце бланка застаюцца два фіялетавыя кружкі.

— Ксёндз, кажаце?..

— Ну, гэта мы смяёмся. Бацька ў яго быў ксёндз. А мо выдумляюць.

— А маці яго жыве?

— Ды хіба вы яе знаеце? Ой, нагаварыла я тут... — чырванее і сарамяжа хавае свае шарыя вялікія вочы мілавідная сакратарка. А потым, перавярнуўшы мой камандзіровачны бланк, нарэшце чытае, хто і адкуль я. — А прозвішча ў вас, як нашае.

— Скажэце, а вы часам не дачка Леакадзіі? — нарэшце смялею і пытаюся я.

— Бабуля ў мяне была Леакадзія. А што? —

На мяне зноў падымаюцца вялікія шарыя вочы. І на адным з іх я бачу трохі нібы ўсечаную зрэнку. Як помніцца, такая зрэнка была ў нашай местачковай гандляркі Леакадзіі Чарток.

— Паўміралі нашыя бабулі. І ўсе на рак хварэлі. Пад намі знайшлі радон, а ён, кажуць, радыеактыўны. Аблучае. Але санаторыю будуюць, вялікую — на тысячу семсот месцаў. Гоняцца за грашыма, а што ім рак.

— А вы мне пра ксяндзову маці, — перабіваю сакратарку, — так нічога і не сказалі: жыве ці не?

— Гады чатыры назад, як памерла. Адмучылася, застаўшыся без ног. Не глядзеў яе гэты арганісты. Кіне адну, хворую, у хаце, а сам — то на пахаванне, то на малебны.

— А ён, арганісты, як?

— Ого, які спраўны дзед. Касцёл адваяваў, а цяпер на хорах так іграе, ажно касцёл разлягаецца.

— Хіба ўцалеў там арган?

— Ёніку купіў.

Дзверы прыадчыняюцца, і ў кабінет зазірае мужчына ў пляскатай кепачцы. Ён — «ксёндз». Сакратарка нагінае галаў у бела-залацістых, як у баранчыка, кудзерках, і чуваць, як яна нястрымана пырскае смяшком. І мае вусны торгае нечаканая ўхмылка. Я згортваю і

хаваю ў пацёрты, яшчэ не абмяняны пашпарт камандзіровачны бланк.

У калідоры размінаюся з чарнявым, прыкметна пасівелым на скронях мужчынам. І нават пачынаю сумнявацца, што менавіта ён, ужо абсыпаны срэбрам на скронях, ляжаў у блакітнай калясцы недалёка адсюль, ад даўнейшага магістрата альбо цяперашняга будынка адміністрацыі, і яго, як і яго маці, нечакана выратаваў ад смерці, трапіўшы пад кулі, хворы на галаў Васіль...

Нарэшце, як з глыбокага віру, выплываю на сонечна-мройны, успенены ветрам дзень. На душы бруіцца, кіпіць незразумелае, дваістае пачуццё: як радасна, як шчасліва, што таго страшнага і даўняга няма, і як шкода, і як тужліва, што няма і болей не будзе мае светлае пары — майго ужо забытага дзяцінства.

*9—10 кастрычніка 1999 года*



# Нязрушаны камень

Дадому на адведзіны, ці мо праўдзівей будзе, — на развітанне, Сымон Чачотка прыехаў з невялікага, калісьці нямецкага, а цяпер польскага курортнага гарадка на беразе Балтыйскага мора, заселенага найбольш кашубамі, дзе ён асталяваўся пасля вайны. Не, спачатку быў хутар і неблагі: дзесяць гектараў урадлівае зямлі, цагляны дом з раскошным падвалам і светлаю мансардаю, хлеў, таксама мураваны, з двума бельгійскімі цягавітымі коньмі, палявым валом і трыма пярэстымі, як усе галанкі, дойнымі каровамі. І вядома — падпаветка, застаўленая спружыноўкамі, баронамі, плугамі і двума вазамі, тымі, нямецкімі, з ручным тормазам. Не хапала толькі вазка ці санак, але пры тамтэйшай маласнежнай зіме яны ці патрэбныя былі.

Былую нямецкую асаду выдалі Сымону Чачотку як удзельніку вайны і добраахвотніку войска польскага. Ён, беларус, родам з-пад Нарачы, набожны католік, лічыў сябе трохі палякам, і калі ўлетку сорак чацвёртага прыйшлі зноў, як на іх казалі, другія Саветы, Чачотка з'явіўся ў райваенкамат на зборны пункт і заявіў, што ён паляк і хоча служыць у польскім войску. Вайну Чачотка скончыў у Судэтах, на тэрыторыі Чэхіі. Яму, рупліваму і спраўнаму гаспадару, які прывык да ўласнага кавалка зямлі, варочацца дадому, дзе паціху пагаворвалі ўжо пра калгасы, вядома, не хацелася. І ён, як за саломінку, хапіўся за дагледжаны і багаты нямецкі надзел. Нават напісаў жонцы, каб кідала свой малы хутар з чатырма гектарамі неўрадлівай пясчугі, забірала дзяцей і ехала да яго. Але ж Алена, упартая і непаслушная, як гаворыцца, з мухамі ў носе, ехаць да яго ў Польшчу наадрэз адмовілася. Яны так і жылі: ён, адзінокі, на нямецкім хутары, яна з дзецьмі — на сваім, нарачанскім.

І, пэўна, Алена мела розум, што засталася дома, бо і сам Сымон неўзабаве мусіў уцякаць з таго багатага хутара з усім спраўным інвентаром у падпаветцы і сытым быдлам у аборы. Кожнае ночы каля будынкаў хутара пачалі блукаць невядомыя людзі, сцішком пастрэльваць.

І калі выбілі сям'ю — жонку, двое дзяцей і гаспадара, які, як і Сымон, быў добраахвотнікам і гэтаксама атрымаў суседні хутар, высьнілася, што гэта былі немцы, выселеныя з сваіх уласных дамоў. Іх адпраўлялі далей, углыб Нямеччыны.

Сымон Чачотка памеркаваў, трохі памуляўся, але, паехаўшы ў павет, хутар здаў. Балазе ў прыбалтыйскім мястэчку на зернескладзе было месца кладаўшчыка: пра гэта пісаў яму яго знаёмы, таксама беларус, з якім Сымон служыў у адным сапёрным узводзе.

Гады са два Сымон Чачотка пажыў нібы ўдаўцом пры жывой жонцы, покуль нарэшце не агледзеў ніц сабе маладзіцу, удаву з дзіцем, што прыехала сюды з Украіны. Алена была зласнаватая і помслівая, з крутым норавам — да двух не гавары, а гэтая, хахлуха, аказалася яшчэ наравісцей. Аднак разводзіцца Сымон не стаў — не тыя гады, каб шукаць новую жонку. Ды за трэцім разам невядома на якую яшчэ натрапіш. Жончына злосць і круты нораў ішлі, можа, ад хваробы, бо неўзабаве ў яе знайшлі рак. А лячылі, не збадаўшы як належыць, ад сухотаў, ад туберкулёзу. Аднак жа ў лёгкіх аказаўся рак. Праз тры месяцы яна счахла. Сымон застаўся ўдаўцом пры жывой першай жонцы. Але і яе пераўжыў. Як напісала яму старэй-

шая дачка, Алена, едучы на возе саломы, на пераездзе, калі воз затрасло, саслізгнула з яго, упаўшы якраз спіною на рэйку. Адбіла ўсё ў сярэдзіне і праз колькі дзён у вялікіх муках скапала.

Цяпер можна было наведаць радзімую старану, бо сустракацца з Аленаю, глядзець ёй у вочы Сымон чамусьці саромеўся.

Яму бралася пад восемдзесят, і покуль засталіся такія-сякія сілы, можна было зірнуць на ўнукаў і на сваю вёску, якую не раз бачыў у снах, прайсці родным полем, пастаяць на кладцы над чыстаю з залаціста-пясчаным дном рэчачкаю, дзе ён малым уваліўся ў бухту і ледзь не ўтапіўся, альбо завітаць на той равок, дзе пад кустамі навіслага арэшніку ён качаў курносую з маладымі гладкімі сцёгнамі сваю Алену...

Сымон быў напісаў дачцы, якая ўжо, выйшаўшы замуж, жыла ў вёсцы, у новай хаце, а старую, хутаранскую, разабрала на хлеў, — што ён нарэшце маецца прыехаць у адведкі.

Малодшая дачка апынулася ажно ў Эстоніі. Завербавалася ці што і рабіла там на ткацкай фабрыцы. Ён быў нават напісаў ёй колькі слоў, але на пісьмо яна не адгукнулася. Можа, мела крыўду на яго за мацеру.

Дарослых дачок, як старэйшую, так і мала-

дзейшую, ён бачыў толькі на фатаграфіі. Здаецца, яны былі падобныя да Алены, курносенькія, харошыя з твару. Губкі пухлаватыя і ямачкі на шчоках, як у Алены.

Старэйшая, як аказалася, была прывабліваю не толькі на фотакартцы, але і на яве, у жыцці. А вось мужык з чорнымі, што зрасліся на пераноссі, густымі бровамі, насуплены, як вупыр, негаваркі ды ростам невялікі, штосьці не спадабаўся Сымону Чачотку. Можа ад таго, што і Данінага мужыка ён хацеў убачыць гэтакім прыгожым, як яго дачка. А ўнукі — рослы, шыракаплечы хлопец і танюткая, як лазіна, дзяўчына — мелі від. Дзякуй Богу і за гэта.

У першую ноч пасля шчодрага частавання — Сымон у чарку не зазірае даўно — ён дачцы спаць не даў. Яна сядзела на табурэце пры яго ложку і, склаўшы рукі на каленях, пераказвала яму, хто жывы, хто памёр, а Сымон усё распытваў. Зяць з унучкаю храплі за квяцістаю занавескаю ў спальні, а яны з дачкою перабіралі і тутэйшае жыццё, і тутэйшых людзей. Сымона Чачотку цікавіла, вядома, старэйшае пакаленне, яго равеснікі, з кім таварышкаваў, з кім хадзіў нават у суседнія вёскі на вечарынкі ды вяселлі, бо маладзейшых, што нараслі за сорак гадоў, ён ужо не ведаў. А старэйшыя, нібы стаўшы ў калейку, адзін за адным

адышлі. Той упаў у баразне, ідучы за плугам, калі садзілі бульбу, той, зламаўшы нагу, памёр у бальніцы. А найблізшы яго таварыш, ціхі, лагодны Захар Дабрыян, пасварыўшыся з жонкаю, нагле скончыў жыццё — павесіўся на гарышчы.

— Што ты кажаш, дачка?

— Ды дзён два правісеў там.

— Во як бывае, — жахаўся Сымон.

— Такога не прыдумаеш, як здарыцца, — згаджалася дачка.

— А Тэкля Захарава хоць жыве?

— Жыве, — ужо са спальні, пазяхаючы, адказала дачка. — Яшчэ нагрузіць поўную каляску яблыкаў, то адно шаша грыміць, як яна імчыць на торг у мястэчка.

— А дзеці Захаравы як?

— Гультаі. Разбэсціліся, распіліся. Абое з'ездзілі недзе ў Расію на заработкі і прывезлі адтуль апухлых ад перапою маладзіц. Адна была тут, у саўгасе, даяркаю рабіла. Толькі так і вытрывае да палучкі, а як палучка ў рукі, то і паляцела ў мястэчка па віно. Тыдзень гульба. Меншы, праўда, жыве спраўней. Машыну мае.

— Во бачыш, у бацьку не ўдаліся. А ён жа акуратны гаспадар быў. Але, як гаворыцца, свет той, ды людзі не тыя.

Пра таварышаў, з кім вадзіў дружбу, Сымон Чачотка распытаў, толькі пра найбольшага свайго ворага Апанаса Жамойдзіка ні паўсловам не абмовіўся. Не хацелася ведаць і чуць, жыве ён ці памёр, не хацелася варушыць, уздымаць на вілы ўсё благое. І паўтарыў сваё:

— Свет той, а можа на ім лепшыя людзі нараслі.

— Дзе вы бачылі, тата, гэтакае шаленства цяпер. А ў вас тамака як? — спытала праз занавеску дачка.

Сымон, не спяшаючыся, трохі сіпаватым сваім голасам расказаў пра сябе, пра кашубскае мястэчка і пра жончынага сына, свайго пасынка, што таксама недзе цягаецца па завуголлі. Вучыцца ленаваўся. Аб'ездзіў усю Польшчу, сышоўся з гэтакімі валацугамі, як сам, і пачаў красці самаходы. Колькі чалавек злавілі, а рэшта ўцякла. Ужо не раз да Сымона прыязджалі паліцыянты, распытвалі, дзе можа быць Тадак.

— Але час і спаць. Другая гадзіна ўжо, — сказаў ён, зірнуўшы на гадзіннік, што свяціўся ў змроку зялёнымі стрэлкамі і кропкамі. Гадзіннік быў японскі і заводзіўся ад узмаху рукі, а паляжыць нерухома — спыніцца, таму Сымон не здымаў яго нанач, спаў з ім.

Прачнуўся ён ад тупату ног і шоргату па-

тэльні на прыпеку. Шыпела яечня, і пахла выхаджанымі пухкімі аладкамі. За сталом сядзеў, чакаючы Сымона, насуплены, як сыч, яго зяць. Адолік, як называла яго дачка. Для блізіру стаяла запацелая, дастаная з халадзільніка бутэлька. Але Сымон толькі памачыў губы. Выйшаў з хаты і, каб ні з кім не страчацца, наўпроста чужымі гародамі спусціўся да рэчкі, як помніў, туды, дзе даўней пры тоўстых алешынах ляжала кладка. Але і знаку не засталося, што некалі сюды бегла сцежка, што тут раслі алешыны і да іх былі прывязаныя дзве гонкія сасновыя жэрдкі. Сымон нават падумаў, што абмыліўся, і пайшоў уздоўж чыстай, з пясчаным дном рэчкі, атуленай абапал маладым алешнікам — старэйшыя і таўсцейшыя дрэвы павысякалі. Пры беразе ружавелі толькі нізкія пні. Крыўда апякала сэрца, што няма тых шурпатых чорных алешынаў, на якіх клалі свае раз’еханыя гнёзды дзяркатыя вароны, што кралі пры гародах малых куранят. Залаціста-ліловая стужка вады ў рэчцы, якая бруілася пад карчамі, была, здаецца, тая ж самая, толькі наўкруга ўсё выдавала новым і незнаёмым.
І вёска на грудку з аднастайна сіваватымі шыфернымі дахамі, і раўчучок, дзе некалі сачылася ў рэчку крынічка, а цяпер густа зарос сніткаю і крапівою. Шарэнга зялёнастволых, са

срэбным лісцем явараў берагла ад сівернага ветру нечы двор. За імі на грудку бялеў блочны гараж з жалезнымі, на дзве палавіны, дзвярыма, а за ім ганарыста ўзвышалася жоўтая ад покасту, ашалёваная пад елачку новая хата.

«Чыя ж гэта? — абмінуўшы равок, заглушаны сніткаю і крапівою, Сымон Чачотка на міг спыніўся. — Няўжо Захаравы сыны тут разбудаваліся?»

З грудка, з хаты сюды спускалася старая жанчына ў бардовай камізэльцы і шарым хвартуху, босая, трохі гарбаватая. І калі яна крыкнула на курэй, Сымон па галасе пазнаў Захараву Тэклю. Яны з Захарам былі нават за яе злёгку паспрачаліся. Але Тэкля аддала тады перавагу ўраўнаважанаму, заўсёды спакойнаму Захару.

«Дзіўна, — падумалася Сымону, — людзі старэюць, мяняюцца ў абліччы, а голас у іх застаецца той самы».

Сымон затуліўся за чародку алешнікавых кустоў і стоена, нават не дыхаючы, цікаваў за Тэкляю.

— О, дзе ўздумалі нясціся. У крапіву пад рэчку ходзяць, покуль шашок ці каршун не схопіць! — Тэкля схавалася ў крапіве і высунулася ўжо адтуль, трымаючы перад сабою згорнуты хвартух. У ім, напэўна, былі яйкі.

— Акыш на вас! — Старая навотліў махнула рукою, ганяючы курэй, што, цяжка пераварьваючыся і падмахваючы крыллямі, беглі на груд, пад хату.

«Не баба, а страхоцце. І трэба ж было за гэтакую яшчэ паспорыць, — ціха ўхмыльнуўся Сымон Чачотка. — Але ці ж лепшы сам? Пасмяяўся гаршчок з катла».

Счуўшы чужога, недзе там, у вёсцы, зацяўкаў дробны, але пільны сабачка. І Сымон прыспешыў крок. Ішоў насустрач павольнай стужцы вады, што адбівала чыстае ранішняе неба і першую белую хмарку, якая адзінока плыла ў зеніце. Кладкі так нідзе і не было. Але калі Сымон падняў галаву, то над вяршкамі пруткага алешніку ўбачыў мост. Не, спярша драбіны тоўстых цэментавых пярылаў. І ўжо наўпрост праз луг, ружовы ад смолкі і вобаратніку, пайшоў туды. Праўда, яшчэ азірнуўся на рэчку, на сухія, ужо без кары, падмытыя алешыны. Зляцеўшы з іх, плаўна замахаў доўгімі гнуткімі крыллямі і востра загаласіў чорны дзяцел. Нібы ікаў. Сымону прыгадалася маладое. Як ён ужарт пакаціў тут на поплаве дзябёльшую за сябе, ужо з прыкметнымі грудзьмі, пастушку Лявонку і незнарок трапіў між яе шаўкавіста-гладзенькіх ног і нібы апёк руку аб яе казытлівы чубок. І доўга адчуваў на руцэ гэ-

ты спакусліва-казытлівы дотык і гарачыню мяккіх сцёгнаў.

З-пад моста, туга залопаўшы, выпырхнула чародка шарых галубоў, спуджана закружылася ў вышыні. Па цэментавых усходах з саржавелаю трубчатаю парэнчаю Сымон падняўся на мост. Доўга стаяў, абапёршыся на пярыла, азіраючы рачную даліну са звілістымі, як рэчка, вянкамі алешніку і знябожана пахіленымі вербамі над шыпучымі, забросненымі завоінамі.

Усё было тое і не тое. Знаёмае і чужое.

На мост, падняўшы на дарозе гаркаваты, скрыпучы на зубах пыл, уз’язджаў лабаты грузавік з блакітнаю кабінаю. У ёй выскаляўся, бачачы, як ціснецца да пярыла Сымон, чарнявы, з круглаю, як у шашка, галавою малады шафёр. Знарок, дзеразуючыся, нават пасігналіў.

«Чый жа ён, гэты недавярак? — Сымон паглядзеў услед грузавіку, што, з’ехаўшы з моста, падляскваў жалезнаю пустою скрыняю на выбітай, даўно не раўнянай і не падсыпанай дарозе. — Можа, Апанасаў унук? Бо гэтакі круглагаловы і чорны, як шашок. Дарэчы, на Апанаса Жамойдзіка і мянушка была — Шашок».

Сымону прыпомнілася тое здарэнне, калі яго нажом парнуў п’яны і здурэлы Апанас Жа-

мойдзік. Сымон Чачотка быў ужо ажаніўшыся, але ці сядзець маладому мужчыне ў святні дзень дома, і ён пайшоў зірнуць і новую хату, якую выбудаваў Мацей Хадаркевіч, і вечарынку, што ўжо звінела ў ёй. А іграў і выспёўваў рыжа-агністы Салавей, найлепшы музыкант у наваколлі і на найлепшым, купленым у Францыі на заработках зялёным гучным баяне.

Яшчэ знадворку Сымон учуў голас Салаўя і глухавата-рытмічнае пастукванне барабана. Памкнуўся зайсці ў хату, але, стоячы ў парозе і падпіраючы адным плячом касяк, дарогу яму заступіў п'яны Апанас Жамойдзік, рослы, самы большы хлопец у вёсцы. І калі Сымон адвёў яго руку з растапыранымі пальцамі, Жамойдзік, пырскаючы пенаю, дзіка зароў:

— Тут жанатым няма чаго рабіць! — І гэтая растапыраная рука пхнула Сымона ў грудзі. Сымон учуў, як ад крыўды і знявагі забушавала злосць. Ён з усяе моцы плячом штурхануў Жамойдзіка і ўвайшоў у сені. Але нешта раптоўным скразняком апякло яму правы бок ніжэй рэбраў. Сымон нават яшчэ не здагадаўся, што гэта быў нож. Абмацваючы гарачае месца, ён нарэшце здагадаўся, што на пальцах была ліпкая кроў. Жамойдзік парнуў бы яшчэ, і можа нават пад лапатку, але яго тут жа за руку схапіла і залямантавала стрыечная Сымонава

сястра, што якраз ішла за ім. А на гэты ўжо енк і крык з хаты выскачылі хлопцы. Яны разбаранілі, бо далей невядома што было б — Сымон у кутку сенцаў намацаў нейкі капач.

Рана гаілася доўга, бо да доктара Сымон не пайшоў, як не пайшоў мальдавац і скардзіцца ў паліцыю. Выхадзіла яго Алена, прыкладаючы да раны кнот, змочаны ў адвары гарніка, што цвіце па лесе якраз на Купалле жоўта-ёдзістымі кветкамі і гаркавата пахне. Ад раны застаўся шнар, а на душы — крыўда. Яна не праходзіла ніколі.

Але Сымонавы думкі нечакана перабіла яшчарыца. Шара-жоўтая з радком белых пацерак па брушку, яна вёртка шмыганула з дарогі ў траву пад зламаную калючую дзічку, пакінуўшы ў пясчанай ямцы кончык варухлівага хвосціка. Ён яшчэ выкручваўся жывым чарвячком, а яшчарыца, зашалясцеўшы, знікла пад травою ў норцы. Сымонава памяць зноў уваскрэсіла пагодны жнівеньскі дзень, калі Сымон, разбіраючы на калюча-шапаткім ржышчы пашаркі, звозіў у гумно гузаватыя падсохлыя снапы. І з аднаго з іх, калі, стоячы на возе, ён кінуў яго на торп у застаронак, выслізнула і заблыталася ў канёвай грыве маладая кароценькая яшчарыца. Спуджаны конь турзануў воз і скінуў Сымона на ток. Як ён тады не разбіўся, выцяўшыся

тым самым параненым бокам аб вось у возе, зноў распаласаваўшы той самы рубец. Нешта з паўгода не гаілася і не зажывала балячка. Сымон зноў наракаў на Апанаса Жамойдзіка і ўжо на палахлівага каня з яшчарыцаю, што затаілася ў жытніх снапах.

Потым, калі час нібы і загаіў раны, перакуліўшы для храбрасці і адвагі чарку, Жамойдзік пераймаў Сымона Чачотку на вуліцы, прабуючы загаварыць і падлашчыцца, але той, рэзка і рашуча махнуўшы рукою, аднекваўся і не даваўся на згоду.

— Не падмошчвайся, не падшывайся — гаварыць не буду.

Так яны варагавалі, так і засталіся непрыяцелямі. Даравацць крыўды Сымон ні за што не мог. І вось яна зноў завірыла ў грудзях.

Паволі, як пабіты яшчэ раз, Сымон Чачотка азірнуўся на вёску — хацеў пазнаць, дзе стаіць Жамойдзікава хата, тая нягеглая, з павыгніванымі дзеравінамі і заўсёды замшэлаю карычневаю страхою, але будынкі, ужо нават без гумнаў, былі перасыпаныя альбо абкладзеныя белаватаю сілікатнаю цэглаю і ўсе спрэс накрытыя хвалістым нудным шыферам. І дрэвы наўкруга іх вышугалі новыя. Адзіная высокая ліпа, некалі з калодаю для пчол, магутным зялёным фантанам уздымалася ў сінява-

та-густы купал неба. Яна звінела калісьці ад рахманага гуду пчол, бо далей у садзе была Пытлева пасека — колькі рамкавых вулляў, а найболей калодаў-лежакоў, накрытых яловаю карою. Самога Станіслаўку Пытля, члена гміннай рады, трохі адукаванага, растаропнага мужчыну, зайшоўшы, бальшавікі арыштавалі адразу, толькі залётаў першы сняжок, а сям'ю вывезлі ў саракавым, на згоне зімы.

Падбіраліся і да яго, да Сымона. Патрымалі дзён колькі ў лёхах мяснога склепу, а потым павязлі ажно за Белавежскую пушчу пад горад Бельск на будаўніцтва аэрадрома. Дадому адтуль Сымон прыйшоў ужо разам з немцамі. За гэта і недалюбліваў Сымон бальшавікоў, і калі яны зайшлі другі раз, ён, каб часам не трапіць на Урал ці ў Данбас, у шахты, добраахвотна запісаўся ў польскае войска. А пасля вайны асеў і, лічы, пражыў астатнія сорак год у прыморскім кашубскім гарадку.

«І тут, на радзіме, ужо як чужы», — Сымон цяжка ўздыхнуў, прымружваючы гарачыя ад слёз вочы і пазіраючы на старую векавечную ліпу, пад якою падымала паласаты цынкавы дах прыгожа выбудаваная незнаёмая хата. «І хто гэта там разбудаваўся», — намагаўся ўгадаць Сымон Чачотка, бо даўнейшую Пытлёву хату разабралі і перавезлі пад клуб.

«Новыя людзі і новыя хаты», — ад гэтых думак, аднак, у грудзях шчымела балючая і неразгаданая крыўда. Вочы слязіліся не то ад сустрэчнага лёгкага ветру, не то ад таго, што яго, Сымонаў, свет адышоў. І даўнейшая дарога, што слалася пад яго ногі, была ўбітая і ўтрамбаваная грузавікамі, без глыбокіх каляінаў, выезджаных вазамі, без конскага памёту, над якім, асабліва надвячоркам, фуркацелі, падняўшы растапыраныя шкарлупкі крылцаў, чорна-сіняватыя жукі.

«Усё мяняецца, усё», — у рытм сваёй хадзе гаварыў Сымон, паволі падбіраючыся да абгладжанага, як бохан хлеба, пагорка з ружова-сіняватым ад маладога коласа высокім жытам. А за ім калматаю грываю падымаўся блакітна-зялёны, завешаны празрыстаю, як газавая хустка, сінечаю малады хвойнік.

«Няўжо на іх полі высадзілі новы лес? Няўжо? І чаму ж нічога не сказала дачка? Але што ёй. Яна ўжо звыклася з новым лесам і без яго ўжо не можа ўявіць тутэйшых мясцін. Але як жа я знайду сваё поле?»

Яму хацелася рассунуць гэты густы, прысадзісты, яшчэ не ацярэблены хвойнік, убачыць гарыстае поле, зялёную мяжу ў агністых кветачках палявога сардэчніку, гваздзікі, пляскаты, рассечаны маланкаю камень на ёй, што

віднеўся здалёк, як абломак вежы ці якога замка.

Ногі ў Сымона блыталіся, яго, як на холадзе, калацілі дрыжыкі, і ён праз жыта, разгортваючы, адводзячы рукою казытлівыя каласы, падышоў да краю маладога леса. Нейкі грыбнік ужо разгроб, раскешкаў пад хвоечкамі заплеснелую волкую кастрыцу, і на ёй жоўта-яснымі гарошынкамі высвяціліся дробныя лісіцы.

Нават не адводзячы калюча-яршыстых лап з залацістымі свечкамі новых пасынкаў, Сымон пашыўся ў шчыльны хвойнік. Нібы апечаныя крапівою, пачалі гарэць паколатыя рукі, якімі ён засланяў твор і вочы. Камень, як помнілася Сымону, павінен быў стаяць ніжэй. «Няўжо няма яго, няўжо не засталося ніякага знаку, што тут было маё роднае поле?»

Маладыя дваццацігадовыя хвоечкі баязліва ціснуліся адна да адной, але сярод іх вузкімі лентамі, як прошва на абрусе, бялелі гонкія, вышэйшыя за хвойкі, чуйна-шапаткія бярэзінкі. І Сымон нават подбегам пайшоў гэтаю светлаю прошваю. Але пляскатага, расколатага перуном каменя нідзе не было. Сымон спыніўся і ўпоперак густых пасадкаў, зноў закрываючыся локцем, раптам выйшаў на яго. Камень, як што жывое, даўно чаканае і жаданае, велічна заружавеў перад Сымонам. Той самы пляскаты,

адсечаны з аднаго боку, нібы сякераю, востры, падобны да нарога ў плузе, родны камень. Сымон прыкленчыў і з цяжкім уздыхам хацеў абняць гэтую вечна маўклівую глыбу, але рукі не сцягвалі — камень быў шырэйшы. І Сымон прыпаў шчакою і грудзьмі да яго ранішняга, яшчэ вільготнага холаду.

«Ты жывы? Ты адзін тут помніш мяне. Бо, утаміўшыся на жніве ці на ворыве, я ішоў і адпачываў каля цябе», — Сымон гаварыў уголас, бо ведаў, што ніхто яго не чуе.

Ён паляпаў па камені рукою, як пяшчотна ляпаюць на шыі цягавітага і любага каня:

«Ці ведаеш ты, што я прайшоў паўсвета, каб нарэшце вярнуцца сюды і развітацца з табою? Не, мусіць, не ведаеш, бо маўчыш. А мы паўвека не бачыліся. Ты нават мне сніўся, як сніцца хлопцу любая дзяўчына».

Злазіўшы абедзвюма рукамі востры кантовы верх, Сымон нарэшце падняўся з каленяў. Абцерушыў, шмаргануўшы рукою, з калошаў чорных мурашак і жоўты, наточаны імі пясок. І ўжо бярозаваю светлаю прошваю высунуўся з хвойніку. У грудзі дыхаў яшчэ сыраваты ранішні вецер, цёк пад пахі, сцішна віхрыў у вушах. Ішлося лёгка. Сымону прыгадвалася дзяцінства, калі во гэтаксама ў вушах віхурна пасвістваў вецер, а ты, босы, здаецца, зусім бес-

клапотны, ляціш з груда ў лагчыну, альбо ловіш маладога, яшчэ ў пушку, жаваранка ці даганяеш нізкую ў лёце папялова-ржавую курапатку.

«Дзе тое ўсё дзелася? Застаўся толькі адзін нязрушаны камень. Няўжо толькі ён?»

У мроіве калыхаўся, мігцеў свет — на вочы Сымону зноў высачыліся слёзы. Не то ад ветру, не то ад шкадавання да самога сябе. І ён не выціраў іх, пякучых і салёных, а толькі злізваў языком, калі яны дабягалі да губ.

Яму не помніцца, як дайшоў да моста, і гэтак, не помнячыся, мінуў бы яго, каб на мосце перад ім не паўстаў, як прывід, як здань, сутулаваты мужчына на нягнуткіх, як палкі, нагах. Сівы, бяззубы, з праваленым ротам, ён абапіраўся на чорную ў алюміневых драпінах ляску і хрыпата, з нейкім прысвістам смяяўся:

— Мне так і падумалася, што ты сюдою будзеш ісці.

Голас, як падалося Сымону, быў яго, Апанаса Жамойдзіка. Але худы і стулены, як сугнет, мужчына ніяк не пасаваў, не паходзіў на дужага, калісьці рослага Апанаса Жамойдзіка. І нос у гэтага быў ліловы і большы, спушчаны трохі да губы.

— Сын падказаў, што бачыў цябе тут,

на мосце. Па вёсцы ўчора пагалоска пайшла, што прыехаў Сымон Чачотка.

«Значыць, у тым грузавіку за кіраўніцаю сядзеў Жамойдзікаў сын», — трохі адступіўся назад Сымон Чачотка.

— Што, не пазнаеш? Ды гэта я, Апанас Жамойдзік, — да Сымона пацягнулася дрыготкая, як у п'яніцы, рука. — Ну, здароў быў!

Сымон ухіліўся, як ухіляюцца, калі на цябе ляціць наўскапыта ашалелы конь.

— Не хочаш улічыць і прызнаць свайго ворага? — Нягнуткія ногі адарваліся ад запыленых сіваватых панэляў моста і няўпэўнена, дрыготка, як у дзіцяці, што вучыцца хадзіць, пайшлі на Сымона. — Я прыйшоў мірыцца. Ну, давай, браце, паручкаемся.

— Позна ты адумаўся.

— Хоць позна, як ты кажаш, але мушу папрасіць у цябе даравання. Цяжка паміраць з грахом, — дрыготкая рука ўсё плавала з боку на бок, лавіла Сымона.

— Хто грэх які ўчыніў, з ім і памрэ, — Сымону здавалася, што літасці просіць не той буялы, здаровы, як мур, хлопец, а нейкі нягеглы і нямоглы чужы чалавек.

— Значыць, не даруеш?

— Не, — Сымон рэзка крутануўся і, абышоўшы наўкруга Жамойдзіка, ступіў з моста на

перацёрты, сіва-зеленаваты, як цэмент, сухі пясок дарогі.

— О, які ты!

— А якім хочаш, каб я быў? Забітым, як ты жадаў? — хутчэй злосна крыкнуў, чым спакойна сказаў, і ўжо не азірнуўся разгневаны ад усяго даўняга, што нахлынула на яго, узнерваваны Сымон.

— Мусіць, дарма я тады прамахнуўся.

— Вось яно, тваё раскайванне. Вось які ты, — Сымон усё ж такі азірнуўся на мост, дзе, шырока расставіўшы хворыя ногі і абапіраючыся на ляску, стаяў знябожаны і сівы, як абсыпаны халодным снежным пухам, здзіўлены і бездапаможны Апанас Жамойдзік.

Чуў ён ці не чуў астатнія словы Сымона Чачоткі — невядома. Але яго худы, зморшчаны падбародак калаціўся і ўпалыя папяловыя губы шапталі:

— Мусіць, дарма...

*1—7 лютага 2000 года*



# Бронекамізэлька № 36

Кажуць, хто ў жыцці спазнаў рай, той памрэ ў пекле.

Калі быў рай у Івана Мацюка, то хіба да нараджэння, ва ўлонні маці, бо ўсё астатняе жыццё гаравалася ў чорнай агорклай бядоце.

Яшчэ ў часе вайны з гэтакімі, як сам, падшыванцамі Янак Мацюк натрапіў на горбу доўгіх, нібы ментузы, пёрыстых мінаў, выкінутых, пэўна, з вайсковай палутаркі, што, не маючы ўжо гаручага, праз вярсту застыла на абочыне жвірыстай шашы. Яны, падлеткі, дапалі спярша да кароткай палутаркі з брызентавай кабінай, у кузаве якой быў умацаваны трохствольны кулямёт. Стаяў, нібы бусел, на адной назе.

Узяўшыся за ручкі, можна было павярнуць то ўправа, то ўлева, альбо падняць ці апусціць тры тоўстыя рубчастыя «кажухі», з якіх страхатліва вызіралі кароткія чорныя рулі. Забаўка скончылася тым, што, згледзеўшы палутарку з трохствольным кулямётам, па-ястрабінаму імклівы нямецкі самалёт, які злосна вынырнуў з-за пагорка, нечакана зрабіў разварот і паласнуў нядоўгаю кулямётнаю чаргою. Кулі ўзнялі пылок каля самай палутаркі, балазе не патрапіўшы ў яе. Яны, перапалоханыя дзеці, разбегліся, каб, акрыяўшы ад страху, сабрацца каля горбы чырвоных мінаў і завалачы дзве з іх у нейкі спешна выкапаны адступаючымі байцамі акопчык...

Старэйшы за іх чатырох, сын дарожнага майстра з сіняга прыгожага дамка, што стаяў тут, пры шашы, у заценi дзвюх заграніччных елак, Рома Мікульскі, прынёсшы з дому малаток і французскі ключ і разбіраючы ў гэтым акопчыку першую з дзвюх мінаў, хацеў нешта падправіць малатком. Мацюку пашэнціла — ён якраз вылез з задушлівага, напаленага сонцам акопа і толькі азірнуўся на стук малатка, каб на ўсё жыццё застацца з пасечанаю пяском рагавіцаю і ледзьве не аслепнуць. Выбух быў надзіва глухаваты, але ў разбураным акопе ад тых чатырох, што сядзелі ў ім, засталося кры-

вавае месіва. Мацюк, праўда, гэтага не бачыў, як не бачыў наўкруга сябе нічога — у вачах была моцная рэзь і непраглядная мігатлівая чарната.

Свет трохі праясніўся толькі на трэці дзень, але ўсё бачылася як праз тоўшчу вады, калі дасі нырца ў глыбокі каламутны вір.

Вылечыў Янака вайсковы доктар, ужо немец, калі яны праз тыдзень зайшлі ў мястэчка і маці, напытаўшы пра нямецкі шпіталь, завяла туды пакалечанага, з запухлымі вачыма сына... Немец нават выпісаў акуляры, але дзе ты іх вайною купіш, ды ці патрэбныя яны вясковаму хлопцу?

Не спрыяла Мацюку і з вучобаю.

Скончыўшы тры класы акупацыйнай школкі, покуль яе не разагналі партызаны, Мацюк яшчэ пахадзіў у няблізкую местачковую сямігодку. Гэта пасля вайны ўжо. З іхняй невялікай, напалову расселенай на хутары Жывіцы вучылася ўсяго трое: ён, Янак Мацюк, і Сяргей Жаўрыд з сястрою.

Вайна скончылася, а ў тутэйшай лясной старане ўсё яшчэ кіпела, нібы ў гаршку, куды ўкінулі гарачы камень: то партызаны, прыгадваючы нядаўнія свае паходы на «хозаперацыі», браліся за прыхаваную зброю, то туляліся, каб не трапіць на вочы чырвонапагоннікаў — унут-

раных войск НКВД, — акоўцы, то проста шлындала і, як кажуць, паслася прылётная брыда, і аднойчы яны, трое падлеткаў, незнарок натрапілі на зладзюг, што абкрадалі сельпоўскую краму. Было гэта ў гадзін пяць, але позняй восенню, калі пры зямлі чорным і глыбокім разводдзем плаваў сляпы прыцемак. Перапуджаныя зладзеі, не столькі мо згледзеўшы падлеткаў, колькі ўчуўшы незнаёмыя галасы, чамусьці пачалі ўцякаць і адстрэльвацца, і забілі трынаццацігадовую Жаўрыдаву сястру.

Сяргей Жаўрыд пасля гэтага здарэння кінуў школу, а ён, Янак Мацюк, неяк дацягнуў, дабіраючыся ў мястэчка і праз цёмную яшчэ ноч, калі збоку дарогі іншы раз двума пільнымі агеньчыкамі блішчалі воўчыя вочы, і праз кудасу — непраглядную завею, калі ён патанаў па пахі ў сыпкіх курганах, каб хоць з тройкамі, але скончыць сем класаў. У восьмы Янак Мацюк не пайшоў — пасведчанне і заяву адвёз у Баранавічы, у медтэхнікум, але зрэзаўся на рускай мове — атрымаў двойку. Прыкрых дванаццаць памылак. Ён папраўдзе не ведаў, як наўкруга ўсе, чужаватай і немілагучнай для яго мовы.

Прыйшлося летаваць дома, у сумнай, прыгнечанай вёсачцы, адрэзанай сцяною цёмнага яловага лесу ад неспазнанага зваблівага свету,

памагаць бацьку дабудоўваць хату, што стаяла без сенцаў. У войска Янака не ўзялі, забракаваўшы па той жа хваробе — пасечаных пяском вачах. Але яму даволі было тых сямі класаў, каб уладкавацца ў сельсавет на пасаду сакратара, адкуль яго перавялі ў райфінаддзел і прызначылі на агідную, валацужную работу падаткавага агента. Хто паважаў сябе, за такую сабачую справу не браўся.

Аднак іншай работы, акрамя таго, каб завербавацца ды паехаць на лесапавал у Карэлію, ужо нідзе наўкруга не было. Ды і тыя, хто завербаваўся, папрацаваўшы там год-два, вярталіся дадому ледзьве жывыя і зарослыя барадамі, як турэмшчыкі ці жабракі, альбо сённяшнія бамжы.

І Янак, узяўшы кірзавую палявую сумку, пачаў цягацца па чуйных, адгароджаных сабачым брэхам хутарах і тады яшчэ не калгасных вёсках. Пад канец пагодна-прытульнага жніўня ён збіраў трэцюю рату сельгаспадатку і надвячоркам ужо на прылесным хутары зайшоў у хату, дзе смуродзіла толькі што выгнаным самагонам. Увішная лісявая гаспадыня тут жа на тлустых скварках падсмажыла яечню. Ад пачастунку са шклянкаю першака ён, вядома, не адмовіўся і, згаладалы за дзень, добра ўпіўся. Яму невыразна, нібы праз сон, толькі прыгад-

валася, як ён дайшоў да наравістай мармытлівай рэчкі з вузкаю кладкаю і ненадзейна хісткаю парэнчаю. І дзіва — як з яе не зваліўся, не нырнуў у патайную бухту. Да калацця ўстыўшы на роснай атаве, ачуняў Мацюк ужо сярод ночы. Палявое кірзавае сумкі з грашыма і квіткамі пры ім не было. Хто і як забраў яе, ці будзеш ведаць з п’янае галавы. А ў сталінскі час за страту дзяржаўных дакументаў і грошай каралі сурова. Янак Мацюк, падатковы агент раённага фінансавага аддзела, на падставе артыкула, за растрату дзяржаўных грошай, як было сказана ў выраку суда, атрымаў тры гады. І адсядзеў ён іх, як кажуць, ад званка да званка — будаваў у Мінску аўтазавод, пасля — дамы на праспекце, куды іх, брытагаловых, у зліньялых бушлатах, пад аховаю салдат вазілі на крытых грузавіках. Раненька, яшчэ прыцемкам, прывязуць, а на шарай гадзіне, каб менш бачыла староннняе вока, затарабаняць назад, за высокі шчытны плот з кольцамі калючага дроту.

Нікчэмнае, заўсёды пад назіркам узброенага вартавога, агіднае, абцяжаранае прымусам жыццё, а да яго Мацюк прызвычаіўся. Ва ўсялякім разе ты хоць так-сяк, а накормлены, і ёсцека заслужанае, нязрушнае месца на нарах. Бо пасля турмы, застаўшыся ў Мінску, спачат-

ку качагарам пры кацельнай, потым грузчыкам пры складзе з размаітымі будаўнічымі матэрыяламі — рубероідам, цэментам, шклом, нават чамусьці унітазамі — жылося мала лепш. Той самы барак, дзе ім на чатырох выдзелілі пакойчык, забруджаны наўкруга вулічны туалет, заўсёдная нястача грошай, бо калі купіш бутэльку «Маскоўскай», а адною звыкла не абыдзешся, то на абнову з адзежы альбо на тыя ж кірзавыя боты капейкі не застанецца.

Дадому да адзінокай маці — бацька памёр, упаўшы ў баразне, яшчэ тады, калі Мацюк быў, як смяяўся сам, на выгодзе — сядзеў у турме, ён прыязджаў гады ў рады. Недалюбліваў матчынага прымака — нейкага прыблуду з Казахстана, васпаватага, з сіпатым голасам Зюзюкіна. Праўда, ён як нечакана з'явіўся ў іхняй Жывіцы, так нечакана і знік.

Вось тады, калі Янак Мацюк рабіў яшчэ качагарам, з ім прылучыўся не столькі, можа, смешны, колькі дурнавата-нягаданы, прыкры выпадак. І не столькі, можа, з ім, колькі ўжо з нямогла-хвораю, састарэлаю маці.

На велікодныя святы, каб трохі назапасіцца вэнджаным кумпяком ды выхаванаю на гарышчы пахучаю ад часнаку і каляндры каўбаскаю ці сальцісонам і выпіць падкрашанае ягадамі — парэчкамі ці чарніцамі — жытняе сама-

гонкі, Мацюк замяніўся з напарнікам — той быў праваслаўны — і прыехаў у родную Жывіцу дадому.

Выйшаўшы лагодным вясновым ранкам з самага першага прыгараднага цягніка, што ішоў з Мінска на Баранавічы, Мацюк у зманліва-светлым настроі з прадчуваннем шчодрага велікоднага стала, густа застаўленага бутэлькамі, з місаю хрумсткай, квашанай у галоўках капусты, з вяндлінаю і ружавата-сіняю, як вясёлка, нарэзанаю скрылікамі паляндвіцаю, бадзёра ступаў палявою дарогаю пад высокую і несціханую песню жаваранкаў. Пройдзеш аднога, а з акрыялай пасля зімы руні падымаецца другі. І ўжо звініць ручаінкаю, што пераліваецца праз камень ці корчык, ён, ясна-шары, асвечаны спадыспаду нізкім сонцам, трапяткі жаваранак.

Пясчаная дарога ўбягала ў вёску, убраўшыся ў ружаваты брук, з лагчынкаю пасярод, выбітаю яшчэ даўнейшымі вазамі. Прыгорблены, нікім не бачаны на адзінокай дарозе, Мацюк тут выпрастаўся, ганарыста прыўзняў галаў і скрыва зіркнуў на цёмныя і патайныя, як азёрная вада, вокны першай з канца Жаўрыдавай хаты з крыжавінаю тэлеантэны на шыферным даху, — ці не бачыць хто яго? Сыты распрэжаны конь з доўгім, даўно не стрыжаным

хвастом панура цягаў з воза пачарнелую канюшыну.

З недаўменнем Мацюк згледзеў за шыбаю перакрыўлены твар і разяўлены рот вастраносага, як дзятлік, Сяргея Жаўрыда, сябра ўжо амаль забытых падлеткавых гадоў. Узнятая рука, нібы пачэрпваючы жменяю, клікала яго ў хату.

Прыстаўшы на міг, Мацюк раздумваў — зайсці ці не.

Але, расчырванелы ад першае велікоднае чаркі, Сяргей Жаўрыд нават выбег з хаты і, зашпільваючы металічныя капялюшыкі гузікаў на расхрыстанай чорна-белай клятчастай кашулі, здзіўлёна выгукнуў:

— Янак, гэта ты?

Мацюка па-даўняму ў роднай каталіцкай Жывіцы называлі Янакам, у горадзе ён па-прасцяцку ды па-мужыцку быў звычайна — Ваня.

— А ты што — перабраў? Не пазнаеш? — Мацюк падаў сваю дужую, ужо нават загарэлую руку.

— Ды як табе сказаць... — Жаўрыд жменяю абцёр бліскуча-ільсністы ад тлушчу рот. — Пазіраю ў акно, а ў мяне ажно валасы дыбам — ты з таго свету ўстаў.

— Той свет не такі ўжо даўні — паўгода дома не быў, — хмыкнуў Мацюк, азіраючыся на

акно, дзе чырванеў яшчэ адзін, але незнаёмы твар.

— Сваяк мой, — Жаўрыд прыплюшчыў п'янаватае замутнёнае вока і нават не азірнуўся. — А ты ці ведаеш, мы ж ужо былі пахавалі цябе.

— Рана ты мяне хаваеш, — прымаючы ўсё за нейкі здзек, нарэшце раззлаваўся Мацюк.

— Чаму я? Маці твая. Але хадзем у хату. Без чаркі не разбяромся, — Жаўрыд папхнуў нагою брамку і, узяўшы пад паху Мацюка, злёгку пацягнуў да сябе. — Праўда, я ажно ўмлеў, убачыўшы цябе.

— Ну, не дурыся, — зноў хмыкнуў Мацюк, пераступаючы высокі парог і з яснага, залітага вясновым сонцам дня ўваходзячы ў поцемак старое нізкае хаты.

— Пачакай, раскажу. А покуль прысядзь, — і прыляпнуў рукою па сіняй табурэтцы, бо на другой умасціўся шыракаплечы, мурлаты, з сівою чупрынаю сваяк. — Я толькі выпраўлю дачку, няхай усё ж накажа мацеры, што прыехаў ты.

І схаваўся за перагародкаю, абклеенаю паласатымі блакітнымі шпалерамі:

— Збегай, дачка, скажы Марылі, што з горада прыехаў Янак.

— Ну, гэта ўжо лішні клопат, — паглядзеў

услед цыбатай дзесяцігадовай дзяўчынцы з цяжкаю залацістаю касою настроены на чарку і павесялелы Мацюк.

— Як сказаць, ад такой навіны і разрыў сэрца можа быць — сын уваскрос з магілы, — Жаўрыд падышоў да выштукаванага, мусіць, свае работы, буфета, што пабліскваў мядовым лакам, дастаў гранёную трэцюю чарку, паставіў перад Мацюком.

— На, асвяжыся, — і наліў з зеленаватае бутэлькі смярдзючае, пэўна, цукровае самагонкі.

Апёкшы ўсё ў грудзях, згаладалы Мацюк схапіў з талеркі самую большую скварку ружаватага сала.

— Дык што тут было? — спытаў ён, пазіраючы не на Жаўрыда, а на сівога з распухлым сінявата-ліловым носам сваяка.

— Ды пахавалі былі цябе, — Жаўрыд павярнуўся да сваяка, што моўчкі хрумстаў цвёрды салёны гурок, сарамліва ўсміхнуўся. — Дальбог, праўду кажу. На згоне зімы было. Прыйшоў нехта ў вёску і кажа: «Вунь у раён, у міліцыю прывезлі Марылінага Янака. Пад снегам усю зіму праляжаў». Паехала маці глядзець, а яго ўжо ў Мінск адправілі. Яна следам у горад. Там, у трупярні, і не разабралася, мусіць. Сын дык сын. Увесь пачарнелы.

— Чужога чалавека прызнала за мяне? — насупіўся ўжо ап’янелы і ад першае чаркі, і ад дзіўнае страшнае навіны ўражаны Мацюк.

— Ну, абазналася, значыць.

— І хто гэта быў? Я ці не я? — зубы ў Мацюка едка заскрыпелі.

— Як гэта ты? Ты во сядзіш у мяне ў хаце, а той ляжыць на нашых могілках поруч з тваім бацькам.

— Што? Поруч з бацькам? — Мацюк падняў зеленаватую з чырвонаю замежнаю этыкеткаю бутэльку і наліў сабе сам. — Во як, поруч з бацькам?!

— Бо думалі, што гэта яго сын. Ты, значыць.

— Сын, кажаш? — Мацюк растапыранаю рукою злавіў чорна-белую, як шашачная дошка, байкавую кашулю Жаўрыда і тузануў да сябе. — І хто пахаваў таго валацугу разам з бацькам, пытаю?

— Ну, хто ж — твая маці.

Мацюк павярнуў да акна наліты ўжо сінявата-тай чырванню распухлы твар і ўбачыў старую прыгорбленую кабету ў вялікай сіва-ваўнянай хустцы. Наўрад ці прызнаў бы ён, што там, на вуліцы, стаяла яго знябожаная, зусім састарэлая маці, каб не падказаў Жаўрыд.

— А во — лёгкая на ўспамін цётка Марыля. Па цябе, Янак, мусіць, прыйшла.

— Каб пахаваць яшчэ раз?

Мацюк, пахістваючыся, падняўся з-за стала і шырокім няцвёрдым крокам ступіў да дзвярэй.

Як толькі ён выйшаў на брукаваны надворак, дзе галавою да воза стаяў і цягаў леташнюю пачарнелую канюшыну каштанавы конь, у браме, трымаючыся за слуп, каб, мусіць, не ўпасці, закрычала прыгорбленая, у чорнай камізэльцы і ружаватым фартушку старая жанчына — Мацюкова маці:

— Ах, Божа, з таго свету ўстаў!

— Нябось, не хацела, каб я ўстаў? — закруціў галавою п’яны і зусім ужо звар’яцелы Мацюк.

— А я ж цябе гэтак хораша пахавала. Касцюмчык нізгоршы купіла, п’яніца ты няшчасны. Кары Божай на цябе няма. На што ж ты на маю галаву з’явіўся зноў? На што ж ты ўваскрос?!

Болей прычытваць і аплакваць сябе Мацюк не даўся. Ён акруціўся наўкруга, агледзеў пры падрубе пачарнелы, азызла-гнілы млён, падняў яго і шпурнуў туды, у браму, дзе стаяла маці.

— Ах, Божа мілы, чаму ж я сама не лягла ў тую магілу, чаму не памерла?

— Маўчы! — Мацюк прыгразіў кулаком і за-

круціўся зноў, каб знайсці што падхватнае ў руку. — Цяпер не ты мяне, а я цябе пахаваю!

Але тут яго схапіў у пояс і пацягнуў назад у хату перапуджаны Жаўрыд.

Пераспаўшы да вечара ў чужой хаце, нанач пацішэлы, прысаромлены Мацюк прыйшоў дадому. Замірэння, праўда, з маці не было, як не было ўжо і сварбы. Мацюк сцішком пашныпарыў у варыўні, знайшоў трохлітровы слоік самагонкі — яшчэ той, што засталася ад яго пахавання, — адрэзаў ад апольца добры брус сала, спакаваў усё ў паркалёвую торбу, што муляла заўсёды ў кішэні, і назаўтра ранералька сабраўся ў дарогу.

— Куды ж гэта ты? — спытала маці, калі ён наспех снедаў.

— Пайду, зірну на сваю магілку.

— Ой, дурны быў, дурным і застаўся, — маці навотліў безнадзейна махнула рукою.

Ужо знанадворку Мацюк убачыў у акне яе заплаканы, з дрыготкім падбародкам твар.

На могілкі ён не пайшоў — чаго глядзець на копчык чужога, можа, ужо апалага і падзёўбанага дажджом долу, — і вуліцаю выкіраваў на гравійку, што вяла да ціхага, за чатыры кіламетры ад вёскі, чыгуначнага паўстанку. Усё ж, падымаючыся на прылесны пагорак, азірнуўся на белы стрункі бярэзнік за густою зялёнаю рунню — там у зямлю ўрасталі вясковыя магіл-

кі. І Мацюк уявіў, як пад вусцішны пошум доўгага, яшчэ не ўбранага ў лістоту карычневага вецця на апалых капцах прабівалася першая ценькая трава, зелянелі пахіленыя замшэлыя крыжы, западалі глыбока ў грунт забытыя каменні і іскрыліся мармуровай крошкай новыя помнікі. Там, пад адзінокаю сухаверхаю хвойкаю, пахаваны бацька і дзве малодшыя сястрыблізняты, што захварэлі былі на водру і засаб — у дзён тры — памерлі абедзве. А цяпер поруч з імі палажылі нейкага прыблуду.

Злосць, як пена на кіпячым малацэ, узнялася ў Мацюковай апаленай крыўдаю чуйнай душы. І ён не стрываў, адкупорыў слоік, сарваўшы брудна-жоўтую пластмасавую накрыўку, і адным дыхам адпіў можа са шклянку смярдзюча-атрутнай самагонкі. У торбе намацаў сала і, не дастаючы, адгрыз яшчэ моцнымі зубамі палоску любовага.

Праз хвіліну-дзве свет лагодна паяснеў, зрабіўся празрысты, хоць над галавою ў Мацюка вісела ўжо сіняватая хмурнасць. І злосць паступова апала, утачылася, як вада ў траву.

У электрычку Мацюк сеў вясёла-раздабрэлы. Заўважыўшы гэта, да яго падсунуўся хітраваты, з наздратым задзірыстым носам, агністарыжы, стрыжаны пад бобрык, як ён назваў сябе, Стас.

Яны з Мацюком зноў адкупорылі той сінявата з каламутнаю самагонкаю трохлітровы слоік. Праўда, з вакзала яшчэ здужалі дабрацца ў кацельню, каб пачаставаць Мацюковага зменшчыка. Але гэтага, вядома, аказалася мала, і Стас схадзіў у магазін і прынёс дзве бутэлькі «Агдаму». Ачмурэлі яны добра, бо нехта адкруціў вентыль, і за ноч больш як семдзесят тон салляркі сплыло ў блізкі раўчак, а адтуль ужо ў азярцо, акружанае шархоткім сухім троснікам. Сіне-ружовая пляма ўкрыла ўсю паверхню прадаўгаватага азярца з белымі лебедзямі, і тады ўжо ў мікрараёне ўзняўся крык і лямант. Трывога была як на пажары.

Пасля гэтага здарэння Мацюк на тры месяцы застаўся без работы, покуль нарэшце, згаладалы і абношаны, не напытаў месца грузчыка ў снабаўскім складзе. Тут на пару з маладым хлопцам работы было няшмат: разгрузіць ці загрузіць машыны дзве-тры то з рубероідам, то з шыферам, то з якімі-небудзь унітазамі ці скрынкамі абліцовачнай пліткі. Найбольш хадзілі з мётламі ды шуфлямі, падмятаючы склад і ходнік перад шырокім і доўгім блочным складам.

Да таўставатай, з кругленькім прыемным тварам загадчыцы склада, што разышлася з мужам, Мацюк нават пачаў быў сватацца. І ўсё,

здаецца, было, як кажуць, на мазі, каб асмялелы ад бутэлькі віна, якую яны з напарнікам ціхенька «раздушылі» ў час абеду, Мацюк не паспрабаваў злёгку нахіліць раздабрэлую, сытую загадчыцу на торп мяхоў з цэментам, што ляжалі за скруткамі металічных сетак у канцы склада. Але яна так спрытна жарнула яму між ног абцасам карычневага боціка, што пачарнелы ад болю Мацюк прылёг у праходзе між гэтых драцяных сетак.

Асарамачаны, ён ажно два дні не з'яўляўся на работу, а напіўшыся зноў, познім надвячоркам націснуў чорную кнопку званка на блакітным вушаку перад яе кватэрай. Убачыўшы яго ў адчыненых дзвярах, яна з тою ж самаю злосцю пхнула яго ў грудзі.

Але п'яны Мацюк, вядома, не адступіўся, бясконца націскаў на чорную кнопку ў белым квадраце, пакуль у яго за спіною не засаплі трое дужых міліцыянтаў. У аднога з іх, самага здаравейшага, васпаватага, у руцэ аказалася карычнявата-тоўстая, што нагадвала бычыны чэлес, вагкая дубінка. І яна некалькі разоў, цяжка прылёгшы, тупою гарачынёю апякла Мацюковы плечы. Заламаўшы за спіну рукі, яго звялі па сходах уніз і там ужо з размаху кінулі плячмі на бляшаную падлогу ў закратаваным уазіку.

У шурпатай камеры без аконца, з цьмянаю лямпачкаю і адною на ўсіх вузкаю лаўкаю, дзе гэтакіх самых, з адабранымі рэчамі і вышмаргнутымі з портак папругамі, было як селядцоў у бочцы, Мацюк праляжаў на жываце цэлую ноч. Перавярнуцца на пабітую спіну ён не мог.

Яго выпусцілі позняю раніцаю, выпісаўшы на месца работы нязначны штраф.

І ўнураны, як пабіты сабака, Мацюк прыехаў на работу. Не асмельваючыся заходзіць у склад, ён моўчкі і прысутулена стаяў каля зялёнага металічнага гаража, перачэкваючы сцюдзёны вясновы дождж, пакуль яго не прыкмеціла загадчыца і не крыкнула цераз вуліцу:

— Чаго стаіш, як той на вяселлі?! Ідзі пераносіць цэмент, там з даху працякае вада.

Зрэшты, з ёю яшчэ можна было мірыцца і жыць. На абразу і крыўду яна нібы забывалася. Бо потым, калі яе прызначылі на нейкую пасаду ва ўпраўленне і за столікам у кутку склада ўладна сеў лысаваты армянін, Мацюк ужо ледзьве вытрываў паўгода, так і не дацягнуўшы да пенсіі. А здарылася тое, што здараецца не раз і з кожным — у Мацюка з рук выслізнула банка з фарбаю. Армянінаў жаўтлявы, густа зарослы чорна-сіняватым шчаціннем твар наліўся помслівай чырванню, рудыя вочы бліснулі крывавымі бялкамі, і на Мацюка пасыпа-

лася падкрашаная каўказскім акцэнтам грозьба. Стрываць абразу было не ў натуры Мацюка, і ён з усяе моцы штурхануў новага загадчыка склада ў агідна зарослую валаснёю расхрыстаную грудзіну. Задраўшы кароткія ножкі, гарача-трапяткі, але слабенькі армянін праехаў плячмі па тлустай лужыне разлітай фарбы. Вядома, пасля гэтага давялося развітацца з работаю, а да пенсіі заставалася месяца паўтара. Мацюк жывіўся тым, што ў дварах, асабліва ў шпалерах густога, роўненька падрэзанага глогу недалёка ад гастранома і на сметніках каля металічных кантэйнераў, абкружаных цаглянымі сценкамі, валяліся пустыя бутэлькі.

Ды хто ўжо не ведаў Янака Мацюка з яго рудым пад пахаю, яшчэ пустым мяхом ці поўным — ужо на плячах. Шафёры, што прыязджалі да сметнікаў на зялёных, раздзьмутых, як аб'етая карова, пакоўных смеццявозах, знарок пакідалі пры пустых кантэйнерах шарэнгі рознакаляровых бутэлек.

Ведала Мацюка і чарада п'яных абношаных мужчын з смярдзючымі і худымі, як плоткі, маладзіцамі, пазбіванымі да чорных гузакоў і сініх кругоў пад вачыма.

— Гэй, Ваня! — крычалі яны з паласатай лаўкі, што стаяла ў цяньку пад брылём пад'езда, і кісла-п'яна смяяліся, крывавата расцягваючы

рот на адутлаватых бурачкова-сінюшных тварах. — Раскажы, як ты ўваскрос з мёртвых.

— Я то ўваскрос, а ты як памрэш, то ўжо не ўстанеш, — злаваўся Мацюк і на іх, дурнаватых алкашоў, і на сябе, што быў прагаварыўся пад чаркаю пра тое прыкрае здарэнне, што адбылося ў роднай Жывіцы.

— Ладна, выбачай, — спагадліва суцяшаў хто-небудзь з іх і, падышоўшы, ляпаў шырокаю лапатаю пяцярні па яго худым, вастраватым плячы. — Вунь, каля століка, дзе рэжуцца ў казла, мы пакінулі табе бутэлькі. Поўнай, праўда, няма.

— Ого, каб ты паспагадаў чалавеку, — казаў Мацюк, але ішоў туды, ведаў, што не абмануць. Тады-сяды, расшчодрыўшыся, пакідалі і напарстак віна.

Мацюка не любіла чамусьці дворнічыха, сіваватая нізенькая жанчына з нетутэйшаю гутаркаю. Нават памахвала дзяркатаю мятлою:

— Чевой-та ты здеся?

Як не любілі яго і падвальныя каты, што з нізкіх пяціпавярховых хрушчовак асцярожна, каб не нарвацца на слінкатага, з шырокай пашчай, крывалапага ўкормленага бульдога, выпушчанага на выгул, падкрадваліся сюды, да смярдзючых кантэйнераў, і, седзячы на адкрытых да палавіны накрыўках, прымружана

бліскалі залаціста-зеленаватымі вачмі, надзімалі на гарбатых спінах поўсць і нават па-гадзючаму шыпелі.

Вельмі ж злосна і ўнурана зіркаў на Мацюка чорны, з белым нагруднікам, сыты кот, што ажно паліскаўся, ад'еўшыся на неразважных, гультаяватых галубах, якіх затоена выцікоўваў і лавіў каля металічных кантэйнераў са смеццем.

Аднога разу Мацюк нават натрапіў, як ён валок па шурпатай стужцы асфальту дымна-ружовага галубка, што нямогла палопваў крыллямі і жаласна, нібы птушаня, ціненька папіскваў, а над дваром чорнаю хмараю вілося і каркала перапуджанае вараннё — гракі, вароны, галкі — і нават наіўныя безгалосыя галубы. Стаяў такі свіргат і чыркат, што нават чалавек унараві́ўся б, а ён, брыдота, адно скрыва азіраўся і падцягваў бездапаможнага голуба да падвальнага разбітага акна.

Пакуль Мацюк, пазвоньваючы пустымі бутэлькамі ў рудым, закінутым на плечы мяху, дабег да шарай цэментнай адмосткі пры белым блочным доме, чорны кот, апеты ў даўнейшай песні, якую ён, Мацюк, любіў слухаць з расколатай пласцінкі, асалавелы ад бурштынавага яблычнага віна, разам з голубам ускораў пераваліцца ў разбітае акно.

«Хто чым жывіцца! — брыдка крывячы рот, сам сабе ўсміхнуўся Мацюк, адыходзячы ад цёмнага, як прорва, падвальнага акна. — Кот галубамі, а мне, каб пракарміцца, трэба кешкацца ў смецці — выпорваць і збіраць бутэлькі. Але ўжо як чыя доля...»

А яны, пустыя сабраныя бутэлькі, ратавалі ад прогаладу Янака Мацюка нават тады, калі ён нарэшце сышоў на пенсію. Бо якія там былі грошы — адныя слёзы. Тых няшчасных васемнаццаць, як цяпер іх называюць, лімонаў сцягвала толькі на разбаўленае малако, цяслявы хлеб і няўежную каўбасу, скручаную з каніны ці пераляжалай валовіны. На чарку зноў прыходзілася кешкацца, як курыца, у смярдзючых кантэйнерах, а то нават і біцца за гэтыя сметнікі з бамжамі. Але з чым не звыкаецца чалавек! Звыкся і Янак Мацюк са сваім адзінокім бадзяннем па агідных сметніках і неадступным зазіраннем у вулічныя урны — а ці няма там кінутай бутэлькі?

У суботу, калі ў іхні мікрараён пад’ехаў крыты грузавік з блакітнымі і ружовымі пластмасавымі скрынкамі, Мацюк, прывалокшы загадзя падрыхтаваныя тры мяхі пустых бутэлек, выручыў ажно два «лімоны». І сёння, у светлую нядзельку, яму, як спраўнаму і добраму чалавеку, належала бутэлька таннейшага за га-

рэлку і, ліха яго ведае, з чаго выгнанага, але даволі моцнага брэндзі, што добра б’е ў голаў і валіць з ног.

Высокае, ясна-блакітнае неба, абмытае нядаўнімі ўліўнымі дажджамі, крохкае, як шкарлупка ў ластаўчыным яечку, з баязлівымі пеніста-пухкімі дзвюма хмаркамі прарочыла пагодны дзень.

Адзеўшы зношаны з закручанымі кляпамі карычневы касцюм, што, здаецца, нават свіціўся, нібы кволая лічына, і прычасаўшы ўскалмачаныя і ўжо нібы попелам абсыпаныя, сівааватыя валасы, што даўнавата не ведалі цырульні, Янак Мацюк выйшаў з свае голае — тапчан і збіты з дошак стол, — прапахлае перагарам аднапакаёўкі ў блочным доме і апынуўся ў двары, дзе падлеткі гулка, нібы стукаючы ў бубен, падбівалі нагамі чорна-белы мячык.

Не маючы сваіх дзяцей, Мацюк чамусьці не любіў чужых. Прытоеную нянавісць чуў і да маладзейшых за сябе мужчын, фанабэрыстых, ганарыста непадступных і шыкоўна апранутых. Асабліва калі яны садзіліся ў чорныя з танаваным шклом «мерседэсы». Як чужаўся атлусцелых, раскормленых, у аднолькавай плямістай форме, з грознымі дубінкамі на таўставатай, пажаночы адтапыранай задніцы, чуйна-маўклівых «мільтонаў».

Але сёння пад настрой светлага ранку і шчаслівага адчування, што можна пахмяліцца — нутро ўжо даўно гарэла няўтольнаю смагаю, — Янак Мацюк быў ласкавейшы. Баючыся натрапіць на гайню зарослых, як дзікуны, з нямытымі барадамі, прапахлых едкім потам і ўчарашнім перагарам бамжоў, што маглі выкленчыць грош, ціхенька пракраўся ў гастраном і ў гарэлачным аддзеле ўзяў бутэльку віна, а ў каўбасным — сто грамаў варанай шклоўскай, што аказалася, як гума, зусім няўежнай.

Прысеўшы на драцяную скрынку, што стаяла па другі бок падстрыжаных кусцікаў, дзе пацвірквалі неўгамонныя вераб'і, а зводдаль, паставіўшы пры нагах мяшэчкі з семачкамі, дзяркатa перасварваліся жанчыны, Мацюк з горла выпіў церпкаватае віно і закусіў гэтаю пустою, што зусім не пахла мясам, шклоўскаю каўбасою. Бутэльку прыхаваў, падпіхнуўшы нагою ў густы куст. Настрой уміг прыўзняўся, і свет узвысіўся, падабрэў і прыемна задрыжэў, як летняе мроіва над нагрэтым дахам. Прытоптваючы і падгладжваючы абедзвюма рукамі пышна ўзнятыя, прыемна слізкія валасы, тупкаю сцежкаю, што перасякала асфальтныя дарожкі, Мацюк спаважна, не спяшаючыся, падышоў да тралейбуснага прыпынку.

Як ва ўсе выхадныя дні, гарадскі транспарт

хадзіў рэдка, на прыпынку сабраўся нецярплівы натоўп. І калі, прыпадаючы на адзін бок, прыпоўз перагружаны тралейбус, усе хлынулі ў сярэднія дзверы, бо заднія не адчыніліся. Мацюк размашыста ступіў у таўкатню, дзе людзі, адпіхаючы адзін аднаго локцямі, шыліся ў затораныя дзверы. Паперадзе Мацюка, заступаючы дарогу, лез валасаты, ссутулены мужчына з вялікаю, напакаванаю невядома чым сеткаю. Мацюк рэзкім узмахам рукі адхіліў яе, каб яна зноў не звалілася яму на грудзі. Здаецца не ўголас, але злосна ён вылаяўся і тады ўбачыў панылы твар з даўгаватым, як рашпіль, носам. І ў Мацюка да болю ў пальцах сашчаміўся вагкі кулак — яго на падпітку заўсёды разбірала ахвота храснуць каму-небудзь па носе, асабліва, як у гэтага патлатага, па доўгім рашпілі. Балазе Мацюк устрымаўся, бо чалавек з апушчанымі валасамі прасунуўся далей, і ён нарэшце ўціснуўся ў перапоўнены тралейбус.

— Мужчына, не дышыце на меня, — раптам закрычала, адсоўваючыся ад Мацюка, каратка падстрыжаная жанчына з тоўстым, як у барца, каркам і залатымі цяжкімі завушніцамі.

Мацюк адвярнуўся, але з гэтага боку на яго не то злосна, не то палахліва пазіралі выцвілыя вочы старой прыгорбленай кабеты.

Аднак Мацюкоў позірк быў з такою, мусіць, грозьбаю і злосцю, што вочы ў старое баязліва заплюшчыліся і яна сагнулася яшчэ больш і мацней абхапіла абедзвюма худымі, у сінявалых жылках рукамі нікеляваную скобку над сядзеннем.

Мацюк задаволена ўсміхнуўся і, падымаючы твар, зглядзеў за акном, на пляцы Незалежнасці, купкі людзей, абкружаных міліцыяй.

«Што там?» — хацеў спытаць, але, бачачы, што тралейбус прыцішае ход, павярнуўся і праціснуўся да дзвярэй.

— Во фашысты тусуюцца, — сказаў нехта мужчынскім сіпаватым голасам ужо за спіною ў Мацюка.

— Збіраюцца, бо ім даляры даюць, — трохі шапялявячы, бяззубым ротам нямогла выціснула напэўна тая старэнькая кабета.

— Бабуля, бяжы і ты, а то даляры разбяруць, — нехта здзекліва смяяўся з неразважлівай старой.

— А мне і не трэба чужога. Чужога не спажывеш.

«Праўду кажа», — пагадзіўся Мацюк, выскокваючы на асфальт і чуючы адразу палёгку ад свежага, трохі пранізлівага ветру, што віхрыў з блізкай аркі.

Тралейбус, крывабока асядаючы на шырокі

перагружаны зад, на якім, як хвост у заезджанага каня, пацялепвалася размачаленая вяроўка, марудна пасунуўся далей і адсланіў пляц. Там, за шырокаю шарэнгаю міліцыі, што выстраілася перад «зебраю», нехта ўладна-цвёрдым голасам пакрыкваў у мегафон: «Грамадзяне, прашу разысціся! Мітынг на пляцы Незалежнасці не дазволены».

Гэты голас нібы паддаў Мацюку напорыстасці і злоснай адвагі, і ён уроскід, размашыста і рашуча ступіў на «зебру», нават не звяртаючы ўвагі на рознакаляровыя іншамаркі, што імчалі тут, набраўшы добры разгон.

Але не ўскораў дайсці да палавіны вуліцы, як недзе збоку нахапіўся таўставаты, чырванатвары афіцэр — звання яго Мацюк нават не паспеў вызначыць — і ўжо, як на якога блазна альбо смаркача, уладарна выкрыкнуў:

— Ты куда прёшь? А ну — назад!

Сцяўшы кулакі, Мацюк ледзьве спыніўся — д'ябальская сіла пад'юшчвала, спакушала і несла яго на гэтага сытага з шырокай седлаватай фуражкай афіцэра міліцыі.

— На пляц Якуба Коласа трэба ісці. Там ужо збіраецца шэсце, — падказаў дробны і нейкі замуляны мужчына ў пляскатай кепцы і заношанай куртцы, што, нібы ўцякаючы ад міліцыі, шпарка перабягаў «зебру».

Чакаць тралейбуса не выпадала, тым больш, што на прыпынку, тулячыся ад скразняку, стыў і курчыўся той самы нецярплівы натоўп, і Мацюк рушыў на праспект. У пераходзе, паклаўшы каля сваіх ног футарал з некалькімі таннымі купюрамі, можа, нават яшчэ сваімі, выгінаўся і іграў на флейце рослы хлопец. Мацюк намацаў у кішэні дваццаць жоўтых пакамечаных рублёў — яшчэ старых, з Пагоняю — і кінуў у футарал. Янак Мацюк змалку паважаў музыкантаў. Бедны і недавучаны вясковы хлопец, як ён хацеў стаць гарманістам. Але не пашэнціла і тут: каб купіць гармонік, бацька нат не даўся гаварыць.

Праспект, здаецца, быў ціхі. Аднак, як падалося Мацюку, падазрона і чуйна ціхі. Неяк асцярожна, каб нікога не зачапіць, у адным кірунку рухаліся купкі моладзі. «Ідуць на пляц Якуба Коласа», — адзначыў для сябе Мацюк.

А паабапал праспекта, спіною ад праезджай часткі яго, праз кожныя пяць-дзесяць крокаў струнка застылі міліцыянеры з дубінкамі і зачахлёнымі газавымі сумкамі на клубах. Мацюку нават карцела спытаць, што там у іх. І ён, падышоўшы да аднаго, што стаяў трохі вальней і расслаблена, спытаў, але не пра сумку:

— Скажэце, што сёння за дзень такі? Чаму так многа міліцыі?

— Манеўры будуць, — адказаў малады вуграваты міліцыянер, і вочы яго хітра заблішчалі.

Скасіўшы вока на арку, Мацюк згледзеў, што там затуліліся грузавікі, поўныя зеленавата-плямістых, як балотныя жабы, вайскоўцаў. Упрытык адзін да аднаго цiснуліся уазікі з закратаванымі аконцамі.

«Во на такім, злупцаваўшы, вязлі мяне. Гады!» — вылаяўся Мацюк і тут за уазікамі ўбачыў цёмна-зялёны «бэтээр» з дзвюма рулямі цяжкіх кулямётаў на ўсечанай вежы.

«Ого, нешта ж будзе», — нібы жахнуўся Мацюк і тут жа, сплюнуўшы, жорстка вылаяўся зноў.

Чым бліжай ён падыходзіў да пляца Якуба Коласа, тым болей у дварах тулілася аўтобусаў, крытых грузавікоў, тым болей шнуравала па праспекце сіне-белых міліцэйскіх машын, а да тратуараў цiснуліся падазроныя жыгулі з танаванымі вокнамі і заміж міліцыянераў уздоўж праспекта варту нясліі ўжо спецназаўцы ў белых шлемах з забраламі і ў бронекамізэльках з вялікімі лічбамі на грудзіне. Віжавалі маладыя дагледжаныя мужчыны пад вусікамі і ў цывільных касцюмах. Яны падыходзілі то да спецназаўцаў, то да машынаў з зацемненым шклом. Іх непакоіў і прыгнятаў нейкі свой таемны клопат.

Выхад на пляц яшчэ здалёк пры трамвайных пуцях заторылі шчытна пастаўленыя грузавікі. Моладзь — хлопцы і дзяўчаты — спрытна і лёгка ўзбіралася на іх і, саскокваючы, бегла туды, дзе насустрач пастаўленаму ў тры рады кардону спецназаўцаў у касках і са шчытамі рухалася, цякла паўнаводнаю ракою калона маніфестантаў.

Яе Мацюк убачыў тады, калі пераваліўся ў брудны кузаў старога краза. Ён, як дзіця, ажно захліснуўся ад радасці — над людзьмі, што ішлі шчыльнымі, шырокімі радамі, ірдзела, цякло і калыхалася безліч бел-чырвона-белых сцягоў. Яны паласкаліся на ветры і ўпарта, прыгожа плылі насустрач яму. Наперадзе калоны мужчыны ў белых комжах з гафтаванымі караткаватымі рукавамі няслі абраз. У інваліднай калясцы, гонячы яе за колы, ехаў, пэўна, бязногі пакалечаны хлопец. Чацвёра падлеткаў-дзяўчатак у белых прыталеных сукеначках і з распушчанымі, падвітымі валасамі трымаліся за блакітныя трымцівыя стужкі, што цягнуліся да абраза.

Сэрца Мацюкова млела і трапяталася ад балючай уражанасці. Ён дзівіўся і ажно палохаўся, як палохаецца чалавек, убачыўшы вялікі агонь, ці хлопец, упершыню згледзеўшы распранутую дзяўчыну.

Але яго дзіва і радасць уміг перапыніў гулкі пошчак чорных дубінак па белых шчытах, — здалося, што загрымелі сотні барабанаў, і кардон рвануўся наперад, уклініўся ў натоўп, рассякаючы яго надвое. І над галовамі людзей замільгалі вагкія дубінкі. Успуджаны лямант і крык вырваўся з калоны маніфестантаў. Янак Мацюк пудка жахнуўся, згледзеўшы, як падалі і падымаліся, абліваючыся кроўю, сталыя мужчыны.

Нейкая свая, няспраўджаная помста закіпела ў Мацюковай душы, і ён, агледзеўшы кузаў, заўважыў вялікую іржавую гайку, можа, ад якога крана, і падняў яе. Саскочыў з краза і, трымаючы настылы метал за спіною, не помнячыся, рвануўся наперад. «Біць іх трэба, біць!» — крычаў ён, але, здаецца, толькі самому сабе.

Да кардона ў белых касках і з белымі, увагнутымі, нібы ночвы, шчытамі ён не дабег. Дарогу яму перагарадзіў драбнаваты, з савіным тварам, наколькі мог яшчэ распазнаць Мацюк, спецназавец у блакітнай камізэльцы з лічбаю «36» на ёй.

Перахапіўшы руку, што ўзняла дубінку, Янак Мацюк з усяе моцы, навотліў жахнуў гэтай гайкаю ў апушчанае забрала, учуўшы хрусткі лускат і ўбачыўшы смяротную чырвань крыві.

А далей ён пачуў агністы, тупы ўдар па галаве. Адзін, пасля другі... Удары адгукаліся ў вушах, як высокі грымотны абвал. І, як ад моцнага раптоўнага грому, падкошваліся ногі.

«Б'юць тыя, што са сталёвымі штырамі», — яшчэ паспеў угадаць ён. Бо за чацвёртым ці пятым ударам памяці не было. Быў правал у глыбокую чорную прорву. Падхапіўшы за рукі і ногі, Мацюка зноў кінулі ў закратаваны міліцэйскі уазік, але на гэты раз ужо нежывога. Хто і адкуль ён быў, ніхто не ведаў, бо ніякіх дакументаў пры ім не аглядзелі.

*Май—чэрвень 2000 года*

# Трывушчая

Яна, прыгорбленая, у чорнай, ражком завязанай жалобнай хустцы, са звялым, але яшчэ ружовашчокім здароўчым тварам, усунулася ў людны тралейбус паперадзе цыбатых кароткаспаднічных дзяўчатак у скураных куртках. Ці мо праўдзівей, яны ўвапхнулі яе ў вузкі, сціснуты поручнямі і бляшанай сценкаю пярэдні выхад, каб услед за ёю ўжо ўскочыць самім.

Я прыпадняўся, саступаючы ёй на высокім сядзенні не вельмі ўседнае першае месца. Другое, ад замурзанага акна, было занята надзьмутай удабрэлай маладзіцай у зялёным плашчыку, што разыходзіўся на яе вагкіх грудзях.

— Не старайцеся, мужчынка, я яшчэ і пас-

таяць магу, — старая для блізіру пааднеквалася, але, паклаўшы спачатку парэпаную і аблушчаную сумку, абедзвюма рукамі ўзялася за нікеляваны, але ўжо абшморганы да чарнаты поручань, каб падняцца на высакаватую прыступку.

Цяпер ужо, сціснуты абапал рослымі плячыстымі і не вельмі ўступлівымі мужчынамі, я стаяў над ёю.

На задняй пляцоўцы, дзе збілася купка легкадумнай, паспраўнелай за лета моладзі — быў пачатак верасня, і ўвесь гарадскі транспарт быў гаманкі, вясёлы і перапоўнены ёю, — пачыналася нервова-злосная, неадступная сварба:

— Ну, праходзьце.

— Як жа я прайду, калі ты плячыма свет загарадзіў! — крычаў нехта старэйшы, басавіты, што на кожнага маладзейшага за сябе глядзеў, пэўна, з помслівай злосцю. Бо ўсё маладое староніцца і не прымае ці адкідае ўсё старое.

— Цяперака ні старому, ні маладому не ўшыцца у транспарт. Праз людзі — у людзі. Але ж некалі яны былі мілейшыя, — востры ражок жалобнай хусткі падымаецца да мяне, і я бачу рознакаляровыя вочы — адно карычневае, другое светла-шэрае.

Я ажно здрыгануўся: мне прыгадаўся сусед, ужо нябожчык, у якога гэтаксама былі вочы featureнага колеру. Я чамусьці нават пачаў лічыць, колькі гадоў прайшло, як яго пахавалі.

Але мяне назад у перапоўнены тралейбус варочае трымцівы і слабенькі, нібы дзіцячы, голас старой у жалобнай хустцы:

— Я ледзьве свайго дачакалася. Хоць і спяшацца няма куды. Хіба пад сосны на вечнае спачыванне. Але ж жывым у зямлю не ляжаш.

Нахіліўшыся на бок, з цяжкім ржавым скрыгатам тралейбус пад'язджае да чарговага прыпынку і сутаргава тыцкаецца у броўку. Планкі дзвярэй складваюцца, як мяхі ў гармоніка. Лёгка саскокваюць на шурпаты тратуар цыбатыя галаногія дзяўчаты, а двое маладых лілова-вуграватых хлопцаў узбягаюць на іхняе месца каля дзверцаў кабіны. І наўкруга мяне паслабаднела — рослыя мужчыны, ад якіх патыхала атрутным тытунём, падаліся ўглыб салона. Тралейбус, як наеты вол, ледзь зрушвае з месца.

— Сёння ж нам, пенсіянерам, помач на заводзе давалі, — тым самым ціхаватым і трохі нібы ахрыплым голасам гаваркая старая пачынае перарваную споведзь. — Каму дзвесце ты-

сяч, каму трыста, а мне ажно пяцьсот адшкадавалі. О, каб вы бачылі, сколяка там нас, старых, назбіралася. Азірнешся наўкруга сябе — адно чарап'ё. Я ж ужо дваццаць гадоў на пенсіі. У шэсцьдзесят пайшла.

Востры ражок чорнай хусткі, пад якою іскрыць сівая пасма, зноў падымаецца ўгору. Мне карціць спытаць, па кім старая носіць жалобу, але яна, нібы наўздагад, без майго роспыту, гаворыць сама:

— Бачыце, — яе худая у ліловых венах рука, адарваўшыся ад папярочнага поручня, падымаецца да чорнай хусткі, — жалабую. Чацвёрты тыдзень пайшоў, як пахавала свайго дзеда. Я — з сямнаццатага, а ён на два годзікі быў старэйшы за мяне. Зазнаў усяго, праз усе вайны прайшоў. У сорак восьмым толькі вярнуўся. Дзякуй Богу, жывы і не калечаны. З кантузіі на адно толькі вуха недачуваў. А я трое, лічы, без яго выгадавала. Адно пад адно, як гарох, маленькія былі, як яго забралі, нябось, не пашкадавалі — прыехалі і забралі. За год ці два, як на Заходнюю ішлі. Расказваў, што колькі тыдняў у лесе пад Заслаўем лягалі. Адсюль ужо на Гродна, а з-пад Гродна, дзе ў ровішчах розных паноў стралялі, — на фінскую. Фіны, як чэрці, на лыжах... Казаў, лягло там нашых, як снапоў на току...

Але тут нецярпліва пачала паводзіць шырокімі плячыма бабульчына суседка, што, крыўдліва ўзняўшы пухлую напамаджаную губку з чорным пушком, маўкліва і адрошана пазірала ў шарае ад закарэлых пырскаў акно. Тралейбус зноў скрыпуча-ўедліва і неяк бокам прыціраўся да прыпынку з жоўтаю і пухлаю, нібы надзьмутаю, як гумовая лодка, адзінаю лаўкаю. Высока ўздымаючы і памахваючы перад сабою лакіраванаю сумкаю з танна-залацістымі ланцужккамі і прышчэпкамі, раздабрэлая жанчына моўчкі пасунулася клубам наперад, гэтаксама моўчкі зганяючы старую з сядзення.

— Адна варона з кала, другая — на кол, — засмяялася старая, паказваючы ружовыя, як у дзіцяці, бяззубыя дзёсны, і падсунулася на чорным дэрмацінавым сядзенні з зацыраваным косым прарэзам і прыляпнула яшчэ худою зжоўклаю рукою. — Садзецяся і вы, во якраз нам дваім месца аслабадзілася.

Старая яшчэ шчытней падсунулася да замурзанай, упраўленай у чорную гумовую раму вялікай шыбы, і я сеў поруч з ёй.

— Людзі цяпер распаўнелі, паразбываліся, няхай Бог адносіць, — старая яшчэ, мусіць, не забылася пра сытую, з цяжкім падбароддзем маладзіцу. — Чэрава ў іх не раўнуючы,

як у жарэбных. Вядома ж, у горадзе якая работа. Сядзяць, распусціўшы спадніцы, як кураводкі ў рэшаце на яйках, і глядзяць у гэты целевізар, дзе скачуць голыя, рыхтык чэрці. Ото, свет разбэсціўся. А я з замаладу пры малых дзецях, усё не дасыпаючы. Як спявалася ў песні: «Замуж пойдзеш, трэба знаць — позна легчы, рана ўстаць». Ды яшчэ сярпом за дзень намахаешся, рукі ўвярэдзіш. Пажаўшы калгаснае, ціхенька праз дрот, праз граніцу ў Заходнюю на заработкі бяжыш... Да багатых наймаліся. Там у мяне і сваякі жылі. І мукі мех за жніво заробіш, і проса, і бобу добрую торбу. Альбо гэтых авечых слёзак — сачыўкі. Падвязуць да граніцы, а тут ужо сама цягаеш. Адно пільнуйся, каб не злавілі. Мой жа ж дзевяр, што хадзіў туды, за кардон, як называлі, па лікёры ды вішнёўкі, нарваўся-такі на засаду. Свае падказалі. За злоўленых шпіёнаў тады і адрэзы на сукенкі давалі. Чаму ж не зарабіць на чужой бядзе якую блузку. Ён і загрымеў ажно ў Архангельск, дзе ўжо след яго прастыў. А мяне Бог сцярог. Дзяцей свекрыва глядзіць, яшчэ і падганяе мяне: «Ідзі, Вікця, ідзі, дзяцей я ўпільную». Лістом перада мною не слала, шорсткая, як шчотка, была, а дзяцей гадаваць мне памагала. Хоць на свекрыву і кажуць: «Свекрыва не матуля, дзяцей не

прытуліць». Мая ўсё ж прытуляла. А я то ў жытняе, то ў аўсянае жніво ўсё бягу ў Заходнюю ды бягу. Туды з сярпом, а назад з поўным мяхом. Прывалаку гэтага бобу, напару. Дзеці наядуцца і ходзяць як пукі. Толькі папёрдваюць. Бо ён жа ж спажыўны, спорны, гэты боб... Вой, можа, вам няма інтарэсу слухаць мяне?

Яе разнакалёрныя вочы імкліва і скоса зірнулі на мяне і на тых, ужо новых пасажыраў, што, чырванеючы ад натугі, упарта і ўчэпіста трымаліся за поручні, сам-насам наракаючы на людны, перапоўнены да немагчымасці тралейбус.

— Во колькі ўжо ўтрамбавалася, — усклікнула яна з лёгкаю, нібы дзіцячаю радасцю.

— Всэм, бабушка, надо ехать, всэм, — адазвалася мардатая, перафарбаваная жанчына нетутэйшага аблічча ў вялікай карычневай хусце з залацістымі фрэнзлямі* і папхнула локцем палавінку сціснутых у гармонік дзвярэй, што не хацелі разгортвацца і зачыняцца.

Тралейбус ужо да астатку перагружаны і поўны, бо блізка рынак, і бальшыня пасажыраў едзе туды.

Чуецца прыцішаная гутарка пра цэны, і мая спадарожніца, павярнуўшыся да мяне, тым часам падхоплівае яе:

— Дарагавізна. Пенсію ледзьве сцягваеш. І яек не дакупіцца. Мая суседка ажно дзве гадзіны прэла ў чарзе, а давалі на рукі толькі па два дзесяткі. Кажуць, нашы прадукты ў Расію ідуць. Дзіва-дзіўнае, узвелічалі Расію, а як прыйшлося, есці тамака няма чаго. І вайны гэтакай Расія, пэўна, не зазнала, як зазналі мы. Там спалілі, тут забілі. Там — парцізаны, тут — немцы. Калі ж, як не вайною, усялякая чэрня разводзіцца. Гэта цяпер парцізаны прыгнуліся ды прыцішэлі. І сярод іх рознага было. Зловяць дзяўчат, што з горада прыбягалі, каб абмяняць што на харчы, і вядуць да мяне нанач. У дзяўчат холад і голад, а ў гэтых маладых басякоў юр у галаве. Я рассцялю куль саломы, а дзіцям — хоць мяхі на галаву... Усенькага наглядзелася. Пражыла, як кажуць, баба, што і вол не пацягне. Нябось — трывушчая. Дабіраю во восемдзесят трэці гадок...

Яе халодная, нават мярцвяна халодная рука нарэшце ловіць маю руку:

— Насакатала я вам, як курыца, але ўжо пайду. Зірну і я на сённяшні кірмаш. Цікава ж старой бабе, што там робіцца.

Я памагаю ёй вышчаміцца з вузкага сядзення і плячыма, націскаючы на іншых, пратораваю дарогу да выхаду.

Тралейбус, вызваліўшыся ад пасажыраў,

нібы з палёгкаю ўздыхае і прыўзнімаецца. За шырокай рамай акна, рабаватага ад нясцёртага бруду, я невыразна бачу чорную жалобную хустку і нібы яшчэ чую слабаваты, як дзіцячы, голас старой Вікці: «Пражыла баба, што і вол не пацягне. Нябось, трывушчая».

*Кастрычнік—лістапад 1998 года*





# Вяртаючыся да пражытага

Маё першае знаёмства з прыгожым пісьменствам пачалося з вершаў. Спакушаў рытм і зачароўвала мелодыка ўвабраных у форму і нязвыкла выкладзеных слоў.

І на шчасце, нібы з вышыні неба, мне былі пасланыя «Пагоня» Максіма Багдановіча і «Ты, мой брат, каго зваць беларусам» Алеся Гаруна. Упершыню прачытаўшы чуйна-жывыя радкі, я задыхнуўся ад іхняй арганнай, вадаспаднай музыкі. І гэтага, мусіць, было даволі, каб пачаў рыфмаваць сам. А потым дапамог і абнадзеіў Купала.

Кніжка яго выбраных твораў з партрэтам валошкавага колеру і кавалачкам чырвонага ар-

наменту на жаўтлявай кардоннай вокладцы ляжала поруч з падручнікамі на маім ясеневым стале, як Біблія перад набожным чалавекам.

Яе падараваў сусед, сірата, трохі старэйшы за мяне, які, напэўна, і сам набыльваў, як кажуць у нас, вершамі.

Да беларускасці і нацыянальнай самасвядомасці прывучалі кніжкі Антона Навіны (А. Луцкевіча) і Адама Станкевіча.

У гадоў 14—15 я ўжо ведаў, што беларусы мелі сваю дзяржаўнасць, а ў 15—17 з усёю маладою запальчывасцю і экстрэмізмам ужо думаў, як адрадзіць і вярнуць былую дзяржаўную веліч — княства Літоўскае.

А наўкруга мяне панавала беспрасветная сталіншчына — прымусовая пазыка і прымусовыя запісы ў калгас, — непісьменныя, абыякавыя да ўсяго, апрача хіба вечарынкаў, панажоўшчыны і гарэлкі, вясковыя аднагодкі. Папраўдзе ўспамінаюцца вядомыя вершы Мікалая Някрасава:

*В неведомой глуши, в деревне полудикой*
*Я рос средь буйных дикарей…*

Як падняўся вышэй усяго гэтага, як пашэнціла зразумець, што ёсць іншы свет, да якога трэба ўсімі магчымымі і немагчымымі сіламі цягнуцца і падымацца, як здолеў нарэшце паступіць ва універсітэт. І які ўсё ж гэта, калі гля-

нуць з сённяшняй далечыні, займальны, поўны душэўных прыгодаў, неапісаны, не засведчаны мною час загадкавай маладосці.

А з якою ўпартасцю і нязрушным спадзяваннем у тыя гады чыталіся звінючыя, іскрыстыя радкі Багдановіча, нібы сам ты гартаваў і каваў востры да адчаю меч:

*Ведай, брат малады, што ў грудзях у людзей*
*Сэрцы цвёрдыя, быццам з камення...*
*Трэба з сталі каваць, гартаваць гібкі верш...*

Сапраўды, толькі бязмерная, неўтаймаваная вера і гарачае спадзяванне, як на крыллях, нясуць чалавека да яго жаданай, неспатольненай мэты.

Усе кніжкі мае — няспраўджаны пошук чагосьці страчанага ў жыцці — кахання, чалавечнасці, нязрушанай праўды, узаемнай павагі, запрацаванага акрайца хлеба.

Дарэчы, на гэта скіроўвае нас і назва вядомай французскай эпапеі — «У пошуках страчанага часу» (Марсель Пруст).

Міця Корсак з маіх раманаў — гэта ў нейкай долі я сам.

Алеся... Напэўна ж, мая маці, што, выйшаўшы замуж за нялюбага, хацела задушыць сваё дзіця. І вось наперакор усяму — злосці, адчаю, помсты, нялюбасці — радзіўся я.

О, які ненапісаны драматычны твор сатлеў

на маім стале. Гэтае нялюбае дзіця робіцца любым сынам.

За кадрам, як кажуць, застаецца значна больш, чым высвеціла кінастужка.

Я перажыў вайну. У чэрвені 41-га мяне каля чыгуначнага моста абстраляў чорны (хоць ён срэбны, як лёд, і чорны, як лёд, на сонцы) месершміт. А праз тыдзень, 30 чэрвеня, я застаўся без хаты — на месцы яе смуродзіла чорнае пажарышча і бялела печ з кароткім, абваленым комінам.

У маі 44-га на палявой дарозе мяне расстрэльвалі — але Бог сцярог, пуля чапіла толькі калашыну штаноў, — двое адурэлых ад атрутнага самагону данскіх казакоў з паходнай арміі атамана Паўлава, што слугоўваў немцам.

Сёння, прыгадваючы свае падлеткавыя гады і вайну, перажываю за падзеі на Балканах. Малюся, каб югаслаўскае Косава не стала Косавам беларускім. Бо мы, беларусы, ніколі не мелі спакою абароненасці. Ніхто і ніколі не затуліў нас ад бяды. Нас не спытаўшы, як праўдзіва пісаў Якуб Колас, нас дзялілі і намі — дарам ад сябе — гандлявалі. Асабліва нашай спрадвечнай зямлёю.

Шчаслівы, што ад беларускасці не адвярнуліся мае сыны. Хіліцца да ўсяго беларускага і не цураецца, не зракаецца роднага слова і дзесяцігадовы ўнук Чэслаў.

Бо, як заўважыў Герцэн, лёгка вяшчаць разумныя ісціны з-за кафедры, цяжэй выхаваць адно сваё дзіця. Не дзіва, што многія з нашых народных не навучылі роднаму слову сваіх дзяцей і ўнукаў. Як і кіраўнікі дзяржавы.

Якая, зрэшты, безнадзейнасць — зварот да праўдзівай незалежнасці не бачыцца і ў далёкім абсягу.

Асцерагаюся, каб мы не заплацілі вялікай цаны за сваю абыякавасць да ўсяго нацыянальнага і не прынеслі бяды і шкоды нашым будучым пакаленням. Але я ўтаймую сваю крыўду і адчай. Застануся з непахісным і нязрушным спадзяваннем у душы. Так лепш — жыць з надзеяй.

*15 красавіка 1999 года*





# Воўк прагне крыві
## Біяграфічнае апавяданне

Усё пачалося з таго, што рыжавата-рабацілісты і шыраканосы Міша, як ён сябе называў, падвёў мяне да чорных, абабітых дэрмацінам дзвярэй з падазронай шыльдай, на якой срэбрам паблісквала ўсяго адно слова — «спецчасць», і, падмаргнуўшы рыжымі вейкамі, неяк уладна, па-гаспадарску, нібы пажадаўшы шчасця, сказаў:

— Зайдзі сюды. Тут цябе ведаюць.

Я адчыніў чорныя дзверы і ў другім пакоі каля бар’ера ўбачыў трохі ўстрывожанага маім нечаканым візітам рослага чарнявага мужчыну, якога спатыкаў не раз тут, пры рэктарацы, прымаючы яго то за аспіранта, то за выкладчыка.

— Вы да мяне? — скоса і з падазроным чаканнем зіркнуў чарнявы мужчына.

— Не! Я памыліўся, — змахляваў я і ўміг высунуўся назад, у калідор.

Міша, прытуліўшыся спіною да адзінага тут на калідоры акна, стаяў зводдаль.

— Ты што? — ён падаўся мне насустрач.

— Ды нічога.

Нарэшце здагадаўшыся, хто ёсць гэты фіктыўны студэнт фізмата, я шпарка, з рашучым імпэтам прайшоў міма яго.

— Ну, глядзі, каб не было горай.

Ужо, вядома, не помніцца, што я адказаў тады.

Дарэчы, потым нехта з журфакаўцаў мне сцішком і таемна шапнуў:

— Што ты з ім ходзіш, мы ж усе ведаем, хто такі Міша.

— Дзякую, але запозна ты мяне папярэдзіў.

Дзіўная рэч — пасля такой перасцярогі я, нібы набожная кабета, пачаў перабіраць на ружанцы сваёй памяці ўсе пацеркі, дзе, калі і што мною было перагаворана непрыкметнаму, у шарым пацёртым касцюмчыку недаростку з фізмата. Бо гутарак папраўдзе было нямала, і каля акна, пры бібліятэчнай зале, і на лаўцы ў скверы перад знакамітай скульптурнай групай,

і проста на асфальтнай дарожцы паміж універсітэцкімі карпусамі.

Ішоў 1956-ы год — час, як потым яго называлі, хрушчоўскай адлігі. Але ў турмах задыхаліся яшчэ сотні тысяч людзей, асабліва нас, заходнікаў. На пошце ў роднай Наваельні я падпісаў насліненым хімічным алоўкам на фанернай скрынцы калымскі адрас былога вучня нашай школы Івана Мароза, асуджанага, як сказаў яго трохі нібы адрошаны, непісьменны, бездапаможны бацька, на ўсе 25.

Але, адчуўшы паслабленне, як заўсёды, гатовая да незалежнасці, пачала бунтаваць ганарлівая Польшча. І непакорная Вугоршчына, узняўшыся ўсім народам на змаганне за дэмакратычныя правы і за адлучэнне ад прыгону Масквы, аблівалася гарачаю крывёю. Яе душылі сталёвыя гусеніцы савецкіх танкаў. Кроплю чалавечай свабоды былая савецкая імперыя ўспрымала як успенены акіян варожай непадуладнасці і гнеўнай непакорнасці. Дзяржаўныя стражнікі бяспекі і прымусовага парадку ўстрывожана высочвалі і вышуквалі як за межамі, так і тут асабліва небяспечных ворагаў, якія імкнуцца звергнуць, падарваць і аслабіць «власть рабоче-крестьянских советов», «учиняют массовые беспорядки, изготовляют и хранят литературу того же характера».

І вось за мною, куды я ні іду, дзе ні прысяду, як прыручаны грак, з ціхім шорхатам падлятае ён, Міша, студэнт з фізмата. Палкія, невядомыя і, пэўна ж, небяспечныя падзеі яго хвалююць не менш, чым мяне.

Наіўны, неспрактыкаваны ў жыцці хлопец, я ж, вядома, дзялюся ўсім, пра ўсё расказваю: што здаў падборку вершаў у часопіс «Беларусь», што рыхтую апавяданне для «Маладосці», а ў «Полымі» мае быць надрукавана мая навела — першая ластаўка, як назваў яе Максім Танк.

Міша неадступна, як прыпрэжаны, ходзіць за мною. Гэта прыкмячаюць усе, апрача самого мяне.  Бо я жыву ў нейкім іншым, непраўдападобным, неверагодным свеце, чакаючы з нясцерпным жаданнем чарговага нумара часопіса «Беларусь», які я разгарну і са шчаслівым дзівам убачу падборку сваіх вершаў. Аднак у кіёсках і бібліятэках з'яўляюцца новыя, пахучыя ад друкарскай фарбы адбіткі часопіса, а майго імя ў іх няма. Я саджуся на грукатлівы трамвай з тадышнімі бясконцымі званкамі на частых прыпынках і еду на вуліцу Пушкіна, 55, у Дом друку, дзе змяшчаліся ўсе нешматлікія рэдакцыі, каб высніць справу: мае ж вершы дакляравалі надрукаваць пасля падборкі С. Гаўрусёва. Я ж так

паслухмяна, старанна і ўпарта шліфаваў кожны радок.

— Нічога не ведаем, нічога не знаем. Шукайце Кавалёва.

— А дзе яго знайсці? — пытаю.

— У Маскве.

Не ўсцешылі мяне і ў «Полымі», сказаўшы, што навела дзесьці згубілася. Дакляравалі, праўда, пашукаць.

У «Маладосці» на мяне з падазроным недаверам глянула нерухомае шкляное вока:

— Што вы ўслаўляеце касцёлы і дзікія грушы? Ета всё даўно ішчарпал Кузьма Чорный, — мова і акцэнт літаратурнага работніка былі, здаецца, магілёўскія.

Дрыготкі дымок надзеі так неспадзявана і зманліва рассеяўся. Што рабіць? Як за саломінку, хапаюся за нечаканую ідэю паслаць апавяданне ў беластоцкую газету «Ніва»: там, здаецца, мяне зразумеюць і падтрымаюць — тэма заходнебеларускага жыцця блізкая ім. Перапісваю з падшыўкі адрас рэдакцыі і кіруюся на Цэнтральны паштамт. Ён, напэўна, тады ўжо працаваў.

І зноў жа з нецярплівым хваляваннем чакаю весткі з рэдакцыі. Мінае месяц, а яе ўсё няма. Пэўна ж, мне, студэнту чацвёртага курса аддзялення журналістыкі БДУ, не ведалася, што не

толькі падпіска, а нават чытанне беластоцкай «Нівы» лічылася вялікім палітычным грахом і шкодніцтвам: газета на сваіх старонках магла даносіць варожыя ўплывы Захаду. Сцішком «Ніву» можна было пагартаць у аддзеле беларусістыкі, што знаходзіўся ў прыгожым зашклёным эркеры на другім паверсе Дзяржаўнай бібліятэкі, дзе нас, студэнтаў старэйшых курсаў, трохі прывячалі. Але ўжо і сюды перасталі даходзіць чарговыя нумары беларускай замежнай газеты. Яна, напэўна, затрымлівалася ў Брэсце, дзе падчас знакамітых венгерскіх, польскіх і чэшскіх падзей згружалася ўся прэса і праглядалася замежная перапіска, тым болей рэдакцыйная.

Рабацiністы Міша з фізмата непрыкметна растварыўся і знік. Праз колькі гадоў у людным, задушлівым трамваі, што ішоў па Лагойскім тракце, нехта мяне вясёла-ўзбуджаным голасам гукнуў:

— Прывет сваім!

Я азірнуўся і за чужым высокім плячом ледзьве ўбачыў недарослага Мішу з фізмата.

— Дзе ты цяпер? — пацікавіўся.

— У політэхнічным, — усміхнуўся ён, задзіраючы свой шырокі твар, усыпаны жаўтлявым рабацiннем.

— У спецчасці?

Гэтага ён не пачуў, шыючыся да выхаду. Але, і праўда, сышоў з трамвая на прыпынку насупраць політэхнічнага.

Загадкавы Міша стомлена вычхаўся, расплыўся і знік, а да мяне прысуседзіўся нехта ўжо іншы.

На светлым калідоры пры акне недалёка ад дзвярэй аддзела беларусістыкі, дзе я тады-сяды перакідваўся думкамі аб прачытаным з Алесем Наўроцкім альбо Арсенам Лісам, няўзнак пачаў спыняцца гладзенька адпрасаваны, трохі нават дагледжаны не то аспірант, не то студэнт. Аднойчы ён і затрымаў мяне пры шырокім металічным стале з вострым, увагнутым скобкаю нажом, што стаяў у падвале і на якім, мусіць, рэзалі паперу, калі сшывалі ці пераплятали зношаныя кніжкі.

Незнаёмец папрасіў дазволу спыніцца і, поўны важнай значнасці, загаварыў да мяне па-расейску:

— Я краем уха слышал. Ты всё восхваляешь своего земляка. А знаешь ли, что во время оккупации здесь, в Минске, он заведовал складом БНС и печатался в фашистском листке?

Незнаёмец, вядома ж, назваў прозвішча.

— Советую тебе быть подальше от таких.

Я стаяў аслупянелы: Міша з фізмата знік, аднак за мною віжуе ўжо нейкі дагледжаны

аспірант і, пэўна ж, старэйшы па званню.

— Ты, конечно, знаешь и другого своего земляка, — ён нейкім уважліва-пільным вокам змераў мяне. — Ну-у, этого, из Слонима... А ведь он в своё время, будучи школьником, приветствовал Арсеньеву, читал стишки, посвящённые ей. Не мешало бы тебе быть более осмотрительным и разборчивым.

Не скажу, каб я надта напалохаўся, але нечаканае папярэджанне трохі нібы прыгняло і пакорна прынізіла мяне, бо я ўжо чуў пра таямніча раскіданыя на філфаку ўлёткі.

Наколькі ўпарта і неадступна мяне выследжвала і высочвала нядрэмнае вока шпегаў і канфідэнтаў, настолькі неадступна і нязрушна імкнуўся я да свае мэты — надрукавацца. Як мог, старанна перапісаў «Зоню» і рукапіс занёс у рэдакцыю «Маладосці», на гэты раз галоўнаму рэдактару — Аляксею Кулакоўскаму.

Ні да гэтага, ні пасля гэтага ніхто не сказаў мне такіх прыязных, добразычлівых слоў, як ён, трохі пануры і чымсьці заўсёды незадаволены Аляксей Кулакоўскі:

— Я да гэтага ішоў дваццаць гадоў, а ты з першага разу напісаў такое слаўнае апавяданне.

Вядома ж, я быў усцешаны. Але амаль такія

ж словы сказаў Максім Танк, аднак навела засталася чамусьці ненадрукаванай.

Нехта з рэдакцыйных супрацоўнікаў параіў змяніць назву. Ці не Вера Палтаран?

Праз колькі тыдняў мне паказалі мастацкае афармленне і паклікалі фотакора, каб зрабіў здымак.

Але на кожную чалавечую светлую радасць цёмнаю абложнаю хмараю чамусьці насоўваецца немінучая бяда.

Перастрэўшы мяне на калідоры, устрывожаны альбо, праўдзівей, нават напалоханы намеснік дэкана Р. Булацкі неяк спешна сказаў мне і гэтак спешна, каб не дацца болей гаварыць, адбегся:

— Зайдзі да рэктара. Ён выклікае цябе. — І, нібы схамянуўшыся, удакладніў: — Не-е! Да прарэктара ідзі.

Я зноў спусціўся на першы паверх у той самы паўцёмны калідор, прайшоў міма тых самых чорных дзвярэй з таямнічаю таблічкаю «спецчасць» і спыніўся каля другіх, таксама чорных.

Не помніцца ўжо, што я думаў у той момант, на што спадзяваўся, чаго чакаў, але, вядома ж, не добрага, апынуўшыся ў прасторным кабінеце з жоўтым масіўным сталом, удэкараваным зялёным сукном, і забытым ужо партрэ-

там на сцяне. Помніцца толькі: за гэтым масіўным сталом, што сваёю веліччу ўзбуджаў страх, сядзеў кірпаносы, стрыжаны пад бобрык мужчына сярэдніх гадоў, а поруч з ім на крэсле — густавалосы з ліловым ад перапою тварам выкладчык палітэканоміі — Баравік. Той самы Баравік, якому мы, студэнты, задавалі нялёгкія пытанні пра становішча ў калгасах, і які замест таго, каб адказаць на іх, спяшаўся ў рэктарат ці спецчасць з даносамі на нас. А піў ён, як усе выкладчыкі з кафедры палітэканоміі і асноў марксізма-ленінізма. І, вядома ж, як усе яны, крадком цягаўся за кабетамі, бо нават з выгляду быў адпаведны мужчына ды яшчэ з залатою фіксаю ў верхніх зубах.

Але парушыў маё маўчанне не ён, а прарэктар па прозвішчу, калі не мыляюся, не то Малышкін, не то Малышаў:

— Ты ж, напэўна, ведаеш Уханава? — гаварылася ўсё, як і належыць у беларускіх ВНУ, па-расейску.

Мне прыгадаўся дзябёлы рыжаваты хлопец з капою густых кучаравых валасоў. Але каб сказаць, што я яго добра ведаў, — не сказаў бы. Ён вучыўся на ніжэйшым ад мяне курсе. І я недаўменна паціснуў плячыма.

— Так я табе скажу. Ён шарыць з ножыкам па мінскіх вуліцах і каля кафэ «Вясна» ўчыніў

бойку. Але ты бандыт больш небяспечны.

— Што вы мяне зневажаеце! — не стрываў нарэшце я.

— Ты глядзі, як нахабна ён сябе паводзіць, — бліснуў залатою каронкаю выкладчык палітэканоміі.

— Так вот, пісацель, я Уханава ва універсітэце пакіну, а цябе выключу, — стрыжаная пад бобрык галава нахілілася над паперамі, а потым паднялася зноў. — А ты ведаеш, ад каго залежыць твой лёс?

— Ну, цяпер толькі ад самога сябе.

— Я ж і кажу — фраер. Выключыць яго! — мусіць, каб улісціць шэфу, падтакнуў угодлівы Баравік.

На дошцы для аб'яў, што на курыных ножках стаяла поруч з фотавітрынай сталінскіх ці ўжо ленінскіх стыпендыятаў, здаецца, назаўтра я ўбачыў загад аб сваім выключэнні з універсітэта, падпісаны тым жа прарэктарам — не то Малышкіным, не то Малышавым.

Кажуць, добрае далёка чуваць, а благое — яшчэ далей. Увесь філфак з дзівам і недаўменнем азіраўся на мяне.

У «Маладосці», калі я прыйшоў вычытаць з трапяткою радасцю і ўзнёслым шчасцем першую ў жыцці карэктуру, мяне сцішком паклікаў у свой рэдактарскі кабінет Аляксей Кула-

коўскі. І неяк разважна, нават з халаднаватым спакоем, нібы для інфармацыі, сказаў сухавата:

— Званілі з рэктарата. Напытвалі, ці не друкуем мы цябе. Параілі, вядома, не друкаваць, паколькі ты, як сказалі, звязаўся з замежным антысавецкім друкам. Што здарылася, Вячаслаўко?

— Мая віна хіба ў тым, што я паслаў апавяданне ў беластоцкую «Ніву».

— Ну во, нашкодзіў сабе. «Ніва» тут забаронена. Нашы пісьменнікі, бываючы ў Польшчы, за сто вёрст абыходзяць яе.

Цяпер я нарэшце здагадаўся, што тэлефанавалі не толькі сюды, у рэдакцыю часопіса «Маладосць».

— Апавяданне я не здымаю і буду друкаваць! — як заўсёды цвёрда, нават прыстукнуўшы па стале кулаком, ускрыкнуў Аляксей Мікалаевіч і ўсё ж па-бацькоўску параіў: — Але ж ты перад тым, як што і куды пасылаць, прыйдзі да мяне і парайся.

Не ведаў незабыўны Аляксей Кулакоўскі, спрыяючы мне, дваццацітрохгадоваму выключанаму студэнту і пачынаючаму літаратару, што неўзабаве чакала яго самога. У тую пару ён якраз рыхтаваў да друку знакамітую аповесць «Дабрасельцы», што віхурна прашумела, злёг-

ку скалыхнуўшы непарушныя асновы сацрэалізма. Велічна-халодны айсберг сталіншчыны раставаў і расколваўся, сыплючы крышталёвы звон лёду, але яшчэ мог раздушыць і ўтапіць не адзін белы, поўны адвагі карабель.

Аднак у штармавое, успененае мора літаратуры пад светлымі ветразямі выплывала ўжо новае пакаленне. І пакуль што яно зрабіла ці здзейсніла найбольш — даплыло да неадкрытых берагоў святое праўды. Але ж колькі сярод іх засталося невядомых і нязнаных, выключаных з універсітэтаў, інстытутаў і тэхнікумаў.

Мне прыгадваецца знаёмае з таго далёкага часу імя паэтэсы Рагнеды Грышкевіч, вершы якой я, школьнік, з высокім паднябесным усхваляваннем прачытаў у часопісе «Полымя». І вось на першым універсітэцкім сходзе (1952), што галосна і ўзбуджана шумеў у тэатры оперы і балета, нечаканым агніста-перуновым ударам мяне апаліў жорсткі загад, прачытаны дакладчыкам: «За сокрытие фактов биографии исключить с третьего курса филфака студентку Рагнеду Гришкевич».

Гэта было маё першае, найбольш балючае адчуванне непарушнага, абвеянага пакорным страхам сталінскага рэжыму, які неспатолена прагнуў чалавечай крыві.

І ў памяці ўваскрасае ўжо не адна шчымлі-

вая, як задаўненая рана, блізкая ці падобная гісторыя, калі ў мяне на вачах нявечылася чыясьці маладосць, калечыўся і перайначваўся чалавечы лёс. Але пра гэта з Божае ласкі напішуцца іншыя старонкі маіх нявыдуманых апавяданняў.

*Лістапад—снежань 2000 года*



# Генеалогія,
## альбо Радавод Адамчыкаў

Прозвішча Адамчык паходзіць з памежжа Вялікага княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай (Бярэсце). На Слонімшчыну яно прыйшло разам са знакамітымі Агінскімі. Падкаморына Віленская Барбара з роду Агінскіх, жонка Мальхера Шэмета, сакратара камісіі па складанні Літоўскага Статута, у 1651 годзе «вечным правам набыла за шэсцьсот коп грошай лічбы літоўскай з баярамі, падданымі і ўсімі прыналежнасцямі» навакольныя фальваркі і вёскі і тут жа далучыла іх да маёнтку Наваельня, да якога ўжо прыналежала наша ятвяжская Варакомшчына. Так у тутэйшай мясцовасці з’явілася прозвішча Адам-

чык. Ад упраўляючых ці эканомаў — невядома.

Пасля Шэметаў маёнтак перайшоў у спадчыну Шукевічаў.

У Гродзенскім гістарычным архіве я шчасліва натрапіў на абрывак інвентара (1843) маёнтку Наваельня, які чамусьці апынуўся ў фондах Ашмянскага раёна. Але радасці маёй не было межаў — там пералічваліся назвы мне знаёмых і блізкіх вёсак. А да панскага двара іх прыналежала ажно дваццаць тры з мястэчкам Раготна і шасцю фальваркамі. У суседніх ад нашай Варакомшчыны Аханянах на 9 двароў я з няменшым дзівам прачытаў прозвішчы двух Адамчыкаў — Тодара і Сымона. Багацейшым аказаўся Тодар, не толькі на авечкі, свінні і валы ў хляве, але і на мужчынскія душы ў хаце — іх было ажно сем. І тут у дакумент умешваецца даўняе варакомскае паданне. Пабіўшыся з сынамі — адзін праз гэта павесіўся, а другі ўцёк з хаты, — багаты гаспадар у Варакомшчыне Язэп Юсіфаў Аблажэй, застаўшыся без дужых мужчынскіх рук, пасадзіў у сані і павёз у суседнія Аханяны сватаць сваю дачку. Павёз да братоў Адамчыкаў — Тодара і Захара, у якіх было найбольш хлопцаў. Аднаго з іх — Янку — Язэп Аблажэй і ўзяў да свае дачкі прымаком.

Дзея гэта адбылася яшчэ напярэдадні адме-

ны прыгону. Пасля смерці цесця Язэпа Янка прыклікаў да сябе ў помач малодшага брата Алеся (1834—1919). Нарадзіўшы чацвёра дзяцей, Аблажэіха гвалтоўна памерла. Янка Захараў Адамчык мусіў жаніцца другі раз. І браў ён удаву Ганну з вёскі Дудзічы (як сведчыць назва, там было, напэўна, нямала музыкаў-дудароў), якая, ажаніўшы сына Захара і заручыўшы дачку, кінула гаспадарку і сама пайшла замуж. Ад яе ўжо і нарадзіўся Тодар, будучы мой дзед Фёдар Адамчык (1865—1943), сын Івана і Ганны.

Неўзабаве памёр Янка. Гаспадарку ў свае рукі бярэ старэйшы яго сын Лявон (іншы раз у дакументах — Леў) (1855(?)—1940). Дзеда ж майго, сірату Тодара, гадавала старэйшая сястра Хвядора, што была замужам у Ліжэйках, якія таксама, як і Варакомшчына, прыналежалі да панскага двара Наваельня, толькі былі іншага фальварку — Зосін. Падросшы і падужэўшы, Тодар у зводнай сястры быў і за пастуха, і за малацьбіта, і за сяўца.

Але звернемся, прынамсі, да архіўных дакументаў. Згодна інвентару маёнтка Наваельня ад 5 снежня 1845 года прыгонны Язэп (Іосіф) Аблажэй, дзевяты з адзінаццаці гаспадар у вёсцы Веракомшчызна 3-га фальварку Ахонаў (Ахонва — цяпер рабкоўскія і варакомскія хутары),

валодаў 7 дзесяцінамі* і 2010 сажнямі добрай, 6 дзесяцінамі і 1900 сажнямі сярэдняй і 6 дзесяцінамі ніжэйшай зямлі. Трымаў чатырох валоў, аднаго каня, тры каровы, семнаццаць авечак, трое свіней і меў адзінаццаць вулляў пчол.

Як тут не пасадзіш у сані дачку і не паедзеш сватаць яе за дужага хлопца, каб даглядзець спраўную гаспадарку.

І можна было б жыць, як варакомцы кажуць, на шырокую нагу, каб не прыгон. Згодна павіннасці варакомскі селянін мусіў адбываць на пана тры з канём і тры пешых дні. Гэта кожны тыдзень. Былі яшчэ знакамітыя гвалты, калі з хаты выходзілі ўсе (вядома, хто мог працаваць), пакінуўшы на варце толькі аднаго. На выпадак пажару ці зладзейства. Гвалты прыходзіліся найбольш на жніво і сенаванне.

Апрача таго, была грашовая павіннасць — аброк альбо чынш. Варакомцы, надзеленыя 19 дзесяцінамі воранай зямлі, плацілі ў год 1 р. 44(?) кап.

Не абыходзілася і без рэчавай даніны з сялянскага двара: па 3 курыцы, 10 яек, 3 талькі пражы, 1 фунту невады і 2 фунты сушаных грыбоў.

Сытна, уежна і ўлежна, як сказаў бы варакомец, жылося панам і падпанкам Шукевічам і Лахніцкім. Але час адмераны ўсяму, у тым ліку і прыгону. Праўда, дзед мой не зведаў яго.

У шаснаццаць ці семнаццаць гадоў Тодар вяртаецца ў родную варакомскую хату. Лявону, старэйшаму брату, гэта не ў нос — гаспадарку прыйдзецца дзяліць на двух. Прылучыўшы момант, калі слабейшы і маларослы Тодар аказаўся ў варыўні ці стопцы, Лявон (я помню гэтага высокага сіва-рудаватага дзеда) разам са сваёю Аўдоцяю, схапіўшы за горла, намагаюцца яго задушыць. Невядома, чым скончылася б усё, каб на гэты лямант не надышла суседка Міхаліна...

І гаспадарку сквапнаму Лявону прыйшлося падзяліць ужо на траіх — яго, Лявона, зводнага брата Тодара і іхняга дзядзьку Алеся Захарава Адамчыка.

Як успамінаў мой бацька, Ладзімер Тодараў Адамчык, дзеду дасталася траціна — трэцяя частка валокі.

Атрымаўшы надзел, Тодар нарэшце пачаў падумваць пра жаніцьбу. Жаніўся ён ужо сталым хлопцам на беднаватай, як і сам, дзяўчыне. Браў яе, маладзенькую, з суседняе вёскі Рабкі. Гэта пацвярджае мая выпіска з метрычнай кнігі Наваельнянскай царквы Слонімскага прыхода Літоўскай духоўнай кансісторыі:

«Частка другая. Аб шлюбе

4 ліпеня 1893 года

Селянін вёскі Варакомшчына Фёдар Іванаў Адамчык праваслаўнага веравызнання першым шлюбам, 25 гадоў (на самай справе дзеду было 28 гадоў).

Сялянка вёскі Рабкі Фядора Варфалам'еўна Талкун праваслаўнага веравызнання, першым шлюбам, 20 гадоў.

Паручыцелі па нарачоным: сяляне вёскі Варакомшчыны Піліп Восіпаў Пыцель і Іван (Янэчак. — *В. А.*) Матэвушаў Нагорны.

Па нарачонай: сяляне вёскі Рабкоў Сцяпан Станіславаў Кузюк і Лявонці Антонаў Адамчык.

Настаяцель Наваельнянскай царквы Якаў Іллюкевіч».

Баба Тадора, як прыгадваў бацька, пражыла сорак пяць гадоў: «Хварэла. Папрасіла есці і памерла. На Сёмуху, 7 чэрвеня 1918 года».

Дзед Тодар да канца дзён сваіх застаўся ўдаўцом.

Яны нарадзілі сямёра дзяцей: Стэфаніду, альбо па-вясковаму Стэпку, Настасю, Юльку, Васіля, Маню, Ладзімера (мой бацька. — *В. А.*), Змітрука.

Старэйшая з іх, цётка Стэпка (Стэфанія), выйшла замуж у суседнія Рабкі за ўдаўца Петрука Грыцука (1883—1938) і нарадзіла яму чатырох сыноў і дачку Алену. Пражыла яна з

усіх Тодаравых дзяцей найбольш — дзевяноста гадоў і два тыдні (1894—1984).

Як прызнавалася мне, ніколі ў доктара не была: «Сорамна ж раздзявацца».

Малодшая за яе Настася, бо Юлька памерла дзіцем, выйшла замуж першаю за багатага ў вёсцы хлопца Янку Нагорнага. Ён трохі быў адукаваны. Падвыпіўшы на вяселлях ці хрэсьбінах, чытаў па памяці раздзелы з «Новай зямлі» Якуба Коласа. У былой Заходняй Беларусі гэта была папраўдзе народная паэма. Дай Божа нашым творам мець сёння такую папулярнасць.

Янка Нагорны некаторы час з'яўляўся членам гміннай (валасной) рады, за што ў 1939 годзе, з прыходам бальшавікоў, быў арыштаваны і адпраўлены на лесапавал у Архангельскую вобласць. Цётку Настасю з пяццю дзецьмі на згоне зімы 40-га года вывезлі ў Казахстан, пад Акмолінск.

З двума стрыечнымі братамі я сустрэўся праз трыццаць пяць гадоў. Яны ўспаміналі, як у стэпе лавілі суслікаў. Маці смажыла іх. І гэтым сям'я выратавалася ад страшнага голаду.

Пасля вайны Нагорныя пераехалі ў Польшчу. Там, у вёсцы Гжыбяны каля Лягніцы, цётка Настася і памерла. Гаварыла яна па-беларуску, і польскія дактары не маглі разабрацца,

што значыць баліць сярэдзіна і «крыж».

Дарэчы, два мае стрыечныя браты апынуліся ў польскім войску. Адзін — у дывізіі Андэрса, што была сфармавана на тэрыторыі СССР і пазней прыняла бой пад Монта Касіна, другі — у дывізіі, якая штурмавала вышыню пад Леніна на Магілёўшчыне. Па сутнасці яе паслалі на немінучую пагібель — немцы замацаваліся на вышыні і ў дзотах. Але Франак загінуў, вызваляючы Варшаву, у прадмесці Прага. Ладак, нараджэння 1922 года, апынуўся спачатку ў Англіі, потым — у ЗША, дзе скончыў політэхнічны інстытут. Там для мяне і згубіўся яго след. Кажуць, ён працаваў камерцыйным дырэктарам у касмічным цэнтры.

Але трэба нарэшце вярнуцца да генеалагічнага дрэва Адамчыкаў.

Бацька мой быў шостым дзіцем у немалой дзедавай сям'і. Як сведчыць метрычная кніга Наваельнянскай царквы Дзятлаўскага благачыння, ён радзіўся 17 красавіка (ст. ст.) 1907 года. Хрышчаны 24 чысла таго ж месяца.

Хроснымі бацькамі яго былі Хведар Аляксандраў Адамчык, стрыечны дзедаў брат, і бабіна малодшая сястра Параскева (па-вясковаму, мусіць, Параска) Таўкун.

Хведара Адамчыка, спраўнага гаспадара ў Babакомшчыне, я помню. Помню, бываў у яго ў ха-

це, забаўляючыся з унукамі-дзяўчаткамі, маімі равесніцамі, — і здзіўляўся з прыгожай лямпы з малочным абажурам і насценнага гадзінніка з выштукаванай карычневай шуфлядкай.

У Хведара быў і дагледжаны жоўты ці, праўдзівей, палавы конь, выменяны на старую вопратку ў польскіх пагранічнікаў, што ўцякалі з-пад Стоўбцаў у верасні 1939-га. Прыгадваецца і такі факт. Калі гарэла, расстраляная запальнымі снарадамі (таму і не памечана на мемарыяльных дошках у Хатыні), наша Варакомшчына, стары Хведар не баяўся куль і, стоячы над зараслай крапівой ямаю для спрату бульбы, дзе ўперамешку з перапалоханымі салдатамі ляжалі мы, дзеці і жанчыны, падганяў наіўна-маладзенькіх хлопцаў да бою: «Вы толькі смелыя лазіць па маіх свірнах». Багатыр, як кажуць у нас на багатага чалавека, Хведар, вядома, бальшавікоў не любіў.

Але вернемся да бацькі. З якім здзіўленнем і цікавасцю я прачытаў па-польску метрычны запіс у той жа царкоўнай кнізе: «25 лістапада 1932 года. Грамадзянін селянін Владзімеж Адамчык, сын Фёдара і Фядоры з дому Талкуноў, праваслаўны, вёскі Варакомшчыны гміны Дварэцкай, першым шлюбам, 25 гадоў.

Грамадзянка Браніслава Шэйбак, дачка Яна і Юзэфы з дому Баравікоў, праваслаўная (маці

на самай справе была каталічкай. — *В. А.*) вёскі Варакомшчыны гміны Дварэцкай, першым шлюбам, 23 (26. — *В. А.*) гады.

Паручыцелі:

З боку нарачонага (маладога. — *В. А.*) грамадзяне вёскі Варакомшчыны Ян сын Станіслава Нагорны і Дзімітры сын Фёдара Адамчык.

З боку нарачонай Ян сын Яна Шэйбак і Канстанцін сын Пятра Аблажэй».

Прыгадваецца, бацька ўспамінаў: «Вяселле было перад запустамі (запусты — 15 лістапада па старому стылю, значыць, па новаму — 28-га), пасля ўсіх святых. На ўсе святыя былі ў споведзі. Восень у той год выдалася цёплая. Мы з Броняю варочаліся з Дварца, а насустрач нам ішлі босыя бабы. Вяселле гулялі ў нядзелю рана ў нас, у Тодаравай хаце. Пасля вянца — вечар, ноч і панядзелак — у Шайбаковай хаце, у Броні. Аўторак, серада — зноў у нас, Адамчыкаў».

Маці пра сваё замуства: «Прысніла сон, што прачнулася ў Тодаравай хаце, а там — сонца, яснасць. Падумалася мне, што замуж пайду за Тодаравага Ладзімера. На гэта і выйшла».

А тое, што расказвала перад смерцю, было нават страшнае: «Замуж ішла не любіўшы. Не хацела нават, каб дзіця ад Ладзімера было. Пайду на рэчку паласкаць бяллё і цісну свой

жывот. Таму і ўрадзіўся ты гэтак нездароўчы. Нават голасу не падаваў. Думалі, жыць не будзеш. Адно ж баба Юзэфа, падаслаўшы пялюшку (пялёнку), палажыла цябе на цёплую печ, ты адагрэўся і голас падаў».

Жылі бацькі ў бядоце. Аддзяліўшыся ад дзеда Тодара, наша сям'я знайшла прытулак у падпаветцы — даўнейшай прыбудове пры хаце, дзе стаялі вазы, сані, плугі, бароны і іншыя сялянскія прылады і рэчы. Там бацька адгарадзіў куток, прабіў аконца і паставіў невялікую печ.

Бацька — сірата ў падлеткавыя гады, малазямельны — у сталыя. У дзяцінстве амаль не ведаў, што такое малако. Яго замяняла талакно — прарошчаны, высушаны і змолаты авёс. Штодня ў прагаладзі. «Ідзеш, — расказваў ён, — а перад вачыма ржышча расце». Дзед, аддаючы замуж бедных дачок, аддаваў ім звычайна ў пасаг і астатнюю карову.

Васілю, старэйшаму сыну, выпраўляючы яго ў прымы, дзед аддаў, як з гаркатою ўспамінаў і ўсміхаўся бацька, каня, вазок і стусінавую пугу.

А потым каня трэба было купіць. Удавец Тодар коней любіў — яны ў яго заўсёды palіскаліся ад сытасці і дагледжанасці. Напэўна, лічыў, што дзеці як-небудзь пераб'юцца самі,

а скаціну трэба накарміць.

Умеў і лашчыць іх. Помніцца, як храплі і білі задзёртымі ўгору капытамі дужыя жарабцы, калі іх, сабраўшыся на прыгуменні, валілі маладыя мужчыны.

Востры, наточаны ножык быў заўсёды ў дзедавай кішэні. І як баяліся гэтага ножыка пяцісямігадовыя хлапчукі. Без памяці, толькі чубкі мігцелі, імчалі з нашага панадворка, згледзеўшы майго лысаватага, курносага дзеда. А ён у дадатак быў яшчэ жартаўнік. Бывала, вылегчае барана і нясе ў барановай машонцы два яечкі. Падыме іх і патрасе перад маладзіцамі. А тыя — у злосць і кляцьбу. А калі спячэ іх на вуголлях збоку печы — мне, малому, ласунак.

Мяне ён чамусьці любіў і расказваў мне нямала сёння ўжо забытых казак.

У вайну дзед цяжка захварэў. Канаў у гарачцы, успамінаючы сваю найлюбшую дачку Настасю, вывезеную саветамі ў Казахстан. Хапаў сякеру і выбягаў з хаты ці, дакладней, з гумна, дзе жыў пры меншым сыне Змітруку, бег забіваць Міхася Лазовіка, які пры бальшавіках, будучы старшынёю сельсавета, пісаў даносы і складаў спісы на дэпартацыю. Дзеда лавілі, бо магла ўчыніцца новая бяда — немцы арыштавалі б сям'ю Лазовіка, які сам падаўся ў партызаны.

І вось кароткая даведка пра смерць дзеда,

выпісаная мною з Наваельнянскае царкоўнае кніжкі (Дзятлаўскі архіўны ЗАГС). Дарэчы, запіс зроблены па-беларуску — як відаць, на праваслаўных святароў патрэбна цвёрдая рука, каб яны да Бога загаварылі родным словам.

«1943 год. Студзень. 26 дня памёр, 27 пахаваны жыхар вёскі Варакомшчына Дзятлаўскага раёну Адамчык Фёдар, сын Івана і Анны, удавец, праваслаўны, 78 гадоў.

Пратаіерэй: Вяч. Лапацінскі».

Бацька, што меў на лічбы камп'ютэрную памяць, чамусьці ўдакладняў, што дзед памёр 28 лютага. І я яму веру болей, чым запісу ў метрычнай кнізе.

І мне прыгадваецца марозны хмуры дзень. Белы атынкаваны дом у мястэчку Наваельня, дзе мы, пагарэльцы, знайшлі часовы прытулак. Азяблы бацька, які забег пераабуцца і сказаў, што на могілкі ўжо вязуць дзеда. Я зірнуў у акно і ўбачыў жалобны картэж: фурманка з новаю жаўтлява-ружоваю трунocc, наперадзе яе — высокі, лысы дзядзька Пятрук з узнятым карычневым крыжам.

А за возам — купка жанчын і мужчын. Збоку воза ў накінутай на галаву і на плечы балонкавай хустцы ідзе цётка Стэпка.

Дзеда пахавалі поруч з яго ўнучкаю, маёю роднаю сястрою Геняю (Яўгеніяй), што памерла

ад водры напрадвесні 1941 года. Дату і дзень Генінай смерці называў бацька: «Як зязюлька закуе, так і яе ўспомню. Паўдзеўкі было — «Кацюшу» спявала. У маі памерла, у чацвер, пятнаццатага».

Да гэтых успамінаў іншы раз дамешваўся і мацярын жаласны голас: «Спытала я ў яе: «Памрэш?» «Памру», — кажа. «А якую ж табе на смерць сукенку скласці?» Я адчыніла куфар і паказваю на кітайскі шоўкавы шалік, які мне бацька з чыгункі, з Маньчжурыі прывёз. «Во гэту», — сказала яна, паказаўшы на шалік. З яго і пашыла ёй вуаль».

Памятаю, перад пахаваннем кароткую труну паставілі ў настылай халоднай царкве, помню дзяўчынку ў труне з пасінелымі губкамі, з вянчыкам на лобе і гэты зеленаваты вуаль, пашыты з празрыстага ядвабу...

Запісу аб смерці сястры я не знайшоў — царква, як гаворыцца, была ўжо адлучана ад дзяржавы.

Метрыка Геніна ёсць. Яна на польскай мове і з недаравальнымі памылкамі. Месцам нараджэння чамусьці памечана суседняя вёска — Рабкі. А мне помніцца, як я начаваў у дзеда Шайбака, бо ў тую ноч (10 жніўня 1938 года) мая маці нарадзіла дзіця. Гэта і была мая сястра Геня.

Вось нарэшце надышла пара, калі я мушу зірнуць з другога боку на галіны майго генеалагічнага дрэва. Па матчынай нітцы я паходжу з Шайбакоў. І, мусіць, трэба агаварыцца, што ў нашым рэгіёне поруч з славянскаю тапанімікай можна натрапіць на літоўскую альбо татарскую. Вёскі літоўскія, а праўдзівей — ятвяжскія, як, для прыкладу, Погіры, Малдуці, Гезгалы, Ятвезі, межавалі з славянскімі Сядлярамі, Ганчарамі, Рыбалавымі, Дубатоўкамі, Агароднікамі, а тыя, у сваю чаргу, з татарскімі: Таркачы, Уланаўшчына, Шайбакова, Карыцы.

Як Шайбакі апынуліся ў нашай ятвяжскай Варакомшчыне — для мяне яшчэ застаецца загадкаю. Што на рэчцы Ятры ці Ятве стаяў Шайбакоў двор, гэта я знайшоў у адным з тамоў Актаў, выдадзеных археаграфічнай камісіяй у Вільні. А Ятра ці Ятранка абмывае агароды тых жа Шайбакоў яшчэ сёння. Але прозвішча Шайбак у нашай ваколіцы цяпер звычайнае, хоць паходзіць яно ад вядомага хана Шайбака, разбітага з яго цьмою пад Лідаю.

Калі ж аднойчы я прызнаўся казахскаму паэту, што ў маіх прадзедаў па матчынай лініі было такое прозвішча, той здзівіўся і прывітаў мяне кампліментам: «О, з такім прозвішчам вы былі б у нас у пашане. Яго калісьці насілі

аўтарытэтныя людзі, і мы пра гэта не забываемся».

Добрае слова, як вучыць Каран, — яно як дрэва добрае: корань яго цвёрды, а галіны ў небе...

Таму і бяруся за адну з іх — разгортваю інвентар альбо рэестар панскага двара Наваельна Слонімскага павету Гродзенскай губерні, складзены 5 снежня 1845 года. Ён, двор, ужо раздзелены паміж сёстрамі Шукавічанкамі — Генрыетай Валовічавай і Езафінай Ляхніцкай. Ці не апошняя вядомая як руская пісьменніца? Не, хутчэй яе дачка. Але цікавасць мая ў іншым. Да трэцяга з васьмі фальваркаў — Ахонаў (там цяпер варакомскія хутары) прыналежала наша невялікая, усяго на адзінаццаць двароў, Веракомшчына (так у дакуменце. — *В. А.*). Трэці двор — Шайбакі, мае прапрадзеды, дзявяты — Іосіфа (Язэпа) Аблажэя, куды ў прымы прыстаў мой прадзед па галіне Адамчыкаў — Янка Захараў. Але пра яго ўжо апавядалася вышэй. Шайбакі ў параўнанні з Аблажэем не вельмі і багатыя: адзін конь, два валы, дзве каровы, чатыры авечкі, дзве свінні. Гэта на дзесяць душ, дзе пяцёра рабочых.

Надзел кожнаму двару: прысядзібнай — 2000 сажняў (0,910 га), ворнай — 19 дзесяцін 10 сажняў (валока альбо 21 га), сенажаці —

2 дзесяціны 28 сажняў (трохі больш як 2 га).

Зрэшты, з голаду Варакомшчына, нават прыгонная, не памірала. Яго найчасцей прыносілі войны, у якіх, як заклятая, кожны раз палала наша саламяная, прыдарожная вёска. Вынішчаў яе і мор — халера, крываўка ці чума. Пра гэта сведчыць круглы пляскаты камень з замшэлым і ўжо нечытэльным тэкстам. Я разабраў толькі два словы: «Свента Марыя» (папольску). Камень ляжыць перад вёскаю. Савецкі танк ссунуў яго з сярэдзіны вуліцы, балазе не разбіў.

Але разгорнем пажоўклы інвентар, спісаны рыжаватым чарнілам. Шкада, што ў ім пазначаныя ўсяго толькі імёны і прозвішчы асноўных гаспадароў альбо, кажучы моваю прававодцаў, юрыдычныя асобы. Далей усё абязлічана — рабочыя і «прочие» душы. Не вызначаны сем'і, не ўказаны гады, як гэта іншы раз рабілася ў інвентарах другіх маёнткаў.

Таму ў трэцім двары асноўным гаспадаром упісаны Казімір Шайбак, а прозвішча яго брата, роднага ці стрыечнага, Фэлікса Шайбака ўжо няма.

Я знайшоў гэтае прозвішча ў «Алфавіце метрыкаў Дварэцкага касцёла», складзеным у 1931 годзе ксяндзом Янам Карвелісам. Там аказаўся толькі год смерці Фэлікса Шайбака —

1881. Тут жа быў зафіксаваны і год скону (1889) яго сына — Пятра, майго прадзеда па маці. Апошні памёр адносна маладым, маючы гадоў сорак. Пасля сябе ён пакінуў нямала смешных і забаўных гісторыяў, якія дайшлі нават да мяне, і точаны драўляны кубак з золатам, якое паціху, будучы маладою ўдавою, прапіла на кірмашах з падкімі на чужое мужчынамі і распазычыла сваякам (тады якраз распрадаваліся панскія двары) мая прабаба Ганна.

Не дзіва, што, вярнуўшыся з бежанства, з далёкага чараміскага Бугуруслана, куды трапіла ў 1915 годзе, яе дачка Разалія прыгадала марна растрачанае золата і да паўсмерці збіла васьмідзесяцігадовую маці. Тая толькі здужала дайсці ў хату да сына Янкі, каб ужо паказаць скрываўленыя сінякі і бітыя раны і яшчэ папрасіць, каб прыгатавалі вады ёй памыцца, бо яна сабралася паміраць. У тую ноч яна і сканала.

Аднак бяда аплочваецца бядою, зло — злом. На абочыне шашы насупраць нашае вёскі грузавік, за рулём якога сядзеў п’яны савецкі афіцэр, рэзка хіснуўшыся ўбок, бартом ударыў спадарожнай жанчыне ў плечы. Жанчына ўпала, але з гарачкі яшчэ паднялася, села і пачала здымаць рукавіцы...

Мужчыны, якія ішлі ўслед, у забітай жанчыне пазналі Шайбакову Разэлю з Вара-

комшчыны. Гэты трагічны выпадак здарыўся напрадвесні 1953 года.

Кожная сям'я, прынамсі, мае свой немінучы, наканаваны лёсам знак. Ці, праўдзівей, фатальную непазбежнасць. Гэтак жа трагічна загінула і старэйшая сястра Разаліі — Станіслава, зваліўшыся на чыгуначным пераездзе з воза, нагружанага снапамі ці сенам, і трапіўшы галавою якраз на рэйку.

Мая маці, успамінаючы цётку Станіславу, кожны раз расказвала з сарамлівым смехам, як яна ў завейныя зімовыя дні, калі хадзіла да польскай школкі ў далекаватыя Аханяны, начавала там у свае цёткі. А маладая салдатка, муж якой ваяваў дзе-небудзь пад Псковам, прымала ў сябе дома дужых рыжых абознікаў-немцаў, што дастаўлялі на фронт за Навагрудкам амуніцыю і правіянт.

«А нам што, малым?.. Салдаты насыплюць і цукерак і цвыбікаў (сухарыкаў). А яе Бортнік мужык добры быў. Вярнуўшыся з фронту, бабі Ганне акоп зрабіў, бо хата згарэла...»

Малодшы брат майго дзеда Іосіф, ці па-вясковаму — Язэп, быў трохі пісьменны. Напэўна, скончыў народнае вучылішча, што адкрылася ў суседніх ад нас Карыцах. Таму ў часе рэвалюцыі, калі інтэлігентнаму чалавеку давяралі толькі кірку з лапатай, ён, бядак, мог заняць вышэй-

шую, нават кіруючую пасаду: Іосіфа Шайбака прызначылі дзяжурным па станцыі.

Там, на Паволжы, дзе ён апынуўся з сястрою Разаліяй, у часе эпідэміі халеры, якая пачалася разам з голадам, Іосіф Шайбак і памёр.

«Нябожчыкаў вазілі, як дровы, — помніцца, прыгадвала баба Разэля. — З усяго вялікага дому на два паверхі засталася толькі я ды мужчына».

Але бабе Разэлі, калі яна расказвала пра свае бежанскія пакуты, голад і жорсткасць бальшавікоў, амаль ніхто ў нашай Варакомшчыне не верыў. «Выдумляе», — казалі.

Бальшыня варакомцаў, асабліва гультаі, чакалі, як яны гаварылі, прыходу камуны. Калі ў нашага суседа Юліся Нагорнага з капою дзяцей у хаце хтосьці спытаў, чаму ён не ўстаўляе ў акно замест пабітай новую шыбу, той адказаў: «А нашто? Неўзабаве прыйдуць бальшавікі і дадуць мне хату з вазонамі».

Праўда, дзеду майму Янку Пятровічу Шайбаку (1875—1944), прыйшоўшы, бальшавікі далі, як бедняку, з панскага двара, здаецца, з Язяран, дзе калісьці гаспадарыў брат Дамейкі, сытую вішнёвую карову. Я пасвіў яе і помню, як ашалела-радасна крычалі мне, найменшаму з іх, варакомскія пастухі: «Чэсік, пасі ўсюды! Вайна пачалася».

У той жа ўжо згаданай касцельнай кнізе, якую склаў ксёндз Ян Карвеліс, у раздзеле «Метрыкі шлюбныя» я натрапіў на прозвішча свайго дзеда. Вянчаўся ён, Ян, сын Пятра і Ганны Шайбак, у 1899 годзе. Браў за жонку Юзэфу Баравік, дзяўчыну з працавітай каталіцкай сям'і. Дарэчы, ён і сам быў каталік. Юзэфін бацька Лаўрын (Ваўжыняц) Баравік меў асаблівы аўтарытэт сярод навакольнага сялянства — ён у Дварэцкай воласці працаваў пісарам.

У яго, як прыгадвала мая маці, была адна на ўсю вёску лазня, смольная, добрая хата, абнесеная парканам, а за ім — садок, які называлі Лаўрынавым раем, і ў ім — калоды пчол.

Матчын дзед быў працавіты і спраўны гаспадар.

Матчын бацька, Ян Пятровіч, аказаўся чалавекам іншай натуры — любіў скрыпку, рыбалку, доўгія, на ўсё лета адлучкі з дому, калі ён ездзіў ажно ў Кітай на будаўніцтва Маньчжурскай чыгункі.

«Бывала, надыдзе вясна, пара сяўбы, а наш бацька збіраецца на чыгунку, — успамінала не раз яго дачка, мая маці Браніслава. — Дома ўпраўляецца пры малых дзецях адна Юзэфа, твая баба. Яшчэ і грошы зарабляе: назбіраўшы разам з дзецьмі воз каменняў на полі, вязе іх

прадаваць. Тады якраз брукавалі шашу».

Для мяне мой дзед пахнуў тытунём і рыбай. На ім вясёлкай адсвечвала луска, асабліва на грудзіне, дзе ў яго вісела торба з рыбаю, а пальцы на правай руцэ былі жоўтыя ад тытунёвага дыму. Помню яго торбачку з крэсівам, асколкам крэменя і пухкай, рудавата-цёмнай, як сухая порхаўка, губкай. Прыгадваю, як ён варыў, тоўк і сушыў скрылі яловай губы.

А найперш у памяці ўваскрасае яго самаробная, што вісела на сцяне над ложкам, светлаяловая скрыпка. Дзед быў яшчэ музыка.

Гэта адбывалася, як у нас кажуць, не за маю памяць. Узяўшы скрыпку і сабраўшы гурт спеўных маладзіц, дзед у велікодныя дні хадзіў па вёсцы і пад вокнамі хатаў выспёўваў валачобныя песні.

У дзеда быў спрыт не толькі да скрыпкі, але і да кельмы — ён умеў вымураваць цагляную печ. Як і зрубіць новую хату. Сваю ён будаваў, нават не маючы каня, болей перанёсшы дзеравін на ўласных плячах.

Коні з'яўляліся ў яго пазней, калі, зарабіўшы грошы на чыгунцы, ён вяртаўся ўвосень дадому. Тады і пачынаўся гандаль коньмі. Дзедператвараўся ў цыгана. А дзе гандаль, там і барыш, там і гарэлка.

Ізноў жа ўспамінала мая маці Браніслава,

як, не стрываўшы гэтага гандлю і залітых гарэлкаю вачэй, баба Юзэфа перахрысцілася і дастала з-за коміна недасушаны грабавы біч. Дзед, упаўшы на парозе, толькі цяжка стагнаў.

Пасля такога хрышчэння дзед тыдняў два адлежваўся на печы, а прычакаўшы вясны, зноў ехаў на заробкі ў далёкую Маньчжурыю.

Адтуль ён прывозіў такія-сякія падарункі, а найперш не знаныя дагэтуль у нашай Варакомшчыне прыгожыя шоўкавыя хусткі і шалікі.

Памёр дзед на згоне зімы 44-га года, захварэўшы на запаленне, — пасля спаленай немцамі хаты на голым хутары, дзе ўжо нават засадзіў садок, ён збудаваў дашчаную буду, у якой жыў з новаю жонкаю, бо Юзэфа памерла перад вайною, і ў якой застудзіўся падчас дужага студзеньскага марозу. Яму, здаецца, яшчэ не было і сямідзесяці.

Як адзначалі ў даўнейшых пасведчаннях аб смерці, пасля сябе ён пакінуў трое дзяцей: двое сыноў і дачку, маю маці Браніславу Янаўну.

Старэйшаму сыну Яну бралася за сорак.

Ёсць і метрыка яго хрышчэння. Для мяне засталося толькі загадкай, чаму хрысцілі дзядзьку Яна не ў блізкім, Дварэцкім, а ў дальшым — Дзятлаўскім касцёле.

«Тысяча дзевяцьсот трэцяга года Кастрыч-

ніка семнаццатага дня ў Дзятлаўскім Рымска-Каталіцкім прыходскім касцёле (збудаваны ў 1632 годзе, фундатар Леў Сапега. — *В. А.*) ахрышчана дзіця імем Іван (Ян) ксяндзом Юсцінам Пятранісам, настаяцелем Дзятлаўскага касцёла, з здзяйсненнем усіх абрадаў таемнасці».

Не ведаю, у якім годзе, але дзядзька Ян скончыў Рабкоўскае народнае вучылішча (у суседняй вёсцы) і зіму ці дзве ў роднай вёсцы працаваў настаўнікам — тым, вядомым па коласаўскай паэме «Новая зямля», вясковым дарэктарам.

Ад пашы да пашы — ад глухое восені да ранняга прадвесня — у свайго будучага швагра вучыўся мой бацька, Ладзімер Тодаравіч. Вучыліся па чарзе ў хатах, дзе былі вучні.

Адзін вучань у хаце — адзін дзень вучобы ў ёй. А ў Петрука Аблажэя, вядомага ў нашай вёсцы штукара і гультая, дзяцей было найбольш.

Мой бацька са смехам успамінаў: «Мы вучымся, а ён, Пятрук, прывязаўшы за бэльку, мне круком сухую аўчыну. Наступае босаю нагою на вяроўку. Бачыць, што вучыцяль павярнуўся да дошкі і стаіць да яго спіною, ён адскочыць і зробіць які выбрык нагою, альбо рукамі паказвае розны муштрыкі. Дзеці, вядома, раго-

чуць. Ім ужо не да вучобы, калі дзядзька чвэрыць розныя штукі».

А пра гэта ўжо расказвала маці. Шаснаццацігадовы рослы хлопец, калі польскі фронт перад Вялікаднем 1919 года наблізіўся да мястэчка Наваельні, уцякае з дому і, прызнаўшы сябе за паляка, уступае добраахвотнікам (охотнічым) у шэрагі польскага войска. Уцякае не адзін, а намовіўшы равесніка і суседа Язэпа Рака (арыштаваны пазней, у 30-я гады, у Слуцку за пераход польска-савецкай граніцы).

Першае баявое хрышчэнне неабстраляныя салдаты прымаюць недалёка ад роднае хаты каля вёскі Рыбакі на рэчцы Маўчадцы (цяпер там забудаваны знакаміты санаторый «Радон»). Ім шанцуе — бальшавікі, кінуўшы зброю і кажухі, якія тут жа падбіраюць варакомскія пастухі, спешна ўцякаюць на ўсход. Вызвалены Навагрудак. Згаладалае польскае войска, трацячы падбітых, здарожаных коней, губляючы не столькі ад куляў, колькі ад хваробы сваіх неабвучаных салдат, наступае на Мінск.

Недзе ўжо за Навагрудкам шаснаццацігадовы шараговец захварэў на тыф. Пэўна, заразіўся. Завашывены і ледзьве жывы, ён варочаецца дадому — у родную Варакомшчыну. Наша баба Юзэфа, кабета разумная ды спрактыкаваная ў леках, зёлкамі ды напараным льняным

семем адхадзіла сына. Але, акрыяўшы, добраахвотнік зноў уцякае з дому, каб паступіць у падафіцэрскую школу ў горадзе Слоніме. Аднак афіцэрскага ці падафіцэрскага звання польскія вайсковыя ўлады прысвоіць беларусу-добраахвотніку не захацелі. І паступова беларус-католік пачынае разумець, што ён не сапраўдны паляк, а чалавек нейкага другога, ніжэйшага гатунку.

«Што я беларус, — прыгадваючы тыя далёкія гады, расказваў мне ўжо сам дзядзька Ян, калі астатні раз наведаўся ў родную Варакомшчыну з Польшчы, з кашубскага мястэчка Лэба, дзе апынуўся пасля вайны, прайшоўшы ў другі раз добраахвотнікам нялёгкі фронт, — даведаўся пасталеўшы, калі пачаў выпісваць віленскія газеты на роднай мове».

Тады ён і арганізаваў з больш-менш пісьменных маладых мужчын-вяскоўцаў, што скончылі народнае вучылішча і маглі ўжо чытаць газеты і разбірацца ў палітычнай сітуацыі, якая запанавала ў Заходняй Беларусі, гурток грамадоўцаў. У Агніску каляёвым (культурным вогнішчы чыгуначнікаў) станцыі Наваельня яны ўжо ставілі беларускія спектаклі, аб чым нават паведамляла віленская прэса, і праводзілі таемныя сходы.

У нашай Варакомшчыне, у хаце дзядзькі

Яна, на гэтакім беларуска-нацыянальным, затоеным ад паліцыі і канфідэнтаў-сышчыкаў сходзе пабылі дзеячы Беларускай сялянска-рабочай грамады, шматлікай, папраўдзе народнай партыі, якая налічвала ў сваіх шэрагах каля ста тысяч членаў, найболей сялян. Мой бацька-нябожчык прыгадваў такія прозвішчы: Рак-Міхайлоўскі, Валошын, Мятла, Аўсянік.

Апроч сялянска-асветніцкай дзейнасці, мой хросны займаўся зборам нашага, варакомскага фальклору.

Шкада, што гэты неацэнны скарб — запісы песень, казак, паданняў, прыказак і прымавак, поруч з падшыўкамі віленскіх беларускіх газет і часопісаў, купленымі на астатні сялянскі грош, выданнямі Кухты і Клецкіна, — увесь гэты скарб згінуў у агні 41-га года, калі запальнымі снарадамі была расстраляна наша вёска і яе навакольныя хутары.

Восенню 1944 года дзядзька Ян, як ужо сказана вышэй, добраахвотна ўступіў у Польскае войска, каб скончыць вайну каля чэшскай Прагі. Прадчуваючы, што ўсёдасведчаны смерш ці НКВД за нацыянальна-беларускую дзейнасць могуць не даравацць, застаўся як польскі салдат на землях «адзысканых» (землях вернутых) — нямецкіх, што адышлі пад народную Польшчу. Нават атрымаў ва ўзнага-

роду баўэрскую гаспадарку. Дадому не вярнуўся, паклікаўшы ў помач васемнаццацігадовага сына. Ды і цяжка было вяртацца да старэйшай за сябе на дванаццаць гадоў жонкі, да якой калісьці, беззямельны, прыйшоў у прымы і з якою жыў не ў згодзе.

Але нядрэмнае вока НКВД высочвала і выследжвала нацыянальных беларускіх дзеячоў не толькі ў Беларусі, але і за яе межамі. Арыштаваны і кінуты за краты разам з акоўцамі (Армія Краёва) і гамулкаўцамі (былыя польскія камуністы), дзядзька Ян нізашто адбыў два гады турмы. На волю ён выйшаў разам з тым жа Гамулкам, у дні хрушчоўскай адлігі, што прынесла пацяпленне і ў Польшчу.

Астатнія гады жыў на беразе Балтыйскага мора, у мястэчку Лэба, загадваючы адным са збожжавых складаў, якія збудавалі яшчэ немцы і куды з караблёў згружалі зерне.

Там, на чужыне, і памёр ён, змагар за беларускую справу, як паміралі тысячы гэтакіх, адданых Бацькаўшчыне, то ў халоднай тундры, то ў гарачай Аргенціне, то за блізкі свет нечуванай Аўстраліі.

Малодшы дзядзькаў брат Юзаф, што па прыкладу старэйшага цягнуўся да беларускага друкаванага слова, зведаў ужо савецкую турму і вярнуўся адтуль хворы на трасцу. Гэта з яго га-

рышча ў мой карычневы «шкапік» трапілі кніжкі Адама Станкевіча, Уладзіміра Жылкі, Наталлі Арсенневай, Антона Навіны, Вінцука Адважнага, Максіма Гарэцкага.

Не дзіва, што малады сарамяжы аспірант Алесь Адамовіч на першай сваёй лекцыі, атрымаўшы маё запытанне, ці ведае ён названых літаратараў і што чуў пра іх, за трэцяй маёю запіскаю наліўся кроўю і выкрыкнуў: «Хто мяне экзаменуе?» Пасля гэтага выкрыку я зразумеў, што распытваць пра заходнебеларускіх дзеячоў і знарок забытых літаратараў не трэба. Але праз пэўны час, асмялелы з нагоды палітычных пераменаў, я з падобнай цікавасцю падступіўся да Максіма Танка, але ён спахмурнеў, а потым знайшоўся — пачаў расказваць анекдот пра раздзел абкамаў: «Во паслухай. Аднаму трэснулі молатам па лобе. Ён пайшоў са скаргаю ў сельскі абком. А там кажуць: звяртайцеся ў абком прамысловасці. Во калі сярпом па я...х, тады — да нас». І раскацiста, дужа, па-Танкаўску зарагатаў.

Не менш цікавыя гісторыі можна было б расказаць пра маіх стрыечных братоў, што, прайшоўшы высылку, фронт, апынуліся далёка ад роднага парога. А дзеці іхнія, тым болей унукі, што гавораць па-ангельску, па-польску, па-эстонску ці па-расейску, наўрад ці будуць распытваць і ўяўляць тую шарую вёску ў

шэсцьдзесят хат з саламянымі стрэхамі, з-пад якіх іхнія дзяды выпырхнулі ў свет.

Генеалагічнае дрэва Адамчыкаў так шырока разраслося, што галіны яго аплялі ўсю зямную кулю. І няхай прыветна і ўтульна шумяць.

Я толькі мушу ўспомніць тут свайго малодшага брата Яна, што марыў стаць музыкантам, але, скончыўшы мараходнае вучылішча, трапіў на катэр матарыстам, які абслугоўваў ледакол «Ленін». У беспрасветны кіпучы шторм, што гнуў і ламаў на палубе парэнчы, іхні катэр дапłываў ледзьве да берагоў Англіі, каб падвезці паліва ледаколу, які вёў разведку.

З гэтых падарожжаў малодшы брат вярнуўся дадому хворым. Першая аперацыя ў Бараўлянах прадоўжыла яму жыццё, але не на шмат. Другое ўжо не было, бо не выявілі захворвання — лячылі туберкулёз.

А ён хацеў жыць. Яму ішоў усяго сорак дзевяты. «Чэсік, знайдзі лякарства», — папрасіў ён, працягваючы кволую руку пры нашым астатнім спатканні. Праз тыдзень ён памёр. Стаяў грымотны жнівень 1993 года.

Якая фатальная для мяне лічба «3».

*Мінск, 22 снежня 1999 года*

P. S. Згодна гіпакратаўскаму трактату «Аб сядміцах», у чалавека ёсць сем сезонаў, якія

называюць узростамі: да сяміжды сямі — пажылы, аж да пяцідзесяці шасці гадоў, да сяміжды васьмі і адтуль — стары. Значыць, сённяшні мой узрост паміж шостым і сёмым сезонам. І мне ўжо забаронена ўжываць салодкае, есці толькі салёнае і памяншаць насалоду.

На гэтым скончу, прыгадаўшы толькі Арыстоцеля: «Той, хто шукае мяне, знойдзе мяне ў дзецях...»





Дадатак

# Адам Глобус

# ТАТА + МАМА

# Тата

*Словы пра бацьку майго —*
*Чэся (Вячаслава) Адамчыка*

## Вугаль

Тата страшэнна не любіць рыпення вугалю на зубах. Адны калоцяцца, калі нехта жалезкаю чыкірыжыць па шкле, другія не пераносяць шапацення спарахнелай паперы. А бацька не есць вугаль. Ён не можа пакаштаваць печанай у вогнішчы бульбы, што для беларуса дзіва-дзіўнае.

## Ручкі

Калі тата нешта любіць больш за кнігі, дык гэта ручкі. Ён прывозіць іх адусюль: з Нью-Йорка, з Парыжа, з Масквы... У татавым стале поўная шуфляда самых розных ручак і алоўкаў. І калі збіраюся ў якое падарожжа, тата нагадвае пра ручку і сшытак. З дзяцінства я помню бацьку, які над ракавінай старанна прамывае кітайскую асадку. Ён любіць, каб ручка пісала тоненька і добра пускала атрамант. А першы раман «Чужая бацькаўшчына» піша школьнай ручкаю, абмакваючы сталёвае пяро ў белую чарніліцу. Апошнім часам тата пачынае друкаваць на машынцы, але кожнае другое апавяданне ён прыносіць да маёй сакратаркі Надзеі ў тонкім школьным сшытку, напісанае ручкаю.

## Нажы, ножыкі, сцізорыкі…

З вайны ў таты застаецца любоў да нажоў. Пэўна, гэта генетычнае, бо ў сялянскай хаце нашага дзеда Ладзімера нож — культавая рэч. Ніхто без дзедавага дазволу не можа крануць нож. Ён ляжыць у шуфлядзе кухоннага стала, другога стала ў хаце і няма. Гэта ў бацькоўскай

кватэры шмат сталоў і безліч нажоў. Тата з дзяцінства нажы збірае. Кажа, што ў вайну меў тры казацкія шашкі. Даводзілася хаваць іх у лесе, увагнаўшы ў зямлю па самыя тронкі і замаскаваўшы мохам. Нехта высачыў і скраў бацькаву зброю. Ад усяго ваеннага застаецца толькі нямецкі штых-нож. Тата хоча назваць свае чатыры раманы, сабраўшы пад адной вокладкай, «Цень ад штыха». Але перавыданне раманнага цыкла адкладаецца ў няпэўнасць. На жаль. А я дык нажы, ножыкі, сцізорыкі не шаную. Купляю наступны, калі папярэдні губляецца альбо ломіцца.

## Кніжныя паліцы

Тата любіць сядзець на канапе насупраць кніжных стэлажоў і разважаць пра літаратуру. Я магу гадзінамі стаяць побач і слухаць, слухаць... Развязваецца спрэчка. Няма такога, каб не распачалася палеміка. З-за Камю, ці з-за Дастаеўскага, ці з-за Вавенарга... Абавязкова ці я, ці тата ловім субяседніка на памылцы ў цытаце ці няправільнай даце нараджэння якога з класікаў. Спрачацца каля паліцаў з кнігамі — сямейная традыцыя. Мы даводзім адзін аднаму сваю праўду з томікамі ў руках. Тата паважае

раманістаў, а мне даспадобы апавядальнікі. Ён выдатна ведае расійскую літаратуру, а я так ніколі сур'ёзна і не перачытваў Цютчава, бо захапляўся Усходам — Сёнагон, Басё, Бусон, Іса... Мы розныя, але страшэнна любім сядзець на канапе, насупраць кніжных паліц, і весці дыялог пра літаратуру.

## Сябры

У таты няма і не было сяброў, у маім разуменні гэтага паняцця. Можа, у юнацтве ён і меў сябра, я пра тое зусім нічога не ведаю. Дый калі ўважліва прачытаць татавы творы, наўрад ці знойдзецца яскравы матыў сяброўства. Тата шмат з кім падтрымліваў добрыя адносіны, але каб ён на роўных з кімсьці сябраваў — такога не было. Ён больш за мяне еўрапейскі чалавек, ён заўсёды трымаў людзей на адлегласці. Пэўна, таму тата любіць размаўляць з мала-дзейшымі, з тымі, хто не можа быць яму за сябра. І сваю выснову, што сябры знікаюць у пэўным узросце, недзе ў гадоў трыццаць, я зрабіў, назіраючы за татам больш, чымся за сабою.

## Зялёны акіян

Тата спакойна кажа пра смерць. Яшчэ ў сорак ён пачаў гаварыць сваім раўналеткам, што стары, што ён адмаўляецца ад той ці іншай справы або пагулянкі з-за ўзросту. «Які ж ты стары, Чэсь? Ты ж маладзейшы за нас на 10 гадоў!» — здзіўляліся некаторыя. «Не-не, я стары», — настойваў тата. Таму, калі ён мне з братам Міраславам сказаў, што сур'ёзна хоча пагаварыць пра сваё пахаванне, мы ўспрынялі гэта як належнае. Гэта было ў 1998 годзе, улетку, мы сядзелі за сталом на татавай кухні, калі ён сказаў: «Я хачу знікнуць у зялёным акіяне. Мне не падабаюцца менскія могілкі. Я хачу вярнуцца на сваю Навагрудчыну, у Варакомшчыну, у свае лясы, і назаўсёды знікнуць у зялёным акіяне...»

## Прыніжэнні

Значна лягчэй перанесці ўласнае прыніжэнне, чым бачыць прыніжэнне таты. А можа, толькі здаецца. Адно ведаю дакладна: глядзець, як тата прыносіць скрэмзаныя рукапісы сваіх твораў ад цэнзараў-рэдактараў, больш чым непрыемна. Яны выкрэслівалі палітыку, бурылі сюжэт, кастрыравалі вобразы і мову.

Апавяданне «Кароль Нябожа»: з 32 старонак стала 18. І так праз усё жыццё, праз усю творчасць. Пэўна ж, таму большасць сваіх кніжак я выдаваў уласным коштам, паўлегальна, без цэнзараў і паскудных дзяржаў.

## Галенне

Тата голіцца перад выхадам з дому, а ў выхадныя — перад прыходам гасцей. А я, наадварот, галюся з самага ранку, я не магу сесці снедаць, не пагаліўшыся. А тата можа да вечара няголены па кватэры прахадзіць, але няголены спаць не ляжа. Барады ён ніколі не насіў, бачыў у барадзе азіятчыну, а ён еўрапеец, каталік, і мусіць галіцца.

## Голас

Які марудны, запаволены, слабы зрабіўся татаў голас. У тэлефоне ледзь чуваць. Даводзіцца перапытваць пра адно і тое ж па некалькі разоў. Раней тата гаварыў у тэлефон вельмі гучна, ледзь не крычаў, баяўся, што не дачуюць, не зразумеюць. А цяперака гаворыць ціха і ніколі і нічога не баіцца.

## Сэрца

У 1971 годзе ў таты схапіла сэрца. Ён ляжаў апрануты, на засланым ложку. Панаехала дактароў. Усе паўтаралі страшны выраз: «Схапіла сэрца!» І мне ўяўлялася нейкая рука ў гумовай пальчатцы, якая хапае татава сэрца. Сперажываліся мы тады. І дагэтуль не магу проста так сказаць два словы: «схапіла сэрца».

## Уражлівасць

Тата вельмі ўражлівы чалавек, акуратны і асцярожны. Ён не любіць чужога ў побыце і інтыме. Калі тата вучыўся ў Літаратурным інстытуце, ён у бібліятэцы памыў рукі і выцер іх ручнікам агульнага карыстання. Праз гадзіну рукі пакрыліся чырвонай высыпкаю. Можа, з месяц ён не мог пазбавіцца зудлівых плямінаў, ажно пакуль доктар не здагадаўся, што высыпка не інфекцыйная, а нервовая: псіхалагічна тата настроіўся на хваробу і захварэў. З-за такіх здарэнняў ён і не любіць усяго чужынскага, агульнага, грамадскага.

## Трускалка

Днямі зайшоў да бацькоў. Проста каб пасядзець з імі. Маці запарыла гарбаты і пачаставала мяне трускалкамі. Тата працягнуў руку, каб узяць ягаду, а маці далікатна адсунула талерку: «Табе яшчэ няможна сырога». І яна і я ледзь стрымаліся, каб не заплакаць. Але стрымаліся і пачалі гаварыць пра палітыкаў. Тата захваляваўся, і да яго вярнуўся голас.

## *Лес*

Тата ў бальніцы просіць Міраслава, каб звазіў яго ў лес. Яны заязджаюць у ельнік. Бацька адмаўляецца выходзіць з машыны. Адчыніў дзверцы, паглядзеў, і яны вярнуліся ў бальніцу.

## *Лекі*

Міраслаў пытаецца ў доктара, чаму так мала лекаў ён прызначыў нашаму тату. «А ў нас больш няма, прывозьце свае лекі, і мы ўсё зробім...» Тых лекаў і ў Мінску няма. Даводзіц-

ца тэлефанаваць Харэўскаму ў Вільню, каб купіў і перадаў. Той запісвае груваcткую назву, купляе, перадае. Лекі не тыя. Што з імі рабіць? Доктар суцяшае: спатрэбяцца вашай маці.

## Колер твару

У таты зусім кепскі колер твару. Як цяжка пра гэта думаць. І калі ён быў дома з мамаю, я адганяў ад сябе гэтае назіранне. Але ў бальніцы зноў убачыў жоўты колер смерці на бацькавым твары. Такі колер быў на твары ў маёй хворай на рак бабы Ядзі, калі яна сустрэла мяне ў бальнічным двары, такі ж колер меў твар дзядзькі Чэся ў калідоры ракавага корпуса. Каб жа я памыліўся!

## Сваё

Зрэдку ў іншых бачыш самога сябе. Так дзяды бачаць сябе ва ўнуках. Так я назіраю ў сыходзе таты ўласную нямогласць, слабасць і бездапаможнасць у бязлітасным свеце. Тата — частка мяне. Сумна і балюча ўсведамляць незваротнасць сыходу.

## Тэрмін

Калі выпісвалі з лякарні бабу Ядзю, дактары напрарочылі ёй месяц жыцця. Яна пабыла з намі месяц і тры дні. Цяпер, калі мы забіралі тату, лекары сказалі, што пражыве ён толькі тры месяцы. Ад гэтых думак у мяне халадзее кроў і калоціцца сэрца. З усіх сілаў стараюся хоць бы выглядаць спакойным.

## Агрэсія

Бываюць імгненні, калі мая жывёльная сутнасць паўстае супраць відовішча паміранне. Нехта нябачны падштурхоўвае ўдарыць майго тату і ўцячы ад яго. Я саромлюся гэтых думак, гэтых біялагічных жаданняў. Стрымліваюся. Пераступаю праз іх. Гавару з татам. Услухоўваюся ў ягоныя часам блытаныя сказы. Імкнуся зразумець, падтрымаць. Бывае, што ён ужо і не зусім побач, і не зусім са мною. На сонечны дзень ён можа сказаць: «Вось і дождж пайшоў. У Бога ўсё гатова!» А жывёліна зноўку прачынаецца. І каб стрымацца, я кусаю сваю шчаку да болю, да крыві.

## Маці

У маці заплаканыя вочы. Яна ўздзявае акуляры, і я бачу, якія ў яе вялікія і якія заплаканыя вочы. Мама ўспамінае, як яна з татам і са мною, трохгадовым, ішлі па вуліцы. Я ў самаробных валёнках. «Каціўся наперадзе». Вялікі п'яны дзядзька прысеў перада мною, працягнуў руку і павітаўся: «Сяргей». Я таксама даў яму руку і сказаў: «Адамка». — «Ну, ён у вас маладзец! Адам яго завуць?» — «Не, гэта прозвішча», — сказаў тата. Мама ўспамінае featureзнае, добрае, вясёлае, каб не закрычаць, не завыць, калі глядзіць на свайго Чэся...

## Маркі

Далёкія і нязначныя дэталі маіх узаемаадносінаў з татам пачалі набываць патрэбнасць і выразнасць. Гэта выключна нашае з ім, яно нікому іншаму не належыць. Вось паштовыя маркі... Тата дасылаў іх мне з Масквы ў канвертах, разам з лістамі да маці. Я наклейваў маркі ў альбом для фотакартак і безнадзейна псаваў іх як калекцыйныя рэчы. Сутнасць таго збірання, дасылання і наклейвання была ў

нашым разуменні адзін аднаго. Мы сядалі за стол, разглядалі маленькія карціны, гаварылі пра далёкія краіны, пра Бурундзі, пра Індыю, пра Алжыр...

## Спадчына

Тата шмат напісаў. Апошнія гады ён пісаў па маіх замовах і ў нейкай ступені асабіста для мяне... Цяпер я разумею, што большасць напісанага татам зроблена дзеля мяне і майго брата, дзеля ўнукаў. Смешна згадваць у дадзеным кантэксце аўтарскія правы і наогул нейкае там заканадаўства. Але татава літаратурная спадчына належыць мне, я гэта адчуваю. І да законаў мне справы няма, а большасць нашчадкаў і спадкаемцаў творчага чалавека якраз цікавяць законы і грошы, выгандляваныя за спадчыну. Звычайна гэта людзі бедныя, ва ўсіх сэнсах.

## Камяні

Тата шмат разоў фатаграфаваў камяні. Вялікія валуны, што ляжаць на берагах беларускіх палёў. Захапляцца гэтымі цёплымі, па-

рослымі мохам падарункамі ледавіка ён навучыў і мяне. Ёсць у нашых камянях неспазнаная таямніца, як у егіпецкіх пірамідах. Калі доўга глядзець на такі неабдымны, непад'ёмны валун, можна ўбачыць у ім Бога, Буду, будучыню... Я вельмі ўдзячны тату за нашыя прагулкі да валуноў. Гэтыя камяні паміж полем і дарогаю сталі сімваламі нашай з татам Радзімы.

## Трава

Па Інтэрнэце на мой сайт, дзе змешчана і татава кніга «Развітальная аповесць», прыйшло пытанне: «Чаму Вячаслаў Адамчык так часта ўжывае складаныя прыметнікі, напісаныя праз дэфіс: «зеленавата-блакітны», «рэдзенька-шары», «густа-ліловы»?» Тата адказаў, што гэта з-за любові да батанікі ды, пэўна, перабольшанай увагі да розных даведнікаў і паказальнікаў раслін, дзе колеры кветак падаюцца праз дэфіс. Апісанне раслін у татавых раманах — адзін з найцікавейшых матываў, прынамсі, для мяне, чалавека далёкага ад прыродазнаўства.

## Гадзіннікі

Тата паскардзіўся Міраславу, што ў яго зламаліся ўсе гадзіннікі. Хоць насамрэч гэта няпраўда. Міраслаў падарыў тату новенькі японскі настольны будзільнік. Тата доўга разглядаў яго, а потым спытаў: «Колькі зараз часу?» — і вельмі здзівіўся, калі Міраслаў назваў час, які паказваў будзільнік у ягоных руках. Тата ўсё ніяк не можа паверыць, што зламаліся не механічныя прылады, а разбураецца ягоны ўнутраны біялагічны час. Ён можа сказаць: «Во, ты схадзіў пераапрануўся!» — хоць прайшло два дні, а ў яго ўсё яшчэ цягнецца адзін пакутлівы, хваравіты, цёмны дзень.

## Самагубства

Калі бачыш, як няўхільна згасае зорка татавага жыцця, вельмі прымітыўнымі падаюцца нават думкі пра самагубства. Колькі пакутаў і роспачы нясе ў сабе адыход блізкай душы. А наколькі больш балюча такі зыход адгукнецца ў сэрцах блізкіх людзей, калі ён несвоечасовы, калі дзіця памірае раней за бацькоў. І варта жыць толькі таму, каб не параніць сваіх блізкіх заўчасным сыходам.

## Аптэка

Мама пайшла ў аптэку па лекі для таты. Па рэцэптах, выдадзеных у лечкамісіі, яна магла заплаціць палову ад кошту. Аптэкарка сказала, што такіх рэцэптаў не прызнае і выдасць лекі толькі за поўны кошт. Мама абурылася: «У такім разе я не прызнаю вашай аптэкі!» На што гандлярка секанула: «А вам засталося нядоўга купляць такія лекі». Мама расказвала пра сварку спакойна, плакаць у яе сілаў няма.

## Рэчка Ятранка

У кожнага чалавека ёсць свая рэчка, свой лес, сваё поле... Тата любіў Ятранку. Апісваў яе. Калі мы разам прыязджалі ў Варакомшчыну, дык першым чынам ішлі на рэчку. Тата сядаў на беразе, даставаў нататнік і пісаў. Уся ягоная проза нібыта напісана на беразе Ятранкі. І для мяне крынічная вада празрыстай Ятранкі — сімвал чысціні. Нідзе ніколі я не бачыў рэчкі святлейшай за нашу.

## Вёска

Ёсць тэмы, пра якія я пісаў мала, ці амаль зусім іх не кранаў. Адна з такіх тэмаў — вёска. Так павялося: вёска — татава тэма. Калі ён казаў: «Тваё Койданава, твая Барселона...», дык у падтэксце гучала: «Мая вёска, мой Навагрудак, мая Заходняя Беларусь...». Напэўна, так і застанецца надалей. Тата будзе жыць у сваім найлепшым рамане пра вёску «Чужая бацькаўшчына».

## Сшытак

Тата заўсёды пісаў у сшытках. Шмат хто з літаратараў піша інакш. Хто на асобных аркушах, як Уладзімір Караткевіч, хто адразу вылясквае на друкарскай машынцы, як Міхась Стральцоў. Апошнім часам камп'ютэр ледзь не татальна авалодаў пісьменнікамі. А Уладзімір Сцяпан наогул надыктоўвае раманы на дыктафон. На пытанне «Чаму сшытак?» тата адкажа: «А чалавецтва нічога лепшага за сшытак не вынайшла. Кніга — той жа сшытак...» А я так і застаўся мастаком, усё на асобных аркушах літары малюю. І толькі апошнім часам прымусіў сябе дзённік пісаць у сшытку. Любоў да сшыткаў у мяне яшчэ наперадзе.

## Брат Ян

Хварэе тата амаль паўгода і ўвесь гэты час спадзяецца на выздараўленне. Мы ўсе як можам падтрымліваем ягоныя надзеі. Гаворым пра будучыя кнігі, апавяданні, пра палітычны лёс Беларусі. Хоць самі ведаем пра прысуд лекараў. І вось тата загаварыў з маці пра незваротнасць сваёй хваробы. «У мяне тое самае, што і ў Яна?» — «Не». Ян — татаў малодшы брат — памёр ад раку, у пакутлівых болях, калі морфій не дапамагае. Тата не паверыў маці і прыйшоў да Міраслава. У мяне ён не пытаецца пра сваю хваробу. Я для яго больш чужы і далёкі за маці і Міраслава. Пэўна, так, бо магу ўночы спаць, а Міраслаў з мамаю спаць не могуць. У таты дзень пераблытаўся з ноччу. І ён паціху мірыцца з лёсам, са сваёй блізкай смерцю.

## Вайна

Яшчэ адна тэма, якую я старанна абмінаю, — вайна. Для таты яна — аснова. Хлапечыя ўражанні ніколі не адпускалі яго душу. Спаленая, расстраляная з германскіх гарматаў вёска Babaкомшчына. Галава каровы, якая

высунулася ў акенца гумна і таму не згарэла. Аднавяскоўцы, пасечаныя шашкамі казакаў, што перайшлі на бок Гітлера. Усё гэта запаланіла ягоную свядомасць. Можа, таму, калі доктар сказаў, што тата памрэ ў эйфарыі, падумалася, а колькі можна яму пакутаваць. Ён і так адпакутаваў за ўсе здзекі і прыніжэнні беларуса.

## Магнітафон і фотаапарат

Калі нядаўна я прачытаў пра ньюйоркцаў, што яны забудуць сёння тое, пра што ты даведаешся заўтра, дык магу пацвердзіць гэты факт. Бо музыку, якую слухаў і запісваў тата ў Амерыцы, у Беларусі пачалі слухаць праз гадоў 5, а графіці прыйшлі ў Менск праз 20 гадоў. З камандзіроўкі ў Нью-Йорк, дзе тата прадстаўляў у 1980 годзе Беларусь у ААН, ён прывёз магнітафон і фотаапарат. Тэхніка прывезлася не дзеля прапаганды амерыканскага ладу жыцця. Тата паехаў з ёй у сваю вёску, дзе сфатаграфаваў нашу зямлю, нашых дзеда Валодзю і бабу Броню. Запісаў іх галасы. Пэўна, музыка рэп ніколі і не дакоціцца да Варакомшчыны, як не будуць распісаныя з балончыкаў сцены вясковых хат. І добра. А вось я, у адрозненне ад

таты, не веру ў магутнасць тэхнікі. Я прымітыўна малюю тату на паперы і занатоўваю згадкі пра яго і пра нас з ім на аркушах у клетку.

## Партрэт

Папрасіў у таты фотаздымкі. Ён дазволіў іх забраць, нават сказаў, дзе ляжаць. Цэлы вечар я разглядаў фотакарткі, каб выбраць адну і замовіць мастаку апрацаваць яе на камп'ютэры і надрукаваць партрэт. Выбраўся здымак 1965 года. Той час, калі нарадзіўся брат Міраслаў, калі тата займеў першае шырокае прызнанне, калі я пайшоў у школу, калі ў нас была маладая, шчаслівая, прыгожая сям'я — тата, мама, я і брат.

## Таблеткі

Мама сказала, што няможна пакінуць тату ні на хвіліну, бо стаў зусім дзіця. Спрабаваў з'есці ўсе таблеткі. «Што ты робіш, Чэсь?» — «Ты ж мне сказала: з'еш усе таблеткі — і хутка паправішся...»

## Тэлефон

Думкі пра тату ўзнікаюць паўсюдна і ў самыя нечаканыя моманты. Вось узяў тэлефонную слухаўку і падумаў, што зусім хутка (а можа, ужо і сёння) я не змагу пагаварыць з татам па тэлефоне. Ужо цяпер гэта складана зрабіць, бо ён часам не можа націснуць на патрэбную кнопку. Сумна.

## Тое, што знікае

Я так доўга збіраўся напісаць лірычны твор пра тое, што знікае. Адкладваў, адкладваў... Лічыў сябе не падрыхтаваным да тэмы. Так, адно накіды пра дым, які віецца над згаслай свечкаю, пра жоўты пясочак, што цячэ са стромкага берага ў рачную плынь, пра зменлівыя карункі аблокаў... А тут татава паміранне... Нават у кроплях дажджу, што скочваюцца з лістоў ліпы за акном, я бачу свае слёзы, свой плач па тату.

## Два словы

За мінулы дзень тата сказаў толькі два словы. Адно ён сказаў маме, калі тая раніцай аб-

мывала яму ногі. Паклаў далонь ёй на плячо і прашаптаў: «Цярплівая». А другое прашапталася ўвечары. Я зайшоў у спачывальню. Тата паспрабаваў сесці. Мама спытала, ці хоча ён вады. «Не».

## Вочка малпы

Я дапамог маме пакласці тату на ложак. Ягоная прыўзнятая рука дробненька калацілася. Згадалася вочка малпы, якая пазірала з пашчы анаконды і хутка-хутка міргала. Тата ў пашчы ўсепаглынальнай смерці, а мы — назіральнікі.

## Сава

Так склалася, што ёсць два Вячаславы Уладзіміравічы Адамчыкі і абодва яны з адной сям'і, больш за тое — родныя браты. Тата мой — Чэсь, брат ягоны — Сава, а ў савецка-прарасійскіх дакументах яны запісаныя Вячаславамі.

Каб праўдзіць тэлефон дзядзькі Савы, запісаны немаведама калі, я набраў нумар. Пачуў жаночы голас, які гукнуў у далёкай наваеленскай кватэрцы: «Дзядуля, цябе да тэлефона...»

Я сказаў, што тата зусім кепска сябе адчувае. Сава падзякаваў за званок і паабяцаў патэлефанаваць і прыехаць. А я не змог яму сказаць, што ехаць пакуль не трэба. Вось не змог сказаць, і ўсё.

## Маміна прызнанне

— Мне яшчэ не цяжка. Вось пастаю каля яго на каленях, скажу: «Чэсь, пацісні мне руку». Ён так слабенька, але ж пацісне. Я не адна.

## Прыезд Савы

— Ты ж сказаў, што па тэлефоне пагаварыць з Чэсем не ўдасца, вось я прыехаў...

Сядзім выпіваем. Я, Міраслаў і Сава.

— Ён мяне прызнаў, — паўтарае і паўтарае Сава. — Я зайшоў, а ён рукой махнуў. Вось так узняў руку і махнуў.

Тата выйшаў у залу, каб пасядзець на канапе, я прысеў побач з ім.

— Цяжка табе, тата?

— Цяжка, — амаль нягучна выдыхнуў мой тата і лёг на канапу.

Дзядзьку Саву мы правялі на электрычку.

## Ноч

Пасля выпітага з Савам і Міраславам я праваліўся ў небыццё. А маці з маёй жонкаю Аленаю цэлую ноч змагаліся з татам, бо ён ставаў і падаў. Пакідаць яго на ложку стала небяспечна.

— Баюся, каб не зламаў сабе што. Ён такі крохкі. Праціраю яго спірцікам, мажу дзіцячым крэмам і баюся зламаць якую костачку. Ён зусім крохкі, — кажа мне мама нараніцу.

Прыўздымаю тату, і ён выпівае паўкубачка вады з сардэчнымі кроплямі.

## Сцэнар

На працы я паклікаў сваяка Мікалая, і разам мы пачалі пісаць сцэнар пахавання, складаць спіс неабходнага. Крыж. Труна. Месца на могілках. Партрэт. Вянкі. Надпісы на стужках. «Дарагому тату ад сыноў Міраслава і Уладзіміра». «Дарагому дзеду Чэсю ад унукаў Чэсіка, Ядзі, Вольгі і Мікалая». «Дарагому майму мужу ад жонкі Ніны». Надпіс на шыльдзе з крыжа. «Вячаслаў Адамчык. 1933—2001».

Калі план быў збольшага гатовы і сакратарка Надзея набірала яго на камп'ютэры, дык збаялася друкаваць дату смерці і зрабіла пропуск. Давялося другі раз пісаць дату смерці пры жывым тату.

## Антон

Развітацца з татам і падтрымаць сястру прыехаў з Койданава дзядзька Антон. Я выклаў на стол цыгарэты з запальнічкай. «Хіба ты курыш?» — «Куру і выпіваю». — «А вось я нічога не магу. За гэтае лета два разы ў бальніцы ляжаў. Сэрца цісне і цісне». Мне згадалася, як Антонава Ніна паскардзілася, што дзядзька выпівае штовечар. «Радуйся, Ніна, ён можа яшчэ чарку ўзяць». Пасмяяўся я тады. А цяпер я зрабіў іншую недарэчнасць. Парадаваўся, што Антон добра выглядае. «Што ты, Валодзя... Паглядзі на мае рукі, яны ўсе ў сіняках ад кропельніц. Я хутка наркаманам стану...» Маўчым. Сапраўды, так кепска, як выглядае тата, не выглядае ніхто. Пальцы на руках счарнелі. Ён ляжыць з немігаючымі вачыма і часта хрыпла дыхае.

## Дождж

Выйшаў на вуліцу. Паліўся дождж. Я паглядзеў на неба з-пад парасона й падумаў: «Божа, калі ты ёсць, зрабі, каб скончыўся дождж. Ну хіба табе цяжка? Пакутуе тата. Мучыцца маці. Праз дзень у мяне самалёт да Барселоны. Як я кіну бацькоў? Што скажу людзям пра сваю адсутнасць на пахаванні?»

«Калі ты не пабудзеш на татавым пахаванні, ты сабе гэтага ніколі не даруеш», — кажуць навокал. І яны кажуць праўду.

«Божа, дай мне знак, спыні дождж». І дождж перастаў.

Я вярнуўся дамоў, пачаў парадкаваць фінансавыя запісы. І тут патэлефанавала мама і сказала: «Тата не дыхае. Тата памёр».

## Апрананне

Тое, што адбылося ў першыя гадзіны пасля татавай смерці, праходзіла для мяне ў істэрычным паўсне. Цяпер я дакладна ведаю, навошта занавешваюць люстэркі. Калі пабачыў скрыўлены плачам уласны твар са звар’яцелымі вачыма, дык напалохаўся больш, чым ад выгляду аголенага таты, якому я трымаў твар, каб ён

не застыў з адкрытым ротам. Вочы закрыў тату я. Калі апранаў пінжак, дык ледзь-ледзь не зламаў ужо нягнуткую і халодную татаву правую руку.

Мы паклалі тату на стол у святочным гарнітуры і новенькіх чаравіках.

Пасярод ночы прыйшоў Міраслаў, і я паехаў дадому паспаць. Выпіў гарэлкі і праспаў да 10 раніцы.

## Кроў

Поўна людзей з кветкамі. Усе выказваюць спачуванні. А ў мяне праз кожныя пяць хвілін твар перакошваецца, збіваецца дыханне, слёзы цякуць з вачэй.

Тату пераклалі са стала ў труну.

Маміна цётка Вікця прывяла жанчын, і яны адспявалі нашага тату Чэся.

У кватэры такая задуха, што я захацеў выйсці на вуліцу, каб не страціць прытомнасць. Калі адчыняў дзверы на праспект, дык ададраў кавалак скуры з указальнага пальца на правай руцэ. Стаю з акрываўленымі рукамі на праспекце, і кроў мая крапае на шэры брук.

І тут падыходзіць да мяне мастачка ў чорных акулярах, падобная да вупыршы, і пытаецца:

— Адамчык, што з табой? Ты вельмі кепска выглядаеш...

— Бацька ў мяне памёр. Зараз хаваць будзем. Вось я дзверы адчыніў і скуру з пальца садраў. Я і ўчора яе садраў, калі татавымі ключамі спрабаваў гэты замок адчыніць. Толькі ўчора ранка была маленькая...

Вярнулася Ядзя з аптэкі, забінтавала мой палец.

Мастачка развіталася.

«Крэпка будзе стаяць тое, пад што кроў пацякла», — згадалася мне.

Што будзе крэпка стаяць?

## Слова

Труну закрылі вечкам і прыкруцілі. Як добра, што вечка прыкручваецца, і не будзе гэтага жахлівага гуку забівання цвікоў.

Хлопцы ўзнялі майго тату на плечы й панеслі. Маці ледзь ідзе, а таму труна далёка ўнізе. З цемнаватага пад'езда выходжу на сонца і слепну. Гучыць аркестр, але што за музыка, я разабраць не магу. Падыходзіць Толік Кісель і абдымае мяне. З ім іду да аўтобуса-катафалка. Як толькі мы селі ў аўтобус, пайшоў дождж. Праз вентыляцыйныя люкі на труну, на крыж,

на партрэт пачалі падаць буйныя кроплі, падобныя да кропляў маёй крыві, адно празрыстыя. А перад самай Кальварыяй заззяла сонца. Неверагодна зыркае ў вільготнай свежасці.

Тату чакала магіла на грудзе, непадалёк ад касцёла. На рамонт і адкрыццё гэтага касцёла тата адным з першых ахвяраваў грошы ў часы атэістычнай безнадзейнасці.

Паніхіду праводзіла старшыня Саюза пісьменнікаў Вольга Іпатава. Выступалі татавы калегі. А калі далі слова мне, мама, якую я падтрымліваў за локаць, ціха сказала: «Толькі не доўга, бо я не вытрымаю». Маміна рэпліка збіла мяне, і маму стала шкада больш за тату. І я толькі сказаў:

— Тата, я так цябе люблю, што ў мяне няма словаў.

Сказаў і заплакаў гучна, непрыгожа.

Потым гаварыла маці. Потым труну апусцілі ў яміну, засыпалі. Далакопы, калі ўпрыгожвалі капец, зламалі напалам кветкі. «Каб не пакралі», — растлумачылі яны.

## Кватэра

На жалобную вячэру ні я, ні Міраслаў не пайшлі — сілы не было.

З дачкой я вярнуўся дадому. Пераапрануўся ў спартовае і пайшоў бегаць у парку, каб змучыцца фізічна і на нейкі час забыцца пра смерць. Пасля ледзянога душу я апрануў усё чорнае, паехаў на бацькоўскую кватэру. Адчыніў Міраслаў: «Цяжка сюды прыходзіць, калі нікога няма...»

Сапраўды. Я прайшоўся па пустых пакоях. Усе татавы рэчы нібыта памерлі разам з ім. Кнігі, нататнікі, рукапісы ляжалі як нежывыя. Адчужанасць свяцілася ў кожнай рэчы.

Мы дачакаліся маці. Толькі калі яна пераапранулася ў хатняе і загаварыла пра сонечнасць гэтага дня, пра тое, што тата збіраўся напісаць буквар, а цяпер мы мусім дарабіць задуманае, я перастаў хвалявацца за яе і развітаўся.

## Мора

Стаю на беразе Міжземнага мора. Гляджу на ваду. Чалавечае жыццё падобнае да падзення хвалі. Я пра гэта казаў раней і, пэўна, скажу і падумаю не адзін раз. І як небяспечна чалавеку зазіраць у сваё будучае, у сваю магілу... І чамусьці ўсё адно даводзіцца гэта рабіць. На Кальварыйскіх могілках мы прыдбалі сямейнае месца.

Пакуль там толькі тата, а я на беразе мора згадваю падарункі, якія ён прывозіў мне, якія я прывозіў яму. «Прывязі просты сшытак і простую ручку», — казаў тата. І я прывязу яму ручку і сшытак, і пакладу пад крыж, бо тата любіў пісаць, а я люблю свайго тату.

*06.02.—09.08.2001*





# Мама

*Словы пра маю маці — Ніну Глобус*

## Кашулі

Тату, ужо ледзь жывога, прывезлі на лецішча, у Валоўшчыну. Ён любіў свой блакітны двухпавярховы дамок у крышку неахайным садзе з яблынямі і кустамі парэчкі. Тата сабраў свае старыя кашулі і папрасіў маці памыць. Там няма гарачай вады. Таму мама грэла яе і за некалькі дзён перамыла ўсе чыста кашулі. Каб тата, крый Бог, не даведаўся пра свой блізкі сыход.

## Пас

Дзядзька Антон падарыў мне салдацкі пас з важкай абзоранай спражкаю. Я вельмі ганарыўся скураным пасам. З ім я быў непераможны ў свае адзінаццаць гадоў. Калі перацягнуць такой зброяю па рэбрах, выдатны атрымліваецца ўдар. Толькі біўся я тым пасам можа якіх тры разы, дый тое пабойваўся рассекчы галовы сваім аднакласнікам.

Пасам лупцавалі мяне. За боты, поўныя вады, за двойкі па паводзінах, за падманы, за гырканні на бацькоў, за ўцёкі з дому… Было за што біць. Пас выдатны пад рукою. Ён ляжаў на палічцы сцянной шафы ў вітальні. Выдатны пас. Перацягнуў раз-другі па плячах і болей ня трэба. Біла мяне маці. Тата сыходзіў у кабінет, калі толькі пачыналася сварка. Маці брала пас, сварылася і лупіла. Было за што.

## Рука

Адзін з самых даўніх успамінаў пра маму звязаны з яе рукою. Я, двухгадовы, ахоплены страхамі, не магу заснуць. Прашу: «Мама, дай мне руку». Маці сядае на ложак і кладзе да-

лонь на падушку. Я абдымаю цёплую руку, супакойваюся і засынаю.

## Малако

Не ведаю, хто такое прыдумаў і падказаў маме. Але нехта даўмеўся, што жаночым малаком добра прамываць мае хворыя вочы. Якраз нарадзіўся брат. Мама, калі карміла яго, клікала мяне і пырскала ў вочы малаком. Вочы ў мяне сапраўды моцна балелі, я страшэнна не любіў дактароў і розныя працэдуры, у тым ліку і малочныя прамыванні. Трываў, канешне. Плакаў. Слёзы змешваліся з малаком, я іх размазваў па шчоках. Ішоў мыцца. З люстэрка на мяне злосна глядзеў першакласнік, размалёваны маміным малаком.

## Ахвяры

Дзеля татавай творчасці, дзеля мяне з братам мама адмовілася ад кар’еры. Ці шкадавала яна? Пэўна ж, так. Каб не шкадавала, дык і не ведаў бы я, што ёй прапаноўвалі пайсці ў аспірантуру, застацца працаваць у Нацыянальнай бібліятэцы, а яна выбрала сям’ю. Мама заўсёды

выбірала сям'ю. Калі ў брата ўзніклі складанасці з вучобаю, мама адмовілася ад пасады загадчыцы бібліятэкі і пайшла працаваць у школу настаўніцай працы. Мама заўсёды жыла болей дзеля нас, чым дзеля сябе.

## Малюнкі

Намаляваць маму цяжка. Вельмі блізкі чалавек, немагчыма аддаліцца, цяжка зірнуць адстароненымі вачыма. Таму, колькі ні рабіў я спробаў намаляваць партрэт, не атрымлівалася нічога вартаснага. Аднаго разу, у інстытуце, калі я ўшчыльную вывучаў кубізм з ягоным жывапісным рэчывам, адзін сівагаловы мастак спытаў: «А маці сваю ты таксама будзеш раскладаць на квадраты і кубікі?». Малаадукаванасць выкладчыка не ўразіла, большасць з іх невукі, але нетактоўнасць абурыла, нібыта ён вылаяўся на маю сям'ю. Спрачацца я не стаў. Адзначыў сабе, што партрэт мамы я абавязаны намаляваць, і ўсё тут. Намаляваў. Выпадкова. Не малюючы намаляваў. Знайшоў яго сярод старых накідаў да вітражу ў сабор «Успення Дзевы Марыі». Безліч эскізаў я зрабіў у 1982 годзе, шукаючы вобраз Божай Маці. Сярод іх знайшлася маленькая акварэль, на якой нама-

лявалася не Дзева Марыя, а мая маладая мама. Тады і не заўважыў. Ёсць у мастацтве чароўнасць — здатнасць твораў жыць незалежна ад стваральніка.

## Маўчанне

Па тыдню, а то і па два я не гаварыў з мамаю, а яна са мною. «Мы не гаворым», — казаў я брату ці бацьку. «Чаму?» «Не гаворым, і ўсё!» Прычыны сапраўды былі малазначныя, мізэрныя. Пэўна, мы стамляліся ад любові, ад шчырасці і цеплыні ўзаемаадносінаў і пераставалі размаўляць.

«Дом для цябе толькі месца начлегу. Прыбег, паспаў і збег», — дакарала мама. Я замаўкаў, бо любіў свой прапахлы алейнымі фарбамі, застаўлены чарапамі і кнігамі, завешаны палотнамі і малюнкамі пакой. Бацькі дазволілі пераўтварыць яго ў майстэрню. А тут — начлежка. Крыўдна.

Выйсці з маўчання цяжэй, чым апынуцца ў ім. Але мы выходзілі: побыт дае шмат нагодаў загаварыць. «Валодзя, вынесі смецце!» «Зараз, а ты каву звары». Каву п’ем разам і гаворым доўга, бо так шмат адбылося ўсяго ўсялякага, пакуль маўчалі.

## *Лекі*

Праца. Камандоўкі. Масква. Вільня. Мітусня. Менск. Вільня. Масква. За справамі маму не бачу. Пагавару па тэлефоне і супакоюся, нібыта адведаў. Мама пра тату сказала, што ягоныя рэчы стаяць на месцы, толькі лекі сардэчныя яна ўзяла і прымае. «Ён дазволіў. Прыйшоў у сне. Я паскардзілася на кепскі стан, на тое, што на вуліцу тры дні не выходжу, і запасы таблетак і кропель скончыліся. «Бяры мае, — ён так сказаў, — бяры мае». Узяла. Мне лягчэй».

## Талерачка

Мама расказвае, што адным з першых маіх слоў было настойлівае «дай». Гаварыць я пачаў у дзевяць месяцаў, любіў сядзець на маміных руках і казаць «дай». Патрабаваў усё чыста: і гадзіннік з гіркамі, і цвік, забіты ў сцяну. Баба Ядзя абцугамі выдзірала той цвік і давала першаму ўнуку. Апагеем «дай» стала талерачка. «Дай мне талерачку з неба!» — запатрабаваў я ў мамы і паказаў на поўню. Яна смяялася. На гэтым мае «дай» і скончыліся, бо калі нешта прасіў, усе дадавалі: «І талерачку з неба».

## Сур’ёзнасць

Наколькі я сур’ёзны, цяжка сказаць. Пэўна, настолькі, наколькі падобны да бацькі. Тата быў суцэльна сур’ёзны. Нават іронію ён скарыстоўваў, каб захаваць у недатыкальнасці сваё грунтоўнае стаўленне да жыцця. Мама, наадварот, любіла і любіць жыццё такім, як ёсць *тут і цяпер*. Яе аптымізм ураўнаважваў татавы песімізм і нігілізм. Маміна заглыблёнасць у побыт, у матэрыю, у сучаснасць аказалася насамрэч больш сур’ёзная і запатрабаваная за нашы з татам надзеі, вечна няспраўджаныя, планы, заўсёды недавыкананыя, захапленні і расчараванні. На мамінай, а не на татавай сур’ёзнасці трымалася і трымаецца наша вялікая сям’я. Наша сур’ёзнасць у творчасці — толькі цень вялікай любові да мамы.

## Радзімка

На безыменным пальцы левай рукі ў маёй мамы ёсць маленькая радзімка цьмяна-залацістага колеру. Такая радзімка была ў бабы Ядзі, якая навучыла маму ў цяжкія хвіліны дакранацца да яе, каб адчуць дапамогу. Такая ж чароўная радзімка ёсць і ў мяне. Калі

мне кепска, я дакранаюся да радзімкі, і свет цяплее, маркота развейваецца — мама дапамагае мне.

## Мамін сын і татаў сын

Была ў дзеда дачка, была ў бабы дачка... Так пачынаецца не адна беларуская казка. Падобным чынам можна распавесці і пра нашу сям'ю. Ёсць татаў сын і ёсць мамін сын. Татавым сынам усе называюць брата Міраслава. Ён і падобны да таты, і любіў яго тата болей. Я — мамін сын. Спачатку (я ж старэйшы за брата на сем гадоў) мне пашчасціла пабыць адзіным любімым Вовачкам і ў мамы і ў таты. Калі ж мама пагадзілася купіць мне браціка, сказаўшы, што нарэшце назбірала грошы, тата засумняваўся. Маўляў, ці хопіць у яго любові, каб так моцна любіць некага іншага, як ён любіць мяне... Ніхто ніколі не дакараў тату за тыя сумневы, акрамя яго самога. Міраслаў адразу ж, з першага свайго дня, стаў татавым сынам. Цяпер, калі бацька сышоў у краіну вечнай радасці, мы абодва маміны сыны.

## Падарункі

Калі тата не меў сяброў, дык у мамы заўсёды былі і цяпер ёсць шмат сябровак. Мама ўмее сябраваць, умее захоўваць таемныя гісторыі, умее слухаць і суперажываць. На дзень нараджэння ёй тэлефануюць з усяго свету. Без перабольшванняў. Эня з Нью-Йорку, Ада з Адэсы, Галіна з Берліна.

Завядзёнкі дасылаць падарункі ў гэтых сціплых кабет няма, па іх сродках і званок абыходзіцца не танна. Таму Галіна прыдумала гульню. Яны з мамаю заходзілі ў ювелірную краму і на словах дарылі адна адной найкаштоўнейшыя ўпрыгожванні. «Я дару табе, Ніначка, вось гэты пярсцёнак з дыяментам!» «А я табе, Галачка, дару залатыя завушніцы з рубінамі!». Абдораныя і вясёлыя, яны пакідалі краму. Цяпер Галя распавядае маме пра берлінскую краму з кветкамі. Яна расказвае, як яны заходзяць і выбіраюць маме ў падарунак пяць крэмавых ружаў. У гэты час я, чалавек, які амаль ніколі не дорыць кветак, зайшоў у падземны пераход і набыў пяць крэмавых ружаў. Мама вельмі здзівілася букету і пераказала размову з Галінаю.

## Ззянне

Ралан Барт у сваёй кнізе «Камера», разважаючы пра ўздзеянне фота на чалавека, прыйшоў да высновы, што найкаштоўнейшым фотаздымкам асабіста для яго з'яўляецца партрэт маці. Ні адзін іншы чалавек не зможа адчуць і зразумець той таемнай сілы, якая сыходзіць на яго праз гэты, для ўсіх астатніх звычайны, партрэт. Барт пісаў пра фотамастацтва пасля мамінай смерці, а таму не змог параўноўваць фота з арыгіналам, цень з постаццю. Дзякуй Богу, мая мама жыве, і я магу бачыць светлае ззянне, якое сыходзіць ад яе. Светлыню тую не зафіксуе ніводная камера, яе бачу толькі я.

## Прозвішча

У мамы незвычайнае прозвішча — Глобус. Яе бацька паходзіць з Капыльшчыны, з вёскі Жыліхава. У энцыклапедыі можна прачытаць пра яе некалькі радкоў... *Жыліхава, вёска ў Бучацінскім с/с Капыльскага р-на Мінскай вобл. Цэнтр калгаса. За 32 км на Пд ад Капыля, 149 км ад Мінска, 13 км ад чыг. ст. Цімкавічы. 590 ж., 240 двароў (1997). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі.* З гэ-

тых сціплых звестак зацікавіла апошняя. Кіраўніком аддзялення сувязі ў пасляваенны час працаваў Уладзімір Глобус, мамін бацька. Даведалася яна пра тое ў 70-х, калі мой тата ўгаварыў яе з’ездзіць на радзіму. Мама нарадзілася ў тым Жыліхаве ў 1934 годзе. Адносіны паміж яе бацькамі не склаліся. Баба Ядзя казала, нібыта Глобус загінуў на савецка-фінскай вайне. Пэўна, праз гэта мама не вельмі любіць сваё прозвішча і, калі злуецца, кажа мне: «Ніякі ты не Глобус, ты — Адамчык». Мне падабаецца маміна прозвішча, настолькі, што свае літаратурныя творы і малюнкі падпісваю ім з 1977 года.

## Бібліятэкі

З усіх бібліятэк найлепшай была тая, дзе працавала мама. Спачатку — бібліятэка будаўнічага трэста № 4, пазней — у школе № 16, нарэшце — у Саюзе пісьменнікаў. Цяпер маці на пенсіі, жыве сярод кніжак, сабраных татам.

У бібліятэкі я амаль не хаджу, чытаю куплёнае. Калі што патрабуецца, дык у бібліятэку ідзе сакратарка. Бібліятэка без мамы для мяне не бібліятэка. Кніжны свет змяніўся за апошнія гады, у ім паменела таямніцаў. Бібліятэкі

маміных часоў вабілі якраз забароненымі выданнямі, турмамі для кніжак. Мама дазваляла мне чытаць усё, я ўдзячны за давер.

## З натуры

Калі напісалася апавяданне «Ма-ма», я паказаў яго тату. Ён сказаў, што пісаць на такія тэмы трэба пазней, калі яго з мамаю не будзе сярод нас. У тэксце пераказвалася гаворка з маці, якая ўспамінала сваіх маму з бабуляю. Татава заўвага збянтэжыла. Жаданне пісаць з натуры пра блізкіх людзей знікла надоўга. Зараз я шкадую. Дарма я не напісаў словы пра тату, калі ён яшчэ быў сярод нас. Пісанне з натуры — найвыдатнейшы занятак, вынайдзены чалавекам. Праз яго мы бачым сябе такімі, як ёсць, а не вымалёванымі памяццю і ўяўленнямі. Некалі даўно Уладзімір Караткевіч прасіў, каб я напісаў пра яго праўду пасля смерці. Даючы згоду, я не ведаў, што не бывае праўды пасля смерці. Ёсць праўда смерці. Яе я апісаў падчас адыходу таты ў Край Цішыні. Ёсць праўда жыцця. Да яе імкнуся, пішучы гэты партрэт мамы.

## Гонар

Мама ганарыцца сваімі дзецьмі, гэта натуральна. Я разумею сапраўднасць і шчырасць яе пачуццяў. Сам, тым не менш, я такой радасці за дзяцей не адчуваю. Наадварот, заўсёды ганарыўся сваімі бацькамі: татам і мамаю.

## Знішчэнне кніжак

У людзей, далёкіх ад бібліятэчнай справы, складаецца ілюзія, што кніжкі жывуць доўга. Памылковая думка. Кніга, калі яе прачытае дзесяць самых акуратных людзей, развальваецца і падлягае спісанню. Колькі такіх зачытаных любімых кніжак мама здала ў макулатуру... Не злічыць. Гэта натуральны працэс, а было іншае... Прыходзіў загад знішчыць кнігі новыя, і нават яшчэ нікім не чытаныя. Калі пачалася вайна з Кітаем, маму прымусілі зняць з паліцаў не толькі трохтомнік Мао, а і кітайскую кулінарыю і Гісторыю кітайскай літаратуры. Што змагла, мама перахавала, але большасць кніжак было вывезена на сметнік, дзе ўжо ляжала вялізная зробленая бульдозерамі гурба паперы і кардону, якая га-

рэла з аднаго боку. Ці плакала мама, гледзячы, як гарaць кнігі?.. Не. Яна схавала ў сумку том Гісторыі кітайскай літаратуры, які падарыла мне.

## Булачкі

Мама самая прыгожая, мама самая разумная, мама лепш за ўсіх гатуе... Я доўга не мог выбраць найсмачнейшую са страў, прыгатаваных мамаю. Дранікі залатыя з лоем... Калдуны духмяныя са смятанаю... Чырвоны боршч з грыбамі... Кава па-турэцку з драбочкам цукру... Столькі ўсяго... А бліны... І ўсё ж найсмачнейшымі былі булачкі. Пэўна, з-за ўдзелу ў працэсе. Белага хлеба на пачатку 60-х у Менску не было. Муку выдавалі на святы па талонах. Мама атрымлівала папяровыя пакеты і, не чакаючы святаў, замешвала цеста. Я каштаваў салодкае цеста, здавалася, з’еў бы яго сырым. Толькі мама забараняла. Мы сядалі насупраць духоўкі і час ад часу заглядалі ў яе.

Водар салодкіх маміных булачак — найсмачнейшы ў свеце. Я так доўга не мог вызначыцца са стравою яшчэ і з-за таго, што ў дзяцінстве і ў маладосці кепска еў. Не любіў я есці. І што б

мама не згатавала, казаў: «нясмачна», «не хачу», «не буду»... Колькі крыўдлівых слоў пачула ад мяне мама на кухні — проста працьму. Сорамна.

## Чаканні

Самым цяжкім у дзяцінстве было чаканне мамы. У дзіцячым садку чакаў, калі ж яна прыйдзе і забярэ. У лагеры — калі яна прыедзе, каб пагуляць са мною. У бабы Ядзі — калі павязе з Койданава ў Менск. У нядзелі — калі яна вернецца з работы. Мама працавала па нядзелях, у бібліятэках выхадны прыпадае на аўторак. Я высоўваўся ў фортачку, каб больш бачыць вуліцу, па якой вярталася мама. А калі ў мяне забалелі вушы, і я тыдзень прасядзеў на бабіным ложку з заматанай у хусткі галавою, мне ўсё здавалася, што толькі прыедзе мама, вушы адразу перастануць балець. Так яно і выйшла. Мама прыехала, і боль сціх. Самая шчырая радасць, якую толькі давялося адчуць за жыццё, — гэта хваля цяпла, што накрывала мяне з галавою пры сустрэчы з маёю мамай, Нінаю.

## Рэдактура

Мама просіць мяне, каб не рэдагаваў татавы лісты і дзённікі. Тлумачу, што рэдагаванне неабходнае. Без яго не абысціся. Прапушчаныя літары, недакладныя коскі з кропкамі, паўторы словаў — гэта ёсць у кожным рукапісу і не мусіць быць у друкаваным тэксце. Прыхарошваць і цэнзураваць татавы творы я не збіраўся. Мама ведае пра гэта, ёй проста хочацца пагаварыць са мною пра *яго*.

## Ёсць

Навокал шмат цынізму, процьма нігілістычных і песімістычных настрояў. Даходзіць да таго, што адукаваныя людзі кажуць: «Мяне няма!» І далей... Нас няма, адказнасці нямашака, злачынства няма... Даводзіцца спытаць у такога: «А мама ў цябе ёсць?» У мяне мама ёсць.

## Заклейванне вокнаў

Цяжка растлумачыць у час татальнай замены драўляных аконных рамаў на шклопакеты пра заклейванне вокнаў на зіму папяровымі

стужкамі. Драўляныя рамы мелі такую непрыемную звычку — рассыхацца. Утвараліся шчыліны, з якіх увосень пачынала дзьмуць так, што скавышы гулялі па ўсёй кватэры. У крамах прадаваліся рулоны папяровых стужак. Мама купляла іх, варыла крухмал. Мы з ёй і заклейвалі рамы. Стужкі прастойвалі зіму, а ўвесну, напрыканцы красавіка, са шкляным трэскам я абдзіраў пажоўклую паперу, і мы з мамаю мылі вокны і рамы. Мыццё вокнаў і абдзіранне стужак — не такі просты занятак. Калі гэта зрабіць у халодны, хай сабе і сонечны дзень, можна лёгка падхапіць запаленне ці ангіну. Але мама вельмі дакладна вызначала дзень мыцця вокнаў, і мы ні разу не захварэлі. Тата ніколі не абклейваў рамы і не мыў вокны. Яго раздражняў скрыгат сухой паперы па шкле. Ён сыходзіў з кватэры. Мыццё вокнаў — маё з мамай свята.

Цяпер мае вокны мые пакаёўка. Яна чамусьці прастуджваецца, бо не ўмее вызначыць цёплы дзень, не адчувае яго.

## Кветкі і вазы

Чаму ў нашым доме было мала раслін і кветак? Не магу адказаць. Мама іх вельмі любіла і

любіць. У бібліятэках, дзе яна працавала, заўсёды раслі амарылісы і самыя розныя кветкі. А ў кватэрах зелянеў мясісты і калючы альяс. Мы адломлівалі яго лісты-шчупальцы, каб закапаць густы сок у нос, ад насмарку. Дапамагала. Гаючая расліна — альяс. А кветкі... Іх не было і ў шматлікіх збанках і вазах, што мама назбірала. Ведаю, вельмі прыгожа глядзіцца доўгая галіна вішні ў квецені, пастаўленая ў вялікую вазу, непараўнальна выглядаюць белыя нарцысы ў крышталёвай шклянцы, цёмна-чырвоная лілея грацыёзна стаіць у гліняным гладышу... Ведаў і ніколі не прыносіў дамоў кветкі, і тата не прыносіў, і брат. Расліны і жывёлы з'яўляліся ў нашым доме выпадкова і на кароткі час. Толькі альяс, які яшчэ называюць стагоднікам, прыжыўся на маміным падваконні.

## Просьбы

Як мы не любім прасіць. Жах, як не любім. І не просім. Адстойваць сваё? Калі ласка. Патрабаваць належнае? Абавязкова. А прасіць... І давялося прасіць. Кватэру. Мне. Дзве сям'і на адной варэльні... Хто не ведае, хай і не ведае. Мы пайшлі да чыноўніка. Той сказаў, што ў кабінеце на такую делікатную тэму гаварыць не

будзе, што мы мусім пачакаць у скверыку, пасля працоўнага дня. Мама і я чакалі. Ён падышоў з самазадаволеным выглядам і сказаў, што нічым дапамагчы не зможа, паспрабуе, але не зможа, пастараецца, але нічога не выйдзе... Я ўзненавідзеў яго і сябе — за тое, што маме давялося прасіць гэтую паўразбураную пыхаю, алкаголем і абжорствам пачвару.

Кватэру мне далі, насуперак усім пачварам і пачваркам. Яе даў значна большы чыноўнік, які з павагай ставіўся да бацькавага літаратурнага таленту. І каб тата мог працаваць, мяне з дзецьмі і жонкаю адсялілі на ўскраіну.

Прасіць некага аб нечым я зарокся, а тым больш прасіць маму, каб яна ў некага нешта прасіла.

## Дарослаць

У дзяцінстве вельмі хацелася хутчэй вырасці і стаць дарослым. У кожнага чалавека існуе пэўная незадаволенасць фізічным станам. Але мая найбольшая незадаволенасць прыпала менавіта на дзяцінства. Пагаварыць з татам на падобныя тэмы не атрымлівалася, заставалася мама. Ёй трэба было давесці сваю мужчынскасць і дарослаць. І я давёў...

На выхадныя маму запрасілі на пікнік у вёску Мікалаеўшчыну. Цэлы аўтобус будаўнікоў выправіўся адпачываць і весяліцца. Хто ехаў рыбу лавіць, хто грыбы збіраць, хто гарэлку піць каля вогнішча. Мама ўзяла мяне ў рамантычнае падарожжа. Пачалося ўсё з чытання паэмы «Новая зямля», а дэкламаваў класічныя вершы малодшы брат Якуба Коласа, дзядзька Юзік. Крышку па-настаўніцку ён выглядаў, але мне спадабалася апавяданне пра тое, як Колас на ўласныя грошы збудаваў школу. Непадалёку ад той школы і пераплыў я Нёман. Пайшоў адзін на рэчку. Пераплыў на другі бераг і назад. Прыйшоў да мамы, якая гатавала на вогнішчы вячэру, і сказаў: «Я Нёман пераплыў, я — дарослы!» Сапраўды я стаў дарослым, бо мама не сварылася, а толькі папрасіла больш не плаваць аднаму, бо рэчка хуткая, з вірамі, з крыніцамі — можна патануць.

## Пярэпалах

Адзін з першых успамінаў, звязаных з мамаю, вельмі непрыемны. Плачу, плачу, крычу і не магу супакоіцца. Прыйшла цётка Пэля, схілілася нада мною і зашаптала, загаварыла пярэпалах. Запомнілася сутарга крыку. Паз-

ней мама раскажа, як хадзіла карміць маіх малочных сясцёр: Іру і Тому, дачок дзядзькі Чэся. А ў таго быў вялізны злы сабака. Ён гыркнуў на маму, тая пералякалася і з пераляку пакарміла мяне. Жах праз малако перадаўся мне — васьмімесячнаму немаўляці. Цётка Пэля ўшчувала маму за тое, што накарміла дзіця перапалоханым малаком. Хто ведаў, што страхі захоўваюцца ў малацэ? Толькі чараўніца Пэля і ведала, што пасля сполаху малако трэба сцэджваць. Дурнога сабаку, які раз-пораз зрываўся з ланцуга і палохаў усю вуліцу, дзядзька Чэсь прыбіў.

## Трывогі

Мама перажывала і перажывае за мяне і за Мірыка. Толькі калі яна перажывае за мяне, я не бачу яе гора і пакутаў. А вось яе трывогі за Міраслава я бачыў і суперажываў. Аддаць любімага сына ў салдаты — як гэта горасна для сэрца. Тым больш калі ідзе вайна, і ён можа апынуцца на фронце ў Афганістане. Міраслаў напісаў з войска, што яны трэніруюцца ў гарах. Мама сабрала валізу з прадуктамі і паехала ў Чарнаўцы, дзе Мірык займаўся ў вучэбцы. Паехаў з мамаю і я. Брат быў вельмі худы, твар

счарнеў, ён засынаў на хаду, чым ганарыўся: «Магу ісці і спаць!».

Мама сустрэлася з афіцэрамі, падаравала ім прадукты і каньяк. Тыя, выдаўшы ваенную таямніцу, сказалі, што могуць размеркаваць Міраслава толькі ў тры месцы: Афганістан, ахова турэмных цягнікоў і Чэхаславаччына. Выбралі апошняе.

Падобнае здарылася з маім дзедам Уладзімерам, калі немцы ўзялі яго ў закладнікі, а баба Броня выкупіла яго за тры скруткі палатна.

Якое таннае чалавечае жыццё, калі яго можна прамяняць на каўбасу з каньяком або на скрутак палатна. І якая вялікая любоў павінна быць, каб тое здзейсніць, насуперак законам і акалічнасцям.

## Мода

Мама ніколі не была модніцаю. Канешне, яна апраналася лепш за ўсіх, як для мяне. Модным і стыльным хадзіў тата. У яго былі касцюмы і чаравікі, прывезеныя з-за мяжы. А мама любіла нашае. Толькі аднойчы яна доўга насіла модны плашч. Цяпер гэта выглядае дзіўным. У сярэдзіне 60-х пачаўся бум балоневых дажджавікоў. Цёмна-брунатныя, зе-

ленкавата-балотныя, сталёва-чорныя плашчы з сінтэтычнага, падобнага да цэлафанавага рэчыва захапілі свядомасць насельнікаў СССР. Калі ты не меў балоневай апранахі, ты быў не зусім чалавекам. Тата прывёз маме з Масквы брунатна-шакаладны плашч: «Яго можна скласці ў сумачку, і калі пойдзе дождж...» Жанчыны толькі і чакалі гэтага дажджу, каб дастаць і надзець наймаднейшае. Я вельмі любіў маму ў шакаладным плашчыку. А яна ганарылася тым, што тата здалёк прывёз ёй такую модную рэч.

Некалькі гадоў таму тата падараваў маме выдатнае футра. Яна вельмі радавалася падарунку, але насіць не насіла. Надзела колькі разоў і павесіла ў шафу, а потым і зусім перадарыла яго ўнучцы, маёй Ядзі. Сумна, калі такія рэчы перадорваюцца. І сказаць нічога не скажаш.

## Ідэалізацыя

Ці ідэалізую я вобраз мамы? І так, і не... Каго яшчэ мне любіць і ўсхваляць, як не яе? Тату? Я спазніўся са словамі прыязнасці і павагі. Таты няма з намі. Адной з прычынаў яго хуткага згасання была любоў да алкаголю. Мама

страшэнна перажывае і нервуецца, калі даведваецца, што я ці брат выпіваем. Не гавару з ёю на тэму п'янства. А яна мяне папярэджвае... «Бачыла сон, як цябе сустрэў наш сусед Караткевіч (ён таксама заўчасна пакінуў свет праз гарэлку), як ён паклікаў цябе пайсці разам з ім... Я прачнулася і не змагла заснуць ажно да раніцы. Так што, наліваючы чарку, ведай: гэта ён цябе кліча». «А тата мяне не кліча?» — падумаў я і змаўчаў. Нікога я не ідэалізую — ні сябе, ні маму сваю.

## Навязлівасць

Калі паспадзяваецца, што ў бібліятэку прыходзяць адно разумныя і выхаваныя людзі, можна моцна памыліцца. Наколькі кніжкі трапляюцца разнастайныя, настолькі стракатыя іх спажыўцы. Што ўжо казаць пра часопісы з газетамі. Асабліва надакучлівыя прыходзяць напрыканцы працоўнага дня. Мама сабралася зачыняцца, а тут увальваецца нейкі чытач з гучным голасам і пачынае на ўсё памяшканне пераказваць газетныя навіны. Бібліятэка — ціхае месца, ці прынамсі мусіць быць такім. З'яўленне шумлівага чытача і несвоечасовае і недарэчнае. Але паспрабуй ска-

жы, што бібліятэка зачыняецца. Мама і не казала. Ну няма дзе выгаварыцца чалавеку. Цэрквы і касцёлы пазачынянымі стаялі. Вось і хадзілі людзі ў бібліятэку, да маёй мамы, як на споведзь. Хто навіны пераказаць, а хто пра самае патаемнае распавесці. Мама нікому ніколі тыя споведзі не пераказвала, чым вельмі ганарылася і ганарыцца па сённяшні дзень. А калі хто і быў навязлівы і надакучлівы, дык яна спакойна трывала і такіх.

## Вока

За маміну прыгажосць я перажываў заўсёды больш, чымся за яе здароўе. Лічыў, што знешнасць і адлюстроўвае яе стан. Наколькі памыляўся, яшчэ пытанне. Калі мама адчувае сябе добра, яна і выглядае выдатна. Сам такі. Таму, калі ў мамы захварэла вока, я заперажываў. Яно нібыта выкацілася наперад, стала вялікім, неміргаючым. Ягоная нерухомасць і блакітная празрыстасць палохалі мяне. А тое, што мама з хворым вокам хадзіла ў сваю бібліятэку — абурала. «Ну што ты ходзіш на працу? Пабудзь дома!» «Ну як гэта людзі застануцца без кніжак, без часопісаў новых, без свежых тыднёвікаў? Сам падумай!» Маміна вока мне, бясспрэчна,

даражэйшае за ўсіх яе чытачоў, але забараніць ёй хадзіць на работу не змог. А трэба было б. Добра, што вока вылекавалася, а маміна прыгажосць вярнулася.

## Помнік і лавачка

Які помнік паставіць на татавай магіле? Мы з братам бясконца абмяркоўваем... Крыж? Камень? Які надпіс? Ці скульптуру рабіць? Ці архітэктару праект замовіць? Знаёмыя не надта ахвотна гавораць на тэму могілак і мемарыялаў. Ці то пабойваюцца. Ці то занадта асабістай справай лічаць... Мама сказала: «Рабіце што заўгодна, а мне толькі лавачку пастаўце». Атрымалася: лавачка пры татавай магіле на Кальварыйскіх могілках і ёсць галоўнае ў помніку. Астатняе можа быць якім заўгодна, а лаўка мусіць быць найлепшай, бо яна ж для мамы.

## Чаравікі

«Мама, а чым ты чысціш чаравікі?» — спытаў брат, калі мы, папіўшы гарбаты, абуваліся і збіраліся сыходзіць. «Нічым не чышчу, абці-

раю вільготнай анучкай і ўсё. Тата займаўся абуткам, і сваім і маім», — мама заплакала. Бацькі пражылі разам сорак чатыры гады, мама ўсё яшчэ не змірылася з татавай смерцю, не можа рабіць тое, што звычайна рабіў ён. Балюча на гэта глядзець, горка пра тое думаць.

## Адметнасць

Сваю адметнасць мама заўсёды імкнулася схаваць. Непадобнасць да іншых была ў яе з самага маленства. Прозвішча Глобус інакш як дзіўная мянушка не ўспрымалася, упартасць асуджалася, любоў да кніжак ніхто не ўхваляў. Пагаварыць пра Чарльза Дыкенса і ягоны Лондан не было з кім. Таму мама пачала хаваць уласную непадобнасць. Яна звычайна апраналася, хадзіла на звычайную працу, гатавала звычайныя стравы. З усяго незвычайнага навідавоку ў яе засталося прозвішча, але хто ў нас цікавіцца прозвішчам замужняй жанчыны? Ніна Уладзіміраўна для ўсіх знаёмых была жонкай Чэся Адамчыка і, адпаведна, Адамчыхай. Пра яе незвычайную дабрыню, такт, розум ведаюць збольшага толькі блізкія людзі.

# Навагрудская кнігарня

Адным са шматлікіх вынаходніцтваў бацькоў-заснавальнікаў савецкага ладу жыцця было і раўнамернае размеркаванне кніжак па кнігарнях. У нас усе роўныя і кніжак, як хлеба і солі, атрымаюць пароўну, за выняткам спецразмеркавальнікаў для начальства. Пра чыноўнікаў апушчу. А пра навагрудскую кнігарню распавяду. Нічога не маю злога да навагрудцаў — наадварот, іх вельмі люблю і паважаю: яны ж яшчэ і татавы землякі. Але нашто было рабіць у Навагрудку асартымент кнігарні такі самы, як і ў сталічнай, даўмецца не магу. Так было ў 1970 годзе. Мама, як убачыла стэлажы дэфіцытных кніжак, вельмі ўзрадавалася. Пайшла і дамовілася з загадчыцаю магазіна, што яна адкладзе патрэбныя для бібліятэкі выданні, а потым з Менску пералічыць грошы і кнігі забярэ. Мама наадкладала тамоў 500. Радавалася, як дзяўчынка. І я радаваўся з мамаю, а тата скептычна заўважыў, што нічога ў мамы не атрымаецца, кніжкі застануцца гібець у Навагрудку. Мама заспрачалася, і дарэмна, бо выйшла па-татаву. Чыноўнікі-начальнікі не дазволілі менскай бібліятэцы камплектавацца ў нейкім там Навагрудку. Мама ледзь не плачучы патэлефана-

вала загадчыцы крамы, але тая нічым дапамагчы не змагла.

## Вязанне

Вязанне пруткамі і кручком, безумоўна, жаночы занятак. Мне вельмі падабалася, як мама вяжа. Любіў я клубочкі і маткі нітак. Дапамагаў змотваць маткі ў клубочкі. У часопісах і кніжках па вязанні падоўгу разглядаў узоры розных вязак. Нават навучыўся накідваць петлі на пруткі, далей за накідванне петляў навучанне не пайшло. А болей за ўсё маё сэрца ахоплівала радасць, калі распускаў звязанае і акуратна змотваў нітку ў шчыльны клубок. Калі маме не падабалася звязанае, яна клікала мяне, каб распусціў. У роспуску я стаў безумоўна майстрам, такім жа добрым, як у вязанні мама.

## Першы дзень вясны

У першы дзень вясны мама з самае раніцы адчыняла дзверы на гаўбец і ўмывалася снегам. І нас умывала чыстым снегам. Вельмі паэтычна з надыходам вясны абмыць твар і рукі іскрыс-

тым сняжком. Цяпер такія зімы, што і снегу няма. Але калі зноў зіма надыдзе доўгая, марозная і снежная, я першага сакавіка абавязкова ўмыюся снегам і павіншую маму з першым днём вясны.

## Уцёкі

Шмат разоў я ўцякаў з дому, таму выдатна разумею ўсіх малалетніх бадзягаў. Дома ўсё кепска, а свет такі вялікі. Адзінае, чым мой час дзяцінства адрозніваўся ад цяперашняга — у ім зусім не было беспрытульных дзяцей. Уцякаць даводзілася аднаму. Першы раз я збег зімою, калі вучыўся ў трэцім класе. Намеры былі самыя рашучыя. Мароз стаяў люты. Рукавіцы я не ўзяў, забыўся. Пакуль дайшоў да вакзала, рукі абмерзлі. Ехаць без квітка я збаяўся, давялося вярнуцца. Мама, як убачыла мае чырвоныя рукі, аж заплакала. Павяла мяне ў лазенку. Пусціла ваду. Сказала: «Не бойся, яна халодная, а табе будзе здавацца, што гарачая». Сапраўды, было такое адчуванне, нібыта рукі сунулі ў кіпень. Мама расцірала мае рукі ў халоднай вадзе, боль паціху сплываў, мама ў мяне такая добрая, любіць мяне. Чаго было ўцякаць?

## Каханне

Мама любіла тату, а ён — яе. Але гэта не вобраз іх кахання. Словы, якія кожны ці амаль кожны можа сказаць пра сваіх бацькоў. Мне хацелася стварыць вобраз, і я доўга ўспамінаў, як мама распавядала пра тату. Згадаўся і такі выпадак. Яны, толькі пажаніўшыся, паехалі да татавых бацькоў. Было спякотнае лета. Яны прыехалі ў Наваельню. Да татавай вёскі было кіламетры са тры. Можна было пайсці па напаленай сонцам дарозе, а тата прапанаваў маме ісці па рэчцы. Яны разуліся і пайшлі, узяўшыся за рукі, па празрыстай і прахалоднай вадзе Ятранкі. Яна неглыбокая, дно — залаты пясок. Мама казала, што гэтае падарожжа па рэчцы, у засені алешніку і вербаў, — найлепшае ў яе жыцці.

Калі тата пісаў пра сваю рэчку: «Яна цячэ праз маё сэрца», — ён, пэўна, згадваў і як яны з мамаю ішлі па ёй, узяўшыся за рукі, такія прыгожыя і маладыя, як мае дзеці цяпераka.

## Іспыт

Мама грунтоўна рыхтавалася да іспыту. Стыпендыя была неабходная. Сям’я дапамагчы

не магла. Маміна маці — Ядзя пасля разводу з Глобусам выйшла за Броніка Кісяля і нарадзіла Антона і Рэню. У паваенным Койданаве грошы не вяліся. Бронік вярнуўся з фронту паранены, ледзь жывы. Таму мама вучылася выдатна, і іспыты для яе мелі лёсавызначальны сэнс. Вярнуўшыся з бібліятэкі ў інтэрнат, яна пераапранулася ў сваім пакоі, дзе жыло ажно дваццаць дзяўчат, пайшла на кухню, каб запарыць гарбату на вячэру. Там нейкая першакурсніца вазьмі і спытай: «Ніна, ты маму бачыла?» «Маму?» «Твая мама прыязджала, уся ў чорным». Мама пабегла ў свой пакой, дзяўчаты згасілі святло і ўдавалі, што спяць. Мама казала, што ніколі ў жыцці не было так страшна, як стаяць у цёмным пакоі, дзе ляжаць пад коўдрамі дзевятнаццаць сяброўак. «Яны робяць выгляд, што спяць. Я не ведаю, што спытаць. Нешта здарылася. Нешта жахлівае. Што? З кім? Мама ў чорным...» «Ды скажыце вы, што здарылася?!» — закрычала мама з цемрадзі. Дзяўчаты запалілі лямпачку, пачалі супакойваць маму. Расказалі, што прыязджала яе маці, бо памерла баба Марыя, і папрасіла, каб да іспыту нічога не казалі, а сказалі пасля. Мама ноч не спала. Першай прыбегла ў інстытут, атрымала пяцёрку і паехала на пахаванне любімай бабулі Марыі.

# Паніва

Ёсць здарэнні, пра якія не ведаю, як напісаць. Галоўнае — я зусім не ўпэўнены, а ці варта згадваць пра іх наогул. Але яны навязліва запаўняюць сабой маю свядомасць і засланяюць іншыя згадкі. Яны патрабуюць: напішы пра нас, напішы... Адкладаю наколькі магу. А потым скараюся. Адно з такіх здарэнняў — выпадак з панівою.

Мама ў студэнцкім інтэрнаце смажыла бульбу. А вельмі самаўпэўнены маладзён са знакамітай артыстычнай сям'і Станютаў пачаў непрыстойна сябе паводзіць. Ягонае хамства давяло маму да таго, што яна вывернула яму паніву з кіпячым салам і бульбаю на галаў. Як не выпаліла вочы, ніхто не ведае. Цудам хлопец не стаў калекам. На наступную раніцу ў інтэрнаце з'явілася прыма купалаўскага тэатра — Стэфанія. Яна спрабавала сварыцца на маму, а тая сказала, што калі яшчэ раз яе сын палезе з заляцаннямі, дык застанецца не проста без скуры, а і без галавы, і прынясуць яго дамоў безгаловага. Артыстка абяцала паспрыяць выгнанню мамы з інстытута. Марныя і нікому не патрэбныя запалохванні. Выпадак з непрыемных.

Напісаўшы пра паніву, не адчуў я палёгкі. Можа, пазней адчую. Спадзяюся.

## Матылі

У нашым садзе над блакітнымі качанамі капусты лёталі белакрылыя і жоўта-лімонныя матылі. Іх называлі капусніцамі. Я так любіў ісці праз сад, па вузкай сцежцы, за мамаю і любавацца няўпэўнена-лёгкімі палётамі капусніц. Колькі мне ні казалі, што матылі шкодныя, што яны ператвараюцца ў вусеняў і ядуць-шкодзяць капусныя лісты! Мне было не шкада тых тоўстых лістоў, а матылёў любіў яшчэ больш. Канешне, я любіў іх менш, чым маму. Але сад, мама, матылі... Што можа з гэтым параўнацца? А яшчэ — жыццё маё было наперадзе.

## Каты і сабакі

Хто з жанчынаў не любіць коцікаў і сабачак? Мая мама. У яе развілася алергія на звярыную поўсць. Яна не можа знаходзіцца ў памяшканні, дзе ёсць ці нядаўна была жывёла. Ёй робіцца кепска. Падобная алергія мучыць маю дваюрадную сястру Вольгу. Яе арганізм не прымае паху рыбы. Аднойчы Вольга ледзь не задыхнулася, калі яшчэ дзіцёнкам схапіла ў рукі люстранога карпа. Вось і мама пачынае задыхацца ад каціных пахаў. З гэтае прычыны

яна не прыходзіць да мяне ў госці. Мой кот Чарлі, куплены для Ядзі, нібыта не пускае яе. Пазбавіцца ад ката я не магу, бо Ядзі часцяком даводзіцца заставацца адной, а з коцікам не так самотна. Зрэшты, да брата Мірослава мама таксама не ходзіць, хоць у яго ні ката, ні сабакі даўно няма, толькі два шэрыя пацукі ў драцяной клетцы.

## Плач

Заўсёды саромеўся сваіх слёз. Такі менталітэт: мужчына мусіць хаваць пачуцці, стрымліваць слёзы, быць злым і жорсткім. Такія героі ў нашых казках і аповесцях. Такіх мужчын нашыя жанчыны хочуць бачыць у жыцці. Збольшага мы такія і ёсць. Я вельмі перажываю з-таго, што прылюдна заплакаў на татавым пахаванні. Праявіў слабасць замест таго, каб з каменным тварам рабіць выгляд новага галавы сям'і. Затое маміны слёзы ўспрымаліся натуральна, як абавязковае, як неабходнае. Днямі, паміж камандоўкамі ў Лондан і Вільню, я забег да яе на каву. Мы сядзелі на кухні, і мама расказвала пра сябе: «Мне так сумна без яго. Устану раніцай, пагляджу на партрэт, і слёзы душаць, але не плачу. Пры-

ходзіць пакаёўка Алена, прыбірае, мые мне галаву, стрыжэ, робіць прычоску... А дзеля каго я такая парадная, з прычоскаю? Няма з кім пасварыцца, няма перад кім паплакаць...» Мама здымае акуляры і плача. Мне прыемна глядзець, як плача мая мама. Твар у яе чырванее, робіцца жывым. Так важна, каб твар у мамы быў жывы. «Не перажывай. Я зараз сабяруся. У мяне ёсць вы, але гэта ўсё іншае. З вамі я не магу пасварыцца».

Тое, што напісана тут, слабейшае, за тое, што не сказана і не запісана. Плач мацнейшы за слова.

## Жабрак

Заўважаецца такая акалічнасць: калі дом квітнее, абавязкова ў яго прыходзяць вар'яты і жабракі-папрашайкі. І не важна, які гэта дом — ці палац японскага імператара, ці Дом літаратараў у Менску. Жабракі прыходзілі ў дом пісьменнікаў розныя, але адзін моцна вылучаўся сярод іх. Звалі яго Валера. Ён заходзіў у розныя кабінеты, у тым ліку і ў бібліятэку. Чамусьці ён называў маму «Емяльянаўна». Пэўна з-за таго, што доўгі час у бібліятэцы разам з мамаю працавала Еўдакія Емяльянаўна,

сястра паэта Панчанкі. Мама заўсёды давала жабраку на хлеб. Прыпадкі Валеравай агрэсіі мама ўспрымала спакойна. «Ну не будзем жа мы дактароў выклікаць», — казала яна, і вар'ят супакойваўся, прасіў прабачэння ў Емяльянаўны і хаваўся за дзвярыма.

## Бібліятэкі

Маміны бібліятэкі былі для нас другім домам. У чытальных залах я, а пазней і Мірык рабілі ўрокі. Любіў я маляваць, схаваўшыся за кніжнымі стэлажамі. Не было такога свежага часопіса ці новай кнігі, якія мною не прагортваліся. А яшчэ найвялікшым задавальненнем было ўзяць у мамы ключы ад бібліятэкі, прыйсці ў яе выхадны дзень і доўга разглядаць і чытаць кнігі ў адзіноце, у поўнай цішыні. Тата, брат і я сапраўды лічылі бібліятэку домам.

Аднаго разу я прывёў Мірыка да дзвярэй дзіцячага сада і пабег у школу. Я быў упэўнены, што ён пойдзе ў групу. Думаць не думаў, што мой малодшы брат у садок не зойдзе, а пацягнецца біць абцасамі лёд на лужынах. Хто з нас не ведае, як прыемна прайсціся па малочнаму шклу плыткай калюжыны. Толькі ў адной з іх была яміна, і Мірык праваліўся ў ледзяную ва-

ду па пояс. Выбраўшыся з вады, ён паваloкся не дамоў, а ў бібліятэку. І прастаяў пад дзвярыма гадзіны са дзве, пакуль выхавацелька з інтэрната, які быў у адным будынку з бібліятэкаю, не знайшла яго і не патэлефанавала нам дамоў. Мірык забыўся, што па аўторках мама не працуе, а дамоў не пайшоў, бо тата насварыўся б мацней за маму. Гэта няпраўда, тата на Мірыка амаль ніколі не сварыўся. Проста бібліятэка мамы была для нас другім домам.

## Павага і любоў

«Сынок, — кажа мама, — спачатку трэба, каб дзеці паважалі бацькоў, а бацькі любілі сваіх дзяцей. Пазней надыходзіць час, калі ўсё змяняецца; і трэба, каб старыя бацькі паважалі сваіх дзяцей і любілі ўнукаў, а дзеці любілі сваіх старэнькіх бацькоў. Я вельмі ганаруся сваімі дзецьмі, і цябе паважаю...» А я люблю цябе, мама.
*01.12.2001*

# Змест

**Крэскі з аўтабіяграфіі** . . . . . . . . . . . . . . . . . .5
**Прылёт кажана.** Недапісаная навела . . . . . . . . .11
**Бронікі, альбо Навела пра каня** . . . . . . . . .35
**Смерць на парозе** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .51
**Ноч на Галавасека** . . . . . . . . . . . . . . . . . . .75
**Ксёндз** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .111
**Нязрушаны камень** . . . . . . . . . . . . . . . . . .133
**Бронекамізэлька № 36** . . . . . . . . . . . . . . . .155
**Трывушчая** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .187
**Вяртаючыся да перажытага** . . . . . . . . . . . .197
**Воўк прагне крыві.** Біяграфічнае апавяданне . .203
**Генеалогія, альбо Радавод Адамчыкаў** . . . .217

**Дадатак** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .249
**Адам Глобус.** Тата + мама . . . . . . . . . . . . . .249
**Тата** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .250
**Мама** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .281

*Літаратурна-мастацкае выданне*
НАША НІВА

**Адамчык Вячаслаў Уладзіміравіч**

# НЯЗРУШАНЫ КАМЕНЬ

## Апавяданні

Рэдактар *А. М. Бадак*
Мастак *Т. В. Угрына*
Мастацкі рэдактар *Адам Глобус*
Тэхнічныя рэдактары *М. П. Зоцікаў, І. В. Махнач*
Карэктар *Н. Б. Кучмель*

Падпісана да друку 01.05.2002. Фармат 60×90 1/32.
Папера афсетная № 1. Гарнітура тып Таймс. Афсетны друк.
Умоўна друкаваных аркушаў 10. Улікова-выдавецкіх аркушаў
9,1. Тыраж 500 асобнікаў. Заказ .

Аддрукавана з арыгінала-макета заказчыка
на рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве
"Паліграфічны камбінат імя Якуба Коласа".
220600, Мінск, вуліца Чырвоная, 23.